А. Цітоў

# ЗЛОТНІЦТВА БЕЛАРУСІ

XII – пачатак XX ст.





Анатоль Цітоў

# Злотніцтва Беларусі

XII — пачатак XX ст.



Мінск
«Беларусь»
2020

УДК 739(476)“11/19”
ББК 85.12(4Беи)
Ц74

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

**Цітоў, А. К.**

Ц74 Злотніцтва Беларусі. XII — пачатак XX ст. / Анатоль Цітоў. — Мінск : Беларусь, 2020. — 271 с. : іл.

ISBN 978-985-01-1284-2.

Кніга з’яўляецца першай спробай комплекснага адлюстравання розных галін злотніцкага рамяства на Беларусі. На сёння ўжо амаль усе еўрапейскія краіны маюць абагульняльныя працы па злотніцтве на сваёй тэрыторыі. Такім чынам, наша выданне ў пэўнай ступені запоўніць гэты прагал для Беларусі і будзе карыснае для фарміравання, умацавання і развіцця нацыянальнай ідэі і ідэалогіі. У кнізе ўпершыню прыводзіцца спіс звыш паўтары тысячы злотнікаў, якія працавалі на нашай зямлі або былі звязаны з ёй сваім паходжаннем. Яна зацікавіць усіх, хто неабыякавы да роднай гісторыі і культуры.

**УДК 739(476)“11/19”**
**ББК 85.12(4Беи)**

**ISBN 978-985-01-1284-2**

© Цітоў А. К., 2020
© Афармленне. РУП «Выдавецтва «Беларусь», 2020

# ПРАДМОВА

Пытанні, звязаныя з беларускім злотніцтвам, да сённяшняга часу не знайшлі дастатковага адлюстравання ў айчыннай навуковай літаратуры. Хоць асобныя эпізоды гэтай тэмы эксплуатуюцца і даследчыкамі, і прадстаўнікамі розных плыней і напрамкаў даволі інтэнсіўна — як, напрыклад, імя полацкага майстры-злотніка XII ст. Лазара Богшы. Пасля гэтай постаці імёны ювеліраў, што працавалі на нашых землях, амаль не згадваюцца. У даследаваннях беларускіх гісторыкаў другой паловы XX ст. канстатуецца наяўнасць на нашых землях, без «залішняй» дэталізацыі гэтай з'явы, злотніцкага рамяства. Падобная сітуацыя прыводзіць да няправільных высноў у дачыненні да працэсаў развіцця беларускага места і ўвогуле да не зусім адэкватнага ўспрыняцця гістарычных працэсаў, што адбываліся на нашых землях.

Злотніцтва як гістарычная з'ява ў Беларусі, на жаль, не станавілася аб'ектам пільнай увагі даследчыкаў. Гэтая штучна створаная «лакуна» спараджала і спараджае памылковае меркаванне пра нейкую адсталасць мескага (гарадскога) жыцця ў далёкім мінулым краіны і нават стойкі міф пра вясковую прыроду беларускага народа. Сапраўды ж, гістарычныя факты (зразумела, далёка не поўныя) пераканаўча сведчаць пра тое, што ў старадаўнія часы ў нашых местах назіралася актыўнае рамесна-цэхавае, у тым ліку і злотніцкае, жыццё.

Заняцце на працягу некалькіх пакаленняў злотніцкім рамяством спараджала сапраўдныя злотніцкія дынастыі. Адной з найбольш ранніх у Беларусі была дынастыя Вільгемовічаў. Пачынальнік яе, навагародскі злотнік Сымон Вільгельм, нарадзіўся ў другой палове XVI ст. і актыўна працаваў да першых дзесяцігоддзяў XVII ст. 30 снежня 1609 г. ён падпісаў тэстамент, у якім завяшчаў пахаваць сябе ў Навагародскім евангельскім зборы. Яго сын Міхал Сямён Вільгемовіч, акрамя таго што займаўся паспяхова бацькавай прафесіяй, неаднаразова быў яшчэ і на грамадскай пасадзе навагародскага бурмістра. У 1636 г. па ініцыятыве чатырох старшых злотніцкага рамяства,

якіх ён узначальваў, новагародскія злотнікі атрымалі прывілей на стварэнне свайго асобнага цэха. Апошняя згадка пра бурмістра датуецца 1644 г. і знаходзіцца ў грашовым «зыску» да яго спадкаемцаў, што з'яўляецца сведчаннем яго смерці да названага года. Яшчэ адзін выхадзец з Новагародка, Міхаіл Вільгемовіч, які зафіксаваны ў кнігах віленскага злотніцкага цэха, мяркуючы па часе яго паступлення ў вучні (1671), на нашу думку, быў унукам Сымона Вільгельма.

Славутыя дынастыі віленскіх злотнікаў другой паловы XVI — пачатку XVIII ст. Александровічаў, а таксама выхадцаў са Слоніма Даніловічаў адыгрывалі значную ролю ў злотніцкім жыцці Вільні ў XVII—XVIII стст. Не менш багатымі злотніцкімі традыцыямі валодала сям'я магілёўцаў Сліжыкаў, якая была неад'емнай удзельніцай рамесна-культурнага працэсу ў Магілёве ў другой палове XVII — XVIII ст. Прадстаўніком курляндскай злотніцкай дынастыі быў Фрыдрых Родэ, які атрымаў менскае грамадзянства ў сярэдзіне XIX ст. Паводле друкаваных крыніц, род майстраў залатых спраў Родэ фіксуецца ўжо напачатку XVIII ст. Яшчэ большай разгалінаванасцю вылучаюцца дынастыі віцебскіх майстраў злотнікаў-срэбранікаў XIX ст. Акунёвых, а таксама Роніных. На сёння зафіксавана па дзевяць прадстаўнікоў гэтых фамілій. Нельга не адзначыць тут і злотніцка-срэбраніцкую дынастыю менскіх майстраў-ювеліраў Тапазаў. Пры жаданні гэты спіс чытач можа і самастойна лёгка пашырыць, азнаёміўшыся з рэестрамі злотнікаў, прадстаўленымі ў кнізе.

Хочацца выказаць шчырую падзяку супрацоўнікам архіваў і музеяў Беларусі і Польшчы за добразычлівае стаўленне і дапамогу аўтару ў працы над гэтай тэмай. Асобна адзначаем словам удзячнасці былых дырэктара Дзяржаўнага Эрмітажа Б. Б. Піятроўскага (Расія) і намесніка дырэктара Інстытута гісторыі Польскай акадэміі навук С. К. Кучынскага (Польшча).





# ЛІТАРАТУРА

Злотніцтва як культурная з'ява прыцягвала ўвагу даследчыкаў на працягу ўсяго XX ст. Кнігу польскага навукоўца У. Лазінскага[1], што ўбачыла свет на золку XX ст., можна лічыць першай працай, што была прысвечана дадзенаму прадмету, датычылася непасрэдна нашай тэрыторыі, прыцягнула да сябе ўвагу сучаснікаў і нават не страціла сваёй каштоўнасці да сённяшняга дня. Яна паслужыла штуршком для даследчыкаў гісторыі рамёстваў і мастацтва.

З расійскіх савецкіх аўтараў немагчыма не згадаць В. І. Троіцкага[2]. У яго невялікай па аб'ёме працы сабрана значная колькасць рамеснікаў-злотнікаў, сярод якіх прысутнічае даволі высокая лічба майстраў, падмайстраў і вучняў, што звязаны сваім паходжаннем з нашымі землямі. Храналагічныя межы даследавання — сярэдзіна XVII ст., з невялікімі адхіленнямі ў той ці іншы бок.

Вялікую каштоўнасць для вывучэння дадзенага прадмета мае праца Э. Лапацінскага[3]. Праўда, за даўнасцю выдання яна стала бібліяграфічнай рэдкасцю.

Першай пасляваеннай абагульняючай публікацыяй па тэме можна лічыць югаслаўскую кнігу М. Крлежы[4]. Яна мае даволі сціплую прадмову, і больш слушна было б лічыць яе мастацкім фотаальбомам паўднёваславянскіх злотніцкіх вырабаў за перыяд IX—XVI стст.

Значны крок у вывучэнні злотніцтва быў зроблены ў Расіі ў 1967 г. Аўтары паспрабавалі ахапіць у сваёй кнізе[5] храналагічны перыяд працягам у палову тысячагоддзя на пэўных тэрыторыях былога СССР. Праўда, яны акцэнтавалі ўвагу галоўным чынам на яго еўрапейскай частцы. У кнігу трапілі і некаторыя беларускія гарады. Свой лагічны працяг гэтая праца атрымала амаль праз дзясятак гадоў — у 1974 г., пад аўтарствам, аднак, ужо адной даследчыцы[6]. У кнізе дадзена больш шырокая панарама развіцця злотніцтва на тэрыторыі Масковіі, а потым Расійскай імперыі і СССР. Тут знайшлося месца для адлюстравання тэндэнцый яго развіцця ў Эстоніі, Латвіі, крыху ў Літве. Гэтым тэры-

---

[1] *Łoziński Wł.* Złotnictwo lwowskie. Lwów, 1912.

[2] *Троицкий В. И.* Словарь Московских мастеров золотого, серебряного и алмазного дела XVII века. М. — Л., 1930 (Троицкий).

[3] *Łopaciński E.* Materiały do dziejów rzemiosła artystycznego w Wielkim Księstwie Litewskim (XV—XIX ww.). Warszawa, 1946 (Łopaciński).

[4] *Krleža M.* Zlato i srebro Zadra. Zagreb, 1951.

[5] Русское золотое и серебряное дело XV—XX вв. / сост. Гольдберг Т. [и др.]. М., 1967 (РЗиСД).

[6] *Постникова-Лосева М. М.* Русское ювелирное искусство, его центры и мастера. М., 1974 (Постникова-Лосева).

торыям былі прысвечаны асобныя главы: найбольшая Эстоніі і найменшая (усяго некалькі радкоў!) Літве. Пра Беларусь як нейкую культурную адметнасць нават не згадвалася, хоць у працы асобныя нашы гарады ўсё ж такі фігуравалі. У сувязі з гэтым нам уяўляецца асабліва цікавым перыяд Расійскай імперыі, у якім пазначаны проберныя ўрады ў Вільні, Менску, Полацку і інш.

Не адставалі ад сваіх усходніх суседзяў і ва Украіне. Тут упершыню шырокую панараму развіцця ювелірнай справы зрабіў М. З. Пятрэнка[7]. У кнізе дадзена перыядызацыя працэсаў развіцця злотніцтва ва Украіне. Даследчык вылучае першы этап як ільвоўскі, калі Львоў быў цэнтрам развіцця злотніцкай рамеснай вытворчасці, другі — як кіеўскі. Трэці ж этап, у якім, з пэўнай расплывістасцю, аўтар адзначае «ўклад іншаземцаў» у працэсы развіцця гэтага рамяства, не вылучаецца ані храналагічна, ані геаграфічна. Толькі дзякуючы названым у кнізе прозвішчам майстраў гэтага часу, яго можна храналагічна «прывязаць» да другой паловы XVIII ст.

Даволі багата аформлена кніга, якая адразу прыцягнула ўвагу грамадскасці не толькі ў Славакіі, дзе пабачыла свет, — літаральна праз два гады яна была перавыдадзена ў суседняй Польшчы[8]. Сам матэрыял дыктуе, у пэўнай ступені, і форму яго падачы. У сувязі з гэтым сваёй структурай кніга мала чым адрозніваецца ад сваіх папярэднікаў: незалежна ад краіны паходжання ілюстрацыйная частка пераўзыходзіць сваімі памерамі частку аналітычную. Багацце прыведзенага рэчавага матэрыялу робіць кнігу каштоўнай як для гісторыкаў мастацтва, так і для дзеючых злотнікаў.

У самой Польшчы таксама з пэўнай перыядычнасцю выдаюцца творы на закранутую тэму. У адной з такіх кніг[9] пададзены даволі сціплы агляд развіцця злотніцкага рамяства на тэрыторыі Польшчы і сумежных тэрыторый. Аўтар згадвае і пра выраб слуцкіх паясоў і, як нам здаецца, крыху штучна звязвае гэты працэс з дзейнасцю злотніцкіх цэхаў і асобных майстраў-злотнікаў. Вырабам «літых паясоў» з упляценнем залатой ніткі займаліся хутчэй ткачы. Кніга ўключае ў сябе беглы агляд тэхналогіі апрацоўкі каштоўных металаў, а таксама некаторыя іншыя аспекты працы з імі і можа быць, у пэўнай ступені, добрым падручнікам, асабліва для пачаткоўцаў, хоць аўтар у прадмове настойліва падкрэслівае, што ён не ставіў сабе такую мэту.

Асобнае месца займаюць працы польскага вучонага Міхала Градоўскага[10]. Нягледзячы на тое, што даследаванні гэтага аўтара абмежаваны су-

---

[7] *Петренко М. З.* Українське золотарство XVI—XVIII стст. Київ, 1970.

[8] *Toranova E.* Zlatníctvo na Slovensku. Bratislava, 1983; *Toranova E.* Zlatníctvo na Slovensku. Warszawa, 1985.

[9] *Knobloch M.* Złotnictwo. Warszawa, 1977.

[10] *Gradowski M.* Dawne złotnictwo : technika i terminologia. Warszawa, 1980 (Dawne złotnictwo); *Gradowski M.* Znaki na srebrze (znaki miejskie i państwowe używane na terenie Polski w obecnych jej granicach). Warszawa, 1993 (i inne).

часнымі адміністрацыйнымі межамі Польшчы, яго працы, прысвечаныя развіццю злотніцтва, прадстаўляюць значны інтарэс і будуць карысныя для даследчыкаў суседніх краін.

У Расіі назіраецца актыўны рост колькасці выданняў дадзенай праблематыкі, што адлюстроўваецца ў павелічэнні колькасці публікацый на гэтую тэму. Прычым варта адзначыць іх адметнае мастацкае афармленне. Як прыклад падобных прац можна назваць наступныя. У кнізе[11], прысвечанай злотніцкім вырабам, якія захоўваюцца ў Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве (ГИМ), акрамя тэксту і багатага ілюстрацыйнага матэрыялу прыведзены і слоўнік майстраў-злотнікаў XVI—XX стст. Нягледзячы на тое, што ў бібліяграфіі сустракаецца прозвішча В. І. Троіцкага, аніводны майстра-злотнік беларускага паходжання не згадваецца, быццам бы іх не існавала ўвогуле. Аналагічнае выданне[12] — створаны таксама калектывам аўтараў багата ілюстраваны альбом, дзе разглядаюцца злотніцкія ўпрыгожанні (гузікі, пярсцёнкі, завушніцы, пацеркі і інш.) як элемент тагачаснага строю. Наступны твор[13] уяўляе сабой працу са шматлікімі ілюстрацыямі, у якой дэманструюцца скарбы, што знаходзяцца ў сховішчах расійскіх музеяў. Нягледзячы на тое, што адпаведна назве, якая акрэслівае канкрэтную геаграфічную прастору, альбом пачынаецца з кіеўскага колта XII ст., далей фігуруюць мастацкія творы з Чарнігаўшчыны, а нашы быццам бы ўвогуле адсутнічаюць у маскоўскіх сховішчах!

Крыху горш у параўнанні з суседзямі ішлі справы з вывучэннем дадзенага прадмета ў нашай краіне. Кніг, прысвечаных злотніцтву як рамяству ці мастацтву, не было, за рэдкім выключэннем асобных прац або артыкулаў, што ў пэўнай меры закраналі гэтыя сюжэты. Спробу звярнуць увагу нашай грамадскасці на дадзеную з'яву зрабіў А. Палеес, які надрукаваў у 1947 г. артыкул пра майстраў залатых і срэбраных спраў не ў спецыяльным, а ў грамадска-палітычным часопісе[14]. Яго фонд (ф. 382) зберагаецца ў Архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Там захоўваюцца нататкі навукоўца па развіцці розных рамёстваў, у тым ліку і злотніцтва, на Беларусі і шэраг імёнаў рамеснікаў. Праўда, карткі, складзеныя А. Палеесам, утрымліваюць толькі першасную, вельмі лаканічную і, на жаль, не заўсёды сістэматызаваную інфармацыю.

Абагульняючых прац па гэтай галіне рамяства і мастацтва ў нашай краіне не выдавалася. Намаганні беларускіх гісторыкаў былі прыцягнуты да рашэння «больш важных» пытанняў, рабіўся акцэнт на сацыяльна-палітычную ба-

[11] Русские ювелирные украшения XVI—XX веков из собрания Государственного ордена Ленина исторического музея / сост. Г. Медведева [и др.]. М., 1987.

[12] Русские ювелирные украшения XVI—XX вв. (из собрания Государственного исторического музея). М., 2002.

[13] Ювелирное искусство Росии : альбом / сост. Т. В. Тищенко. М., 2002.

[14] *Палеес А.* Майстры залатых і сярэбраных спраў // Беларусь. 1947. № 1. С. 49—50 (Палеес).

рацьбу з прыгнятальнікамі-эксплуататарамі і барацьбу за светлую будучыню, на вядучую ролю пэўнай грамадскай арганізацыі і г.д.

Адной з першых прац, даволі вялікіх па сваім аб'ёме, дзе фігуруюць злотнікі (хоць і ў якасці ўскоснага аб'екта даследавання), з'яўляецца праца Лаўрэна Абецадарскага[15], напісаная са значным прыцягненнем матэрыялаў, апублікаваных В. І. Троіцкім. Калі даследаванні апошняга канстатуюць наяўнасць на службе ў маскоўскіх цароў беларускіх майстраў (што траплялі туды і не заўсёды добраахвотна!), дык у Л. Абецадарскага кніга напісана з пэўным ідэалагічным ухілам; хоць была яна выдадзена амаль праз чатыры гады пасля смерці аўтара, тэндэнцыя разгляду ўсіх фактаў праз прызму «спрадвечнага імкнення беларускага народа да зліцця» з нашым усходнім суседам, нягледзячы на рэдагаванне тэксту яго навуковым апанентам, з тых жа меркаванняў, была захавана. Тым не менш, калі адкінуць ідэалагічнае шалупінне, у працы сабраны факты, што ілюструюць падзеі і ўмовы жыцця нашых землякоў у XVI—XVII стст. па-за межамі Беларусі.

У маляўнічым фотаальбоме[16] на тэму дэкаратыўнага мастацтва нашай краіны, аўтарам-складальнікам якога з'яўляецца Н. Ф. Высоцкая, першая частка аддадзена злотніцкім вырабам. У заўвагах аўтар, абапіраючыся на апублікаваныя дадзеныя, спрабуе зрабіць падлік колькасці злотнікаў, што працавалі на нашых землях у XV—XVIII стст. У выніку ёй названа лічба ў 1740 чалавек. У сувязі са спрэчнасцю некаторых крыніц і матэрыялаў, на якія спасылаецца Н. Ф. Высоцкая, адзначыўшы, аднак, зробленую працу, пакінем прапанаваную лічбу без каментарыя. Варта заўважыць, што дадзенае выданне спрыяла знаёмству нашай і замежнай грамадскасці з багаццем мастацкай культуры Беларусі, у тым ліку і з беларускімі злотніцкімі традыцыямі.



*Збан туалетны менскага майстры [В. Біркоўскага?]. 1895 г.*

[15] *Абецедарский Л. С.* Белоруссия и Россия : Очерки русско-белорусских связей второй половины XVI — XVII вв. Минск, 1978 (Абецедарский).

[16] *Высоцкая Н. Ф.* Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII—XVIII стст. Мінск, 1984 (Высоцкая).

Даволі ўдалая спроба вылучыць «беларускае кола» ў злотніцкім асяроддзі старадаўняй Вільні была зроблена Э. Максімавай у артыкуле[17], прысвечаным арнаментальнаму мастацтву і яго ўвасабленню ў злотніцтве. Каштоўным дадаткам артыкула з'яўляецца «Спіс віленскіх злотнікаў...». Аўтар «прасеяла» дадзеныя польскага даследчыка Э. Лапацінскага з мэтай вылучэння сярод злотнікаў Вільні асоб, звязаных сваім паходжаннем і дзейнасцю з сучаснай тэрыторыяй Беларусі.

Вялікая па сваім аб'ёме праца, праведзеная літоўскім даследчыкам Э. Лаўцявічусам, была значна дапоўнена і пашырана пасля яго смерці сучаснай літоўскай калегай Б. Р. Віткаўскене[18]. У выдадзенай кнізе прыведзены шматлікія матэрыялы аб развіцці злотніцкага рамяства ў старадаўнім ВКЛ і галоўным чынам у яго сталіцы — Вільні. У сувязі са спецыфікай гістарычных лёсаў дадзенай тэрыторыі, асабліва Віленшчыны, адбылося значнае супадзенне фактаграфіі, сабранай вышэйназванымі аўтарамі, з тымі матэрыяламі, што трапілі ў нашу працу, пры наяўнасці пэўных адрозненняў у іх інтэрпрэтацыі.

Спроба зарэгістраваць на гістарычных землях Беларусі прадстаўнікоў злотніцкай спецыяльнасці праз вывучэнне друкаваных і пісьмовых крыніц была зроблена таксама і аўтарам[19]. З XII да канца XVIII ст. ім было ўлічана 279 злотнікаў. Сярод іх ёсць прадстаўнікі дзвюх асноўных канфесій, якія існавалі ў той час у межах Вялікага Княства Літоўскага (за выключэннем мусульман, якія аніводнага разу не трапляліся ў дакументальных матэрыялах у якасці спецыялістаў-злотнікаў): выяўленыя намі прадстаўнікі ўсіх хрысціянскіх плыней складалі каля 88% агульнай колькасці; астатнія, крыху больш за 12%, былі іўдзеямі (што прыкладна адпавядала колькасці яўрэйскага насельніцтва ў агульнай структуры жыхарства ВКЛ). У прааналізаваных матэрыялах знайшлі сваё адлюстраванне рэлігійныя спрэчкі паміж прадстаўнікамі розных напрамкаў у хрысціянстве, што мелі месца ў канцы XVI — першай палове XVII ст. Але трэба адзначыць, што тэалагічныя пярэчанні і дэбаты не былі вызначальнай рысай іх дзейнасці.

Перад даследчыкам стаіць задача выяўлення злотніцкіх клейнаў (як асобных майстраў, так і агульнацэхавых), але гэтыя матэрыялы амаль альбо зусім (!) не адлюстраваліся ў архіўных дакументах; іх трэба шукаць на месцах — у музеях і іншых «сховішчах», дзе непасрэдна знаходзяцца злотніцкія вырабы. Але пошук такіх помнікаў часта звязаны з работай па-за межамі не толькі горада Мінска, але і краіны, што, безумоўна, патрабуе пэўных матэрыяльных трат і адпаведных бюджэтных укладанняў.

---

[17] *Максімава Э. С.* Арнаментальнае мастацтва злотнікаў «віленскага кола» // Помнікі культуры : новыя адкрыцці. Мінск, 1985 (МЭ). С. 93—101, 202—206.

[18] *Laucevičius E., Vitkauskenė B. R.* Lietuvos Auksakalystė. XV—XIX amžius. Vilnius, 2001 (L—V).

[19] *Цітоў А. К.* Спіс злотнікаў Беларусі XII—XVIII стст. // Гуманітарна-эканамічны веснік. 2001. № 1. С. 12—25.



# ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА ЗЛОТНІЦТВА XII — пачатку XX ст.

У беларускім злотніцтве як культурна-гістарычнай з'яве выразна прасочваюцца наступныя перыяды, якія можна вылучыць і ў гістарычным лёсе нашай Бацькаўшчыны. Праўда, храналагічныя рамкі гэтых перыядаў-этапаў будуць трохі іншымі, што тлумачыцца ў пэўнай ступені як маруднасцю і інертнасцю гістарычных працэсаў, так і некаторай спецыфічнасцю самога матэрыялу даследавання.

## СТАРАЖЫТНЫ ПЕРЫЯД

### *Рамеснікі-злотнікі ў дацэхавыя часы*

Храналагічныя рамкі гэтага перыяду распачынаюцца з даўніх часоў і працягваюцца да цвёрдага ўсталявання на тэрыторыі нашай краіны злотніцкіх рамесных аб'яднанняў (цэхаў), што фактычна абмяжоўваецца канцом XVI — першай паловай XVII ст. Пры гэтым неабавязкова, што стварэнне цэхаў (у прыватнасці злотніцкіх) віталася нашымі продкамі, — наадварот, на гэтай глебе нават узнікалі канфлікты, што вымушала ўлады шукаць розныя варыянты вырашэння гэтага пытання. Але сам гэты факт сведчыць пра эканамічныя пярэчанні паміж прадстаўнікамі «старой» формы ладу рамеснай дзейнасці і «новай», якая прадугледжвала арганізацыю вытворчасці праз папярэднюю пісьмовую фіксацыю правоў і абавязкаў братоў цэха. Безумоўна, такія аб'яднанні — гільдыі, брацтвы — былі ў большай ступені канкурэнтаздольнымі, чым злотнікі-саматужнікі (індывідуалы), якія ў рэшце рэшт зніклі з гістарычнай арэны, саступіўшы месца цэхам.

## Цэхавы перыяд.
## Узнікненне і дзейнасць злотніцкіх цэхаў

Першыя злотніцкія рамесныя брацтвы стала фіксуюцца ў нас напрыканцы XVI ст. Туды прымалі **«людзей добрых, аселых, парадак і згоду мілуючых, месту прысеглых»**. У дакументальных крыніцах і літаратуры захаваліся злотніцкія цэхавыя статуты, іх было няшмат.

Найбольш старадаўнім на сучаснай тэрыторыі нашай краіны з'яўляецца берасцейскі аб'яднаны злотніцка-малярскі цэх, які быў заснаваны «ў годзе 1599 красавіка 17 дня». Менчукі атрымалі права заснавання свайго асобнага цэха 31 траўня 1615 г., а ў Магілёве злотніцкі цэх быў намінальна створаны 20 верасня 1629 г., праўда, каралеўская ўлада выдала «ліст-прывілей» толькі 22 чэрвеня 1634 г. Прывілей злотнікам «места Новагародскага» быў зацверджаны ўладамі ў 1636 г., а ў Гародні гэта сталася, згодна з дакументам, у 1637 г.

Як сведчаць гістарычныя крыніцы, злотніцтва развівалася не толькі ў тых местах, дзе існавалі адпаведныя цэхі, — на тэрыторыі Беларусі былі гарады, дзе рамеснікаў-злотнікаў не «ахапілі» цэхавыя ўстановы: напрыклад, Віцебск, Полацак, Пінск і інш. Часта злотнікі складалі адасобленую групу сярод рамеснікаў іншых спецыяльнасцей у тым ці іншым горадзе. Вузкасць крыніцазнаўчай базы не дазваляе разгледзець дадзенае пытанне ва ўсіх шматлікіх яго аспектах, але пазначыць асобныя рысы праблемы застаецца магчымым.



*Евангелле, аздобленае злотнікам. XVII ст.*

Яшчэ ёсць пэўная група местаў, дзе не было злотніцкіх аб'яднанняў. Гэта збольшага прыватнаўласніцкія гарады. Першым па значнасці ў гэтым шэрагу стаіць Слуцак. Статус сталіцы княства абумовіў той факт, што места было буйным рамесніцкім цэнтрам.

Перыяд XVII—XVIII стст., каб не ваенныя дзеі (асабліва Лівонская і «руска-польская» войны, асноўны ваенны тэатр якіх разгарнуўся на тэрыторыі нашай краіны), можна было б лічыць часам умацавання і росквіту рамеснай вытворчасці ўвогуле і злотніцтва ў прыватнасці.



*Срэбраны куфель «Багуслаў Радзівіл».*
*Сярэдзіна XVII ст.*

# СТРУКТУРА ЗЛОТНІЦКІХ ЦЭХАЎ XVI—XVIII стст.

## *Цэхавыя браты*

Кожную тагачасную карпарацыйную ўстанову, у тым ліку і злотніцкія цэхі, можна параўнаць з пірамідай. Вяршыня яе прадстаўлена старшынямі і цэхавымі майстрамі (цэхмістрамі), якія абіраліся з майстроўскага (містроўскага) асяроддзя — найбольш кваліфікаванай і прывілеяванай часткі рамеснікаў. Наступная група, якая знаходзілася паміж вяршыняй піраміды і яе падмуркам, — містроўскія таварышы, альбо падмайстры, — была больш абмежавана цэхавымі статутамі ў параўнанні з імі. Найбольш шматлікімі і найменш правамоцнымі ў рамесных брацтвах былі вучні.

**Вучні** называліся яшчэ і «пахолкамі, пахолікамі, хлопцамі». Як правіла, у вучэнне прымаліся дзеці вольных бацькоў «добрага ложа». Гэта значыць, што трапіць да майстры ў вучні мог толькі той, хто быў вольным, законнанароджаным і не з'яўляўся падданым будзь-якой асобы. Забаранялася браць у злотніцкія вучні таксама дзяцей млынароў, лазебнікаў (баншчыкаў), цэклераў (пасада ў тагачасных праваахоўных органах: той, хто займаўся крымінальным вышукам), асоб іўдзейскага і мусульманскага веравызнання. Кожны, хто паступаў да майстры, мусіў прадставіць пацверджаныя «свядзецтвы» аб сваім паходжанні ад родзічаў, сваякоў і прыяцеляў.

Кандыдат у вучні пільна разглядаўся майстрам на працягу дванаццаці тыдняў, а па сканчэнні гэтага тэрміну, калі «абітурыент» яму падабаўся, майстра ішоў у цэх і запісваў хлопца ў вучнёўскі рэестр, пасля чаго ўносіў дванаццаць грошаў «упіснога». Цяпер вучань не мог самавольна пакінуць свайго майстру і перайсці да іншага настаўніка, а рэестр, каб не здарылася нейкіх злоўжыванняў з боку цэхавых, знаходзіўся пад кантролем магістрата.

Трапіць у вучэнне да спецыяліста можна было толькі пасля выканання строгай працэдуры: пра кожнага жадаючага абвяшчалася на сходцы ўсім братам цэха з абавязковым «упісаннем» яго ў цэхавы рэестр. Перад гэтай працэдурай хлопцу неабходна было паказаць рэкамендацыі ад «людзей добрых, тутэйшых, аселых і веры годных».

Калі ён датэрмінова прыпыняў працэс абучэння, тыя, хто даваў рэкамендацыі, разам з бацькамі хлопца пагашалі матэрыяльныя страты майстры, які прымаў вучня на сваё ўтрыманне. У працэсе вучэння і пасільнай працы апошні, як правіла, не атрымліваў (асабліва на першым этапе адукацыі) грошай, а толькі стол, дах над галавой і, безумоўна, навыкі практычнай работы. Праўда,

жыццё заўсёды больш шматграннае, чым самыя разнастайныя статутныя патрабаванні.

Тэрмін навучання для добрага авалодання злотніцкім рамяством у розных беларускіх местах не быў аднолькавым і доўжыўся ў залежнасці ад сітуацыі ў сярэднім ад трох да пяці гадоў. Напрыклад, адпаведна статуту гарадзенскіх злотнікаў, тэрмін атрымання першаснай адукацыі (вучнёўства) па гэтай прафесіі працягваўся чатыры гады. Напраўду сказаць, тэрмін вучобы мог быць і восем гадоў! Усё залежала ад узросту вучня, яго кемлівасці, папярэдняй падрыхтоўкі, здольнасцей, жадання вучыцца і г.д.

У выпадку смерці настаўніка яго вучні размяркоўваліся паміж іншымі цэхавымі майстрамі, дзе яны мусілі скончыць сваю вучобу; калі гэта былі амаль «выпускнікі», яны давучваліся, як правіла, ва ўдавы памерлага. З прычыны пераезду ў іншае места ці пры пераходзе ад аднаго майстры да іншага ад вучняў патрабавалі паперы ад папярэдніх настаўнікаў, і, калі яны вучыліся ў цэхавых містраў, тэрмін навучання залічваўся цалкам. Калі ж хлопец датэрмінова прыпыняў сваё вучэнне — не хацеў вучыцца і ўцякаў, — яго маглі «выпісаць» з рэестра толькі пасля таго, як ён аплоціць майстру сваё харчаванне, тэрмін, што адбыў у яго, а таксама шкоду, калі такую нарабіў.

Але вучні-хлопчыкі не былі толькі выканаўцамі майстроўскай волі. Іх правы таксама ахоўваліся ад магчымых празмерных «педагагічных хібаў» настаўнікаў. У тым выпадку, калі майстра «з хлопцам тыранска абходзіўся і біў надпрыстойна», пацярпелы мог звярнуцца (прадставіўшы сведкаў) да старшынь цэха. Пасля трох падобных зваротаў з такім настаўнікам-тыранам, калі ён не супакойваўся і не змяняў метадаў адукацыйна-выхаваўчага працэсу, вучня пераводзілі да іншага майстры. Аднак калі хлопец, не вытрымаўшы цяжару вучэння або настаўніцкіх прыёмаў ці з іншых прычын, уцякаў ад свайго майстры, а потым жадаў вярнуцца, тады ён страчваў усе папярэднія гады абучэння і вымушаны быў пачынаць усё з пачатку. Калі ж такі хлопец толькі пажадаў атрымаць ад цэха «лісты вучэння свайго» (даведку аб атрыманай адукацыі), цэхавая адміністрацыя павінна была выдаць яму такую. За «даведку» вучань мусіў заплаціць у цэхавую скарбонку велізарную па тых часах суму — капу[20] грошаў літоўскіх. У выпадку калі ён не плаціў гэтай сумы, то «адставаў ад рамяства назаўсёды».

Заканчэнне курса навук адзначалася тым, што майстра выпісваў вучня з рэестра і, заплаціўшы пару польскіх злотых «выпісногa», рабіў яго «вольным». Гэта сведчыла, што хлопец-вучань апынуўся ў новым статусе, паспяхова прайшоў курс навучання і набыў больш высокі ранг — містроўскага таварыша, падмайстры.

---

[20] *Капа* — старажытная беларуская мера ліку, якая складалася з 60 адзінак; 1 капа = = 5 тузінаў.

**Таварышы, альбо падмайстры**, называліся таксама і малодшымі братамі. Званне таварыша атрымлівалі асобы, што паспяхова скончылі першасны курс навучання, — гэта была другая, вельмі важная прыступка ў кар’еры злотніка. Не кожны, хто на яе падымаўся, атрымліваў званне майстры, але і на гэтым узроўні можна было дасягнуць пэўнай эканамічнай незалежнасці. Праўда, злотніцкія таварышы не маглі працаваць самастойна, без дазволу цэхмістраў, у тым горадзе, дзе існаваў злотніцкі цэх, незалежна ад таго, пад якой юрысдыкцыяй — свецкай ці духоўнай — цэх знаходзіўся. Парушальнік гэтага параграфа цэхавага статута мусіў заплаціць вялікі штраф — «віну» — як цэхавым, так і мескім уладам, а яго «работа» падлягала канфіскацыі.

Пераход падмайстры ад аднаго да іншага гаспадара-майстры ў параўнанні з прадстаўнікамі папярэдняй катэгорыі, вучнямі, быў спрошчаны. Калі падчас прыёму ў вучні яго паручыцелямі выступалі іншыя асобы, дык таварыш выступаў перад брацтвам як юрыдычная асоба, здольная дзейнічаць без фізічных паручыцеляў, — іх ролю ў пэўных выпадках выконвала брацтва, чыя пячатка замацоўвала дакументы аб атрыманай адукацыі і ступені валодання спецыяльнасцю.

Разам з тым таварышы, зразумела, карысталіся меншымі правамі, чым майстры. Злотніцкія цэхавыя статуты патрабавалі павагі першых да другіх: калі які з таварышаў «паўстаў на містра словамі неўчцівымі», то павінен быў заплаціць на цэх віну памерам у капу грошаў і сядзець «у вязенні да ласкі містроўскай» (да даравання апошнім нанесенай падмайстрам абразы). Таварышы мусілі «...у абхаджэнні містроў пільнасць... захаваць» і «...ні ў чым не занядбаць». Тая ж увага патрабавалася ў адносінах да «містроўскай жонкі, дзетак» і калег. Калі ў падмайстры ўзнікала неадкладная неабходнасць з’ехаць з места, ён не мог гэтага зрабіць без дазволу свайго майстры. Усе распараджэнні і заданні містра таксама павінны былі абавязкова быць выкананымі. Ад таварышаў патрабавалася «рамесло сваё ціха і пристойна рабіць», у святыя дні хадзіць у царкву ці касцёл, а ў дні адпачынку — у «гасподу цэхавую».

Як правіла, таварыш заключаў дамову-кантракт з майстрам, у якога заставаўся працаваць. Перад падпісаннем такога кантракта падмайстра жыў у доме майстры два тыдні — гэта быў «выпрабавальны тэрмін», пасля сканчэння якога яны афіцыйна рэгістравалі свае працоўныя дачыненні ў цэхавай адміністрацыі. Калі такая рэгістрацыя не праводзілася, дык знаходжанне гэтага таварыша ў майстры звыш двух тыдняў лічылася незаконным, і калі таварыш быў «прыхаднем» у горад, то мусіў яго пакінуць. У адваротным выпадку пакаранне чакала абодвух — і прыхадня, і майстру, што яго прыняў, але не аформіў дакументаў. У кантракце было прапісана, што таварыш, які пажадаў пакінуць свайго майстру, абавязваўся цэхавымі статутамі папярэдзіць апошняга за два тыдні да запланаванага адыходу, а пасля заканчэння работы заявіць

слушную прычыну такога рашэння і ісці вандраваць далей. Калі таварыш быў «свавольным» і ўчыніў майстру шкоду альбо парушыў дамоўленасць паміж імі, цэхавая адміністрацыя мусіла паведаміць пісьмова, каб такі падмайстра нідзе не мог знайсці прытулку і каб ніхто «з пачцівых таварышаў» не працаваў з ім. Толькі высветліўшы адносіны са сваім былым майстрам, такі «адступнік» меў шанец вярнуцца ў цэхавае брацтва.

Каб атрымаць званне цэхавага майстры, таварыш мусіў адрабіць у аднаго майстры два гады (з канца XVII ст. гэта называлася «атэстацыя»), потым адбыць абавязковую вандроўку працягласцю ў адзін год і шэсць тыдняў (у некаторых злотніцкіх цэхавых статутах агаворваецца: двухгадовую) у іншыя месты або краіны. Такія вандроўкі па вопыт рабіліся пераважна ў Вільню, якая доўгі час была «кузняй злотнічых кадраў» для ўсёй Беларусі, таксама таварышы выпраўляліся ў Львоў, Кракаў, Люблін, Варшаву і інш. Безумоўна, не забараняліся і больш дальнія — раманскія або германскія — краіны. Галоўным патрабаваннем было, каб таварыш там «добра спраўляваўся і атэстацыю прынёс». Тым, хто з якіх-небудзь прычын не мог гэта выканаць, рабілася выключэнне, але пры ўмове выплаты на карысць цэхавай скрынкі даволі значнай сумы грошай. Калі на званне майстры прэтэндаваў містроўскі сын або той, хто адружыўся з дачкой ці ўдавой па майстры, патрабавалася толькі палова «датку». Скідка такім падмайстрам была і ў наступным: у якасці таварыша яны павінны былі «служыць рок» у іншага майстры, а потым ісці ў вандроўку на той жа тэрмін, што і «шараговы» падмайстра. Пасля адбыцця «таварыскай службы» як вандроўным, так і мясцовым кандыдатам неабходна было «служыць яшчэ рок».

Пасля прыняцця падданства і прынясення прысягі на вернасць месту і брацтву падмайстра прыступаў да вырабу «містрштукі». Абавязковым патрабаваннем для тых, хто прайшоў абучэнне, вандроўку і іспыты, быў узнос у цэхавую скрыню, «датак», у памеры ста злотых — праўда, не разам, але часткамі, з растэрміноўкай на тры гады.

**Містроўскія штукі** (іспыты на званне майстры). Каб набыць статус паўнавартаснага і паўнапраўнага майстры, кандыдат-таварыш мусіў прайсці даволі працяглую працэдуру.

Пасля паспяховага адбыцця «таварыскай службы» прэтэндэнт на званне майстры мусіў абысці па дамах усіх цэхавых майстраў і прасіць іх згоду на дапушчэнне яго да іспытаў. Гэтая працэдура магла адбыцца толькі чатыры разы на год: таварышу належала звярнуцца да цэхавага начальства ў суботу за два тыдні да канца бягучага квартала. Тое самае ён быў абавязаны паўтарыць у наступную суботу, праз тыдзень. Пасля гэтага, раніцай наступнага дня, гэты самы прэтэндэнт мусіў прыйсці разам «з добрымі людзямі» ў «цэхавую

гасподу, калі там будуць майстры», прасіць, каб яго дапусцілі «да рабення штук» (іспытаў). У Францыі гэта называлася **«зрабіць шэдэўр»**. Разам з тым прэтэндэнт мусіў прынесці лісты аб сваім нараджэнні ад тамтэйшых улад, а таксама лісты аб атрыманай ім адукацыі ў злотніцкім рамястве.

Толькі пасля прахаджэння гэтай працэдуры старшы цэха прызначаў месца — канкрэтны містроўскі варштат (часцей за ўсё гэта была майстэрня цэхмістра), дзе прэтэндэнт мусіў рабіць «містроўскія штукі» без аніякай дапамогі ўласнымі рукамі на працягу аднаго квартала. Ва ўсіх злотніцкіх статутах падкрэсліваецца, што прэтэндэнт на званне «...майстэрства сваё і ўласную дасканаласць у навуцы і штуках містроўскіх ніжэйапісаных будзе павінен у варштаце цэхмістра: па-першае, келіх зрабіць, потым пячатку, на якой мусіць быць гелм з наміткай альбо галінкамі ці кветкамі аздоблены [альбо літарамі], як звычай патрабуе, вырыць [выразаць]...». А некаторыя цэхавыя статуты патрабавалі, каб яшчэ быў зроблены пярсцёнак «з камянём, цудоўна асаджоным».

Старшыя майстры пільна сачылі, каб прэтэндэнт не выносіў з дома або варштата распачатых ім работ, і былі абавязаны клясціся пад прысягай, што «містроўскія штукі» зроблены ім асабіста, без дапамогі звонку. Таксама, адпаведна са статутамі, аніводны з памочнікаў не мог нават бачыць тыя штукі-майстэрчыкі, што вырабляў прэтэндэнт. Падчас выканання вельмі складанай працы апошні мусіў азнаёміць майстраў з прамежкавымі вынікамі сваёй работы; калі тыя знаходзілі, што ён «рухаецца ў правільным кірунку», якасць яго работы задавальняла ці мела нязначныя хібы, што можна было хутка выправіць, «дыпламант» працягваў далей працу. У адваротным выпадку іспыты прыпыняліся і няўдалы прэтэндэнт вымушаны быў накіравацца ў вандроўку ізноў. Тэрмін выканання «майстэрчыка, містрштукі, шэдэўра ці штукі» ў залежнасці ад спецыяльнасці працягваўся ад аднаго квартала да двух.



*Навагародскі пацір. [Пачатак XVII ст.]*



*Фрагменты пячаткі Супрасльскага манастыра з выявамі Архангела Гаўрыіла і Панны Марыі*

Па сканчэнні квартала «дыпломная работа» прадстаўлялася на абмеркаванне ўсім цэхавым майстрам, якія ацэньвалі працу і выказвалі свае заўвагі. Праца альбо прымалася, альбо не. На выпраўленне дробных заўваг давалі яшчэ адзін квартал. У тым выпадку, калі заўваг мелася зашмат альбо яны былі выпраўлены няякасна, прэтэндэнт-таварыш мусіў ісці ў вандроўку яшчэ на адзін год. Толькі вярнуўшыся, ён мог атрымаць дазвол на паўторныя іспыты.



*Пячатка (штэмпель) Супрасльскага манастыра з адлюстраваннем сюжэта «Дабравешчанне». Пачатак XVII ст.*

Выкананая і адобраная ўсімі цэхавымі майстрамі дыпломная праца траплялая ў цэхавую скрынку, на агульны пажытак брацтва; туды ж прэтэндэнт мусіў унесці таксама дзве грыўны срэбра і адну (у некаторых злотніцкіх цэхах патрабавалася дзве) капу грошаў літоўскіх уступнага.

Некаторыя цэхавыя статуты патрабавалі, каб «дыпламант» ішоў са сведкамі да мескага ўрада і там прыняў падданства горада, у якім ён здаваў іспыты, ужо пасля таго, як была зроблена

«містрштука». Зрабіўшы гэта, ён далучаўся да злотніцкага цэха. Аднак толькі пасля выканання ўсёй працэдуры — паспяховай здачы іспытаў, пачастунку містрам і іншым братам цэха і адпрацоўкі яшчэ год у якасці маладога (малодшага) майстры — ён нарэшце набываў статус паўнавартаснага брата цэха — Майстры. З дробнымі адрозненнямі гэтыя кваліфікацыйныя патрабаванні фігуруюць у статутах розных злотніцкіх цэхаў. Безумоўна, ад новапрынятага патрабавалася «прыстойна ва ўсіх пунктах выконваць цэхавы статут і захоўваць няўхільна сваю “прысегу”».



*Пячатка (штэмпель) першай інстанцыі суду ардынарыйнага майдэборскага места Новы Двор з выявай Архангела Міхаіла. 1792 г.*

**Майстры** — рамеснікі вышэйшай кваліфікацыі. Дыстанцыя паміж статусам вучня, што ўпершыню трапіў да «містроўскага варштата», і высокім званнем майстры вагалася ў сярэднім (пры ўмове праяўлення адпаведных здольнасцей і спалучэння спрыяльных знешніх абставін) ад дзевяці да адзінаццаці і болей гадоў.

Містры з'яўляліся паўнавартаснымі і паўнапраўнымі сябрамі цэха, менавіта з іх абіралася кіраўніцтва брацтва, цэха, і толькі яны карысталіся поўнай свабодай дзейнасці (зразумела, у межах статутных вольнасцей). Напрыклад, адпаведна з прывілеем караля і вялікага князя Аляксандра, віленскім злотнікам, майстроўскім таварышам, забаранялася жаніцца да таго часу, пакуль яны не атрымаюць званне майстры[21]. Толькі гэтае высокае званне здымала і такую перапону!

Дзе б майстры ні жылі — у горадзе ці на прадмесці, — яны абавязаны былі далучыцца да цэха, пад страхам страты «работы і варштата» (прадукцыі, майстэрні і інструментаў). Ніхто, акрамя іх, не мог прывозіць каштоўныя металы і камяні і гандляваць гэтымі таварамі ў местах, дзе былі злотніцкія цэхі; у парушальніка, які б такое асмеліўся зрабіць, тавар падлягаў канфіскацыі. Часта дамы майстраў былі вызвалены каралеўскімі прывілеямі ад усялякіх пастояў жаўнераў ці падчас з'ездаў дэпутатаў, суддзяў і г.д. Майстры, незалежна ад таго, жылі яны на зямлі магістрацкай, манастырскай альбо пры двары

[21] Акты, издаваемые комиссиею, высочайше утвержденною для разбора древних актов в Вильне : в 39 т. Вильна, 1865—1912 (АВАК). Т. 10. С. 96.

якога-небудзь пана, мусілі падпарадкоўвацца законам рамеснага брацтва і горада.

Нягледзячы на тое, што статус майстры — гэта найвышэйшая ступень прызнання ў рамястве, ён меў не толькі правы, але і абавязкі, якія рэгламентаваліся адпаведнымі статутнымі артыкуламі. Важкім грахом лічылася непавага да сваіх калег, і майстра, які «паўстаў на брата словамі неўчцівымі», мусіў заплаціць штраф на ратушы тры фунты воску, а калі ён адмаўляўся гэта зрабіць, яму забаранялася выконваць заказы з чэляддзю (слугамі) і памочнікамі на тэрмін, які вырашыць цэх. Калі ён адважваўся на сходцы перабіць выступоўцу або ўлезці ў спрэчку без дазволу старшых, павінен быў плаціць віну ў фунт воску «столькі, колькі-крот тое ўчыніць». Адпаведна са статутам берасцейскага злотніцка-малярскага цэха, калі адзін майстра «неўчцівымі словамі зэілжыў» свайго калегу і гэта пацвярджалася двума сведкамі, «годнымі веры», ён мусіў заплаціць у брацкую скрынку палову капы грошаў; калі ж прымяніў да яго «меры фізічнага ўплыву» — капу. Той жа штраф спаганяўся з кожнага ўдзельніка сваркі, калі яна была двухбаковай.

Майстры не маглі выконваць адначасова болей за дзве галоўныя работы, і толькі пасля іх завяршэння дазвалялася распачаць новую працу. Не дапушчалася таксама парушаць правілаў добрасумленнай канкурэнцыі, перахопліваць заказ адзін у аднаго: вінаваты падлягаў штрафу на карысць цэхавай скрынкі «ў палову грыўны срэбра», а заказ, зразумела, губляў. Такі штраф чакаў і таго, хто шкодзіў заключэнню ўжо абумоўленага кантракта паміж майстрам і заказчыкам.

Майстрам забаранялася пераманьваць чаляднікаў у сваіх калег, таксама як і кожнаму мець болей за адну майстэрню-варштат і адну краму для рэалізацыі сваёй прадукцыі. Адпаведна з магілёўскім «парадкам злотнічым» 1629 г., майстра мог трымаць у сябе не болей як чатырох вучняў і двух падмайстраў. У іншых злотніцкіх цэхах нашых гарадоў гэтая лічба вагалася ў межах двух-трох чалавек — як для першых, так і для другіх. Напрыклад, адпаведна са статутам менскіх ювеліраў, кожны тутэйшы майстра-злотнік мог мець адначасова ўсяго двух вучняў і двух таварышаў; толькі ў выпадку хуткага заканчэння навукі адным з іх майстру дазвалялася запісаць сабе трэцяга хлопца. Калі ж хто наважваўся трымаць чэлядзі болей, чым дазволена статутам, мусіў заплаціць на карысць цэхавай скрынкі палову грыўны срэбра. Не маглі таксама майстры і перахоўваць падмайстру-таварыша, якому таемна даручалі майстроўскую работу. За гэта чакаў вялізны штраф у два камені[22] воску.

Калі хто з майстраў «падупаў з прыпушчэння Божага», такому з цэхавай скрынкі выдзялялі дапамогу, якую ён мусіў вярнуць пасля папраўкі свайго

[22] *Камень* — старажытная мера вагі, 1 камень — ад 25 да 32 фунтаў.

здароўя, а таксама выдавалі «найлепшага» таварыша, што дапамагаў у працы. У тым выпадку, калі хвароба заканчвалася сумным зыходам, пазыка-дапамога спадкаемцамі не вярталася.

Удовы братоў цэха карысталіся падтрымкай і дазволам займацца рамяством год і шэсць тыдняў пасля смерці мужа, калі шлюб быў беспатомным. Як сказана ў цэхавых статутах, «асірацелыя ўдовы, па смерці сваіх мужоў, каб мелі выратаванне для выжывання, такім цэх дазваляў трымаць таварышаў і вучняў і працягваць рабіць [рамяство мужа], пакуль не выйдзе замуж, а калі пойдзе за злотніка, тады такі муж набывае званне "Майстры"». У выпадку паўторнага шлюбу адказнасць за вынікі працы прымаў на сябе новы партнёр. Калі ж удава заключала паўторны шлюбны саюз з рамеснікам іншай спецыяльнасці, з гэтага часу яна аўтаматычна «выпадала» з-пад цэхавага заступніцтва і юрысдыкцыі.

## *Функцыянаванне злотніцкіх цэхаў*

Дзейнасць рамеснікаў-злотнікаў знаходзілася пад пільным кантролем цэхавых старшынь — цэхмістраў. Іх галоўнай функцыяй было сачыць, каб **«кожная грыўна паасобку ўтрымлівала ў ... шчырым і чыстым серабры»** строга вызначаную колькасць металу. Такія патрабаванні меліся і для золата.

Асартымент злотніцкай прадукцыі быў даволі шырокі: акрамя вырабу для касцёлаў і цэркваў размаітых аздоб і рухомасці, што выкарыстоўваліся падчас набажэнстваў, злотніцкае майстэрства мела вялікі попыт і ў паўсядзённым жыцці. Са срэбра рабілася і «сталовае начынне» — чаркі, конвы, «розтруханы», куфлі, кубкі, лыжкі і іншы сталовы посуд. Прадстаўнікі менш заможных колаў грамадства карысталіся посудам, які адлівалі з волава рамеснікі-канвісары. З каштоўнымі металамі маглі працаваць толькі спецыялісты — злотнікі. Тонкая філігранная праца злотнікаў была патрэбна і ў ваеннай справе: так, падчас Лівонскай вайны для ўмацавання абароназдольнасці ў інфлянцкія замкі Боўска (суч. Бауска, каля Рыгі) і Розітэн былі накіраваны каралеўскія злотнікі Юрэй Малы і Ленарт Інтофер.

Злотніцкія вырабы маглі вагацца ад некалькіх лотаў да вельмі вялікіх памераў. Так, Іван Гарнастай падарыў у 1556 г. віленскай царкве Прачыстай Багародзіцы срэбраны выраб. Гэта была **«рукомоя сребреная, въ которой важи серебра полъ 9 гривны и 12 золотниковъ»**[23]. А варшаўскі злотнік Антон Шнейлер даў у XVIII ст. справаздачу аб матэрыялах, што пайшлі на вы-

[23] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при Управлении Виленского учебного округа : в 14 т. Вильна, 1867—1904 (АСД). Т. 6. С. 29.

кананне заказу князёў Радзівілаў, калі было патрачана срэбра 613 грыўнаў і 8½ лота[24]. Яго калега — варшаўскі злотнік Якуб Раскевіч — прадставіў Радзівілам рахунак за выкананую працу на агульную суму ў 203 410 фларынаў![25] Думаецца, што гэта не былі абсалютныя рэкорды траты грошай.

Кантроль за якасцю злотніцкай прадукцыі ўскладаўся, перадусім, на самога яе спажыўца, і фальшар-бракароб непасрэдна нёс адказнасць перад ім. Адпаведна з цэхавымі статутамі, «усялякі, хто б работу нядбайна ўчыніў, за чым бы скарга да цэха прыйшла», такі абвінавачаны пасля брацкага разбору мусіў узнагародзіць шкоду пацярпеламу, а да скрынкі брацкай заплаціць паўкаменя воску.

Не было павагі да таго рамесніка, падмайстры ці партача[26], які займаўся злотніцтвам нелегальна — без дазволу старшых. У выпадку калі хтосьці з іх быў злоўлены, то атрымліваў званне «шэльмы»: у тыя часы гэта азначала страту прафесіі. Нават калі рамеснік-партач альбо «прыхадзень» рабіў сваё рамяство неафіцыйна, «па-за цэхам», яго маёмасць падлягала «грабяжу». Такая сітуацыя магла паўтарацца бясконца доўга, аж пакуль гэты рамеснік не ўступіць у цэх. Гэтае «высокае званне шэльмы» чакала і таго таварыша, хто «ў золаце альбо ў срэбры» шкоду якую ўчыніў зладзейскім спосабам, прыўласціў нешта і скарыстаў сабе, працуючы на свайго майстру. Такі падмайстра, згодна са звычаем, перадаваўся на пакаранне адпаведнаму ўраду.

## *Проба*

У старажытныя часы на ўсёй тэрыторыі Еўропы чысціню каштоўных металаў вымяралі ў лотах. Лотам называлася 1/16 грыўны. Найбольш пашыраным у паўсядзённым побыце было «дванаццацілотавае» срэбра, якое абазначалася на вырабе лічбай 12. Яно змяшчала ў сабе 12/16 чыстага срэбра, што сёння складае 750/1000 (750-я проба).

У дарэвалюцыйнай Расіі адзін расійскі фунт дзяліўся на 96 частак-залатнікоў. Адпаведна з прынятымі там стандартамі, паўсюдна ўжывалася 84-я проба (што сёння складае 84/96 = 875/1000 — 875-я проба).

У сучасным свеце колькасць чыстага срэбра падаецца ў «тысячных». Так, лічба 800, зафіксаваная на вырабе, абазначае, што проба складае 800/1000 (800-я проба).

---

[24] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) у Мінску. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 58. Арк. 217.

[25] Тамсама, спр. 55, арк. 331.

[26] *Партач* — рамеснік, які працаваў па-за юрысдыкцыяй цэха.

Вырабы, што выходзілі са злотніцкіх варштатаў у нашай краіне, мусілі быць (як таго патрабуе статут гарадзенскіх злотнікаў 1637 г.) «добрага срэбра адпаведна з пробай і вагой Віленскай, Галоўнага Места ВКЛ», якая была роўная дванаццаці «латам» (лотам). Адной з найгалоўнейшых функцый цэхавых старшынь было назіранне за чысцінёй пробы металу, пра што згадвалася ў берасцейскім статуце 1599 г. («каб срэбра добра рабілі водлуг пробы і вагі Віленскай Места Галоўнага ВКЛ, або кожная грыўна срэбра мусіла ўтрымліваць не менш чым пятнаццаць лотаў»). Такая рознасць у значэнні віленскай грыўны можа тлумачыцца толькі афіцыйнай зменай яе вагі ў першых дзесяцігоддзях XVII ст.

Для кожнага майстры, які працаваў над заказам са свайго матэрыялу і сплаўляў яго з іншым каштоўным металам, патрабавалася, каб золата[27] мела пробу ў васямнаццаць «драгусаў» («як яна называецца паспаліта драгаў»).

У работах складаных — такіх як паясы, цаткі, заглі (pasy, cetki, zagle) і інш. — дапускалася некаторае ваганне пробы, пры агульным утрыманні пятнаццаці лотаў срэбра ў адной грыўне.

Цэхавыя правілы патрабавалі ад старшынь, каб з перыядычнасцю раз у два тыдні, а ў Навагародку раз на месяц абодва цэхмістры асабіста наведваліся да крамніцы (крамы) ці варштата-майстэрні кожнага злотніцкага рамесніка-майстры, аглядалі работы і бралі пробы са срэбра, з якім ён працаваў. Той, «на каторага пакажа, што яго срэбра пробы не выносіць», мусіў быць пакараны. Адпаведна з цэхавымі статутамі, кожны «злапаны» за такім учынкам упершыню павінен быў заплаціць у цэхавую скрынку палову грыўны срэбра. За паўтор такіх супрацьзаконных дзеяў віна ўзрастала ў геаметрычнай прагрэсіі і толькі да трох разоў; на чацвёрты — цэхавыя ўлады перадавалі вінаватага гарадскім уладам, і тыя, пасля пацвярджэння працы з заніжанай пробай металу, закрывалі яго краму. Такі майстра страчваў магчымасць «рамяство рабіць» і таксама мусіў выплаціць «няслоўлівасць» пацярпеламу, а ўсе нізкапробныя вырабы падлягалі знішчэнню.

Сярод найбольш распаўсюджаных прыёмаў падману кліентаў, акрамя згаданага вышэй змяншэння колькасці каштоўнага металу ў вырабе, як прыводзіцца ў цэхавых статутах, было пакрыццё пазалотай медных «штук» — ланцугоў, пярсцёнкаў. Строга забаранялася ў вырабы з каштоўных металаў (напрыклад, пярсцёнкі) устаўляць простае шкло альбо танныя камяні, а таксама «залаціць манеты». За першы такі ўчынак вінаваты мусіў заплаціць у цэхавую скрынку палову грыўны срэбра, за другі — грыўну, за трэці — дзве. Калі гэты ж

[27] Золата пробы 999,9 па сваёй цвёрдасці прыкладна як звычайны пласцілін, яго вырабляюць толькі ў дзвюх краінах свету — Расіі і Швейцарыі. Дзеля лепшай трываласці і надання пэўнага колеравага адцення ў яго прымешваюць медзь, паладзій і срэбра.



*Срэбраны куфель, упрыгожаны каштоўнымі камянямі і залатымі дукатамі. XVII ст.*

майстра пападаўся і на чацвёрты раз, цэхавыя ўлады павінны былі перадаць яго на расправу мескім уладам альбо тым, пад юрысдыкцыяй каго ён знаходзіўся. У выпадку калі віну канчаткова даказвалі, ён губляў права працы ў гэтым горадзе і «сваё майстроўства ў цэху». Калі партач прадаў такую рэч, то пасля пакарання мусіў вярнуць пацярпеламу яго страты, а сфальшаваную рэч стаўчы кавальскім молатам.

Здаралася, што ў рукі майстры трапляў сумніўны метал, які яму прынеслі для «пералівання» (пераплаўкі) альбо пераробкі, тады містр павінен быў да-

несці абавязкова гэты факт старшым цэха. Цэхмістры вельмі ўважліва пыталі заказчыка на прадмет таго, дзе ён узяў альбо хто яму даў «падазроны» метал. Пакуль з чысціні паходжання гэтага металу не здымаліся ўсе пытанні, ён заставаўся на захаванні ў цэхавай скрынцы.

Адпаведна з цэхавымі статутамі, калі да майстры прыносілі «ў работу» срэбра ці золата «непячатанае» (без пробы і асабістага кляйна майстры), ён мусіў «паводле навукі сваёй выпрабаваць» яго і вярнуць з пробай. На сплаўленым злотнікам срэбры альбо золаце рамеснік быў абавязаны «вбіць» сваё кляйно (cechę). Гэтая працэдура сведчыла пра чысціню металу — без кляйна срэбра ці золата лічылася «падазроным». Як падкрэслівалася ў дадатковых артыкулах, што былі дадзены віленскаму злотніцкаму цэху «ў годзе 1687 месяцы лістападзе 30 дня», «для распазнання проб падлейшых, [на злотніцкім вырабе] мусяць быці выбіты цэха тутэйшага места і кляйно злотніцкага цэха. Акрамя таго кожны цэхавы злотнік, які злівае злота альбо срэбра, на такім злітку мае набіці сваё імя».

У ідэале кожны злотніцкі выраб мусіў несці на сабе тры клейны, якія б сведчылі пра чысціню каштоўнага металу і гарантавалі б спажыўцу якасць.

*1. Першым кляйном была проба, пазначаная арабскімі лічбамі. Яго выбіваў на рэчы майстра-злотнік, у варштаце якога яна была зроблена.*

*2. Другое кляйно — імяннік, у якім скарочана праз ужыванне часцей адной-дзвюх літар алфавіта пазначаліся імя і прозвішча майстры. Калі-нікалі ў іменніку мог прысутнічаць нейкі графічны значок, характэрны менавіта для дадзенага канкрэтнага майстры.*

*3. Трэцяе кляйно — «цэха» (cecha) — мела выяву агульнавядомага сімвала, звязанага нейкімі асацыятыўнымі сувязямі непасрэдна з горадам, дзе знаходзіўся містроўскі варштат альбо была злотніцкая крама, з якой тую рэч прадалі.*

У сувязі з тым, што да нашага часу захавалася даволі нязначная колькасць старадаўніх злотніцкіх вырабаў, знадворны выгляд гэтых «цэхаў» — гарадскіх злотніцкіх клейнаў — яшчэ недастаткова вядомы даследчыкам. Так, у Вільні іх было некалькі: кляйно-«цэха» з выявай герба Калюмны, або Гедымінавы слупы, якая выкарыстоўвалася з XVI ст.; у другой палове XVIII ст. на кантрольнай пячатцы, «цэхе», размешчана выява св. Крыштафа — віленскага мескага герба[28]. Згодна з каралеўскім прывілеем 1634 г., магілёўскія цэхавыя старшыні мусілі выбіваць на вырабах кантрольную «цэху» з выявай ільва за кратамі. «Цэха» Гародні другой паловы XVIII — пачатку XIX ст. мела выяву по-

[28] L—V, p. 135, 139.

стаці аленя ў імклівым бегу — элемент эмблемы мескага герба. Разважаючы такім чынам, можна выказаць здагадку (чыста гіпатэтычна!), што навагародскія злотнікі мелі «цэху» з выявай атрыбута Архангела Міхаіла, менскія — Панны Марыі ці яе атрыбутаў, берасцейскія — лука са стралой або нейкіх іх частак.

У аспекце кляймення каштоўных металаў назіраецца даволі значнае адрозненне ў правілах апрацоўкі і пацвярджэння якасці металу паміж тымі, што дзейнічалі ў нас, і нашымі ўсходнімі суседзямі[29]. Так, у Масковіі «майстрам Залатой палаты ў XIV стагоддзі не было патрэбы ў кляйменні сваіх вырабаў таму, што ўся іх прадукцыя спажывалася царскім дваром, і толькі пасля 1651 г. пачынаюць сустракацца рускія клейны, якія робяцца звычайнай з'явай толькі з канца XVII ст.»[30]. Нам уяўляецца красамоўным той факт, што якраз з сярэдзіны XVII ст. у Маскве апынулася значная колькасць выхадцаў з ВКЛ — майстраў-беларусаў, якія прынеслі свае звычаі і маглі, нават ускосна, спрыяць узнікненню гэтага новага для Масковіі парадку маркіравання вырабаў і набыццю ім моцы закону.

Вышэйзгаданы М. Градоўскі дае класіфікацыю знакаў, якія даследчык мінулага або сучасны спажывец можа сустрэць на злотніцкіх вырабах[31]. Яна ў вельмі значнай ступені дапасоўваецца і да той сітуацыі, што панавала на нашай тэрыторыі. Гэта тлумачыцца агульнасцю гістарычных лёсаў на працягу амаль чатырох сотняў гадоў.

*Найбольш часта сустракаюцца знакі чатырох тыпаў:*

*1. Індывідуальныя знакі майстраў і майстроўскіх варштатаў (гарантавалі сваёй прысутнасцю якасць металу).*

*2. Знакі пробы металаў (неслі канкрэтную інфармацыю пра наяўнасць і колькасць «нешляхетных» дадаткаў у шляхетным метале).*

*3. Знакі гарадоў (выступалі гарантам якасці вырабу і сумленнасці майстры-злотніка — грамадзяніна пэўнага места).*

*4. Знакі дзяржаўных проберных устаноў (на Беларусі з'явіліся ў XIX ст.).*

---

[29] Як адзначае М. М. Поснікава-Лосева, спарадычнае кляйменне злотніцкіх вырабаў пачынаецца ў Расіі з другой паловы XVII ст., а афіцыйна кляйміць срэбра там сталі з 1779 г., калі майстры былі абавязаны пазначаць свае вырабы, але не ніжэй за 72—84-ю пробы (Полное собрание законов Российской империи (ПСЗРИ). Собр. 1. Т. XX. № 14949). Пазней, у 1898 г., уведзена ў якасці дзяржаўнага стандарту абавязковай 84-я проба (1 мая 1898 г.; ПСЗРИ, собр. 1, т. XXIV, № 18178 ), а ў 1847 г. былі ўстаноўлены 88-я і 91-я пробы (ПСЗРИ, собр. 2, т. XXII, № 21049).

[30] Постникова-Лосева, с. 188, 190.

[31] Dawne złotnictwo, s. 21—27.







*Злотніцкія клейны і клейны пробераў часоў Расійскай імперыі:*
*віленскі злотнік Данішэўскі, 1855 г.;*
*менскі злотнік Пагарэльскі, 1890 г.*

Акрамя гэтых асноўных тыпаў існавалі яшчэ і знакі, пры дапамозе якіх пазначалі час узнікнення канкрэтнага злотніцкага вырабу. Мытніцкія пробы накладаліся на злотніцкую прадукцыю пры перасячэнні імі дзяржаўнай мяжы. Былі яшчэ і знакі, што калі-нікалі выбіваліся на вырабах, якія захоўваліся ў дзяржсховішчах, вырабах з каштоўных металаў, а таксама рэалізаваных праз ламбарды і г.д.

## Агульнацэхавыя парадкі

Гарадскія ўлады сачылі, каб ніводны мешчанін пад ніякай юрысдыкцыяй не мог прадставіць магчымасць ні тутэйшаму рамесніку, ні злотніку-«прыхадню» рабіць злотніцкае рамяство «на даму» ў мяшчан, шляхты альбо ў кляштарах ці манастырах. Штраф за гэта быў сто коп грошаў, з якіх палова ішла на карысць мясцовых улад, а другая — у цэхавую скрынку. Злотнік-«прыхадзень», перш чым атрымаць дазвол на бесперашкодную працу ў горадзе, мусіў спачатку прыняць гарадское падданства, а калі не меў яшчэ і звання майстры, павінен быў пасля здаць іспыты на гэтае званне і тады толькі стаць паўнавартасным сябрам тутэйшага злотніцкага цэха. Калі ж гэтай нелегальнай дзейнасцю пачаў займацца містроўскі таварыш, яго чакаў штраф у сем коп грошаў з наступным іх размеркаваннем, як і ў папярэднім выпадку.

## Духоўнае жыццё

Нябесным заступнікам — патронам — нашых злотнікаў, як і ў суседняй Польшчы і ва ўсёй Еўропе, быў св. Элігіюш (св. Элой, Элігій). Пра яго культ сведчаць помнікі злотніцтва[32] і выявы на пячатках злотніцкіх цэхаў Кракава, Познані і інш. Выявы асабіста яго ці яго атрыбутаў фігуруюць і на пячатках і клейнах цэхаў Львова, Вільні і інш.

Як паведамляе паданне, св. Элігіюш нарадзіўся каля 588 г. н.э. Ён атрымаў прафесію злотніка, потым паступіў на службу да караля Францыі, дзе не толькі займаўся рамяством, але і быў захавальнікам каралеўскай скарбніцы. У 636—637 гг. св. Элігіюш працаваў у пасольстве ў Брытаніі, з 639 г. быў братам манаскага ордэна бенедыкцінаў, у 640 г. атрымаў статус біскупа ў Ліможы, а пазней стаў абатам у Парыжы. На працягу свайго жыцця ён рабіў розныя цуды. Памёр 1 снежня 660 г.




*Цуд св.Элігіюша (Алоіза). Нямецкі дрэварыт. Канец XV ст.*

Культ св. Элігіюша як заступніка рамеснікаў, што працуюць з металамі, і, галоўнае, злотнікаў, узнік у XI ст. і дасягнуў свайго апагея ў XIII ст. Яго ўшанаванне пачалося ў Францыі. Адтуль культ трапіў да немцаў, потым — на польскія землі. Прымаючы пад увагу тагачасныя шчыльныя сувязі беларускай і польскай культур увогуле і рамесныя ў прыватнасці, што атрымалі асабліва значны імпульс у канцы XVI — першай палове XVII ст., можна са значнай доляй упэўненасці меркаваць, што гэты заступнік карыстаўся і ў нашых злотнікаў адпаведнай пашанай і павагай. Сёння, акрамя злотнікаў і кавалёў, межы заступніцтва св. Элігіюша ахопліваюць нумізматаў і аўтарамонтнікаў.

Адпаведна з «актыкацыяй парадку» магілёўскіх злотнікаў, што была ўнесена ў магістрацкія кнігі ў 1626 г., усе цэхавыя браты мусілі мець «кожную чвэрць року службу божую і цэхавы малебен». Акрамя таго, цэх павінен быў набыць аксаміт для накрывання цел

[32] *Samek J.* Złocista tablica cechowa z wyobrażeniem św. Eligiusza (pocz. XVII wieku) // Krzysztofory : zeszyty naukowe muzeum historycznego miasta Kraków. Kraków, 1975. T. 2. S. 37—40; Encyklopedia katolicka. Lublin, 1983. T. 4. S. 892—893.

памерлых цэхавых, а таксама свечы і інш. Амаль тыя ж патрабаванні фігуруюць у статуце берасцейскага злотніцка-малярскага цэха. Яго першы артыкул абавязвае, каб «ку чці і хвале Пана Бога Усёмогучага» братчыкі, разам з жонкамі сваімі і «таварышамі рамяства свайго, кожны квартал у Касцёле Рымскім» прысутнічалі на малебнах за выратаванне іх душ і за супакой памерлых, «пад вінай у адзін грош». У гэтым патрабаванні назіраецца і пэўны ідэалагічны ўціск: сярод берасцейскіх злотнікаў фіксуецца даволі значная частка прадстаўнікоў іншых, акрамя каталікоў, хрысціянскіх плыней — у прыватнасці, пратэстантаў. Для кожнага прысутнасць на розных цэхавых мерапрыемствах была абавязковай: той, хто не быў там «без слушных прычын», падлягаў штрафу, які ішоў на папаўненне цэхавай скрынкі. Як падкрэслена ў 30-м артыкуле таго ж статута, «калі хто-небудзь з [цэхавых] Братоў на пахаванне Брата свайго альбо яго жонкі ці дзіцяці яго не прыйшоў, такі мусіць заплаціць на Брацтва віну ў тры грошы».

Усе прыходы ў цэхавую скрынку абавязкова павінны былі накіроўвацца на цэхавыя патрэбы, паратунак убогага і падупалага брата, падтрымку бедных сірот, злотніцкіх дзетак, на прыстойнае пахаванне цел памерлых братоў — убогага злотніка ці злотніцкага таварыша, на аздобу цэхавага алтара, набыццё свечак для набажэнстваў, узбраення і інш.



Петрус Крыстас. *Св. Элігій у сваім варштаце. Паўночная Еўропа (Нідэрланды), 1449 г. Алей*



*Варштат (працоўня) св. Элігіюша (Алоіза). Нямецкі дрэварыт. Канец XV ст.*

## Цэхавая сходка і выбары

Вышэйшым органам брацкага самакіравання была сходка сяброў цэха. Рашэнне аб яе правядзенні прымаў старшы цэхмістр, а абвяшчэнне ўсіх братоў рабіў хто-небудзь з малодшых: ён мусіў абысці ўсіх цэхавых братоў і папярэдзіць аб зборы. Знакам яго паўнамоцтваў была «цэхавая таблічка» (або «жэтон», ці «знак старшыні»), якую яму ўручаў часова цэхмістр. Калі хто з запрошаных братоў без важкай на тое прычыны не з'яўляўся на сходцы, за першую такую правіну, як ужо сказана вышэй, мусіў заплаціць тры грошы, за другую — шэсць, за трэцюю — дванаццаць і г.д. Кожны раз штраф павялічваўся ўдвая.

Галоўнай сходкай была, як правіла, Мікалаеўская (перад Новым годам), альбо «на рускі Новы год». На ёй абіралі двух старшых цэхмістраў. Цікава адзначыць, што, адпаведна з некаторымі цэхавымі статутамі, рамеснікам забаранялася «рабіць папярэднія змовы» аб магчымых кандыдатах на гэтыя высокія пасады. Толькі на агульнацэхавай генеральнай сходцы кожны паўнапраўны брат мог вылучаць і быць вылучаным на адпаведную цэхавую пасаду. Там жа, на сходцы, і праходзіла галасаванне.

Акрамя склікання сходак абавязкам цэхмістраў быў разбор спрэчак і пярэчанняў паміж сябрамі цэха,назіранне за выкананнем цэхавага статута, прадстаўленне інтарэсаў брацтва перад мескімі і іншымі ўладамі. Акрамя старшых цэха на генеральнай сходцы абіралі шафароў — скарбнікаў, што назіралі за правільным выкарыстаннем — прыходам і расходам — брацкіх агульных грошай, якія захоўваліся ў брацкай скрынцы. Наколькі правільна выдаткоўваліся на працягу года прыходы ад складанак і вінаў, што траплялі ў цэхавы скарб, шафары былі абавязаны штогадова «лічбу ўчыніць», г.зн. даць справаздачу перад усімі цэхавымі братамі на генеральнай сходцы. Парушальнікаў — тых, хто наўмысна ці не зацягваў тэрміны грашовай справаздачы, — чакаў штраф «у палову грыўны срэбра». Пасля выплаты штрафу вінаватыя абавязаны былі правесці грашовую справаздачу, ужо пад кантролем мескіх улад, і, калі знаходзіліся пэўныя злоўжыванні, тады мескія ўлады мусілі правесці «экзекуцыю» за кошт маёмасці вінаватых і такім чынам пагасіць недахоп скрадзеных альбо нядбайна патрачаных грошай.

Ад усіх братоў патрабавалася, каб цэлы год «абраным старшым належнае паслушэнства і шанаванне» было. Пасля таго як абраныя прыносілі прысягу, якая актыкавалася ў магістрацкіх кнігах, яны распачыналі выконваць свае абавязкі. Адразу пасля абрання новых цэхмістраў і ўсяго кіраўніцтва цэха адбывалася справаздача «мінуларочных», і новыя старшыя, калі ўсе рахункі сыходзіліся, адпаведна са статутам, дзякавалі старым за іх працу.

Акрамя штогадовай сходкі былі яшчэ штоквартальныя і штомесячныя (і нават часцейшыя, па меры неабходнасці, — напрыклад, адна ў два ці чатыры тыдні). Цэхавыя статуты патрабавалі захавання дысцыпліны падчас іх правядзення. У працэсе сходак майстры павінны былі праяўляць усялякія «ўчцівасці» ў дачыненні адзін да аднаго. Пад штрафам забаранялася з'яўляцца на цэхавай сходцы «п'яным... браты мусілі толькі трэзвымі прыходзіць».

Сходка лічылася распачатай, калі на стале «прэзідыума» стаяла адкрытая скрынка «з прывілеямі Яго каралеўскае Міласці». Той, хто прыходзіў у залу пасля адкрыцця скрынкі, спазняўся, мусіў заплаціць штраф. Такое ж пакаранне чакала і таго, хто асмеліўся ўвайсці ў пакой, не здаўшы зброю. Падчас сходкі старшыя каралі малодшых, што парушалі парадак. Прысутныя павінны былі захоўваць маўчанне, не дазвалялася гаварыць без дазволу старшых. Таго, хто парушаў парадак, чакаў штраф у дзесяць грошаў, а «ўпарты, хто маўчаць не хацеў» мог быць пакараны сядзеннем «у вязенні». Найбольшай абразай сярод злотнікаў лічылася, калі адзін аднаго назваў «фальшарам» альбо «цэхавым здраднікам».

Як правіла, сходкі адбываліся ў «дзень нядзельны па палудні». Гістарычныя крыніцы захавалі да нашага часу працэдуру правядзення брацкай сходкі. На яе пачатку старшы ўрачыста даставаў са скрынкі цэхавы прывілей і іншыя дакументы, што ляжалі ў аснове функцыянавання гэтай установы, і ўрачыста перадаваў іх у рукі цэхаваму пісару. Апошні пачынаў зачытваць іх уголас. Усе братчыкі, стаўшы са знятымі шапкамі, мусілі слухаць яго «з учцівасцю і літасцю». Па прачытанні прывілея дакументы вярталі на месца іх захоўвання (у скрыню), слухачам дазвалялася сесці, «а сеўшы на месца, кожны мусіў даці ад сябе па грошу літоўскім да агульнай скрыні». Пасля гэтага пачыналася абмеркаванне бягучых агульнацэхавых пытанняў. На сходках «радзіліся аб добрых рэчах брацкіх і каля парадкаў цэхавых і абмысліваліся» разнастайныя выпадкі, якія «на потым» у іх брацтве маглі адбыцца. Таксама падчас сходак цэхавыя старшыні і ўсе цэхавыя браты выносілі рашэнне аб пакаранні тых, хто «праштрафіўся» ў вачах братчыкаў альбо парушыў цэхавы статут ці прывілеі.

## Цэхавы дом

Асноўныя мерапрыемствы ўнутрыцэхавага жыцця праходзілі ў т.зв. «цэхавым доме». Тут адбываліся сходкі, збіраліся пасля ўрачыстых набажэнстваў, каб адзначыць «мёдам» вялікае рэлігійнае свята. Там жа праходзілі «каляцыі», на якіх былыя падмайстры выкачвалі бочку піва сваім былым калегам — таварышам, прасілі ў іх прабачэння за наўмысныя і ненаўмысныя абразы і развітваліся са сваім тварыскім станам пасля паспяховай здачы майстроўскіх іспытаў. У гэтым жа доме яны праводзілі каляцыі са сваімі новымі «роўнямі» — майстрамі. Калі касцёл ці царква з'яўляліся духоўнымі цэнтрамі, кожны злотніцкі варштат — вытворчым і часта гандлёвым цэнтрам для кожнага паасобку, дык цэхавы дом быў цэнтрам духоўнага і культурнага жыцця ўсяго злотніцкага асяроддзя ў тым альбо іншым горадзе.

Як правіла, будаўніцтва ці набыццё сумеснай маёмасці — цэхавага дома — абумоўлівалася цэхавым статутам. Адпаведна з прывілеем ад 10 чэрвеня 1636 г., навагародскім злотнікам прадпісвалася «мецi дом цэхавы, дзе будзе захоўвацца скрынка цэхавая з прывілеямі і будуць збірацца цэхавыя сходкі...» Аналагічныя палажэнні прысутнічаюць і ў цэхавых статутах іншых беларускіх злотніцкіх цэхаў. Цэхавыя дамы вызваляліся ад усялякіх павіннасцей на карысць як мясцовай, так і цэнтральнай улады: ад пастояў, аплаты падаткаў і розных «мескіх юрысдыкцый». Часта менавіта ў гэтых дамах захоўвалася цэхавая скрынка. Праўда, гарадзенскія злотнікі, адпаведна з каралеўскім прывілеем, захоўвалі сваю скрынку ў Фарным саборы; адзін ключ ад яе быў у аднаго цэхавага старшыні, а другі — у другога.

Акрамя цэхавых прывілеяў у скрынцы, якой прыпісваліся пэўныя сакральныя функцыі, зберагаліся брацкія рэестры, куды ўносіліся цэхавыя вучні, падмайстры і майстры, дакументы справаздач, пратаколы пасяджэнняў, а таксама цэхавая пячатка і агульнацэхавыя грошы. Разам са скрынкай у цэхавым доме захоўваліся цэхавыя харугвы і ўзбраенне — «цэхавая армата».

Берасцейскія рамеснікі, у адпаведнасці з прывілеем 1599 г., былі абавязаны «ад зачацця цэха набываць штогадова пулгак і шэфелін[33], каб праз дзесяць гадоў яны мелі цэлую збраёўню». Прывілеямі іншых злотніцкіх цэхаў таксама падкрэсліваецца, што цэху неабходна мець «харугву, бубен і ўсялякую армату срэбраную для абароны і аздобы места тамтэйшага». Амаль аналагічныя патрабаванні прадстаўлены і ў статуце 1636 г. навагародскіх злотнікаў. Калі цэхі былі колькасна невялікімі, для ўзмацнення да іх дадаваліся рамеснікі

[33] *Пулгак* — мушкет сярэдніх памераў; *шэфелін* — піка.

іншых прафесій, што не мелі ў горадзе асобнага цэха (напрыклад, у Менску). Цэхавая харугва выкарыстоўвалася не толькі падчас абароны горада ў ваеннае ліхалецце, але і пры ўрачыстых сустрэчах першых асоб дзяржавы і нават ваяводства, калі ў места прыязджаў кароль, вялікі князь, біскуп, ваявода і інш.

## Цэхавая юрысдыкцыя



*Адбітак пячаткі Пінскага пав., якая была «вырыта» (выразана) у 1565 г.*

Братчыкі цэха пільна ахоўвалі ад патэнцыяльных канкурэнтаў свае правы на сферу іх прафесійнай дзейнасці. Злотніцкі таварыш — ці то тутэйшы, ці то «прыхадзень» — не мог працаваць пад рознымі юрысдыкамі. Парушальніка чакаў вельмі высокі штраф (напрыклад, у Бярэсці — «сем коп грошаў лічбы і манеты літоўскай»), а работа падлягала канфіскацыі на карысць цэха і мескіх улад. Увогуле, у тых местах, дзе былі адпаведныя рамесныя цэхі, злотнікі мусілі знаходзіцца толькі пад магістрацкай юрысдыкцыяй і ні пад якой іншай. У цэхавых прывілеях, як правіла, абмяжоўваецца і права гандлю наваробленымі залатымі і срэбранымі таварамі «злотнікам і купцам з іншых мест і мястэчак, як хрысціян, так і іўдзеяў, падчас правядзення ў месце пасяджэнняў Трыбунала і іншых з'ездаў» пад страхам страты прадметаў гандлю на карысць каралеўскага скарбу. Гэтае палажэнне не распаўсюджвалася на час правядзення кірмашу.




*Срэбраная мемарыяльная шыльда ў гонар вяртання ў Чарэйскі базыльянскі манастыр абраза «Дабравешчанне» (агульны выгляд). 1640 г.*



*Фрагмент шыльды з выявай «Дабравешчанне»*

# ПЕРЫЯД РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

## *Злотніцкія цэхі ў канцы XVIII — пачатку XX ст.*

Структура саміх злотніцкіх цэхаў не змянілася, чаго нельга сказаць пра бюракратычныя надбудовы над імі — проберныя палаткі і рознага ўзроўню рамесныя ўправы, «казначэйствы» і г.д. У папярэдні перыяд функцыі вышэйпералічаных устаноў выконвалі цэхавыя ўрады і ў экстраардынарных выпадках да іх далучаліся магістраты канкрэтных местаў. Новыя ўлады прынеслі і новыя формы кантролю за якасцю злотніцка-срэбраніцкіх вырабаў. Праўда, поўнай паслядоўнасці ў іх дзеях, як нам здаецца, не прасочваецца: з увядзеннем проберных урадаў пачынаецца кампанія, мэтай якой было адабраць у майстраў асабістыя штэмпелі для кляймення іх вырабаў і пакінуць гэтую функцыю толькі за пробернымі палаткамі.

Вельмі своеасаблівай рысай злотніцтва на Беларусі (ды і ўвогуле на заходніх тэрыторыях былой Расійскай імперыі) гэтага перыяду, у параўнанні з папярэднімі часамі, з'яўляецца значная колькасная перавага злотнікаў-іўдзеяў над прадстаўнікамі іншых канфесій, што працавалі ў гэтай галіне. Адной з прычын узнікнення такой сітуацыі, як нам уяўляецца, стаў той факт, што царскі ўрад шукаў сабе саюзнікаў, на якіх можна было б абаперціся на новадалучаных тэрыторыях. Царызм не давяраў прадстаўнікам тутэйшых кіруючых класаў, ды і іншых колаў грамадства, таму што большая частка іх належала да ўніяцкага і каталіцкага вызнання, а ў Расіі дзяржаўнай ідэалогіяй было праваслаўе. Паколькі на сваіх рэлігійных апанентаў новыя ўлады не маглі абаперціся, таму такога саюзніка яны зрабілі сабе з яўрэяў. Утварэнне мяжы аселасці для іўдзейскага насельніцтва (з 1791 г.) спрыяла яго канцэнтрацыі на гэтай тэрыторыі. Закон 1804 г. дазволіў ім займацца рамяством, вывеў з падполля, у прыватнасці, тую частку злотнікаў-яўрэяў, што раней займаліся гэтай справай нелегальна, у абыход папярэдніх каралеўскіх прывілеяў гарадам.

Акрамя таго, рамеснікі (як і прадстаўнікі іншых саслоўяў) хрысціянскага вызнання маглі з меншымі перашкодамі з боку ўлад перасоўвацца ва «ўнутраныя губерні» Расіі і заставацца там на сталае пражыванне. Такая сітуацыя спрыяла адтоку тутэйшага хрысціянскага рамеснага насельніцтва не толькі на «адхожыя» заробкі, але і назаўсёды. Гэта быў адзін з фактараў, што паўплываў на змену канфесійнай структуры злотніцкага рамяства на тэрыторыі сучаснай Беларусі, калі амаль 96% (і нават болей!) рамеснікаў, што займаліся «юбілерскім мастацтвам», складалі злотнікі-іўдзеі. Падобная карціна назіралася і ў першыя дзесяцігоддзі XX ст.

## *Проберныя ўрады на землях Беларусі*

Пасля падзей 70—90-х гг. XVIII ст. і распаўсюджання з канца гэтага стагоддзя Расійскай імперыяй сваёй улады на нашых землях царскі ўрад пачаў уводзіць на далучаных тэрыторыях свае законы.

Увогуле, утварэнне цэхавай структуры ў Расійскай імперыі звязана з імператарам Пятром І. Пасля таго як Беларусь трапіла ў сферу расійскіх уплываў, на яе тэрыторыі пачалі ўводзіцца тыя ж правілы і парадкі. Часта гэта рабілася без уліку тых традыцый, што былі раней. Калі цэхавыя ўстановы з іх «парадкамі статутовымі» і асаблівым ладам жыцця ў нас існавалі з глыбокай старажытнасці, дык другі перыяд іх функцыянавання праходзіў сінхронна з тымі працэсамі, якія адбываліся і ў іншых расійскіх губернях. На пачатак XX ст. злотніцкія цэхі фактычна зніклі і на іх месца прыйшлі рамеснікі-індывідуалы; нават калі яны працавалі ў пэўнай структуры, якая называлася майстэрняй або, радзей, фабрыкай, паняцце «цэх» заставалася толькі намінальнай архаічнай структурай. За практычнай дзейнасцю злотніцкіх майстраў ажыццяўлялі кантроль дзяржаўныя ўлады праз органы назірання, якія называліся пробернымі палаткамі. У пачатку XX ст. такія проберныя цэнтры, дзейнасць якіх ахоплівала ўсю тэрыторыю беларускіх губерняў, знаходзіліся ў Вільні, Кіеве і Рызе.



*Адбітак пячаткі Случарэчыцкага пав. Канец XVIII ст.*

Утварэнне проберных урадаў[34] фактычна распачалося ў XIX ст. У 1816 г. Маскоўскай горнай палатай пры Міністэрстве фінансаў Расіі была прынята пастанова, дзе гаварылася: «...во всей Белоруссии, кроме Смоленской губернии... пробирных мастеров [и] пробирных палаток не имеется и никогда не было ... [поэтому следует] ... учредить пробирные палатки в Подольской, Виленской, Гродненской, Минской, Могилевской, Витебской и Волынской губерниях, поставив в оных часть сию

[34] Цікава адзначыць, што «вымыслены» расійскі літаратурны персанаж XIX ст. — пісьменнік, «аўтар» вершаў, афарызмаў і, апрача ўсяго іншага, «праекта аб увядзенні адзінадумства ў Расіі» — Кузьма Пятровіч Пруткоў па-за сваёй літаратурнай дзейнасцю «працаваў» амаль сорак гадоў у Міністэрстве фінансаў у проprobернай палатцы, дзе «даслужыўся» да пасады дырэктара і напрыканцы кар'еры атрымаў чын сапраўднага стацкага саветніка і ордэн Св. Станіслава І ступені.

[ювелиров] в общий порядок с прочими губерниями»[35]. Адпаведна гэтаму распараджэнню, проберныя палаткі ўстанаўліваліся ў губернскіх местах і пад іх кантроль траплялі (прыпісваліся да іх) майстры залатых і срэбраных спраў іншых павятовых местаў адпаведных губерняў. Да выканання проберных абавязкаў, паводле той жа пастановы, адбіралі «серебряниковых», а таксама «купецких» і мяшчанскіх дзяцей, здольных да абучэння «пробирному искусству», і накіроўвалі іх у Маскоўскую манетную кантору. Там іх вучылі «непродолжительное время арифметике и что надлежит к тому искусству, дабы чрез огонь аккуратно пробовать могли...»[36].

У правілах 1835 г. накладання клейнаў на вырабы, якія імітуюць каштоўныя металы, падкрэслівалася, што «для адрознення ад звычайнага пробернага кляйна, якое накладаецца на вырабы з золата і срэбра, мусяць быць круглыя ў папярэчніку не менш за тры шаснаццатыя вяршка [0,83 см] альбо прадаўгаватыя не карацей за адну чвэрць вяршка [1,1 см]». На іх мусілі быць паказаны літары, што азначалі «імя фабрыкі альбо майстры і год»[37].

Але гэта засталося нявыкананым: ужо ў 60-х гг. XIX ст. перад губернскімі праўленнямі была сфармулявана задача «доставить слепки с клейн мастеров... в пробирные учереждения». Трэба адзначыць, што ў гэты час паступова ўводзіцца дазвол на выкарыстанне падчас злотніцкай працы не толькі каштоўных металаў, але і розных металёвых сплаваў.

Дзейнасць проберных палатак ахоплівала ўсю тэрыторыю сучаснай Беларусі. Агульнага цэнтра, якому яны падпарадкоўваліся, не было, калі не лічыць Маскоўскай горнай палаты, але яна ажыццяўляла «агульнае» кіраўніцтва. У губернскіх цэнтрах існавалі свае проберныя палаткі, якія рэгулявалі і кантралявалі дзейнасць майстраў-злотнікаў на месцах — срэбранікаў, «юбілераў», лапідараў і іншых спецыялістаў — па ўсёй тэрыторыі пэўных губерняў. Структура размеркавання проберных урадаў па беларускіх губернях не мела «закасцянелага» характару. У 80-я гг. XIX ст. царскім урадам была прынята новая, у параўнанні з пастановай 1816 г. Маскоўскай горнай палаты, схема размяшчэння проберных палатак. Асноўным цэнтрам для губерняў Віленскай, Гарадзенскай і Менскай стала Вільня, для Магілёўскай — Кіеў, для Віцебскай — Рыга, у Смаленскай губерні проберным цэнтрам так і застаўся Смаленск.

Адпаведна агульнарасійскаму проберному статуту, які зацвердзілі 9 лютага 1882 г., было выдадзена «прадпісанне» аб неабходнасці атрымліваць кожным майстрам «дозволительные свидетельства» на права займацца рамяством не пазней за 1 лютага кожнага года[38].

---

[35] НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 837, арк. 1—2.
[36] Тамсама, арк. 3 — 4 зв.
[37] Тамсама, ф. 1430, воп. 1, спр. 5443, арк. 3.
[38] Тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 505, арк. 1.

# ЛАКАЦЫІ ПРОБЕРНЫХ ПАЛАТАК

## ВІЛЬНЯ

Пасля далучэння места ў 1795 г. да Расійскай імперыі і да пачатку дзейнасці Віленскай пробернай палаткі функцыі нагляду за чысцінёй і якасцю каштоўных металаў ускладаліся на розныя ўстановы: рамесныя ўправы, проберныя канторы. Віленская акруговая проберная палатка пачала дзейнічаць у горадзе з 1821 г. Першым праберам быў Караль Праторыус, які займаў гэтую пасаду з 1821 па 1833 г. Усяго за XIX ст. у Вільні дзейнічалі 33 праберы[39]. З 1888 г. віленскія проберныя ўлады значна пашырылі тэрыторыю сваей дзейнасці за кошт скасаванай Менскай пробернай палаткі[40], функцыі якой былі перададзены ў Вільню. Прыкладна ў той жа час аналагічная сітуацыя здарылася і з Гарадзенскай пробернай палаткай — яе дзейнасць была таксама перанесена. На такім значна пашыраным абшары віленскія проберныя ўлады дзейнічалі і на пачатку XX ст.

## ВІЦЕБСК

Першым вядомым на сёння тутэйшым проберным майстрам быў віцебскі мешчанін злотнік В. І. Розет, якога накіравалі за «казённы кошт» у 1819 г. для вучэння пробернаму «мастацтву» ў Маскоўскае горнае праўленне. Пасля заканчэння вучобы ў 1820 г. ён быў вернуты на працу ў Віцебск. Адпаведна Указу Віцебскага губернскага праўлення ад 10 кастрычніка 1820 г., тут створана проберная палатка і ён назначаны проберным майстрам. Паводле тагачаснай традыцыі, для размяшчэння пробернай палаткі гарадскія ўлады арандавалі памяшканне. Часта, як сталася і ў нашым выпадку, гэта быў уласны дом пробернага майстры, там палатка размяшчалася каля дваццаці наступных гадоў. Майстра В. І. Розет выконваў свае абавязкі па пробернай частцы амаль дваццаць пяць гадоў. У 1844 г. ён атрымаў загад здаць «...дела, книги, инструменты и прочее имущество Пробирной палатки...» для перадачы свайму пераемніку — Палякову.

Пасля ўтварэння 27 лістапада 1840 г. Віцебскай мытнай пробернай палаткі 1-га разраду пасаду віцебскага пробера заняў А. Бялоў — праўда, на вельмі нязначны тэрмін. Затым, 5 чэрвеня 1844 г., у Віцебскую казённую палату паступіла «объявление... и об определении в оную исправляющим долж-

---

[39] Падрабязней гл. L—V, p. 408—410.
[40] НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 326, арк. 4.

ность пробирера Унтер Шихтмейстера Полякова» для іспытаў і кляймення золата і срэбра. У канцы мая 1845 г. з Пецярбурга сюды быў камандзіраваны інспектар проберных палатак обер-гаўптман 5-га класа Герман для «обревизования» проберных палатак[41]. Магчыма, наступным пасля Палякова выконваючым абавязкі пробера Віцебскай проберная палаткі стаў Іван Паварнаў. Звесткі пра яго трапляюцца да 1856 г.

Віцебская проберная палатка праіснавала да пачатку 80-х гг. XIX ст. У адпаведнасці з проберным статутам, што быў зацверджаны 9 лютага 1882 г., Рыжская проберная палатка выдала прадпісанне аб неабходнасці атрымліваць «дозволительные свидетельства» (на права займацца рамяством) не пазней за 1 лютага кожнага года[42]. Утрыманне проберных улад пацягнула даволі высокія траты мескіх грошай, пра гэта сведчыць прашэнне гарадскіх улад аб скасаванні нядоімак па падатках, што засталіся за Віцебскам. Як сведчыць дакумент, «…за время существования в городе Витебского Пробирного учереждения, городским общественным управлением нанималось на средства города помещение, за которое в последнее время до 1884 г. уплачивалось по 300 руб. в год, тогда как подобные расходы прочие города Витебской Губернии не несли…»[43]. Так абгрунтоўвалася скасаванне дзейнасці пробернай палаткі ў Віцебскай губерні, хоць насамрэч гэта была рэфома дзейнасці проберных улад у заходніх губернях Расійскай імперыі. Пазнейшыя звесткі, якія датычыліся тутэйшых злотнікаў, канцэнтраваліся ў Рыжскай казённай палатцы.

## ГАРОДНЯ

Паводле вядомых на сёння дакументальных звестак, гарадзенскія проберныя ўрады дзейнічалі тут з пачатку пазамінулага стагоддзя. У 1821—1828 гг. Гарадзенскую проберную палатку ўзначальваў Іван Міхаэліс. Пэўныя змены надзорных урадаў адбыліся ў 60-х гг. таго ж стагоддзя. Дакументальныя дадзеныя пацвярджаюць, што ў населеным пункце на 1835 г. было чатыры ювеліры, а ў 1839-м — дзевяць. У дакументах, датаваных красавіком 1862 г., згадваецца проберны майстра Лаўрэн Балабанаў, які, мусіць, займаў гэтае месца з 1851 г. У маі 1862 г. на пасаду прэтэндуе былы тутэйшы злотнік Ф. П. Венглеўскі, які звярнуўся 10 мая 1862 г. у Казённую палату з адпаведным прашэннем. Гэтае хадайніцтва апошняга не было задаволена: у архіўных крыні-

---

[41] НГАБ у Мінску, ф. 1430, воп. 1, спр. 12587, арк. 1.

[42] Тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 505, арк. 1.

[43] Дело о снятии недоимки с гор. Витебска. НГАБ у Мінску, ф. 1430, воп. 1, спр. 39053, арк. 1 зв.

цах ужо з чэрвеня 1862 г. (да 1873 г.) называецца «выконваючым пасаду» пробера В. Зімін. Прыступіўшы да выканання сваіх абавязкаў, ён разгарнуў бурную дзейнасць: за той час, які ён займаў пасаду (ва ўсялякім выпадку за першыя гады), адбывалася штогадовая змена проберных клейнаў з яго ініцыяламі і датамі 1862, 1863, … гг., а таксама з тымі ж лічбамі і літарамі або без іх, але з гербам Гародні. У часы яго проберства былі асобныя авальныя клейны з літарамі П. і Ш. і адпаведнымі пробамі (94, 91, 88, 84, 72, 56-й). А ў самой Гародні, паводле статыстычных дадзеных, на працягу XIX ст. занятых злотніцтвам і рэзаннем пячатак рамеснікаў было звыш 30 чалавек. Юрысдыкцыя гарадзенскіх проберных урадаў распаўсюджвалася на тэрыторыю ўсёй губерні. Проберная палатка дзейнічала тут да пачатку 80-х гг. XIX ст., а потым была пераведзена ў Вільню.



*Крыж Гродзенскага лейб-гвардыі гусарскага палка часоў Расійскай імперыі*

## МАГІЛЁЎ

Проберная палатка створана тут, калі ўлічваць час далучэння Магілёўшчыны да Расійскай імперыі, даволі позна. Хутчэй за усё, першым магілёўскім проберам быў Гірша Гурэвіч, які ўжо да 1821 г. займаў пасаду «пробермейстера» Магілёўскай губерні. На гэтай пасадзе ён знаходзіўся да 1847 г. (а магчыма, і пазней), калі звярнуўся да начальства з прашэннем «аб задавальненні грашыма магілёўскага проберната майстры». Яго змяніў на пачатку 50-х гг. Янкель Кельн, які згадваецца ў справе з бабруйскімі злотнікамі-фальшарамі.

Інфармацыя пра тутэйшых проберaў XIX ст. пакуль даволі сціплая ў сувязі з тым, што матэрыялы аб дзейнасці Магілёўскай рамеснай управы і блізкіх да яе паводле мэт і задач устаноў у дакументальных фондах на тэрыторыі нашай краіны не захаваліся.

Магілёўская проберная палатка дзейнічала да 80-х гг. XIX ст., пасля чаго яе функцыі былі перададзены ў Кіеў.

## МЕНСК

Проберныя ўрады існавалі тут з пачатку XIX ст. На той час у Менскай губерні налічвалася 87 майстраў залатых і срэбраных спраў. Безумоўна, найбольшая колькасць іх была ў губернскім горадзе — 30 чалавек. У сувязі са значна меншай лічбай майстраў у цэнтрах паветаў была прынята пастанова аб тым, што «няма патрэбы ўстанаўліваць проберныя палаткі ў павятовых местах, пакідаючы гэта для больш зручнага часу». Адпаведна рашэнню 1819 г. Менскай грамадзянскай камісіі «обще» з гарадскім магістратам, было пастаноўлена паслаць аднаго чалавека «хорошего поведения, имеющего грамоту» ў Маскву для вывучэння пробернай справы[44].



Першы вядомы за царскія часы проберных спраў майстра ў Менску — мешчанін С. Г. Анташкевіч. Ён быў накіраваны на вучобу ў Маскву і «по окончании наук», у 1827 г., вярнуўся ў свой горад на гэтую пасаду, якую займаў да дня сваёй смерці — 14 сакавіка 1850 г. У сувязі з «аднаўленнем дзейнасці Менскай палаткі» з 1 ліпеня таго ж года яго змяніў Афендзік Другі (знаходзіўся на пасадзе да лістапада — снежня 1851 г.), калежскі рэгістратар, які да чэрвеня быў проберам ва Уладзімірскай мясцовай казённай палаце. Усяго, паводле літаратурных крыніц (якія не заўсёды пацверджаны архіўнымі ці музейнымі крыніцамі), праз менскія проберныя ўрады прайшло з дзясятак спецыялістаў, якія пакінулі свае клейны на вырабах менскіх майстраў. Сёння гэтыя клейны выступаюць збольшага адзіным сведчаннем іх функцыянавання.

Як правіла, проберная палатка размяшчалася ў памяшканні, якое здымалася менавіта з гэтай мэтай у тутэйшых мяшчан. Так, з 1860 па 1866 г. установа была на вул. Бернардзінскай у камяніцы ўдавы аптэкара Фохта. Пасля некалькіх спроб дамовіцца аб коштах арэнды (а дагавор з арандатарам

*Ліхтар майстры Б.Тапаза. 1875 г.*

[44] НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 1, спр. 165, арк. 196.

падпісваўся на тры гады, па 140 руб. срэбрам у год) свой дом на Віленскай «надбрежнай» здаваў менскі купец А. Ліхтэрман.

Адпаведна пастанове Дэпартамента дзяржаўнага казначэйства ад 12(22) снежня 1888 г., у Менску скасавалі проберную палатку, а яе функцыі былі перададзены ў Вільню. Праўда, фактычна дзейнасць Менскай проберной палаткі спынілася толькі ў канцы 80-х гг. XIX ст.

## ПОЛАЦАК

З апошняй трэці XVIII ст. места разам з іншымі гарадамі Усходняй Беларусі апынулася ў межах Расійскай імперыі. Звесткі аб развіцці тут злотніцтва на гэты час вельмі цьмяныя. Паводле літаратурных крыніц, гораду прыпісваюцца два проберныя майстры[45], якія працавалі тут у 1840—1842 гг. і 1847 г. Да нашага часу захаваліся іх клейны, як і трох невядомых майстраў, і майстры П. Саеўскага.

На наш погляд, гэтыя высновы з'яўляюцца вельмі праблематычнымі. Факт наяўнасці паўнавартасных проберных урадаў у Полацку нашымі даследаваннямі не пацвярджаецца; хутчэй за ўсё, даследчыкаў на гэтую думку магло падштурхнуць супадзенне графічных вобразаў позніх гербаў Полацка і Віцебска. Пасля далучэння да Расійскай імперыі значная колькасць гарадоў новаўтворанай Віцебскай губерні атрымала стандартныя выявы гарадскіх гербаў, мэтай якіх былі прапаганда і ўслаўленне царскага самаўладдзя. Яны адрозніваліся паміж сабой толькі афарбоўкай дэталяў, а сутнасць была адна — Пагоня ў падпарадкаванні імперскаму Арлу. На проберных клейнах, якія тады існавалі, было вельмі складана падкрэсліць каляровыя характарыстыкі гербаў. Гэты факт мог і падштурхнуць нашых папярэднікаў да памылковых высноў.



*Герб Полацка. 1781 г.*



*Герб Віцебска. 1781 г.*

[45] Што ўвяло ў зман даследчыкаў суседніх краін.

# КАРОТКІЯ НАРЫСЫ АСНОЎНЫХ ЗЛОТНІЦКІХ ЦЭНТРАЎ БЕЛАРУСІ

## БАБРУЙСК

Першым вядомым з літаратурных крыніц тутэйшым майстрам з'яўляецца нейкі Багдан. Ён жыў у Бабруйску ў 20-х гг. XVII ст. Больш падрабязна адлюстраваліся ў дакументальных крыніцах бабруйскія злотнікі XIX ст. На той час, паводле няпоўных падлікаў, у горадзе працавала звыш двух дзясяткаў ювеліраў і рэзчыкаў пячатак. Звесткі пра іх сканцэнтраваны галоўным чынам у канцы 40 — пачатку 50-х гг., калі Менскай пробернай палаткай былі выяўлены факты выпуску недабраякасных залатых і срэбраных вырабаў. Менскім губернскім праўленнем разглядалася справа аб вырабе нізкапробнай залатой і срэбранай прадукцыі, якая кляймілася зробленым таксама ў Бабруйску фальшывым кляйном з лічбай «84». Усяго па гэтай справе было прыцягнута каля паўтара дзясятка бабруйскіх майстраў разам са старшынёй мясцовага цэха залатых і срэбраных спраў, які і ўзначальваў гэтае «прадпрыемства». У 80-я гг. XIX ст. у горадзе налічваецца 14 майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, сярод якіх старшым быў В. Смілавіцкі, што ў 50-х гг. лічыўся вучнем і «вызначыўся» тым, што пад кіраўніцтвам свайго настаўніка рабіў завушніцы са шклом, якое выдавалі за «дыяманты».

## БЯРЭСЦЕ

У рэвізіі места, якая адбылася ў 1566 г., згадваюцца чатыры злотнікі. Прывілей на заснаванне цэха быў нададзены берасцейскім злотнікам першым сярод іншых местаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі, «у годзе 1599 красавіка 17 дня». Статут быў зацверджаны мескімі ўладамі і літаральна праз два тыдні, 3 траўня, канфірмаваны каралём Жыгімонтам III Вазай. Цікавай асаблівасцю берасцейскага цэха было тое, што акрамя злотнікаў у яго стварэнні прынялі ўдзел і мастакі, што абумовіла існаванне аб'яднанага злотніцка-малярскага цэха. Адпаведна статуту, «калі каторы таварыш хацеў у Бярэсці стаць Майстрам, павінен быў папярэдне працаваць у цэху два гады, каб яго жыццё і паводзіны маглі быць спазнаны; затым, жадаючы стаць майстрам, добра выхаваны і вывучаны, мусіў два гады ў далёкіх і чужых местах займацца сваім рамяством, пахвальна і прыстойна яго вывучаць». Спачатку таварыш прымаў «права мескае» і прыносіў прысягу на вернасць Бярэсцю. Пасля гэтай



*Адбітак пячаткі майдэборскага места Берасцейскага ў рэнесансным стылі. 1650 г.*

працэдуры ў прысутнасці цэхмістра прэтэндэнт на званне берасцейскага злотніцкага майстры быў абавязаны «паказаць штукі рамяства свайго»: зрабіць келіх, пячатку і ўмацаваць каштоўны камень у залатым пярсцёнку. Напрыканцы дакумента падкрэслівалася, каб цэх і ратуша таго «места Берасцейскага» былі забяспечаны ўзбраеннем.

Статут брацтва быў канфірмаваны сынам Жыгімонта — каралём Уладзіславам IV «у годзе 1633 лютага 2 дня». Дадаткова да папярэдніх артыкулаў кароль падкрэсліў, што нікому іншаму, акрамя злотнікаў цэхавых, «прысеглых», не дазваляецца «смалеваць» срэбра ў гэтым горадзе. Таксама ў дакуменце было пазначана, што замкавы ўрад не можа прыцягваць злотнікаў да свайго суда і яны падлягаюць толькі юрысдыкцыі берасцейскага ўрада.

За перыяд з другой паловы да канца XVI ст., паводле няпоўнай, наколькі нам падаецца, інфармацыі, тут зафіксавана сем майстраў, у XVII ст. іх больш за тузін. Трэба адзначыць, што, калі Бярэсце страціла свой ваяводскі статус і стала звычайным павятовым цэнтрам Гарадзенскай губерні, у XIX — пачатку XX ст., згодна архіўным статыстычным дадзеным, майстраў, занятых злотніцкай і срэбраніцкай справай і рэзаннем пячатак, было трохі больш за тры дзясяткі.

## ВІЛЬНЯ

Злотніцкія традыцыі ў гэтым горадзе існавалі з глыбокай старажытнасці. Прывілей на злотніцкі цэх быў атрыманы «перад святам св. Барталамея» ў 1495 г. Ён быў зацверджаны для віленчукоў у 1516 г. у дзень «пасля фэста св. Марціна». Ускосныя звесткі сведчаць, што існавалі папярэднія прывілеі рамеснікам гэтай спецыяльнасці, якія выдаў у другой палове XV ст. бацька вялікага князя літоўскага Аляксандра — кароль Андрэй Казімір — для тутэйшых злотнікаў «Літвы і Русі», што працавалі аднаасобна ў горадзе спакон веку.




*Пячатка віленскага яўрэйскага цэха рэзчыкаў і гравёраў. XIX ст.*




*Пячатка віленскага яўрэйскага ювелірна-срэбраніцкага цэха. 1838 г.*

Як пацвярджаюць гістарычныя крыніцы, злотніцкае рамяство не заўсёды існавала ў межах толькі цэхавых структур. У гэтым аспекце нам уяўляецца цікавым дакумент, што быў дадзены каралём Жыгімонтам Аўгустам «у годзе 1544 месяца кастрычніка 22 дня», — **«Подтверждение золотаром виленским Литве и Руси, тым которые не суть в цэху золотарском...»**. Апошнія скардзіліся на віленскіх злотнікаў палякаў і немцаў, якія падпарадкоўваліся злотніцкаму цэху і **«...нехотечи им допустити роботы золотарское ... робити на коморах их золотарских...»**, патрабавалі далучыцца да цэха, папярэдне зрабіўшы **«мейстерштуки»**. Сваім прывілеем кароль дазволіў тутэйшым майстрам **«...подле давного обычаю тую роботу золотарскую в месте виленском без жадных цэхов и без мейстершков робити ... золотаром цэховым ... нашим приказали же бы они ... роботы золотарское мати им не забороняли ... которые трудности в томъ имъ не задавали и къ цеху своему не приворочвали...»**. Гэты дакумент адлюстраваў пярэчанні, што існавалі не толькі ў Вільні, але і ў іншых старажытных культурных цэнтрах Беларусі. Аднак не заўсёды яны набывалі форму прамога супрацьстаяння, як гэта здарылася тут.

Першапачаткова мескі магістрат «заактыкаваў» цэхавы статут «у годзе 1628 сакавіка 9 дня», потым, «у годзе 1687 месяцы лістападзе 30 дня», у сувязі са скаргамі спажыўцоў на якасць залатых і срэбраных вырабаў напісаў да статута дадатковыя артыкулы. Канфірмацыя гэтага дакумента была зроблена каралямі Жыгімонтам III Вазай і Уладзіславам IV, а пазней, «у годзе

1664 месяцы чэрвені 30 дня», — Янам Казімірам. У прэамбуле дакумента падкрэслівалася, што даўнія «прывілеі, артыкулы і канфірмацыі загінулі падчас Маскоўскай акупацыі». Усе гэтыя «паракграфы» былі зацверджаны каралём Аўгустам Моцным «у годзе 1705 месяцы лістападзе 5 дня», апошняе пацвярджэнне адбылося «ў годзе 1774 месяцы лістападзе 12 дня».



*Адбітак выразанай Ганусам Трыльнерам дзяржаўнай пячаткі Вялікага Княства Літоўскага, што была ва ўжытку ў 1635—1648 гг. (павялічаны)*

У перыяд Вялікага Княства Літоўскага Вільня была не толькі буйным злотніцкім, але і эмісійным цэнтрам. Віленская мінца (манетны двор) функцыянавала з XV ст. да 30 снежня 1667 г. Сваю дзейнасць яна пачала ў часы Вітаўта (1392—1430) выпускам дынараў; пазней, пры вялікім князю літоўскім і каралю польскім Аляксандру Ягелончыку (1492—1506), тут выпускаліся срэбраныя манеты наміналам ад дынара да гроша; у часы праўлення Жыгімонта Старога (1506—1548) прадукцыяй мінцы былі паўгрошы і грошы, а яго сын Жыгімонт Аўгуст (1548—1572) даў мінцы прывілей выпускаць агульныя для ўсёй Рэчы Паспалітай грошы. З гэтага часу пачалося карбаванне манет са спалучаным чатырохпалёвым гербам (Арол + Пагоня). На ўсіх грашовых знаках, што былі выпушчаны тут, прысутнічаюць гербы падскарбіх ВКЛ або апазнавальныя знакі арандатараў мінцы.

Адным з першых вядомых нам віленскіх «мінцмейстраў» быў Пётра Платын. Ён згадваецца «ў годзе 1592 месяца лютага 6 дня» ў лісце Жыгімонта Аўгуста аб «вызваленні» яго «з вязення» і вяртанні яму «друку і інструментаў» (металаапрацоўчых). А 5 красавіка таго ж года кароль выдаў ліст аб непадсуднасці П. Платына віленскаму земскаму і мескаму судам. Потым згадваецца Ян Тырлзе, які фігуруе ў консэнсе 1601 года караля Жыгімонта III Вазы, якім ён зацвярджае ліст падскарбія А. Завішы аб змене пробераў. На яго месца ў тым жа годзе трапіў Ян Дзітмар. Ставячы яго на пасаду, падскарбі патрабуе ад яго ў лісце, каб «пенендзы ў мінцы рабіліся белыя патройныя срэбраныя». Наступны пробер — Ян Трыльнер, што ўпамінаецца ў дакументах за 1614—1648 гг. У 1614—1616 гг. ён судзіўся са злотніцкім брацтвам, паколькі цэхавыя старшыя містры адмаўляліся ўнесці ў свой рэестр яго сына Ганнуса. Апошні ў 1632—1633 гг. і каля 1649 г. выконваў «дзяржаўныя заказы» — напрыклад, «вырыў» (зрабіў) срэбраныя пячаткі для Канцылярыі ВКЛ часоў Уладзіслава IV і яго наступніка Яна Казіміра. У «дыпломе» віленскага біскупа Юрыя Белазора ад 1663 г. згадваецца «фактор» Андрэй дэ Горн, якому дазваляецца «выбіваць» на віленскай мінцы



Ё. Аман. *Злотніцкі варштат. Нямецкі дрэварыт. Канец XVI ст.*

«орты, шэлягі, патройныя і пулторакі, і грошы, так яко до того в Короне Польской біто» на агульную суму звыш пяці мільёнаў злотых. Дзейнасць тутэйшых ювеліраў не заўсёды працякала ў бясхмарнай абстаноўцы: так, у 1776 г. у выніку цеснага хаўрусу паміж віленскім магістратам і тутэйшым кагалам не вытрымаў несумленнай канкурэнцыі і знік «юбілерскі» цэх.

Адным з лепшых віленскіх злотнікаў, паводле сучаснікаў, быў Крыштаф Струнк. Ён атрымаў ад караля Уладзіслава IV прывілей, якім за ўмельства ў сваім рамястве быў залічаны ў каралеўскія слугі і вызвалены з-пад юрысдыкцый усіх улад, акрамя асабістай падсуднасці каралеўскаму двару. Гэта здарылася «ў годзе 1634 чэрвеня 29 дня».

Вільня з'яўлялася цэнтрам падрыхтоўкі злотнікаў з розных гарадоў і мястэчак як Вялікага Княства Літоўскага, так і замежных дзяржаў: Германіі, Чэхіі, Польшчы, Італіі і Масковіі. Як адзначаў даследчык Э. Лапацінскі, а за ім і Э. Максімава, усяго за сто гадоў, з 1650 па 1750 г., злотніцкую адукацыю ў Вільні атрымалі больш як 250 чалавек.

## ВІЦЕБСК

Упершыню ў Віцебску злотнікі афіцыйна згадваюцца сярод «людзей рамесных» у прывілеі караля Жыгімонта III Вазы «году 1596 месяца сакавіка 17 дня». У ім гаварылася: **«Каждому цеху свою хоругов ... мети позволяемъ и вечне утверждаемъ...»** Пры гэтым **«золотары»** афіцыйна фігуруюць на першым месцы (што можа ўскосна сведчыць пра іх удзельную вагу ў мескай рамеснай вытворчасці) у пераліку прадстаўнікоў розных спецыяльнасцей. Усяго ў Віцебску за XVI—XVIII стст. намі знойдзена 20 прадстаўнікоў гэтай прафесіі. Праўда, у дакументальных крыніцах рамеснікі-злотнікі найбольш інтэнсіўна фіксуюцца з другой паловы XVII ст., калі іх налічваецца 16 чалавек, але толькі чацвёра пражывалі ў Віцебску — астатнія былі вывезены ў Маскву падчас т.зв. «руска-польскай вайны». Шэсць асоб не выклікалі даверу царскіх улад і былі звольнены са сваіх пасад у 1663 г. па палітычных меркаваннях. Адхіляючыся ад тэмы, адзначым, што беларускія злотнікі былі пажаданым вайсковым трафеем: для іх росшуку, адбору і дастаўкі ў сталіцу Маскоўскага княства спецыяльна выязджалі **«государевы»** людзі, якія рознымі абяцанкамі заваблівалі майстраў у суседнюю дзяржаву[46]. Брак датычных Віцебска дакументальных крыніц стварае пэўную «лакуну» ў нашых ведах па дадзеным прадмеце з другой паловы XVII да пачатку XIX ст.

---

[46] Палеес.

Падчас знаходжання места ў Расійскай імперыі злотніцкае рамяство набыло тут новыя, больш шырокія, маштабы. Гэтаму спрыялі як старадаўнія традыцыі, так і атрыманы Віцебскам статус новай для Беларусі адміністрацыйнай адзінкі — губерні. Гэты статус абумовіў таксама ўзнікненне тут новых установ, у тым ліку пробернай палаткі.

Паводле статыстычных дадзеных пазамінулага стагоддзя, на 1867 г. па злотніцкай управе Віцебска налічвалася 14 майстраў, 6 падмайстраў і 9 вучняў; а згодна спісу цэхавых майстраў, на 1892 г. тут было 27 майстраў, што карысталіся правам удзелу ў абранні цэхавых старшынь. Увогуле на працягу XIX — пачатку XX ст. у губерні намі зафіксавана звыш сотні рамеснікаў-спецыялістаў, што працавалі з каштоўнымі металамі і камянямі. Дакладней, паводле статыстычных дадзеных 1894 г., на тэрыторыі Віцебскай губерні ў злотніцтве быў заняты 131 чалавек (майстры, падмайстры і вучні). У самім Віцебску злотнікаў было 50, у Дзвінску — 38, у Веліжы — 12 і ў Полацку — 8[47].

## ГАРОДНЯ

У першай палове XVI ст. у гэтым горадзе фіксуюцца тры злотнікі, у другой палове — два. Хоць нам вядома толькі некалькі імёнаў рамеснікаў, ёсць магчымасць меркаваць, што ў часы, калі ў Гародні быў фундаваны цэх, тут сфарміравалася пэўная група спецыялістаў-злотнікаў, што дазволіла ім прэтэндаваць на ўтварэнне брацтва. «У годзе 1637 верасня 12 дня» была зроблена «актыкацыя» брацкага статута мескімі ўладамі (адпаведна гэтаму прывілею, свой галоўны алтар злотнікі мелі ў гарадзенскім Фарным касцёле). Літаральна праз некалькі месяцаў, «году 1637 снежня 10 дня», адбылося зацвярджэнне статута каралём Уладзіславам IV. Для параўнання можна адзначыць, што магілёўскія злотнікі «заактыкавалі» свой статут на мескай ратушы ў 1629 г., а атрымалі каралеўскі прывілей і зацвярджэнне статута толькі праз пяць гадоў(!).

Канфірмацыя гарадзенскага статута адбылася па прашэнні бурмістра злотніка Станіслава Цвікліча «ў годзе 1650 месяцы сакавіку 20 дня»[48]. Браты Станіслаў і Ян Цвіклі (Цвіклічы) уяўляюцца нам найбольш каларытнымі ў асяроддзі гарадзенскіх злотнікаў. Яны займалі ключавыя пазіцыі: былі старшымі цэха і абіраліся на пасады радцаў і бурмістраў у мескім магістраце, а Станіслаў быў нават абраны лентвойтам (1634). У канцы XVII ст. іх родзіч Войцех Цвікля быў прызначаны пажыццёвым старостам гарадзенскіх рыбакоў.

---

[47] НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 481. арк. 31—51.

[48] Калекцыя мікрафільмаў, якія захоўваюцца ў НГАБ у Мінску (КМФ). 18. Спр. 123. Арк. 299.




*Срэбраны абклад для абраза, зроблены ў 1803 г.
па заказе мужа і жонкі Іаанны і Вінцэнта Шырмаў*




*Знак Гарадзенскага царкоўнага Сафійскага брацтва. XIX ст.*

За перыяд XVI—XVIII стст., паводле далёка не поўных дакументальных дадзеных, у горадзе налічвалася звыш двух дзясяткаў майстраў.

Змена ўлады ў канцы XVIII ст. і атрыманне местам статусу губернскага цэнтра не магло не паспрыяць далейшаму развіццю гэтага рамяства. Згодна нашай інфармацыі, на працягу XIX ст. у Гарадзенскай губерні было больш за 39 злотнікаў: 19 іўдзеяў, 6 хрысціян і 5 чалавек нявызначанай рэлігійнай прыналежнасці. Не выключаецца, што агульная лічба злотнікаў у гэтай губерні магла быць значна большай. Паводле статыстычных матэрыялаў, што захаваліся ў архівах, на працягу XIX — пачатку XX ст. на тэрыторыі губерні дзейнічала больш за сотню прадстаўнікоў гэтай прафесіі. У самой Гародні рамеснікаў, занятых злотніцтвам і рэзаннем пячатак, было звыш 30 чалавек.

Са статыстычных і іншых крыніц нам вядома, што на працягу XIX ст. у павятовых местах Ваўкавыска, у Кобрыне і Пружанах лічба асоб, занятых у злотніцтве, вагалася ад дзвюх да шасці; у Бельску, Драгічыне, Мельніку, Сакулцы і Янаве — ад адной да трох.

Табл. **Майстры залатых і срэбраных спраў Гарадзенскай губ. XIX ст.**[49]

| Назва места | Бярэсце | Беласток | Бельск | Ваўкавыск | Гародня | Драгічын | Мельнік | Кобрын | Пружаны | Сакулка | Слонім | | Янаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1835 г. | 6 | —[50] | — | — | 4 | — | — | — | — | — | 5 | — | — |
| 1875 г. | 6 | 12 | 1 | 1 | 10 | 1 | 1 | 2 | 5 | 1 | 4 | | 1 |

[49] Паводле матэрыялаў НГАБ у Гродне, ф. 14, воп. 1, спр. 639, арк. 10 зв., 35, 102; тамсама, спр. 603, арк. 91 зв. — 94.

[50] Тут і далей рысачка «—» азначае, што па гэтым горадзе альбо павеце дадзеныя адсутнічаюць.

## МАГІЛЁЎ



*Герб магілёўскіх злотнікаў (рэканструкцыя)*

Цэх быў створаны тут адпаведна ініцыятыве **«дванаццату»** людзей **«рамяства злотнічага»**, якія звярнуліся ў мескую ратушу з прашэннем зацвердзіць іх статут. 20 верасня 1629 г. магістрат прыняў пастанову, якая **«заактыкавала артыкулы парадку золотнічого»**. Кароль Уладзіслаў IV выдаў 22 чэрвеня 1634 г. «ліст-прывілей», які налічваў 24 артыкулы і паўтараў папярэдні дакумент. Каралеўская ўлада прадпісала злотнікам карыстацца канкрэтным цэхавым гербам. Гэта быў «леў за кратамі», якім яны мусілі «адзначаць свае вырабы і на харугвах мецць». Тым жа прывілеем кароль дазволіў злотнікам, **«ку хвале Богу»**, двойчы на год «сыціць па дванаццаць пудоў мёду: першы раз на свята Трох Каралёў, другі — на Святога Пётру»[51]. Праз год пасля канфірмацыі цэха, 15 кастрычніка 1635 г., да злотнікаў далучыліся канвісары (валавяншчыкі) і масяжнікі (меднікі). Яны тлумачылі сваю ініцыятыву тым, што **«...для ... недостатков ... цеху своего особливого мети не могучы, приступили есмо вси згодне и одностайне до цеху злотницкого»**, і прынялі на сябе абавязацельствы **«послушенство давати цехмистром обраным»** да таго часу, пакуль яны не ўтвораць свой уласны цэх. Гэты акт стаў штуршком да спрэчкі паміж цэхам злотнікаў і магілёўскім рымарска-сядлярскім цэхам. Апошні, імкнучыся павялічыць сваю колькасць і, адпаведна, паступленні ў скрынку, пачаў дамагацца выканання павіннасцей з боку магілёўскіх бляхароў, масяжнікаў і канвісараў на карысць свайго цэха. Спачатку справу разглядаў мескі магістрацкі суд, але апошнюю кропку ў ёй паставіў каралеўскі суд, які ў 1636 г. пацвердзіў рашэнне тутэйшага суда і сваім дэкрэтам «узмоцніў і замацаваў навадалучаных да злотніцкага цэха».

Маштаб і эканамічнае значэнне места ў краіне абумовілі наяўнасць вялікай колькасці рамеснікаў гэтай спецыяльнасці. За перыяд з XVI па 70-я гг. XVIII ст. іх колькасць перавышала палову капы. Магілёў знаходзіўся на першым у краіне месцы, пасля Вільні, па колькасці рамеснікаў-злотнікаў. Большасць з іх тутэйшага паходжання — праўда, у горадзе працаваў і злотнік-іўдзей Мейта, які паралельна з заняткамі рамяством, пра што сведчаць дакументы, прыгандлёўваў яшчэ і гарэлкай. Падчас даследавання нам трапіўся

[51] Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской в 32 т. Витебск, 1871—1906 (ИЮМ). Вып. 1. С. 494 .



*Партрэт караля Жыгімонта III Вазы. Дрэварыт з выдання Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.*

і немец (мяркуючы па прозвішчы), Д. Дэверт, непасрэдна звязаны з утварэннем у Магілёве злотніцкага цэха. У 1635 г. ён нават быў абраны сваімі калегамі старшым цэха. Магілёўскія злотнікі ў сваю чаргу працавалі ў Маскові. Так, магілёвец Мікола Логвінаў выконваў у 1654 г. заказы ў Залатой палаце Маскоўскага Крамля. Бурная ваенная гісторыя «слаўнага места Магілёўскага» не магла не адбіцца адмоўна на развіцці рамяства, у тым ліку злотніцтва.

Набыццё Магілёвам статусу губернскага места ў часы Расійскай імперыі было дадатковым штуршком для развіцця гэтай галіны рамеснай вытворчасці, але, зноў жа, брак дакументальных крыніц значна звужае перспектывы пошуку.

## МЕНСК

Упершыню менскія злотнікі згадваюцца, калі «ў годзе 1591 месяца снежня 2 дня» ў горадзе быў створаны цэх «васьмі рамёстваў», куды ўваходзілі кавалі, катляры, слесары, пабраічы (спецыялісты па вырабе конскай збруі), пушкары, мечнікі, нажэўшчыкі і, «праз малую лічбу містроў у месце», злотнікі. Гэты «Парадак цэхавы...» быў афіцыйна зацверджаны каралём Жыгімонтам III Вазай «у годзе 1592 лістапада 20 дня».

Толькі амаль праз дваццаць пяць гадоў, 31 траўня 1615 г., менскія злотнікі атрымалі прывілей на права заснавання свайго асобнага цэха[52]. Акрамя таго, што ў ім былі сфармуляваны цэхавыя артыкулы, там падкрэслівалася: «...на астатак [дазваляецца] мець сваю цэхавую пячатку, бубен і армату, патрэбную для абароны і аздобы... места». Разам з тым, апроч «парадку статутовага» і ўзаемаадносін паміж майстрамі, падмайстрамі, вучнямі і чаляднікамі, прывілеем прадугледжвалася, каб цэх меў сваю харугву, пад якую былі абавязаны станавіцца іншыя рамеснікі, якія не мелі ўласных цэхаў.



*Адбітак першай гербавай пячаткі майдэборскага места Менскага, якая ўжывалася менскімі ўладамі з 1591 па 1690 г.*

На жаль, сёння няма звестак пра тое, якія сімвалы ці гербы ўпрыгожвалі галоўныя

[52] Гл. таксама пра гэты цэх у кнігах: *Цітоў А. К.* Менск — места майстроў. Мінск, 2003. С. 43—50; *Цітоў А. К.* Краіна майстроў. Мінск, 2013. С. 96—97.



Чаша з дыскаса, гатычная манстрацыя і даразахавальніца з касцёла Св. Роха. Фота пачатку XX ст.



Манстрацыя з касцёла Св. Роха, упрыгожаная каштоўнымі камянямі. Фота пачатку XX ст.

цэхавыя атрыбуты. У тым жа дакуменце было падкрэслена, што іх «дом цэхавы» вызваляўся ад усялякіх пастояў. Стварэнне гэтага рамесніцкага цэха не вырашыла тых пярэчанняў, якія існавалі паміж злотнікамі (магчыма, не ўсе імкнуліся далучыцца да цэха, а жадалі працягваць працаваць аднаасобна, як гэта было на тыя часы ў суседняй Вільні).

На спробы некаторых злотнікаў захаваць сваю індывідуальнасць і незалежнасць кароль Жыгімонт III Ваза «1619 году чэрвеня 27 дня» накіраваў менскаму старосце Пятру Тышкевічу ліст, у якім патрабаваў, каб той прымусіў менскіх злотнікаў да «паслушэнства цэхавым уладам і каб з цэха яны не выламываліся». Не выключаецца, што гэта водгук такога ж самага канфлікту, які здарыўся ў Вільні паміж тамтэйшымі і новапрыбылымі. У прывілеі кароль падкрэсліў, што прыезджым злотнікам, а таксама «купцам і жыдам» забараняецца прывозіць вырабы з золата і срэбра і гандляваць імі ў Менску падчас з’ездаў і трыбуналаў.

Гэты дакумент разам з цэхавым статутам пазней быў зацверджаны па прашэнні злотніцкіх майстраў Юр’я Эса [Гесъ] і Яна Горвата «ў годзе 1634 чэрвеня 29 дня» каралём Уладзіславам IV. Пасля яго статут быў зацверджаны каралём Янам Казімірам «у 1664 годзе траўня 7 дня». Апошняя ж канфірмацыя папярэдніх прывілеяў зроблена «ў 1672 годзе чэрвеня 25 дня» каралём Міхаілам, які паўтарыў прывілеі сваіх папярэднікаў, не дадаўшы асабіста ад сябе да статута нічога новага.

Лепшым з менскіх майстраў быў патомны злотнік Матыс [Мацяш] Бальцэровіч. Нарадзіўся ён у бацькоў пратэстанцкага вызнання — Людвіка і Раіны,

якая была на той час у трэцім шлюбе. «У годзе 1645 месяцы ліпені 29 дня» Матыс атрымаў каралеўскі прывілей на права вольнага гандлю ў Кароне і ВКЛ і за «ўмеетнасць» быў прыняты ў лік каралеўскіх слуг. Ён неаднаразова абіраўся мескім радцам і бурмістрам. Апошняя знойдзеная намі згадка пра яго датуецца 1671 г., калі ён названы старшым злотніцкага цэха і менскім радцам.

Сярод цікавых злотніцкіх помнікаў тых часоў вядомы срэбраны кубак, што захоўваецца ў Аружэйнай палаце Маскоўскага Крамля[53]. Сведчаннем таго, што ён звязаны пэўным чынам з Менскам, з'яўляецца гравіраваны надпіс на ім, з якога вынікае, што кубак быў падарункам тутэйшых жыхароў на вяселле караля Жыгімонта III у 1605 г. Дарэчы, менавіта гэты кароль надаў Менску майдэборскія правы ў 1591 г. Упершыню гэты дар зафіксаваны ў перапіснай кнізе Аружэйнай палаты ў 1663 г. і апісаны наступнымі словамі: **«Кубокъ сребренъ, золоченъ, чеканной... На поддоне подписано: "Прислалъ к великому Государю Полской Король". — и которой Король и въ которомъ году, того имянно не написано»**. Гісторыя гэтага кубка, думаецца, была наступная. Менчукі з вернападданніцкіх пачуццяў падарылі гэты кубак на каралеўскі шлюб, праз некаторы час з каралеўскай скарбніцы ён быў «перападараваны» маскоўскаму цару Аляксею Міхайлавічу. На жаль, сёння нам даступны толькі вопіс гэтага помніка злотніцкага мастацтва, што быў зроблены ў XIX ст. Адпаведна яму, кубак быў срэбны «зочён», вагой у 13 фунтаў і 6 залатнікоў, упрыгожаны постацямі людзей «нагих», крылатымі галоўкамі і фігуркамі купідонаў, «чудищами»-раслінамі, пальмавымі галінамі, кветкамі і г.д.

Пасля далучэння Менска да Расійскай імперыі золата-срэбраніцкае рамяство атрымала тут новы імпульс. Як цэнтр губерні места зрабілася прыцягальным рынкам збыту і месцам жыхарства для рамеснікаў розных спецыяльнасцей, у тым ліку і злотнікаў. Адпаведна дакументальным дадзеным, у тыя часы цэх узначальваўся выбарным старшынёй і двума яго памочнікамі — таварышамі старшыні, якія таксама падлягалі штогадоваму абранню на агульнацэхавай сходцы.

У сярэдзіне XIX ст. у горадзе існавалі дзве самастойныя, але блізкія паводле сваіх прафесійных інтарэсаў групы рамеснікаў: срэбраніцкі цэх, дзе ў 1849 г. было 18 майстраў і 5 вучняў, і «юбілерскі» цэх, які ў той самы час налічваў 45 майстраў і 5 падмайстраў «юбілерскага рукадзелія»[54]. Праз пяць гадоў, у 1854 г., у менскім злотніцка-срэбраніцкім цэху працавалі 53 майстры[55].

---

[53] Опись Московской Оружейной палаты: в 7 ч. [10 вып.]. М., 1884—1893 (ОМОрп). Ч. 2. Кн. 2. № 856.

[54] НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20—21, 49—50.

[55] Тамсама, спр. 770, арк. 2—3, 7 зв., 9.

# НОВАГАРОДАК

Нягледзячы на багатую палітычную гісторыю гэтага места, злотніцкае рамяство, як нам здаецца, не дасягнула тут таго ўзроўню, як у Вільні, Магілёве ці Менску. У дакументах першай паловы XVI ст. згадваецца адзін злотнік, праз стагоддзе (падчас стварэння злотніцкага цэха) у дакументальных крыніцах іх было тры.

Прывілей на стварэнне мясцовага цэха быў зацверджаны ў Вільні каралём Уладзіславам IV 10 чэрвеня 1636 г. паводле ініцыятывы чатырох старшых злотніцкага рамяства, якіх узначальваў бурмістр Міхаіл Вільгемовіч, як падкрэслена ў дакуменце, «для захавання паміж сабой [злотнікамі] любові і братэрскай згоды, для лепшага вучэння недасканалай у тым рамястве моладзі [і] для пакарання свавольных...». Папярэдне гэты дакумент быў зацверджаны мескімі ўладамі «1636 году траўня 10 дня». Да тэксту цэхавага статута каралеўская ўлада дадала, каб усе злотнікі знаходзіліся пад мескай юрысдыкцыяй, іншым забаранялася працаваць або рэалізоўваць у горадзе сваю прадукцыю. Сярод цэхавых атрыбутаў злотніцкі цэх мусіў, на ўзор «сталічнага места Вільні», мець уласную пячатку з гербам і харугву, пад якую ў час ваеннай небяспекі, вялікіх рэлігійных свят і інш., акрамя іх саміх (злотнікаў), былі абавязаны станавіцца і навагародскія «цырульнікі» («цэрылікі», суч. дактары). Для «памнажэння» гэтага цэха мясцовым злотнікам дазвалялася запрашаць і прымаць у сваё асяроддзе рамеснікаў сваёй спецыяльнасці з іншых местаў і мястэчак, «людзей са свядзецтвам, пачцівых і рамяство добра ўмеючых». Магчыма, гэтае рамяство не атрымала ў горадзе далейшага развіцця, таму ў дакументальных крыніцах звесткі пра тутэйшых злотнікаў амаль не трапляюцца: за XVII—XVIII стст. намі зафіксавана ўсяго толькі сем рамеснікаў гэтай спецыяльнасці. Яшчэ менш дакументальных дадзеных у нашым распараджэнні на перыяд XIX — пачатку XX ст.




*Адбітак пячаткі майдэборскага места Навагародка з выявай Архангела Міхаіла ў стылі ракако. 1729 г.*

## НЯСВІЖ



Выява радзівілаўскага герба са срэбранага каўша XVII ст., які знаходзіўся ў Аружэйнай палаце Маскоўскага Крамля

Размяшчэнне ў Нясвіжы цэнтра княжацкай ардынацыі і сталіцы аднайменнага княства не магло не абумовіць наяўнасці вялікай колькасці рамеснікаў, што абслугоўвалі як гаспадарчыя патрэбы двара, так і тутэйшых мяшчан. Увогуле за перыяд з канца XVI да пачатку XIX ст. тут дзейнічала не менш за сем паўнавартасных рамесных цэхаў.

Дакументы пачатку XIX ст. сведчаць, што злотнікі ўваходзілі ў кавальскі цэх. У нясвіжскай ратушы разглядалася пытанне па скарзе старшыні гэтага цэха, калі Базыль Скарульскі звінаваціў злотніцкага цэхмістра Давіда Гершовіча ў тым, што ён арганізаваў выхад пяці майстраў-злотнікаў з цэха і ўтварыў асобную рамесную суполку, да якой быццам бы далучыліся «бляхары, катляры, масяжнікі і рамеснікі іншых кюнстаў [мастацтваў]». «Адшчапенцы» спасылаліся на тое, што іх цэх быў усталяваны ўжо ў 1797 г., і нават спасылаліся на больш ранні дакумент, «па-гебрэйску пісаны», ад 2 кастрычніка 1789 г.

Як вынікае з рашэння нясвіжскай ратушы 1801 г., да іх далучыліся фактычна, акрамя самога Д. Гершовіча, яшчэ адзін злотнік і адзін бляхар, таму іх «самавольная без нічэйнага» дазволу дзейнасць была спынена. Паводле нашых няпоўных дадзеных, тут на працягу згаданага перыяду дзейнічала каля трох дзясяткаў майстраў-ювеліраў: адны падпарадкоўваліся княжацкай юрысдыкцыі, іншыя — мескай. Таксама гэты факт не выключаў таго, што прадстаўнікі княжацкага двара часта перадавалі дарагія заказы злотнікам Варшавы, Дрэздэна, Парыжа і іншых еўрапейскіх гарадоў.

На жаль, прыходзіцца канстатаваць той факт, што большая частка гэтай злотніцкай спадчыны рассеяна віхурамі гісторыі і асела ў сховішчах суседніх дзяржаў, галоўным чынам на ўсходзе. Адным са шматлікіх прыкладаў можна згадаць і вялізны срэбраны коўш «з умацаванымі на ім замежнымі медалямі XVI—XVII стст.» (думаецца, што гэта срэбныя талеры, якімі па тагачаснай модзе злотнікі любілі ўпрыгожваць свае вырабы дзеля надання ім большай цаны). Вага каўша — «дзевяць фунтаў восемдзясят два залатнікі, вышыня каўша — пяць вяршкоў, даўжыня — пятнаццаць вяршкоў». Трапіў у маскоўскую

Аружэйную палату з Нясвіжскага замка князёў Радзівілаў[56]. Як нам здаецца, гэта адбылося ў 1813 г., калі расійскія войскі захапілі замак і пасля «гутаркі» з радзівілаўскім скарбнікам А. Бургельскім расійская «казна» значна ўзбагацілася. На наш запыт пра лёс гэтага каўша быў атрыманы адказ, што ён «выбыл» у сярэдзіне XX ст.



*Залаты медальён з партрэтам Альбрыхта Станіслава, князя Радзівіла, канцлера ВКЛ (1623—1656)*

*Факсіміле (подпіс) Альбрыхта Станіслава, князя Радзівіла, канцлера ВКЛ*



[56] ОМОрп, ч. 2. кн. 2, № 2068.



*Крышталёвая наліўка, аздобленая срэбрам. XVII ст.*



*Адбітак пячаткі майдэборскага места Пінскага ў стылі ранняга рэнесансу, зафіксаваны на дакументах 1594—1653 гг.*

## ПІНСК

Хоць асобнай злотніцкай суполкі тут не было, але рамеснікі гэтай спецыяльнасці ўпершыню згадваюцца ў дакументальных матэрыялах ужо ў пачатку XVI ст. Пазней яны фігуруюць на першых ролях у 1639—1640 гг., падчас стварэння ў горадзе аб'яднанага злотніцка-кавальска-катлярска-мечнічага цэха.

## ПОЛАЦАК

З глыбокай даўніны «места Полацкае» мела традыцыі рамеснай вытворчасці, што абумоўлівалася яго палітычным становішчам як цэнтра магутнага княства. Добра вядомы сучаснай грамадскасці майстра-злотнік Лазар Богша, які зрабіў у 1161 г. па заказе князёўны Еўфрасінні Полацкай крыж. Гэты крыж меў багатую, але трагічную гісторыю[57]: нягледзячы на закляцце[58] князёўны, ён быў скрадзены і

---

[57] Лёс гэтай нашай духоўнай і культурнай каштоўнасці склаўся даволі звілісты: спачатку Еўфрасіннеўскі Крыж захоўваўся ў Полацку, але ў XIII ст., пасля захопу горада смаленскімі князямі, быў вывезены ў Смаленск, адкуль у пачатку XVI ст., на загад маскоўскага князя Васілія III, патрапіў у Маскву. Толькі ў 1563 г., у знак пакаяння за крывавыя злачынствы ў Полацку, крыж быў вернуты царом Іванам IV (Тыранам) у Полацак.

Падчас французска-рускай вайны 1812 г. полацкія жыхары схавалі крыж у муры Сафійскага сабора. Пасля гэтай вайны святыня знаходзілася ў «сталечных» гарадах Расіі і толькі ў 1841 г. вярнулася ў Спаса-Еўфрасіннеўскі сабор Полацка, як было наканавана самой ігуменняй Еўфрасінняй.

Праз восемдзясят гадоў, у 1921 г., крыж быў рэквізаваны бальшавікамі, а з 1928—1929 гг. з полацкага фінаддзела трапіў у пакой-сейф Магілёўскага абкама і гаркама камуністычнай партыі (бальшавікоў). На пачатку вайны, у 1941 г., крыж знік. Паводле адной з версій, у гэтым вінаватыя нямецкія акупанты, хаця ў перыядычным друку выказваліся і іншыя версіі. Ва ўсялякім выпадку крыж на сёння «в нетях». Гэты факт падштурхнуў БПЦ Маскоўскага патрыярхату да аднаўлення Крыжа Еўфрасінні Полацкай. Працу выканаў берасцейскі злотнік М. П. Кузьміч у 1997 г. (але гэта ўжо выходзіць за храналагічныя межы кнігі).

[58] **«Да не изнесеться из монастыря никогда же яко ни продати ни отдати. Аще се кто преслоушаеть и изнесеть от монастыря да будтъ проклятъ святою животворящею троицею и святыми отцами»**.



*Крыж Еўфрасінні Полацкай, зроблены полацкім злотнікам Лазарам Богшам у 1161 г.*
*Па цэнтры — пярэдні бок. Пачатак XX ст. Каляровая літаграфія.*
*Злева — пярэдні бок, справа — адваротны. Фота канца XIX ст.*

вывезены. Сёння прапаноўваюцца розныя версіі яго лёсу, нам жа застаецца спадзявацца на добрую волю нашчадкаў-злодзеяў і вяртанне святыні дамоў.

Гістарычныя абставіны зменшылі ролю Полацка ў дзяржаве, што, безумоўна, знізіла і працэнт злотнікаў у гэтым горадзе. Тым не менш рамесніцкае насельніцтва Полацка займала даволі значную нішу як у грамадскім, так і ў эканамічным жыцці места. У выраку вялікага князя літоўскага і караля польскага Аляксандра «году 1502 месяца снежня 30 дня», па скарзе полацкіх мяшчан на «пана полацкага» Станіслава Глябовіча, які ўціскаў майдэборскія вольнасці і правы мяшчан, першымі сярод рамеснікаў фігуруюць **«золотари»**[59]. Той самы факт фіксуецца і ў канфірмацыйным прывілеі на майдэборскія правы месту 1510 г., дзе таксама першымі сярод рамеснікаў згадваюцца **«золотари»**. Гэта можа ўскосна сведчыць пра іх удзельную вагу ў агульнай структуры тутэйшай рамеснай вытворчасці[60]. На сённяшні дзень статут злотнікаў не знойдзены, але дакумент, які атрымалі палачане «ў годзе 1605 месяца снежня 28 дня», прадугледжваў **«парадак, [які] з немецка цэхом называют»**. У ім таксама гаварылася: **«...абы во всемъ прыкладом цехов в месте виленском будучых справовалисе... в месте своёмъ способни быти могли»**. У дакуменце згадваюцца кавалі, катляры, слесары, мечнікі, краўцы, кушняры, шапнікі, **«чоботары»**, гарбары, шаўцы і **«золатары»**[61]. Далей было падкрэслена, **«до которого права и порадку цехового и золотаров того ж места прылучаем...»**. Дакументальных звестак пра полацкіх майстраў, якія б працавалі непасрэдна тут у XVII ст., пакуль што не адшукана, але захавалася інфармацыя пра тых, што былі вывезены ў Маскву падчас рэлігійных войнаў сярэдзіны гэтага стагоддзя. Адпаведна ёй, у гэты перыяд там займаліся злотніцтвам шэсць майстраў і вучняў, якія паходзілі з Полацка. У 1660 г. у Маскоўскай срэбранай палаце працавалі майстры Сямён Якаўлеў і С. Астаф'еў, якія мелі вучняў; праўда, звесткі пра іх губляюцца з прычыны недахопу дакументаў. Толькі вучань С. Астаф'ева Іван Палачанінаў згадваецца ў 1679 г. як лепшы майстра, **«пожалованы полукармазиновым»** сукном.

## СЛОНІМ

Места дало шмат майстраў-злотнікаў. У дакументальных крыніцах згадваюцца слонімцы-злотнікі рознай ступені кваліфікацыі. Безумоўна, найвышэйшай дасканаласці ў сваёй кар'еры дасягнуў Станіслаў Даніловіч, які паходзіў

[59] Полоцкие грамоты. М., 1978. Вып. 2. С. 197.

[60] Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссиею : в 5 т. СПб, 1846—1853 (АЗР). Т. 2. С. 76.

[61] КМФ-18, спр. 88, арк. 235 — 236 зв.

адсюль, але пачаў свой шлях у майстэрстве з Вільні ў 1662 г. Пасля таго як ён прайшоў вучнёўства і «адбыў службу таварыскую», у 1670 г. набыў статус віленскага грамадзяніна. Станіслаў даў пачатак віленскай дынастыі злотнікаў — Даніловічаў — і пакінуў пасля сябе вучняў. Сярод яго таварышаў таксама згадваюцца і землякі. Гэта сведчыць пра дух зямляцтва, якім ён карыстаўся пры падборы сабе памочнікаў. Памёр майстра ў 1706 г.



*Сургучны адбітак пячаткі горада Слоніма. Канец XVIII — пачатак XIX ст.*

Сярод злотнікаў другой паловы XVII ст., акрамя згаданага вышэй С. Даніловіча, фігуруюць яшчэ па меншай меры восем слонімцаў, і мы мяркуем, што гэты спіс не канчатковы. Да канца XVIII ст. намі выяўлены толькі два злотнікі, што, безумоўна, вельмі мала для такога места, як Слонім. Трэба адзначыць, што адзін з іх за злачынства быў прыгавораны ў 1707 г. да шыбеніцы.

У XIX ст. карціна рэзка мяняецца: у дакументальных крыніцах фігуруюць ажно дзесяць майстраў-злотнікаў. Такім чынам, даўняя традыцыя злотніцтва ў гэтым горадзе працягвалася. У самім Слоніме, паводле няпоўных статыстычных дадзеных, на працягу XIX ст. было звыш 20 рамеснікаў, занятых злотніцтвам і рэзаннем пячатак. Ва ўсялякім выпадку па лічбе ювеліраў Слонім знаходзіцца на першым месцы сярод тагачасных павятовых гарадоў Беларусі, саступаючы, бадай што, Беластоку.

## СЛУЦАК

Статус сталіцы княства абумовіў той факт, што места стала буйным рамесніцкім цэнтрам. У XVII ст. тут налічвалася значная колькасць рамесных цэхаў — праўда, злотніцкага сярод іх не згадваецца. Даследчык А. П. Грыцкевіч адзначае наяўнасць у Слуцку ў канцы XVI — першай палове XVII ст. цэха «золотых дел мастеров», а таксама піша і пра аб'яднанні рамеснікаў: «серебряников... ювелиров... гравёров»[62]. Аднак інфармацыя пра існаванне ў гэтым горадзе рамесных суполак такой накіраванасці не знайшла пацвярджэння праз нашы даследаванні. Адсутнасць злотніцка-срэбраніцкіх рамесных аб'яд-

[62] *Грицкевич А. П.* Частновладельческие города Белоруссии XVI—XVIII вв. Минск, 1975. С. 88.






*Медальён з вечкі куфля з партрэтам Багуслава, князя Радзівіла,*
*і адбітак яго пячаткі-пярсцёнка*

нанняў не выключае наяўнасці ў Слуцку значнай колькасці рамеснікаў-індывідуалаў.

Паколькі тут знаходзіўся багаты княжацкі двор, колькасць злотнікаў у Слуцку была ў параўнанні з большасцю тагачасных местаў даволі значнай. Дакладная інфармацыя пра майстраў гэтай прафесіі змешчана ў «Інвентарах…» гэтага места і ўсяго княства. Толькі ў XVIII ст. тут зафіксавана больш за два дзясяткі рамеснікаў-злотнікаў. Трэба адзначыць той факт, што некаторыя з іх былі прадстаўнікамі прафесійных дынастый, калі сыны асвойвалі бацькоўскую прафесію.

## ШКЛОЎ

Найбольш даўняй згадкай пра злотнікаў, што працавалі ў Шклове, з'яўляецца скарга 1579 г. тутэйшага злотніцкага майстры Цярэшкі Лукашэвіча на нейкага Г. Максімовіча за тое, што апошні не аддаў істцу яго талераў. Іншы — злотнік Васіль Грыгор'еў, ураджэнец Шклова, «жалаваны майстра» Маскоўскай срэбранай палаты, якога ў рускіх дакументах называлі «паляк-іншаземец», пражываў і працаваў у Маскве з 1660 па 1689 г.

Вядома, што ў XIX ст. не менш як шасцёра выхадцаў з гэтага места працавалі ў розных гарадах Беларусі — Віцебску, Магілёве, Менску і г.д.



# *ДАДАТАК 1*

# РЭЕСТР ЗЛОТНІКАЎ XII—XVIII стст. (I)

Прапанавы спіс злотнікаў XII—XVIII стст. дапаможа пераканаць як аматараў гісторыі, так і навукоўцаў у багацці гэтай галіны мастацкай культуры Беларусі. Безумоўна, ён не прэтэндуе на паўнату, і аўтар будзе ўдзячны за канструктыўныя заўвагі і дапаўненні.

У першай частцы спіса сабраны ўсе выяўленыя намі ў дакументальных крыніцах і нешматлікай айчыннай літаратуры па дадзенай тэме злотнікі хрысціянскага вызнання **(І. 1)**, якіх можна было поўнасцю «атрыбутаваць» у храналагічнай прасторы. У другую ўнесены тыя, у каго можна было ўдакладніць толькі прозвішча альбо імя **(І. 2)**. Трэцяя частка складаецца са злотнікаў іўдзейскага вызнання **(І. 3)**, таму што да канца XVIII ст., у адпаведнасці з блізкаўсходняй традыцыяй (якая існуе і сёння ў некаторых семіцкіх краінах), яны ў большасці не мелі прозвішчаў — ім станавілася імя бацькі. Сапраўдныя прозвішчы ў яўрэяў былі ўведзены, для зручнасці фіскальных органаў, пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі.

Выклікаюць сумненні і «прозвішчы» некаторай часткі беларускіх майстраў, што былі вывезены ў Маскву ў 50—60-я гг. XVII ст. і працавалі ў Аружэйнай палаце Маскоўскага Крамля, на той падставе, што ў тагачаснай Масковіі для дарослых людзей простага стану прозвішчам служыла імя бацькі. Такім чынам, у асоб, якія фігуруюць у спісах гэтых майстраў і спісах, апублікаваных В. І. Троіцкім, страчаныя былыя мяшчанскія прозвішчы часта былі заменены новаўтворанымі мянушкамі. Але яны былі ўключаны намі ў першую частку рэестра.

І. 1. 1. **АБРАХАМ** Матыяс, нарадзіўся ў Слуцку; у 1758 г. запісаны на 5 г. у вучні да віленскага злотніка І. К. Банка, які 17.09.1763 выпісаў яму падмайстроўскае пасведчанне (L—V, № 1.1)[1].

[1] Тут і далей спасылкі падаюцца ў скарочаным выглядзе. Больш падрабязна гл. Спіс скарачэнняў напрыканцы кнігі.

І. 1. 2. **АБРОСІМАЎ** Кірыла (Обросимов Кирилл), магчыма сын *Крыштафа Абросімава*, месца паходжання не высветлена, маскоўскі кармавы, майстра Срэбранай палаты; у 1671 г. атрымаў кармавыя грошы на выраб «саадаков» для польскіх паслоў (Троицкий, вып. 2, с. 87).

I. 1. 3. **АБРОСІМАЎ** Крыштаф (Обросимов Христофор), магчыма, бацька *Кірылы Абросімава*, месца паходжання не высветлена, «паляк», маскоўскі жалаваны майстра Срэбранай палаты; у 1660 г. атрымаў жалаванне ў 12 рублёў на год; у 1663 г. паводле палітычных меркаванняў адлучаны ад службы (Троицкий, вып. 2, с. 87—88).

I. 1. 4. **АДЫЦКІ** Якуб (Jakub Adycki), паходзіў з Мядзеля; у 1690 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 6 г. да віленскага злотніка К. Дзялтовіча (L—V, № 1.37).

I. 1. 5. **АЛАВЯШКА** Грыгорый, нарадзіўся ў Полацку; у 1672 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 2,5 г. да віленскага злотніка Л. Туркевіча, пасля заканчэння вучобы накіраваны ў Коўна; у 1697 г. у мясцовых магістрацкіх кнігах запісаны ковенскім злотнікам; 13.03.1690 падаў маёмасны іск на ковенскага купца, 01.09.1691 — на тамтэйшых дамініканцаў (L—V, № 1.873).

I. 1. 6. **АЛЕКСАНДРОВІЧ** Васіль (Александрович Василий), злотнік віленскі; у 1551 г. разам з *Фёдарам Александровічам* прад'явіў іск на 15 коп грошаў удаве цівуна і гараднічага Троцкага Марыне і яе сыну (КМФ-18, спр. 243, арк. 76 зв. — 77).

I. 1. 7. **АЛЕКСАНДРОВІЧ** Фёдар (Александрович Федор), злотнік віленскі; у 1551 г. разам з *В. Александровічам* прад'явіў іск на 15 коп грошаў удаве цівуна і гараднічага Троцкага Марыне і яе сыну (КМФ-18, спр. 243, арк. 76 зв. — 77).

I. 1. 8. **АЛЕКСАНДРОВІЧ** Фрыдрых (Frydrych Alexandrowicz), злотнік і бурмістр віленскі; у 1671 г. меў камяніцу каля Евангельскага збору (АВАК, т. 20, с. 418).

I. 1. 9. **АЛЕКСАНДРОВІЧ** Юрэй (Jerzy Alexandrowicz), злотнік віленскі; у 1671 г. меў падмайстра *Л. Хржаноўскага*; у 1675 г. «рочны» старшы цэха ў скарзе віленскіх краўцоў на злотнікаў (АВАК, т. 10, с. 415); у 1705 г. старшы цэха ў дадатковых артыкулах злотніцкага цэха (АВАК, т. 10, с. 61); меў каля 30 вучняў, сярод якіх былі: *М. Загальскі* (1680) і *М. Нядзведскі* (1694) (МЭ, с. 202; L—V, № 1.872).

I. 1. 10. **АЛЯКСЕЕЎ** Пашка, паходзіў з Дуброўны, маскоўскі срэбраных спраў майстра; у 1655 г. жыў разам з братам у Пушкарскай слабадзе; у 1676 г. пачалі будавацца ў Мяшчанскай слабадзе; у 1684 г. служыў у прыказе «Большыя казны», меў сына Алёшку (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 12, 42, 79; Абецедарский, с. 12).

I. 1. 11. **АМАЗІКОВІЧ** Іван (Омазикович), залатар менскі; «меў гасподу ў рынку»; у 1600 г. згадваецца ў скарзе Я. Лібаровіча, які спыніўся ў яго доме і, пасля набыцця ў Менску каштоўных рэчаў, быў «паграблены» шляхціцам Станіславам Драніцкім (НГАБ у Мінску, ф. 1724, воп. 1, спр. 1, арк. 489 зв.).

I. 1. 12. **АНДРЭЕВІЧ** Фяско (Андреевич Феско), злотнік магілёўскі; у 1641 г. рабіў «пакутне рамесло»; не ўпісаны ў цэх, таму што не адбыў вандроўку; судовым рашэннем вызвалены ад пакарання «для малости лет его» з папярэджаннем ад падобных учынкаў (ИЮМ, т. 9, с. 413—416).

I. 1. 13. **АНДРЭЕЎ** Іван (Андреев Иван, Иванка), месца паходжання не высветлена, маскоўскі срэбраных спраў майстра, працаваў у Срэбранай палаце; у 1659 г. атрымаў загад прыбыць у Маскву разам з вучнем *Амелькам* і май-

страм *Л. Казырскім*; у 1660 г. прыбыў у Маскву, прасіў дазволу на вяртанне, у красавіку — маі 1660 г. быццам бы атрымаў дазвол; у 1662 г. меў пастаянны «кармлівы аклад у 6 денег» штодзённа; у 1679 г. памёр (Абецедарский, таб. 5, № 6; Троицкий[2], вып. 1, с. 10, 60).

I. 1. 14. **АНДРЭЕЎ** Іван, «іншаземец, узяты з Полацака», маскоўскі срэбраных спраў майстра; у 1660—1669 гг. працаваў у Масковіі (Железнов, т. 3, с. 3, 32).

I. 1. 15. **АНДРЭЕЎ** Івашка, паходзіў з Дубровенскага пав.; узяты ў палон царскімі рэйтарамі і прададзены ў Маскве Навуму — «срэбранаму плавільшчыку», у якога пражыў 3 г. і атрымаў вольнасць; у 1674—1676 гг. жыў у Мяшчанскай слабадзе, меў траіх дзяцей (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 6).

I. 1. 16. **АНДРЭЕЎ** Мікула (Андреев Микула), месца паходжання не высветлена, «иноземец», жалаваны майстра каніцельнай справы; 07.06.1677 паступіў у Срэбраную палату вучнем да *Ф. Мікулаева*, атрымаў на кармленне 6 рублёў на год; у маі 1680 г. пераведзены з вучняў у майстры, меў уласную каніцельную майстэрню (Троицкий, вып. 1, с. 11).

I. 1. 17. **АНДРЭЕЎСКІ** Ян (Jan Andrzejwski), паходзіў з Менска; даследчыкі адзначаюць, што вучыўся ў Вільні; у 1664 г. запісаны на атэстацыю на тэрмін у 2 г. да віленскага майстры; 20.12.1664 прыняў віленскае грамадзянства, актыўна ўдзельнічаў у рэлігійных сутычках на баку каталікоў; у 1665 г. атрымаў дазвол ад віленскіх улад працаваць самастойна злотніцкім майстрам; меў вучняў: *П. Дубіцкага* (1665), *А. Дабраборскага* (1669; Łopaciński, № 214, 228, 241, 296; L—V, № 1.22).

I. 1. 18. **АНІСКЕВІЧ** Лаўрэн (Wawrynec), у 1742 г. полацкі мешчанін, злотнік; меў жонку Мар'яну (Mariana), разам з якой купіў дамок з «грунтам пад ім» на вул. Ільінскай, «ідучы з места за паркан па правай старане», у полацкіх злотнікаў — мужа і жонкі *Лукашэвічаў*. Гэты продаж зафіксаваны ў актавых кнігах «места Яго Каралеўскае Міласці Полацка» (НГАБ у Мінску, ф. 1823, воп. 1, спр. 27, арк. 111—112).

I. 1. 19. **АПАНАСОВІЧ** Мікіта (Микита Опанасович), вучань залатарскі магілёўскі; згадваецца ў 1579 г. у скарзе залатара *У. Багдановіча*, што хлопец, не даслужыўшы ўмоўленага тэрміну, «начинья [прылады] ремесла золотарского и серебро... што на руках своих мел, того всего не давши», уцёк 29 чэрвеня (АВАК, т. 39, с. 275).

I. 1. 20. **АПАНОВІЧ** Мацей (Masej Aronowicz), сын Тэадора, нарадзіўся ў Навагародку; у 1676 г. запісаны ў вучні да віленскага злотніка *Я. Рагацэвіча*, пасля заканчэння вучобы запісаны ў падмайстры (L—V, № 1.29).

I. 1. 21. **АРЛОЎ** Ларыён (Орлов Ларион), паходзіў з Віцебска, вучань у Срэбранай палаце; у 1660 г. фігуруе ў спісе майстраў і вучняў «поляков» з Полацка, «Виленска» і Віцебска (Троицкий, вып. 2, с. 91).

I. 1. 22. **АСТАФЕНКА** Мікалай (Mikolaj Astafęka), нарадзіўся ў Полацку; у 1730 г. запісаны ў вучні на тэрмін 6 г.

---

[2] Троіцкі называе двух Андрэевых Іванаў, але мы мяркуем, што гэта адна і тая ж асоба.



*Адбітак пячаткі пінскіх францысканцаў з датай «1396», зафіксаваны на дакуменце 1839 г. (павялічаны)*

да віленскага злотніка *Г. Снітке* (L—V, № 1.34).

I. 1. 23. **АСТАФ'ЕЎ** Сцяпан (Остафьев Степан), паходзіў з Полацка, срэбраных спраў майстра; у 1660 г. працаваў у Маскоўскай срэбранай палаце, меў жалаванне 10 рублёў на год і двух вучняў: адзін з іх — пляменнік *Іван*, а другі — Антон (Троицкий, вып. 1, с. 12; Абецедарский, таб. 5, № 121).

I. 1. 24. **АТРАШКОВІЧ** Іван (Отрошкович Иван), злотнік і мешчанін магілёўскі; у 1629 г. адзін з ініцыятараў прашэння аб стварэнні цэха (ИЮМ, т. 8, с. 495); у 1636 г. жыў на 2-м паверсе дома, дзе была карчма «Гдаля шыкара», у тым жа годзе абвінавачаны ў смяротным зраненні Мацюшкі Багдановіча, узяты на парукі і пасля «ўчынення прысягі» звольнены ад падазрэнняў (ИЮМ, т. 8, с. 522—530); у 1641 г. цэхмістр, выступаў са скаргай на партачоў, якія пярэчылі, што ён таксама «вандроўку не справовал» і таму не можа быць майстрам (ИЮМ, т. 9, с. 412—415); у 1643 г. выступаў адказчыкам па абвінавачванні ксяндзом Янам Змальскім магілёўскіх рамеснікаў у невыкананні імі воскавай павіннасці на карысць Фарнага касцёла (КМФ-18, спр. 320, арк. 743—744 зв.); у 1646 г. цэхмістр выступаў са скаргай на меднікаў і алавянічнікаў, што далучыліся да цэха, але статут не выконваюць (ИЮМ, т. 9, с. 512).

I. 1. 25. **БАБУТЫ** Караль (Karol Babuty), злотнік нясвіжскі; у 1722—1776 гг. працаваў пры двары князёў Радзівілаў (L—V, № 1.44).

I. 1. 26. **БАГАНОЎСКІ** Сымон (Symon Baganowski), нарадзіўся ў Навадворскай парафіі Навагародскага ваяв.; 30.07.1724 запісаны ў вучні на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка *Г. Б. Крыжаноўскага* (L—V, № 1. 45).

I. 1. 27. **БАГАРЭВІЧ** Ян (Jan Bohorewicz), злотнік віленскі; у 1671 г. меў камяніцу насупраць Уваскрасенскай царквы, «у рыбным канцы», недалёка ад вул. Шкляной (АЗР, т. 2, с. 208).

I. 1. 28. **БАГДАНОВІЧ** Улас (Богданович Улас), залатар і мешчанін магілёўскі; у чэрвені 1577 г. абвінавачваўся ў тым, што «напил» на 50 грошаў у шынкаркі Аўдоцці, а грошай аддаваць не хоча (ИЮМ, т. 30, отд. 3, с. 97); у ліпені 1577 г. скардзіўся на *К. Яцковіча*, што той назваў яго «фальшарам», а ён «чловек добре оселый» (тамсама, с. 108—110); у снежні 1578 г. шляхціц Ф. Бяляўскі запісаў у кнізе магістрата, што залатар «добре учинил и заплатил» пазыку і «становіцца вольным ад доўгу» (АВАК, т. 39, с. 147—148); у маі запісаў свой дом у Магілёве на вул. Княжыцкай, «идучы к рынку по правой стороне», мешчаніну В. Прудніку за даўгі (ИЮМ, т. 32, с. 161—162); у жніўні на яго скардзіўся мешчанін П. Васілевіч за тое, што злотнік напіў капу грошаў, а аддаваць не хоча (АВАК, т. 39, с. 51); у верасні скардзіўся на таго ж мешчаніна, за якога ўнёс залог за вызваленне з вязніцы ў 11 коп грошаў, а той не жадае вярнуць іх яму (АВАК, т. 39, с. 63—64); у 1579 г. заяўляе ў магістрат, што яго вучань *М. Апанасовіч*, «не дослужывшы року омовёного», уцёк (АВАК, т. 39, с. 275); у 1580 г. млынар В. Ескавіч запісаў у магістрацкай кнізе, што на доўг у 15 коп злотнік «досыть учынил и заплатил готовыми грошыма» (АВАК, т. 39, с. 538).

I. 1. 29. **БАГДАНОВІЧ** Юры (Jerzy Bohdanowicz), злотнік і мешчанін магілёўскі; згадваецца ў 1629 г. у пастанове на стварэнне цэха (ИЮМ, т. 8, с. 426).

I. 1. 30. **БАЛЬЦЭРОВІЧ** Людвік (Бальцерович Людвик, Ледвик), бацька *М. Бальцэровіча*, злотнік і мешчанін менскі; у 1600 г. падаў скаргу на «залатарчыка» *Ю. Геса* ў Менскі гарадскі суд за абразу Людвікавай жонкі (НГАБ у Мінску, ф. 1727, воп. 1, спр. 1, арк. 309—310); набыў разам з жонкай Раінай палову дома «пад прысудам замкавым — дзве светліцы і піўніца» ў аптэкара Марціна Чаховіча за 30 коп грошаў літоўскіх (тамсама, арк. 1340); у 1626 г. атрымаў у заставу (залог) «жупан... фалендышовай козацкой, у того жупану гузиков срэбных двадцать семь» (СДМнГ, с. 152).



*Адбітак пячаткі Менскага Свята-Петрапаўлаўскага манастыра. 1698—1699 гг.*

I. 1. 31. **БАЛЬЦЭРОВІЧ** Мацяш (Matyasz Balcerowicz), сын *Л. Бальцэровіча*, злотнік менскі; у 1634 г. згадваецца як радца і мешчанін менскі, які прадаў свой будынак на вул. Савіцкай над р. Свіслаччу за 2 тыс. злотых (БА, т. 3, с. 136); фігуруе ў каралеўскім дэкрэце асэсарскага суда па абвінавачанні яго, М. Бальцэровіча, менскім шляхціцам Еўдакімам Вітальдам, які не хацеў плаціць грошы за выкананую злотнікам новую «форму» (шаты) са срэбра, золата і камянёў, замест старой — меднай, у «папсаванні» і знявазе «абраза Прэчыстай Багародзіцы». Пастаноўлена: аддаць майстру «слушную плату і поўнае шкод узнагароджанне», кантроль за выкананнем пастановы ўскласці на Менскі ўрад (КМФ-18, спр. 312, арк. 99 зв. — 100 зв.); у 1635 г. згадваецца як радца ў прэамбуле да прывілея на цэх цырульнікаў (БА, т. 3, с. 149); 29.07.1645 атрымаў прывілей на права вольнага гандлю ў Кароне і ВКЛ, за «ўмеетнасць» прыняты ў лік каралеўскіх слуг, тут жа названы «райцам» (БА, т. 3, с. 166—167); у 1646 г. скардзіцца на бурмістра Філіпа Зэмбінскага за тое, што той «учыніл похвалку на здороуе» яго і інш. (КМФ-18, спр. 330, арк. 1 зв., 73 — 174 зв.), абвінавачвае ў каралеўскім асэсарскім судзе менскага ландвойта С. Супруновіча ў тым, што «на ратушу публічне райцу словамі надто брыдкімі ўроджэння яго датычлівымі ілжыў і сароміў» (КМФ-18, спр. 334, арк. 45 зв.), названы «райцам Аўсбурскай канфесіі» (КМФ-18, спр. 334, арк. 96 зв.); у 1647 г. абвінавачваецца сваімі калегамі па магістраце, што без іх ведама «на свой прыбытак абрацаў даходы мескія» (КМФ-18, спр. 330, арк. 262 зв. — 264 зв.); у 1649 г. выступае

з іскам супраць менскага войта Тэадора Друцкага-Горскага і ўсяго магістрата ў справе па адхіленні яго ад выканання абавязкаў радцы, адпаведна каралеўскаму дэкрэту ўзноўлены ў сваіх правах (КМФ-18, спр. 342, арк. 79 зв. — 83 зв.); у 1653 г. бурмістр менскі разам з братам Лукашам фігуруе ў справе аб правах на спадчыну пасля Жыкмунта Фелера супраць зводнага брата віленскага купца Крыштафа Горна (КМФ-18, с. 342, арк. 508 — 509 зв.); у 1655 г. упамінаецца як адзін з «екзекутараў» па выкананні «тэстамента Багушэвіча» па адкрыцці шпіталя для бедных пры Койданаўскай браме ў Менску (БА, т. 3, с. 18); у 1658 г. бурмістр вяртаецца з Краляўца ў Менск з сям'ёй пасля ўцёкаў ад Маскоўскай акупацыі (БА, т. 3, с. 211); у 1669 г. менскі бурмістр (КМФ-18, спр. 375, арк. 5 зв.); у 1671 г. згадваецца як радца менскі і старшы злотніцкага цэха ў лісце караля Міхала ў сувязі са скаргай менскіх злотнікаў на віленскіх, тут жа названы Mathias Ludovicus Balcerowicz (АВАК, т. 10, ч. 2, с. 380).

I. 1. 32. **БАНЕВІЧ** Тамаш, паходзіў з Радуні Лідскага пав.; у 1692 г. запісаны вучнем да віленскага майстры *М. Жэгалінскага* на тэрмін у 6 г., адукацыі не атрымаў (МЭ, с. 204).

I. 1. 33. **БАРКОЎСКАЯ** Ядвіга (Jadwiga Borkowska), злотнічка гарадзенская; 10.09.1628 запісана ў кнігу сяброў стралецкага брацтва Св. Антонія пры гарадзенскай Фары (Łopaciński, № 131).

I. 1. 34. **БАРТАШЭВІЧ** Ян (Jan Bartoszewicz), злотнік неаселы; 01.10.1652 абвінавачваецца ўдавой К. Гелебрантавай і мастаком С. Ясінскім у забойстве 20.09.1652 жыровіцкага войта Я. Гелебранта ў Жыровіцах на вул. Шыдлоўскай (НГАБ у Мінску, ф. 1737, воп. 1, спр. 24, арк. 706—707).

I. 1. 35. **БАРЧЫНСКІ** Юзэф (Jozeph Barczynski), злотнік віленскі; у 1675 г. удзельнічаў у бойцы злотнікаў з краўцамі (АВАК, т. 10, с. 415); у 1677 г. разам са сваім падмайстрам *Прыстэрам* абвінавачваецца калегамі ў парушэнні статута (АВАК, т. 10, с. 418); у 1684 г. меў вучня *К. Жывецкага* і падмайстра *А. Туркевіча*; у 1705 г. згадваецца як старшы цэха (АВАК, т. 10, с. 61).

I. 1. 36. **БАРЫСОВІЧ** Андрэй (Andrzey Borysowicz), нарадзіўся ў Гародні; у 1697 г. запісаны вучнем да віленскага злотніцкага майстры *Я. Рагацэвіча* (L—V, № 1.113).

I. 1. 37. **БЕМ** Іоў (Job Beem, Jop), злотнік і мешчанін віленскі; фігуруе ў 1645—1650 гг. у іску да яго з боку Матыса Аўлашэўскага (КМФ-18, спр. 342, арк. 1 зв., 38 зв.); у 1658 г. згадваецца як нябожчык і былы ўладальнік камяніцы на вул. Шкляной (КМФ-18, спр. 130, арк. 438 зв. — 439).

I. 1. 38. **БЕРГЕЛЬ** Аўгусцін (Augustin Bergel), злотнік берасцейскі; у 1585 г. згадваецца ў судовым працэсе з іншым злотнікам, *П. Туровічам* (КМФ-18, спр. 276, арк. 20 — 20 зв.).

I. 1. 39. **БЕСЯКІРСКІ** Піліп (Бесекирский Филипп), паходзіў са Смаленска, жалаваны майстра Срэбранай палаты чарнёнай срэбранай справы; у студзені 1681 г. выкліканы ў Маскву, дзе атрымаў жалаванне 10 рублёў на год (Троицкий, вып. 1, с. 20).

I. 1. 40. **БОГША** Лазар, залатар полацкі; у 1161 г. стварыў крыж для беларускай праваслаўнай святой — князёўны

Еўфрасінні Полацкай[3], які знік з сейфа Магілёўскага абкама ВКП(б) у 1941 г. (бібліяграфію па тэме гл.: Высоцкая, с. 227—228).

I. 1. 41. **БОТЭ** Ян Готліб Фрыдэрык (Bothe [Botta] Jan Gotlieb [Theofil] Fryderyk), дрэздэнскі надворны злотнік; 13.03.1771 пісаў князям Радзівілам пра тое, што ні ён, ні яго родзічы не атрымлівалі ніякага ўзнагароджання; 05.06.1778 выставіў ім рахунак за выкананую работу на 80 злотых, 07.02.1782 — на 108 дукатаў, 15.10.1784 — рахунак на 408 дукатаў і 17 фларынаў, складзены ў Нясвіжы, 13.06.1785 — рахунак на 325 дукатаў, складзены там жа; 21.06.1785 напісаў распіску ў летняй рэзідэнцыі Альбе на імя Гераніма Вінцэнта, князя Радзівіла, аб сваім адмаўленні ад усіх фінансавых прэтэнзій да княжацкага скарба (AGAD, AR, dz. XXI, b — 155, s. 11, 14, 22, 24, 26).

I. 1. 42. **БРАНЕВІЧ** Міхась, паходзіў з Радуні Лідскага пав. (у МЭ — Ашмянскага); у 1696 г. запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага майстры *В. Дольфуса* (МЭ, с. 204).

I. 1. 43. **БРАТАШЭВІЧ** Сцяпан (Stefan Brateszewicz), нарадзіўся ў Навагародку; у 1684 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 6 г. да віленскага злотніка М. Грэйтэра (L—V, № 1.119).

I. 1. 44. **БРЭЙ** Ганус Юры (Hanus Jergi Brey), злотнік віленскі; згадваецца ў 1634 г. у іску да спадкаемцаў *Я. Магрэ*, у 1636 г. — у іску да ўдавы Катарыны Магрэ (КМФ-18, спр. 312, арк. 63 зв.).

I. 1. 45. **БРЭЙТШНЭЙДЭР** Міхал (Брейтшнейдер Михал, Michal Breytsneyder), злотнік і мешчанін віленскі; 12.08.1612 набыў у пісара ВКЛ Яўстафія Валовіча камяніцу на вул. Свята-Духавай — насупраць касцёла Св. Тройцы каля дома цівуна троцкага Барташа Стравінскага з аднаго боку, а з другога — катляра Грыгора Станіслававіча (КМФ-18, спр. 292, арк. 426); у 1630 г. фігуруе як уладальнік той жа камяніцы (тамсама, спр. 306, арк. 1 зв., 30 зв. — 131).

I. 1. 46. **БРЭТЛЕР** Эразмус, віленскі злотнік, згадваецца ў 1541 г. (Бершадскій, с. 282).

I. 1. 47. **БРЭЧНАЙДЭР** Якуб, злотнік віленскі; згадваецца ў 1541 г. (Бершадскій, с. 282).

I. 1. 48. **БУЙНІЦКІ** Ян, паходзіў з Ашмян; у 1668 г. запісаны да віленскага май-

---

[3] З гэтай нашай святой звязана страта рэчавых помнікаў — не толькі крыжа, але і ра́кі, дзе захоўваліся яе мошчы з 1910 г. Як сведчаць дакументальныя крыніцы, рака была зроблена ў тым жа годзе на добраахвотныя ахвяраванні праваслаўных вернікаў Беларусі. Агульная сума затрачаных грошай — 12 000 руб. (у коштах 1910 г.). Рака была выканана з кіпарысавага дрэва і аздоблена срэбрам. На ўпрыгожанне пайшло 8 пудоў срэбра (128 кг) 84-й пробы. Вырабіў раку маскоўскі фабрыкант Мяшкоў адпаведна з праектам і дэтальнымі чарцяжамі мастака П. А. Зыкава. Кожны бок ракі быў упрыгожаны барэльефам: адзін бок прадстаўляў сцэну пераносу мошчаў з Іерусаліма ў Кіеў (быў яшчэ на старадаўняй труне Е. Полацкай), другі (адваротны) — барэльеф паводле эскіза П. А. Зыкава, на якім адлюстраваны момант закладкі Е. Полацкай Спаскай царквы. На кароткай сценцы ля галавы — выява славутага крыжа, ля ног — панарама Полацка ў старадаўнія часы. На версе замацаваны абраз у старажытным грэчаскім стылі, што быў напісаны пецярбургскім мастаком Ягоравым. Шаты на персях у Еўфрасінні ў выглядзе крыжа Л. Богшы зроблены са срэбра (Довгяло Д. И. Перенесение св. мощей препод. Евфросинии из Киева в Полоцк. Вильна, 1910). Рака была адноўлена ў 2007 г.

стры *М. Фроса* вучнем на тэрмін у 7 г., адукацыі не меў (МЭ, с. 206).

І. 1. 49. **БУНЕВІЧ** Мікалай (Mikolaj Bunewich), злотніцкі цэхмістр, мешчанін пінскі; згадваецца ў 1639—1640 гг. у прывілеі на стварэнне аб'яднанага злотніцка-кавальска-катлярска-мечніцкага цэха (СДГМнГ, с. 221—223).

І. 1. 50. **БУРНАЦКІ** Якуб (Jakub Burnacki), паходзіў з Кобрына; у 1676 г. запісаны вучнем на тэрмін у 5 г. да віленскага майстры *Станіслава Даніловіча*, пасля заканчэння вучобы запісаны падмайстрам (МЭ, с. 203; L—V, № 1.143).

І. 1. 51. **БУРХАРД** Міхал (Michael Burhard), старшы цэха юбілераў і злотнікаў віленскіх у 1775 г.; згадваецца ў дэкрэце 1793 г. па справе цэхаў з віленскімі яўрэямі аб парушэнні апошнімі правілаў гандлю (АВАК, т. 29, с. 488).

**БЫК**, гл. **ВЫШЫНСКІ**

І. 1. 52. **БЯЛЕВІЧ** Міхал (Белевич Михаил), паходзіў з Віцебска, названы ў маскоўскіх дакументах «иноземец», срэбраных спраў майстра; у 1664 г. працаваў у Маскоўскім казённым прыказе: «учил по меди серебрить всякие медные дела», навучыў таксама «водку крэпкую составлять из травы ведошы», за што быў узнагароджаны (Троицкий, вып. 1, с. 18; Абецедарский, таб. 5, № 13).

І. 1. 53. **ВАЙЦІЦКІ** Язэп (Jozef Wojcicki), паходзіў са Слоніма; у 1677 г. запісаны да віленскага майстры *Станіслава Даніловіча* вучнем на тэрмін у 6 г., пасля заканчэння вучобы запісаны ў падмайстры (МЭ, с. 203; L—V, № 1.1272).

І. 1. 54. **ВАСІЛЬЕЎ** Ганка, месца паходжання не высветлена, маскоўскі срэбраных спраў майстра; у 1676 г. жыў у Мяшчанскай слабадзе (Материалы… купечества, т. 1, прил. 2, с. 12, 42; Абецедарский, с. 57).

І. 1. 55. **ВАСІЛЬЕЎ** Мацюшка (Мацвей), паходзіў з Барысава («барысавец»); вывезены ў Маскву «служылымі людзямі і прададзены А. Львову», праз 12 г. атрымаў волю; у 1673 г. жыве ў Мяшчанскай слабадзе ў Маскве; у 1676 г. прамышляе срэбраніцкім майстэрствам, мае сына Івашку; у 1684 г. плаціць цягла 2 грыўны (Материалы… купечества, т. 1, прил. 2, с. 58, 108).

І. 1. 56. **ВАСІЛЬЕЎ** Павел, месца паходжання не высветлена, маскоўскі срэбраных спраў майстра; жыў у Мяшчанскай слабадзе (Материалы… купечества, т. 1, прил. 2, с. 171).

І. 1. 57. **ВЕНГРЫН** Мікалай (Nicolaum Wengrzyn, Ungaro), злотнік і мешчанін віленскі; згадваецца ў 1579 г. у іску Дароты і Георгія Дрынчавічоў на суму ў 675 фларынаў (КМФ-18, спр. 273, арк. 1 зв., 99 зв., 200 зв.; тамсама, спр. 276, арк. 88 — 88 зв.); фігуруе ў 1584 г. у справе паміж злотнікамі і віленскім біскупам (тамсама, спр. 276, арк. 52 зв. — 54).

І. 1. 58. **ВІБЕР** Эрнэст (Ernest Weber), злотнік і мешчанін віленскі; 14.06.1757 атрымаў узнагароджанне ў памеры 22 талераў за работу на князёў Радзівілаў (AGAD, AR, dz. XXI, w — 61); у 1766 г. старшы цэха, згадваецца ў супольнай скарзе цэхаў на Віленскі магістрат (АВАК, т. 10, с. 525—527).

І. 1. 59. **ВІДЗІЕВІЧ** Ян (Jan Widziewicz), паходзіў з Ліпнішак; у 1717 г. запісаны вучнем на тэрмін у 5 г. да віленскага майстры-злотніка *В. Траянскага* (МЭ, с. 206), пасля заканчэння вучобы запісаны падмайстрам, ахвяраваў на цэхавую капліцу срэбраную пласціну (L—V, № 1.1250).

I. 1. 60. **ВІЛАТЭ** Лорэнс (Willate; Willatesteyn; Wilans Lorens), злотнік віленскі; у 1677 г. згадваецца як «рочны» старшы цэха ў скарзе цэха на злотніка *Ю. Барчынскага* (АВАК, т. 10, с. 417—419); у 1687 г. упамінаецца як старшы цэха ў дадатковых артыкулах магістрата да цэхавага статута (АВАК, т. 10, с. 95); у 1691 г. адзначаецца, што меў калісьці вучня Яна Вольсана, які стаў злотнікам у Любліне (БА, т. 3, с. 254); у 1705 г. старшы цэха, паводле дадатковых артыкулаў караля Аўгуста II да цэхавага статута віленскіх злотнікаў (АВАК, т. 10, с. 61); меў вучня *М. Нядзведскага* (1688).

I. 1. 61. **ВІЛЬГЕМОВІЧ** Міхаіл (Michael Wilhemowicz), унук Сымона Вільгельма, сын *М. С. Вільгемовіча,* паходзіў з Навагародка; у 1671 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 5 г. да віленскага злотніка П. Жэглінскага, пасля заканчэння вучобы запісаны падмайстрам (L—V, № 1.1257).

I. 1. 62. **ВІЛЬГЕМОВІЧ** Міхал Сямён (Michael Semein Wilhemowicz), сын Сымона Вільгельма і бацька *М. Вільгемовіча*, злотнік і бурмістр навагародскі; у 1636 г. згадваецца ў прывілеі на цэх (КМФ-18, спр. 111, арк. 616); у 1644 г. упамінаецца як нябожчык у грашовым іску да спадкаемцаў (КМФ-18, спр. 320, арк. 553—555).

I. 1. 63. **ВІЛЬКОЎСКІ** Якуб (Вильковский Якуб), злотнік каралеўскі; у 1607 г. згадваецца ў наданні яму ва ўтрыманне 3-х валокаў зямлі ў «сяле Трэйботах» у «дзяржаве Волкініцкой» Троцкага пав. каралём Жыгімонтам III Вазай (КМФ-18, спр. 289, арк. 338).

I. 1. 64. **ВІЛЬЧКАЎ** Себасцьян (Sebestyian Wilczkow), злотнік берасцейскі; памёр каля 1665 г.; згадваецца ў «квіце», які ўнесла 25 мая таго ж года ў берасцейскі гродскі суд яго жонка, «блізкая памочніца Марыяна», на «жыда берасцейскага» Якуба Ельяшэвіча Копыля, які прысвоіў сабе частку рухомасці нябожчыка (НГАБ у Мінску, ф. 1705, воп. 1, спр. 13, арк. 1 зв., 86 — 186 зв.).

I. 1. 65. **ВІТ** Дзітрых (Dytrych Witt), злотнік віленскі; у 1671—1682 гг. — уладальнік камяніцы каля царквы Св. Іллі (АВАК, т. 9, с. 225; тамсама, т. 20, с. 431, 462); згадваецца таксама ў 1674—1685 гг. (ОУМ, т. 2, с. 336, 337—338, 363, 415); меў вучня *Ю. Галінскага* ў 1668 г.

I. 1. 66. **ВІТЭМБЕРГ** Мікалай (Mikolaj Wittemberg), злотнік і мешчанін нясвіжскі; 02.09.1616 прадаў палову пляца «ў нясвіжскім рынку» за 80 коп грошаў літоўскіх злотніку *П. Матысану* (AGAD, AR, dz. XV, t. 5, s. 1).



*Адбітак земскай пячаткі Навагародскага пав. XVII ст.*

I. 1. 67. **ВОСІПАЎ** Якаў (Осипов Яков), «іншаземец», вучань у Залатой палаце Маскоўскага Крамля; у 1655 г. скардзіцца ў сваёй чалабітнай аб непрымальных умовах жыцця, піша, што служыць у палаце 5 г. (Троицкий, вып. 2, с. 91).

I. 1. 68. **ВОЎЧЫК** Афанасі, злотнік і мешчанін магілёўскі; у 50—70-я гг. XVIII ст. з'яўляецца выканаўцам шатаў для абразоў у магілёўскіх цэрквах, у тым ліку шатаў да абраза Збавіцеля ў 1749 г. у «малой мураванай царкве» (Дембовецкий, кн. 2, с. 20).

I. 1. 69. **ВОЎЧЫК** Габрыэль [Гаўрыла Афанасьеў], сын злотніка магілёўскага; 19.02.1770 запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка Я. К. Банка (L—V, № 1.1274).

I. 1. 70. **ВЫШЫНСКІ (БЫК)** Андрэй (Андрей Вышынский Бык), злотнік віленскі; у 1600 г. абвінавачваецца разам са сваёй жонкай Ганнай Казлоўскай у схіленні кравецкай служэбніцы Кацярыны да прастытуцыі (АВАК, т. 20, с. 162).

I. 1. 71. **ГАБЯТА** Ян (Jan Gobiata), паходзіць з Навагародка; у 1674 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 2 г. да віленскага злотніка М. Грэйтэра (L—V, № 1.326).

I. 1. 72. **ГАЙДЭРЭР** Крыштаф (Heiderer Krzysztof), паходзіў з Менска; у 1690 г. запісаны вучнем на тэрмін у 4,5 г. да віленскага злотніка *Д. Плята* (L—V, № 1.382).

I. 1. 73. **ГАЛІНСКІ** Матыяс (Mathias Golinski), паходзіў з Міра; у 1668 г. запісаны вучнем на тэрмін у 3 г. да віленскага злотніка *М. Грэйтэра,* у 1674 г. — на тэрмін у 2 г. на атэстацыю на званне майстры да таго ж злотніка; у 1676 г. атрымаў званне майстры, прыняў віленскае падданства і быў узяты ў віленскі злотніцкі цэх, ажаніўся з Крысцінай Рабой; у 1681 г. праводзіў майстроўскую атэстацыю А. Шостаку (L—V, № 1.330).

I. 1. 74. **ГАЛІНСКІ** Юрэй (Jerzy Golinski), паходзіў з Міра; у 1668 г. запісаны вучнем на тэрмін у 7 г. да віленскага злотніка *Д. Віта*; памёр у 1672 г. (L—V, № 1.329).

I. 1. 75. **ГАЛЬКЕВІЧ** Адам (Adam Halkewicz), паходзіў са Мсцібава; у 1686 г. запісаны вучнем на тэрмін у 2 г. да віленскага злотніка *Я. Александровіча*, па заканчэнні вучобы — падмайстрам (МЭ, с. 202; L—V, № 1.366).

I. 1. 76. **ГАЛЬШАВЕР** Ян (Jan Halszewer), паходзіў з Навагародка; у 1680 г. запісаны ў вучні да віленскага злотніка *Я. Рагацэвіча* (L—V, № 1. 367).

I. 1. 77. **ГАН** Гонест Ганусум (Honest Hannussum Han), злотнік і юбілер (factor corund) віленскі; у 1635 г. выступае з іскам супраць віленскага лаўніка Ф. Більдзюкевіча (КМФ-18, спр. 312, арк. 1 зв., 21 зв.).

I. 1. 78. **ГАНОРСКІ** Антон (Antoni Honorski), злотнік (jubiler) віленскі; у 1747 г. да яго ў вучні запісаны *Ю. Сапежка*; у 1755 г. А. Ганорскі згадваецца ў якасці таксатара (ацэншчыка) каштоўнасцей, што засталіся пасля смерці «рускага» купца г. Кацельніцкага (АВАК, т. 13, с. 381).

I. 1. 79. **ГАНЦЭВІЧ** Тэадор, паходзіў з Любчы; у 1699 г. запісаны вучнем на тэрмін у 5 г. да віленскага майстры *М. Жэгалінскага,* пасля заканчэння вучобы запісаны падмайстрам (МЭ, с. 204; L—V, № 1.371).

I. 1. 80. **ГАРДЗІЕЎСКІ** Станіслаў (Stanislaw Gordiewski), злотнік пастаўскі; згадваецца ў 1740 г. (L—V, № 1.335).



*Пячатка Церабяжоўскай царквы Св. Прарока Іллі (павялічана)*

I. 1. 81. **ГАРТМАН** Якоб, паходзіў са Слуцка; у 1736 г. запісаны на тэрмін у 8,5 г. вучнем да віленскага злотніка *А. Эерлі* (L—V, № 1.375).

I. 1. 82. **ГАРУСОВІЧ** Тэадор (Theador Harusowicz), паходзіў з Навагародка; у 1667 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 6 г. да віленскага злотніка К. Дзялтовіча (L—V, № 1.376).

I. 1. 83. **ГАСЦІЛОВІЧ** Міхал (Michal Hoscilowicz), паходзіў з Менска; у 1729 г. запісаны вучнем на тэрмін у 6 г. да віленскага злотніка М. Крысціяна; 30.07.1729 абакраў свайго майстру, далейшы лёс невядомы (Łopaciński, № 671, 675; L—V, № 1.423).

I. 1. 84. **ГАЎРЫЛАЎ** Сяргей (Гаврилов Сергей), паходзіў з Дуброўны Аршанскага пав.; у 1660 г. вучань (у свайго дзядзькі *І. Красільнікава*) срэбранай справы ў Маскоўскай срэбранай палаце; у 1663 г. разам з дзядзькам даў падпіску аб нявыездзе з Масквы (Троицкий, вып. 1, с. 27; Абецедарский, таб. 5, № 23).



*Адбітак пячаткі каптуровага суда Пінскага пав. 1733 г.*

I. 1. 85. **ГАЎСІУС** Аляксандр (Аляксандар (Wawrynec) Hausius), таварыш берасцейскага злотніцкага цэха і майстры *М. Гранастайскага*; у 1624 г. згадваецца па справе апошняга, нанёс майстру шкоду ў 3 тыс. коп грошаў літоўскіх (КМФ-18, спр. 305, арк. 1 зв., 4 зв. — 15).

I. 1. 86. **ГЕЕР** Ёган Крыштаф (Jahan Cristop Gejer), злотнік нясвіжскі; у 1739 г. працаваў пры нясвіжскім двары князёў Радзівілаў (L—V, № 1.301).

I. 1. 87. **ГЕНЗЕР** Стэфан (Stephan Gienzer), злотнік віленскі; у 1584 г. згадваецца ў справе паміж злотнікамі і віленскім біскупам (КМФ-18, спр. 276, арк. 52 зв. —54).

I. 1. 88. **ГЕС** Юры (Гес Юрей), «залатарчык» менскі, «таварыш *Station Станіславаў*»; згадваецца ў 1600 г. у скарзе *Л. Бальцэровіча*, што «наполнивше ся воли, зле своее... словыми неучтивыми... соромотил» Раіну, яго жонку (НГАБ у Мінску, ф. 1727, воп. 1, спр. 1, арк. 309—310); магчыма, тая ж асоба, што і Е. Эс.

I. 1. 89. **ГІРШОВІЧ** Левін (Lewin Girszowicz), злотнік нясвіжскі; у 1757 г. працаваў пры нясвіжскім двары князёў Радзівілаў (L—V, № 1.404).

I. 1. 90. **ГЛАЗЕР** Піліп (Philip Glazer), злотнік віленскі; згадваецца ў 1584 г. у справе паміж злотнікамі і віленскім біскупам (КМФ-18, спр. 276, арк. 52 зв. — 54) і ў 1586 г. у іску віленскага абывацеля Я. Лемпінскага (КМФ-18, спр. 280, арк. 70 — 71 зв., 74 — 75 зв.).

I. 1. 91. **ГОРВАТ** Ян (Jan Horwat), менскі злотнік; у 1634 г. згадваецца ў канфірмацыйным прывілеі злотніцкага цэха (БА, т. 3, с. 144).

I. 1. 92. **ГОРН** Андрэй Ежы (Andrzej Erzy de Horn), фактор (вытворца); упамінаецца ў 1663 г. у «дыпломе» Віленскага біскупа Юрыя Белазора аб дазваленні яму выбіваць на віленскай мінцы «орты, шэлягі, патройныя і пултаракі, і грошы так, яко до того в Короне Польской біто» (КМФ-18, спр. 132, арк. 173 зв. — 178).

I. 1. 93. **ГОТФРЫД** Габрыэль (Gabryel Gotfrid), злотнік і мешчанін віленскі; у 1774 г. згадваецца ў дадатковых артыкулах парадку цэхавага як старшы цэха (АВАК, т. 10, с. 61).

I. 1. 94. **ГРАКОВІЧ** Самуэль, злотнік слуцкі; згадваецца ў 1687 г. у квітацыйным лісце на імя пана *Станіслава Бавойны* аб адсутнасці да апошняга прэтэнзій за «зраненне» С. Граковіча ў доме слуцкага яўрэя-злотніка *Міхеля* (НГАБ у Мінску, ф. 694, воп. 4, спр. 1231, арк. 38 зв.).

I. 1. 95. **ГРАКОВІЧ** Ян (Joanes Grekowisz; Grekonic; Gregonic), злотнік віленскі; у 1634 г. згадваецца ў іску да спадкаемцаў *Я. Магрэ* (КМФ-18, спр. 312, арк. 62 зв. — 63 зв.), у 1650 г. — у іску да злотніка *П. Рэчынскага* і іншых (КМФ-18, спр. 342, арк. 4 зв.).

I. 1. 96. **ГРАНАСТАЙСКІ** Міхал (Michal Gronostayski), злотнік берасцейскі; у 1599 г. згадваецца ў прывілеі на цэх (КМФ-18, спр. 106, арк. 93); у 1623 г. ад'язджае ў Гданьск (L—V, № 1.356); 09.09.1624 фігуруе ў дэкрэце суда апеляцыйнага як «актор» (ісцец) па справе супраць берасцейскіх злотнікаў і яго таварыша падмайстры *А. Гаўсіуса*, які нанёс яму шкоду ў 3 тыс. коп грошаў літоўскіх, што прывяло майстру да нястачы (КМФ-18, спр. 305, арк. 1 зв. — 4 зв., 15).

I. 1. 97. **ГРОНМАН** Крыштаф (Christophori Gronmann), злотнік віленскі, старшы цэхмістр; у 1744 г. згадваецца ў дадатковых артыкулах да цэхавага статута (АВАК, т. 10, с. 60—61).

I. 1. 98. **ГРУШЧЫНСКІ** Пётра (Piotr Gruszczynski), злотнік віленскі; у 1749 г. запісаны ў вучні да злотніка *Г. Сніткі*; згадваецца ў 1755 г. як таксатар каштоўнасцей, што засталіся пасля смерці «рускага» купца Г. Кацельніцкага (АВАК, т. 13, с. 383).

I. 1. 99. **ГРЫГОР'ЕЎ** Абакум, «родиной с литовских городов», срэбранік маскоўскі; у 1684 г. мае сына Касцюшку і дачку Ларку, жыве ў завулку Мяшчанскай слабады, «ідучы ад гандлёвых лазняў да ракі Негліне» (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 103).

I. 1. 100. **ГРЫГОР'ЕЎ** Васіль (Григорьев Василий), паходзіў са Шклова, названы «иноземец-поляк», жалаваны майстра Срэбранай палаты, знаменшчык; у 1660 г. у гонар нараджэння вялікай княгіні Марыі Аляксееўны яму пажалаваны 4 аршыны сукна; у 1663 г. пажар знішчыў дом майстры, у сувязі з чым яму дадзена «на построенье и платье» 50 рублёў; у 1668—1689 гг. атрымаў жалаванне ў 12 рублёў на год і «6 денег кормовых» штодня (Троицкий, вып. 1, с. 33; Абецедарский, таб. 5, № 25).

I. 1. 101. **ГРЫГОР'ЕЎ** Васіль, «поляк» з Полацка, срэбраных спраў майстра; у 1660—1661 гг. працаваў у Масковіі (Железнов, с. 15).

I. 1. 102. **ГРЫГОР'ЕЎ** Іван, паходзіў з Дуброўны, срэбранік маскоўскі; у 1676 г. жыў у Мяшчанскай слабадзе (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 12, 42; Абецедарский, с. 35).

I. 1. 103. **ГРЫГОР'ЕЎ** Івашка, паходзіў з Менскага пав., срэбранік маскоўскі; у 1656 г. вывезены ў Маскву і прададзены ў Срэбраную палату; у 1667 г. атрымаў вольную і жыў на царкоўных землях, што за Цвярской брамай; з 1672—1676 гг. жыў у Мяшчанскай слабадзе г. Масквы (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 62).

I. 1. 104. **ГРЫГОР'ЕЎ** Фекліст, паходзіў з Полацка, маскоўскі майстра сусальнай справы; спачатку жыў 17 г. у майстры сусальнай справы Срэбранай палаты А. Кандрацьева; у 1672 г. пайшоў у наймы да маскоўскага майстры сусальных спраў В. Васільева; у 1676 г. жыў у Мяшчанскай слабадзе, меў сына Васку (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 10).

I. 1. 105. **ГРЭГАРОВІЧ** Лукаш (Lukasz Hregorowicz), паходзіў са Слоніма; у 1678 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 4,5 г. да віленскага злотніка *Станіслава Даніловіча* (МЭ, с. 203; L—V, № 1.426).



*Адбітак пячаткі Ф. І. Яраславіча, князя Пінскага. 1515 г.*

I. 1. 106. **ГУЗОЎСКІ** Сымон (Symon Guzowski), паходзіў са Слоніма; 30.08.1725 запісаны ў вучні на тэрмін у 6 г. да віленскага злотніка *Г. Сніткі* (L—V, № 1.363).

I. 1. 107. **ГУРГІНОВІЧ** Сымон (Samson Gurginowicz), паходзіў са Мсцібава; у 1683 г. запісаны вучнем на тэрмін у 2 г. да віленскага злотніка Я. Александровіча, па заканчэнні вучобы — падмайстрам (МЭ, с. 202; L—V, № 1.360).

I. 1. 108. **ГУТРОЎСКІ** Станіслаў (Stanislaw Gutrowski), злотнік берасцейскі; у 1624 г. згадваецца ў справе *М. Гранастайскага* супраць тамтэйшага злотніцкага цэха (АВАК, т. 6, с. 256—257).

I. 1. 109. **ДАБРАБОРСКІ** Андрэй (Jendzey Dobroborski), паходзіў са Слоніма; у 1669 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 2 г. да віленскага злотніка *Я. Андрэеўскага*, атрымаў мясцовае грамадзянства; у 1672 г. запісаны [у падмайстры] на тэрмін у 2 г. да віленскага злотніка К. Дзялтовіча (L—V, № 1.207).

I. 1. 110. **ДАБРАБОРСКІ** Мацвей (Matwej Dobroborski), паходзіў са Слоніма; у 1668 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 2,5 г. да віленскага злотніка М. Грэтэра, у 1671 г. — у падмайстры (L—V, № 1.208).

I. 1. 111. **ДАЛУДОВІЧ** Томаш (Tomasz Dołudowicz), паходзіў з Пінска; у 1707 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка Я. Ракуця (L—V, № 1.213).

I. 1. 112. **ДАМ** Якуб (Jakob Dietrich Dahm, Dann, Dam), майстра віленскага злотніцкага цэха; з канца XVIII — пачатку XIX ст. працаваў у Гародні; у 1781 г. запісаны на майстроўскую атэстацыю да віленскіх майстраў-злотнікаў *Т. Скендзерскага* і *М. Ёраса*; у 1790 г. атрымаў званне майстры віленскага злотніцкага цэха; у 1791—1808 гг. фігуруе ў віленскіх

цэхавых кнігах майстраў (Łopaciński, № 940, 1021, 1023; L—V, № 2.163).

I. 1. 113. **ДАМБРОЎСКІ** Ян (Jan Dąbrowski), паходзіў са Слоніма; у 1662 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 1 г. да віленскага злотніка *Д. Граковіча*; пасля заканчэння вучобы — у падмайстры (L—V, № 1.215).

I. 1. 114. **ДАНІЛОВІЧ** Себасцьян (Sebastyian Danilowicz), яго бацька паходзіў са Слоніма; 25.02.1725 запісаны ў вучні на тэрмін у 6 г. да віленскага злотніка П. Эльса, у 1730 г. — у падмайстры (L—V, № 1.181).

I. 1. 115. **ДАНІЛОВІЧ** Станіслаў (Stanislaw Danilowicz), нарадзіўся ў Слоніме, злотнік віленскі; у 1662 г. запісаны вучнем на тэрмін у 5 г. да віленскага злотніка *Д. Граковіча*; у 1669—1670 гг. — таварыш у *Ю. Александровіча*; у 1670 г. атрымаў дазвол на сталае жыхарства ў Вільні; неаднаразова абіраўся старшым злотніцкага цэха: у 1667—1679, 1680, 1682—1683 і 1685—1688 гг.; у 1687 г. згадваецца як старшы цэха ў дадатковых артыкулах парадку цэхавага (АВАК, т. 10, с. 95); у 1682—1683 гг. меў таварыша *А. Скіндэровіча*, у 1685—1688 гг. — *В. Дольфуса* (МЭ, с. 204—205), у 1686 г. — *Мацея Лукашэвіча*; меў звыш 30 вучняў, сярод якіх былі: *А. Сапальскі* (1669), *Якуб Сасноўскі* (1670), *М. Спадоба* (1670), *Л. Лазоўскі* (1674), *Я. Бурнацкі* (1676), *К. Яцкевіч* (1676), *Я. Вайціцкі* (1677), *Л. Грэгаровіч* (1678), *Я. Зарадовіч* (1678), *Я. Леняровіч* (1679), *Амброзі Сапалковіч* (1680), *М. Сасноўскі* (1681), *Я. Рынцэвіч* (1684), *М. Сапалковіч* (1685), *Б. Сасноўскі* (1690), *Л. Карповіч* (1697), а таксама сын Станіслава Даніловіча *Георг*; у 1688 г. меў «малую» камяніцу на вул. Рынкавай (АВАК, т. 20, с. 473); у 1702 г. жыў у камяніцы Альбрыхтоўскай, потым — у камяніцы Монтвіла; у 1705 г. — згадваецца як старшы цэха ў дадатковых артыкулах парадку цэхавага (АВАК, т. 10, с. 61); памёр да 1706 г. (МЭ, с. 203—204), ёсць версія, што гэта здарылася ў 1703 г. (L—V, № 1.182).

I. 1. 116. **ДАНІЛОВІЧ** Юры (Георгі), сын віленскага майстры *Станіслава Даніловіча*; у 1693 г. запісаны вучнем да свайго бацькі на тэрмін у 5 г.; у 1698 г. запісаны да яго ж таварышам на тэрмін у 4 г. (МЭ, с. 203—204).

I. 1. 117. **ДАШКЕВІЧ** Сымон (Symon Daszkewicz), сын Андрэя, паходзіў з панцырных баяраў, нарадзіўся ў Гарадзенскім пав. у 1751 г.; 16.07.1777 запісаны вучнем на тэрмін у 5 г. да віленскага злотніцкага майстры *М. Букхарта*, 25.09.1780 атрымаў званне падмайстры; у 1781 г. запісаны да таго ж майстры на тэрмін у 4 г. для атрымання звання майстры; у 1786 г. лічыцца ў спісе майстраў; у 1794 г. прынёс прысягу на вернасць рускай імператрыцы Кацярыне II; памёр у 1811 г. (Łopaciński, № 926, 940, 1008; L—V, № 1.185).

I. 1. 118. **ДЗЕМІДОВІЧ** Андрэй (Andrzey Dziemidowicz), злотнік і мешчанін магілёўскі; згадваецца ў 1629 г. у пастанове на стварэнне цэха (ИЮМ, т. 8, с. 426).

I. 1. 119. **ДЗЕМ'ЯНОВІЧ** Пётра (Piotr Demianowicz), паходзіў з Менска; у 1715 г. запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка *Б. Траянскага*, у 1717 г. атрымаў званне падмайстры; у 1719 г. мясцовымі ўладамі запісаны на атэстацыю да віленскіх злотніцкіх майстраў *Г. Б. Крыжаноўскага* і *В. Траянскага*; у 1722 г. атрымаў званне майстры і прыняты ў віленскі злотніцкі цэх; меў шэраг вучняў і трымаў падмайстраў;

фігуруе ў цэхавых кнігах да 1733 г. (МЭ, с. 206; L—V, № 1.192).

I. 1. 120. **ДЗІМІТРЫЕВІЧ** Грышко (Hryszko Dimitriewicz), злотнік полацкі; у 1517 г. прадаў сваю зямлю Рыхлікоўшчыну ў старым гарадзішку за 50 коп грошаў полацкаму ваяводзе А. Гаштаўту (ЛМ, кн. 1, с. 107).

I. 1. 121. **ДЗІТМАР** Ян (Jan Dytmarus; Dithmar), пробер на віленскай мінцы; у 1601 г. згадваецца ў лісце падскарбія А. Завішы аб уводзе яго ў пасаду замест І. Тырлзе; ад яго патрабуецца, каб «пенендзы ў мінцы рабіліся белыя патройныя срэбраныя» (КМФ-18, спр. 86, арк. 287 — 287 зв.).

I. 1. 122. **ДЗМІТРОВІЧ (ЗМІТРОВІЧ)** Цімошка (Дмитрович Тимошко), «золотарь» пінскі; яму была «нададзена зямля, што называлася Крыўцоўшчызна», ад князя Ф. І. Яраславіча ў сяле Жыдцы; 08.02.1525 атрымаў пацвярджальны прывілей ад каралевы Боны з умовай, што ён, яго жонка, дзеці «и их потомки служили службу золотарскую». Гэты дакумент быў прадстаўлены ў 1554 г. яго сынам Сямёнам Цімафеевічам для запісу ў кнізе рэвізіі (Ревизия пущ... с. 258).

I. 1. 123. **ДОЖБАХ** Ян (Jan Dorzbach), паходзіў з Гародні; у 1667 г. запісаны вучнем на тэрмін 2 г. да віленскага злотніцкага майстры *Я. Рагацэвіча* (L—V, № 1.218).

I. 1. 124. **ДОЛЬФУС** Войцех, паходзіў з Варшавы, атрымаў там першасную адукацыю; у 1685—1688 гг. злотніцкі таварыш у віленскага майстры *Станіслава Даніловіча*; у 1686 г. атрымаў статус майстры; меў шмат вучняў, сярод якіх былі: *Ф. Яневіч* (1692), *Ю. Радвіла* (1695), *М. Браневіч* (1696) і інш.; актыўна працаваў да 1696 г. (МЭ, с. 204).

I. 1. 125. **ДРЭЗНЕР** Ян (Drezner, Dryznik Jan), злотнік берасцейскі; згадваецца ў 1599 г. у прывілеі на цэх (КМФ-18, спр. 106, арк. 93); у 1624 г. упамінаецца як старшы цэха ў справе *М. Гранастайскага* супраць цэха (КМФ-18, спр. 305, арк. 1 зв., 4 зв. — 5; АВАК, т. 6, с. 256—257); у 1626 г. фігуруе як старшы цэха ў справе злотнікаў супраць *С. Радванскага* (АВАК, т. 6, с. 268—269).

I. 1. 126. **ДУМАНОВІЧ** Стэфан, паходзіў з Любчы; у 1699 г. запісаны вучнем на тэрмін у 5 г. да віленскага майстры К. Дыгайні, пасля заканчэння вучобы запісаны падмайстрам; званне майстры не атрымаў, але лічыўся ў віленскім цэху незалежным злотнікам; у 1686 г. прадаваў цэхавым майстрам срэбра (L—V, № 1.231).

I. 1. 127. **ДЭВЕРТ** Даніэль (Daniel Dewert; Dewersz), злотнік і мешчанін магілёўскі; згадваецца ў 1629 г. у пастанове на стварэнне цэха (ИЮМ, т. 8, с. 426); у 1635 г. упамінаецца як старшы цэха, у 1641 г. — як ужо памерлы (ИЮМ, т. 9, с. 415).

I. 1. 128. **ДЭРСКОФ** Ян (Jan Derskof), магілёўскі мешчанін, «лавник золотниковый»; у чэрвені 1689 г. атрымаў з магістрацкай скарбонкі на пагашэнне асабістых трат 1 злоты і «2 осьмака»; у верасні атрымаў за працу ў якасці платы 1,5 гарца мёду (ИЮМ, т. 6, с. 70, 110).

I. 1. 129. **ЕЛЯНЕВІЧ** Францыск (Еленевич), сын Юзэфа, нарадзіўся ў Бярэсці ў 1749 г.; у 1767 г. запісаны вучнем да віленскага злотніка Н. Ф. Мая, 19.06.1772 кантракт працягнуты на 5 г.; 16.06.1777 запісаны падмайстрам

у таго ж майстры, які выплаціў яму 20 талераў; у 1786 г. прынёс прысягу «месту Віленскаму» і быў прыняты ў цэх; у 1820 г. апошняя дакументальная згадка пра яго (L—V, № 1.478).

І. 1. 130. **ЁРАС** Міхал (Michal Joras), віленскі мешчанін і злотнік; у 1775 г. старшы цэха «віленскіх юбілераў і злотнікаў»; у 1793 г. згадваецца ў дэкрэце ў справе цэхаў з віленскімі яўрэямі аб парушэнні апошнімі правілаў гандлю (АВАК, т. 29, с. 488); меў вучня *Я. Дама* (1781).

**ЖАХАЛЬСКІ**, гл. **ЗАГАЛЬСКІ.**

І. 1. 131. **ЖУК** Дзітрых (Dytrych Zuk), злотнік віленскі; у 1671 г. меў камяніцу каля царквы Св. Іллі (АВАК, т. 20, с. 411).

**ЖУРАДОВІЧ**, гл. **ЗАРАДОВІЧ**

І. 1. 132. **ЖЫВЕЦКІ** Казімір (Kazimerz Żywiecki), паходзіў з Воўпы; у 1684 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 7 г. да віленскага злотніка *Ю. Барчынскага* (L—V, № 1.1342).

І. 1. 133. **ЖЫЗМАН** Ян (Jan Zyzman), злотнік віленскі; згадваецца ў 1755 г. як таксатар каштоўнасцей, што засталіся пасля смерці «рускага» купца Г. Кацельніцкага (АВАК, т. 13, с. 382).

І. 1. 134. **ЖЭГАЛІНСКІ** Марцін (Martin Zegalinski), злотнік і мешчанін віленскі; згадваецца ў 1675 г. як таварыш цэха злотніцкага, удзельнічаў у бойцы з краўцамі (АВАК, т. 10, с. 415); меў вучняў (МЭ, с. 204): *Т. Баневіча* (1692) і *Т. Ганцэвіча* (1699); памёр каля 1693 г.; у 1694 г. яго камяніцу на Шкляной вуліцы канфіскуюць ва ўдавы — Кацярыны Дзякоўскай Жэгалінскай за нявыплату апошняй працэнтаў па даўгах мужа; (АВАК, т. 9, с. 287—280).

І. 1. 135. **ЗАБОРСКІ** Пётра Іванавіч (Заборский Петр Иванович), месца паходжання не высветлена, «залатых і срэбных спраў майстра»; працаваў у Новаіерусалімскім Уваскрасенскім манастыры на р. Істры (Масковія); памёр 02.07(па ст.ст.).1665 (Абецедарский, с. 227).

І. 1. 136. **ЗАГАЛЬСКІ (ЖАХАЛЬСКІ)** Матыяс (Marcin Żochalski, Zegalski), паходзіў з Ашмян; у 1680 г. запісаны вучнем на тэрмін у 5 г. да віленскага злотніцкага майстры *Ю. Александровіча*, па сканчэнні вучобы працаваў падмайстрам; у 1690 г. запісаны віленскімі мясцовымі ўладамі яшчэ на 2 г. да майстры *Ю. Александровіча* (МЭ, с. 202—203; L—V, № 1.1343).

**ЗМІТРОВІЧ**, гл. **ДЗМІТРОВІЧ**

І. 1. 137. **ЗАРАДОВІЧ (ЖУРАДОВІЧ)** Ян (Jan Zurodowicz), паходзіў з Беліцы; у 1678 г. запісаны вучнем да віленскага майстры *Станіслава Даніловіча* на тэрмін у 3 г. (МЭ, с. 203), у 1683 г. — на 2,5 г. да майстры А. Жаланкевіча, пасля заканчэння вучобы залічаны ў падмайстры (L—V, № 1.1335).

І. 1. 138. **ЗАХАР'ЕЎ** Сямён (Захарьев Семен), месца паходжання не высветлена, названы «поляк», жалаваны майстра Маскоўскай срэбранай палаты; у 1658 г. «за многую работу» атрымаў 5 аршынаў «ангельскага» сукна і 5 аршынаў тафты «доброй» венецыянскай; у 1660 г. меў жалаванне 12 рублёў у год і «6 денег кормовых» штодзённа; у лістападзе 1663 г. збег у «Литву», перад уцёкамі браў у «иноземцев письма многие неведомо какие, а с Москвы поехал с Витебскою шляхтой» (Троицкий, вып. 1, с. 41).

І. 1. 139. **ЗАХАРЫНІЧ** Якуб (Захаринич Якуб), злотнік магілёўскі; у 1577 г. абвінавачвае свайго калегу *К. Яцковіча* ў крадзяжы рэчаў і абвінавачваецца апошнім у крадзяжы інструментаў і срэбра (ИЮМ, т. 30, с. 150—153).

І. 1. 140. **ЗАЦІНІЧ** Стэфан (Stefan Zotinicz), злотнік і мешчанін магілёўскі; згадваецца ў 1629 г. у выпісе з магістрацкіх кніг Магілёва ў прашэнні аб стварэнні цэха (ИЮМ, т. 8, с. 426); у 1634 г. фігуруе ў пацверджанні каралём Уладзіславам IV цэхавага статута магілёўскім злотнікам (тамсама, вып. 30, с. 495); у 1636 г. сведчыць у судзе «о зранене» М. Багдановіча злотнікам *І. Атрашковічам* (тамсама, с. 527).

І. 1. 141. **ЗЕЗЕМАН** Крыштаф (Zezeman Chistophori), злотнік віленскі; згадваецца ў 1774 г. у дадатковых артыкулах да цэхавага статута як былы старшы цэхмістр (АВАК, т. 10, с. 60—61).

І. 1. 142. **ЗЕЙДЭЛЬ** Ян (Jan Zeydel), злотнік віленскі; у 1705 г. старшы цэха (АВАК, т. 10, с. 61); меў вучняў: *Я. Скабяту* (1679) і *Г. Б. Крыжаноўскага* (1707).

І. 1. 143. **ЗЕЛІГМАХЕР** Аўгусцін (Augustin Zeligmacher), злотнік віленскі; у 1675 г. згадваецца як «рочны» старшы цэха ў скарзе віленскіх краўцоў на злотнікаў (АВАК, т. 10, с. 415).

І. 1. 144. **ЗЕЛІГМАХЕР** Крыштаф (Krzysztof Zeligmacher), злотнік і мешчанін віленскі; у 1579—1599 гг. меў камяніцу па вул. Замкавай, «ідучы з замку па левай руцэ» каля дома К. Астрожскага (АВАК, т. 20, с. 104, 119, 128, 156, 522).

І. 1. 145. **ЗЕЛЯНЕЎСКІ** Адам Тэадоравіч (Adam Theodorowicz Zieleniewski), злотнік «з места Слоніма родам»; у ноч з 23.06 на 24.06.1707 абакраў у Магілёве брацкую царкву, як «яўны святакрадца», прыгавораны да «шыбеніцы ў полі», экзекуцыя назначана на 11.06 (ИЮМ, т. 11, с. 256—261).

І. 1. 146. **ІВАНОВІЧ** Мацвей, «золотаръ» віленскі; у 1598 г. выступае сведкам нападу студэнтаў віленскага іезуіцкага калегіума на Свята-Духаў манастыр (АВАК, т. 8, с. 31, 35).

І. 1. 147. **ІВАНОВІЧ** Францішак (Franciszek Iwanowicz), паходзіў з Ашмянскага пав.; у 1683 г. запісаны на 8 г. да віленскага злотніцкага майстры Дольфуса, пасля заканчэння вучобы запісаны ў падмайстры (Łopaciński, № 451; L—V, № 1.466).

І. 1. 148. **ІВАНОЎ** Андрушка, сын Ірыкаў, родам са Смаленска, срэбраніцкі майстра, «узяты» ў Маскву разам са срэбраніцкім майстрам *Л. Фёдаравым*; працаваў у палаце «кармавым майстрам» (атрымліваў жалаванне); абодва адпушчаны дамоў, але А. Іваноў застаўся ў Маскве; у 1673—1676 гг. жыў у Мяшчанскай слабадзе г. Масквы (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 65).

І. 1. 149. **ІВАНОЎ** Пятрушка, родам з Оршы, срэбранік; перад руска-польскай вайной пераехаў у Віцебск з рускімі войскамі, «разам з іншымі братамі срэбранікамі» вывезены ў Маскву; у 1670 г. адстаўлены ад Срэбранай палаты Маскоўскага Крамля: у 1676 г. жыў у Мяшчанскай слабадзе г. Масквы (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 50).

І. 1. 150. **ІВАНОЎ** Раман (Иванов Роман), месца паходжання не высветлена, названы «поляк», срэбраных спраў майстра; у 1658—1659 гг. працаваў у Срэбранай палаце, меў жалаванне

12 рублёў на год і «6 денег» кармавых штодзённа; у 1659 г. пажалаваны за «многую» работу сукном; у 1663 г. пакінуты ў «жалаваных» майстрах; у 1667 г. за «беспрестанную» работу ўзнагароджаны вядром віна і «полтя мяса» ў дадатак; у 1669 г. удзельнічаў у вырабе царкоўных сасудаў для ўсяленскіх патрыярхаў; у 1676 г. паручнік майстры ў Срэбранай палаце; у 1678 г. пакінуў службу (памёр?) (Железнов, с. 22; Троицкий, вып. 1, с. 47; Абецедарский, таб. 5, № 55).

І. 1. 151. **ІВАНОЎ** Сідар, паходзіў з «літоўскіх гарадоў», майстра залатых спраў, жыў у Кузнечнай слабадзе, з 1675 г. — у Мяшчанскай слабадзе г. Масквы; у 1684 г. плаціў цягла 2 грыўны (Материалы... купечества, прил. 2, с. 101).

І. 1. 152. **ІВАНОЎ** Станіслаў (Иванов Станислав), названы «поляк» з Віцебска, срэбраных спраў майстра; у 1660 г. трапіў у Маскву з жонкай, дзвюма дочкамі і пляменніцай; у 1662 г. працаваў у Срэбранай палаце, меў жалаванне 8 рублёў на год і «6 денег» кармавых штодзённа; у 1663 г. адстаўлены ад пасады па палітычных матывах (Троицкий, вып. 1, с. 47; Абецедарский, таб. 5, № 57); у 1676 г. жыў у Броннай слабадзе, меў сына Аляксашку (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 50).

І. 1. 153. **ІВОНІЧ** Іван (Ивонич Иван), залатар навагародскі; 27.01.1524 згадваецца ў выраку гаспадарскім наконт яго скаргі на несправядлівыя дзеі каралеўскага служэбніка В. Заройскага (ЛМ, т. 4, с. 353).

І. 1. 154. **ІНТОФЕР** Ленарт (Ленарт Интофер), злотнік; у 1559 г. згадваецца ў «інвентары рэчаў, пасланых у інфлянцкія замкі», накіраваны ў замак Розітэн (КМФ-18, спр. 37, арк. 399).

І. 1. 155. **ІСАКАЎ** Багдан (Исаков Богдан), месца паходжання не высветлена, названы «поляк», срэбраных спраў майстра, працаваў у Срэбранай палаце; у 1655 г. на выраб царскай пячаткі атрымаў 1,5 фунта срэбра; у 1656 г. за выраб 2-х «государевых» пячатак атрымаў узнагароду — 9 рублёў і «ангельскае» сукно (Троицкий, вып. 1, с. 51; Абецедарский, таб. 5, № 69).

І. 1. 156. **КАЗЫРСКІ** Лука Грыгораў (Козырский Лучка Григорьев), са Смаленска, срэбраных спраў майстра; у 1659 г. названы «поляк»; у снежні прывезены ў Маскву, стаў прасіць дазвол на вяртанне, у красавіку — маі 1660 г. яго атрымаў (Троицкий, вып. 1, с. 60).

І. 1. 157. **КАЛБЕКА** Ян, злотнік менскі; у снежні 1679 г. набыў у «малжонкаў» Ба-



*Пячатка земскага суда Навагародскага пав. 1565 г.*

лазевічаў пляц з будынкам «іх отчызны» за 800 злотых польскіх у Менску «над берегам» на вул. Вялікай (вул. «Троіцкай, альбо на Троіцкай гары»), паміж камяніцай яўрэя Чортка і пляцам Абрама Варпуховіча (НГАБ у Мінску, ф. 1816, воп. 1, спр. 54, арк. 974—976 зв.).

I. 1. 158. **КАЛІКЕВІЧ** Канстанцін, паходзіў з Гародні; у 1683 г. запісаны вучнем да віленскага майстры *Я. Рагацэвіча* на тэрмін у 4 г., вучобу не скончыў (МЭ, с. 204).

I. 1. 159. **КАЛМАЧЭЎСКІ** Андрэй, мешчанін і злотнік полацкі; 02.03.1650 страціў за даўгі на карысць полацкага бурмістра Б. Рашэўскага свой дом на вул. Вялікай (ИЮМ, вып. 5, с. 149); 5 жніўня прыцягнуты да суда Ю. Сапрановічам за [фальша]ванне золата падчас вырабу пярсцёнка на заказ (тамсама, с. 38).

I. 1. 160. **КАЛПАЧЭЎСКІ** Вацлаў (Wacław Kolpaczewski), паходзіў з Олыкі; у 1677 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка К. Дзялтовіча, пасля заканчэння вучобы — падмайстрам (L—V, № 1.592).

I. 1. 161. **КАМЛАШЭЎСКІ** Ян (Jan Komlaszewski), паходзіў з Паставаў; у 1715 г. запісаны вучнем на тэрмін у 7 г. да віленскага злотніка Дамадорфа Крыштафа, вучэнне не вытрымаў (Łopaciński, № 597; L—V, № 1.595).

I. 1. 162. **КАНДРАЦЬЕЎ** Сенька, паходзіў з мяст. Халопенічы Аршанскага пав., срэбранік маскоўскі; у 1656 г. забраны ў Маскву; у 1672—1676 гг. жыў у Мяшчанскай слабадзе г. Масквы (Материалы… купечества, т. 1, прил. 2, с. 1—2).

I. 1. 163. **КАНЕНБЕРГ** Петэр (Peter Kannenberg), злотнік віленскі; у 1634 г. згадваецца ў іску да спадкаемцаў *Я. Магрэ* (КМФ-18, спр. 312, арк. 63 зв.).

I. 1. 164. **КАРДЗЯНЕЎСКІ** Тамаш (Korzanewski Thomas), паходзіў з Полацка; у 1719 г. запісаны вучнем да віленскага майстры *В. Траянскага* на тэрмін у 4 г. (МЭ, с. 206; L—V, № 1.613).

I. 1. 165. **КАРНІЛОВІЧ** Ян, паходзіў з Полацка; у 1718 г. запісаны да віленскага майстры *В. Траянскага* вучнем на тэрмін у 4,5 г. (МЭ, с. 206).

I. 1. 166. **КАРПАЎ** Анікей (Карпов Аникей), месца паходжання не высветлена, жалаваны майстра Маскоўскай срэбранай палаты; у 1660 — сакавіку 1662 г. названы «поляк», на «дзень Ангела цара» атрымаў 31 алтын; у 1663 г. адхілены ад пасады па палітычных меркаваннях (Железнов, с. 26; Троицкий, вып. 1, с. 53; Абецедарский, таб. 5, № 73).

I. 1. 167. **КАРПОВІЧ** Лявон (Leon Karpowicz), паходзіў з Полацка; у 1697 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка *Станіслава Даніловіча*, але вучобы не скончыў (МЭ, с. 204; L—V, № 1.552).

I. 1. 168. **КАРПОВІЧ** Фелікс (Felix Karpawicz, Karpowicz), паходзіў з Ружанаў; у 1703 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 6 г. да віленскага злотніка П. Ракуты (L—V, № 1.550).

I. 1. 169. **КАРПОЎСКІ** Станіслаў (Stanislaw Karpowski), паходзіў са Слоніма; у 1676 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 2,5 г. да віленскага злотніка *Я. Рагацэвіча*; пасля заканчэння вучобы запісаны ў падмайстры (МЭ, с. 205; L—V, № 1.553).

I. 1. 170. **КАТКОВІЧ** Міхась (Michal Kotkowicz), паходзіў з Ракава; у 1664 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 2 г. да

віленскага злотніка М. Шнэйдэра (L—V, № 1.612).

I. 1. 171. **КАЎЗАНОЎСКІ** Георг (Georg Kolzanowski), злотнік віленскі; згадваецца ў 1639 г. у маёмасных спадчынных прэтэнзіях шаўца Д. Мінкоўскага (КМФ-18, спр. 316, арк. 308—309).

I. 1. 172. **КАЎШЭВІЧ** Стэфан (Stefan Kowszewicz), паходзіў з Полацка; у 1684 г. запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка М. Грэйтэра; вучэнне не скончыў (Łopaciński, № 404).

I. 1. 173. **КАХАНОВІЧ** Ян, злотнік навагародскі; згадваецца ў 1663 г. у прывілеі на цэх (КМФ-18, спр. 111, арк. 616).

I. 1. 174. **КАХЛЕЎСКІ** Казімір (Kazimierz Kochlewski), паходзіў з Геранёнаў; у 1663 г. запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка *О. Петэрсана*, пасля заканчэння вучобы запісаны падмайстрам (Łopaciński, № 194; L—V, № 1.586).

I. 1. 175. **КАХЛЕЎСКІ** Павел, паходзіў з Геранёнаў Ашмянскага пав.; у 1663 г. запісаны вучнем да віленскага майстры *О. Петэрсана* на тэрмін у 4 г. (МЭ, с. 204).

I. 1. 176. **КВАШНІЧ** Іван Рыгоравіч (Квашнич Иван Григорьевич), злотнік і слуга каралеўскі; 20.02.1599 згадваецца ў консэнсе аб наданні яму і яго жонцы Любе Альшанічанцы «ў дажывотнае трыманне» с. Яцовічы Долгаўскага староства Троцкага ваяв., с. Пакоршы Прэлайскай вол. і воз. Солія (КМФ-18, спр. 86, арк. 9).

I. 1. 177. **КЕРСНОЎСКІ** Геранім, паходзіў з Камянца Берасцейскага ваяв.; у 1664 г. запісаны вучнем на тэрмін у 5 г. да віленскага майстры *Я. Рагацэвіча*, пасля заканчэння вучобы запісаны падмайстрам (Łopaciński, № 219; МЭ, с. 205; L—V, № 1.562).

I. 1. 178. **КЕЧНЕРСКІ** Юзаф (Jozef Kiecznierski), мешчанін і злотнік берасцейскі; у 1673 г. абвінавачваецца М. Лейбовічам у нападзе 23.06.1673 на яго дом на вул. Кавальскай (НГАБ у Мінску, ф. 1786, воп. 1, спр. 4, с. 125).

I. 1. 179. **КІКЕНАП** Георг Людвіг (Georg Ludwig Kikenap), злотнік віленскі; 26.06.1779 прыняў яго на службу Караль Станіслаў, князь Радзівіл; у 1785—1806 гг. працаваў у Нясвіжы; у 1791—1794 гг. меў вучня *К. Насулевіча*, які быў запісаны ў віленскія падмайстроўскія рэестры ў 1797 г. (L—V, № 1.563).

I. 1. 180. **КЛІНОЎСКІ** Ян (Jan Klinowski), паходзіў з Ашмянскага пав.; у 1683 г. запісаны ў вучні на 6 г. да віленскага злотніцкага майстры *А. Скіндэровіча*; у сувязі з тым, што ім раней былі адпрацаваны 4 вучнёўскія гады, у 1685 г. запісаны ў падмайстры (Łopaciński, № 394; МЭ, с. 205; L—V, № 1.583).

I. 1. 181. **КНЯЗІКОВІЧ** Павел Міхайлавіч (Павел; Pawel Michalowicz Knezikowicz), злотнік менскі; у 1592 г. згадваецца ў прывілеі Жыгімонта III як старшы аб'яднанага цэха (БА, т. 3, с. 69, 213); у 1599 г. меў дом на вул. Замкавай, «ідучы к рынку па правай старане» (КМФ-18, спр. 86, арк. 69); у 1600 г. падаў скаргу ў Менскі гарадскі суд на зямяніна мяст. Кіявец Я. Адыхоўскага, які пазычыў і не вярнуў срэбраны посуд (НГАБ у Мінску, ф. 1727, воп. 1, спр. 1, арк. 1 зв. — 24 зв. — 126); у 1626 г. меў ва ўтрыманні «Басалаеўскі» дом (СДГМнГ, с. 151).

I. 1. 182. **КОЛБЕК** Ян (Jan Kołbek), паходзіў з Лепеля; у 1688 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 1 г. да віленскага злотніка М. Шнэйдэра, пасля заканчэння вучобы запісаны ў падмайстры (L—V, № 1.587).

I. 1. 183. **КОЛС** Іона (Jonas Kols, Cols), злотнік віленскі; згадваецца ў 1634 г. у іску да спадкаемцаў *Я. Магрэ* (КМФ-18, спр. 312, арк. 63 зв. — 64 зв.).

I. 1. 184. **КОЛС**[4] Ян Тэадор (Jan Teodor Kols), злотнік і ювелір гарадзенскі; 31.01.1756 запісаны вучнем на тэрмін у 5 г. да віленскага майстры *Э. Вібера*; 19.08.1760 атрымаў званне падмайстры і пераехаў у Гародню, але плаціў падаткі ўвесь час на віленскі злотніцкі цэх, сябрам якога ён быў з 1768 да 1810 г.; «ювелір Яго Каралеўскай міласці»; 03.06.1796 ацаніў брыльянтавы пярсцёнак доктара пана Міхельсона ў 50 чырвоных злотых (НГАБ у Мін-ску, ф. 1711, воп. 1, спр. 74, арк. 975—976 зв.); меў вучняў і падмайстраў у Гародні, сярод якіх былі *В. Бродскі* (1774), Я. Кузін (1791), К. Позер (1793), Л. Дыманскі, сын Саламона (1801), *Я. Эберт* (1807); у 1811 г. пасля смерці майстры яго справу працягвала ўдава, з якой працаваў падмайстра М. Лафо (L—V, № 1.569).

I. 1. 185. **КОРСАКАЎ** Рыгор Тарасаў (Корсаков Григорий Тарасов), названы «поляк, мяшчанскі сын з Магілёва», нарадзіўся ў 1696 г.; фігуруе ў спісе майстраў залатых і срэбраных спраў «рускага» злотніцкага цэха ў Санкт-Пецярбургу; пасля 1764 г. звесткі пра яго адсутнічаюць (РИБ, т. 2, с. 276).

I. 1. 186. **КРАЙЦЭНС** Мацей (Maciej Krajcensis), злотнік, езуіт, нарадзіўся ў Польшчы каля 1563 г., вырабляў «касцёльнае срэбра»; у 1593—1596 гг. працаваў у Нясвіжы, потым ад'ехаў у Рыгу; у 1598—1600 гг. зноў у Нясвіжы; пасля 1603 г. працаваў у Вільні і Львове; памёр у 1634 г. у Кракаве (SJA, s. 141—142).

I. 1. 187. **КРАСІЛЬНІКАЎ** Іван (Красильников Иван), названы «поляк с Витебска», срэбраных спраў майстра; у 1660 г. прыбыў у Маскву з дачкой і пляменнікам; працаваў у Срэбранай палаце, меў вучня — свайго пляменніка *С. Гаўрылава;* атрымліваў жалаванне 8 рублёў на год і «6 денег» штодзённа; у 1663 г. адхілены ад пасады па палітычных матывах, разам з пляменнікам даў падпіску аб нявыездзе з Масквы (Троицкий, вып. 1, с. 27, 63; Абецедарский, таб. 5, № 23, 81)[5].

I. 1. 188. **КРАСОЎСКІ** Пётра (Красовский Петр), паходзіў з Віцебска, названы «поляк», срэбраных спраў майстра; у 1660 г. прыбыў у Маскву, працаваў у Срэбранай палаце, меў жалаванне 10 рублёў на год, хлеба — аўса і жыта — 24 «чэці»; у 1663 г. адхілены ад пасады па палітычных меркаваннях (Троицкий, вып. 1, с. 63; тамсама, вып. 2, с. 77; Абецедарский, таб. 5, № 82).

I. 1. 189. **КРУМ** Ёган (Johan Krumm), сын Яна, нарадзіўся ў Гародні ў 1773 г.; 05.07.1790 запісаны вучнем на тэрмін у 6 г. да віленскага злотніцкага майстры Я. Ф. Гёрыца; 09.02.1795 атрымаў званне падмайстры; у 1795 г. працаваў у Вільні; 13.09.1805 атрымаў званне майстры і быў прыняты ў віленскі злотніцкі цэх; быў двойчы жанаты; у 1807 г. меў падмайстра Р. Вольфа, у 1808 г. —

[4] Э. Лапацінскі называе гэтага злотніка Koss Teodor (№ 987), а ў L—V яго прозвішча падаецца як Kioss (№ 1.569).

[5] Абодва аўтары налічваюць двух І. Красільнікавых з амаль аднолькавымі біяграфіямі і месцамі паходжання. Магчыма, у дакуменце няправільна ўнесена пляменніца, калі гэта пляменнік — усё становіцца на сваё месца.

вучня Б. Матэйсена; памёр 01.12.1809 (L—V, № 2.529).

I. 1. 190. **КРЫЖАНОЎСКІ** Габрыэль Базыль (Gabriel Bazyli Krzyzanowski), паходзіў з Талочына, яўрэй; у 1704 г. прыняў у Вільні хрысціянства; у 1707 г. запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага майстры *Я. Зейдэля*; атрымаў званне падмайстры, запісаны таварышам на 4 г. да таго ж злотніка, пасля гэтага працаваў [меў атэстацыю] у віленскіх майстраў Я. Славаковіча і *В. Траянскага*; у 1715 г. атрымаў званне майстры і быў прыняты ў віленскі злотніцкі цэх; у 1719 г. абраны цэхавым старшынёй; меў падмайстраў і вучняў (сярод апошніх былі: *П. Свяцкі* (1721), *С. Баганоўскі* (1724)); прысутнічае ў цэхавых спісах да 1726 г. (МЭ, с. 205; L—V, № 2.656).

I. 1. 191. **КУЗБОРСКІ** Станіслаў (Stanislaw Kuzborsky), старшы злотнік (alternum Aurificer) віленскі; згадваецца ў 1584 г. у прывілеі Стэфана Баторыя цэху (КМФ-18, спр. 280, арк. 54—56 зв.).

I. 1. 192. **КУЗЬМІЧ** Ян (Jan Kuzmicz), паходзіў з Полацка; у 1668 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 5 г. да віленскага злотніцкага майстры А. Жаланкевіча (L—V, № 1.653).

I. 1. 193. **КУРЫЛОВІЧ** Самуэль (Samuel Kurylowicz), паходзіў з Друі; у 1688 г. запісаны на 5 г. да віленскага злотніцкага майстры А. Жаланкевіча, пасля заканчэння вучобы запісаны ў падмайстры (L—V, № 1.650).

I. 1. 194. **КУХНАРОЎ** Грыгорый, месца паходжання не высветлена, названы «поляк», срэбраных спраў майстра; у 1662 г. працаваў у Масковіі (Железнов, с. 32).

I. 1. 195. **КУЦАР** Беньямін (Beniaminus Kucer), злотнік віленскі, старшыня цэха; згадваецца ў 1774 г. у дадатковых артыкулах да цэхавага статута (АВАК, т. 10, с. 60—61).

I. 1. 196. **КУЦЕНЬ** Максім Сямёнаў, нарадзіўся ў Капылі, маскоўскі срэбраных спраў майстра; у 1655 г. вывезены разам з маткай у Маскву; у 1668 г. адпушчаны «ў сваю старану»; у 1670 г. вярнуўся назад; у 1676 г. жыў у Мяшчанскай слабадзе, меў трох сыноў, «прамышляў срэбным майстэрствам»; у 1684 г. узяты майстрам у Срэбраную палату (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 27; Абецедарский, 1955, с. 35, 88).

I. 1. 197. **КУШНАРОЎ** Аніка (Кужнаров Аника), вучань у Маскоўскай срэбранай палаце; у 1660 г. названы «поляк» з Віцебска (Троицкий, вып. 1, с. 63).

I. 1. 198. **ЛАЗОЎСКІ** Лукаш, паходзіў з Сядзельнікаў Ваўкавыскага пав.; у 1674 г. запісаны вучнем на тэрмін у 2,5 г. да віленскага злотніка *Станіслава Даніловіча*, паспяхова скончыў вучобу (Łopaciński, № 337; МЭ, с. 203; L—V, № 1.675).

I. 1. 199. **ЛАНГРЫН** Даніэль (Daniel Longryn), злотнік гарадзенскі; у 1793 г. разам са сваім калегам, гарадзенскім ювелірам *Я. К. Рабе,* выступае ў судовым працэсе аб залатой табакерцы (L—V, № 1.721).

I. 1. 200. **ЛАПАЦІНСКІ** Васіль (Bazyli Lopacinski), паходзіў з Полацка, злотнік віленскі; у 1697 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 2 г. да віленскага злотніка П. Данілевіча, пасля заканчэння вучобы — у падмайстры; у 1699 г. запісаны да віленскага злотніка *А. Туркевіча*; у 1700 г. прыняў да сябе вучня на тэрмін у 5 г.; апошні раз згадваецца ў 1704 г., калі ўзняў да сябе вучня А. Мацкевіча;

меў жонку Тэрэзу і двух сыноў: Юзэфа і Ігната (L—V, № 1.722).

I. 1. 201. **ЛАРЫ** Іван (Joannes Lari), злотнік віленскі, старшыня цэха; у 1748 г. меў вучня *М. Паўловіча*; у 1774 г. І. Лары згадваецца ў дадатковых артыкулах да цэхавага статута (АВАК, т. 10, с. 60).

I. 1. 202. **ЛАТКЕВІЧ** Юрый (Jerzy Łotkewicz), паходзіў з Гародні; у 1669 г. запісаны вучнем на тэрмін у 2 г. да віленскага злотніка К. Дудзінскага, пасля заканчэння вучобы запісаны падмайстрам (L—V, № 1.726).

I. 1. 203. **ЛАЎРЫКАЎ** Гаўрыла (Лавриков Гавриил), майстра ў Маскоўскай срэбранай палаце; у 1660 г. названы «поляк» з Віцебска, фігуруе сярод 9 майстраў-злотнікаў, вывезеных у Маскву (Троицкий, вып. 1, с. 68).

I. 1. 204. **ЛАЎРЫНОВІЧ** Апанас (Aphanas Lawrynowicz), злотнік і мешчанін магілёўскі; згадваецца ў 1629 г. у пастанове аб стварэнні цэха (ИЮМ, т. 8, с. 426).

I. 1. 205. **ЛЕНЯРОВІЧ** Ян (Jan Lenerowicz), паходзіў са Слоніма; у 1679 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 2 г. да віленскага злотніка *Станіслава Даніловіча*; пасля заканчэння вучобы запісаны ў падмайстры (МЭ, с. 203; L—V, № 1.690).

I. 1. 206. **ЛІНГ** Ян (Jan Ling), злотнік віленскі, юрысдычанін [гродскі?]; у 1717 г. страціў камяніцу на вул. Замкавай за нявыплату арэнды (АВАК, т. 20, с. 541).

I. 1. 207. **ЛІШНІ** Антон (Антон Лишний), злотнік і мешчанін віленскі; 05.05.1593 разам з жонкай Даротай Кграбаўшанкай пазычылі 40 коп грошаў «манеты літоўскай» Гені Кашыцкай і яе сыну Матэвушу Кашыцкаму (КМФ-32, арк. 115 – 116 зв.); у тым жа годзе атрымалі ад Я. Чычкі ў заставу дом па вул. Віленскай, каля Вялейскай брамы (АВАК, т. 20, с. 88).

I. 1. 208. **ЛОГВІНАЎ** Мікола (Логвинов Николай), паходзіў з Магілёва, залатых спраў майстра; у 1654 г. працаваў у Залатой палаце г. Масквы, атрымаў загад зрабіць 100 напрастольных крыжоў, 15 чаканеных крыжоў і столькі ж разных, а таксама аклады на 36 Евангеляў і засцібкі да 31 кнігі (Троицкий, вып. 1, с. 70—71; Абецедарский, таб. 5, № 89).

I. 1. 209. **ЛУКАШЭВІЧ** Масей (Mojzesz), у 1742 г. згадваецца як мешчанін і злотнік полацкі; меў жонку Яўфімію, разам з якой прадаў полацкім злотнікам — мужу і жонцы *Аніскевічам* — дамок з «грунтам пад ім» на вул. Ільінскай, «ідучы з места за паркан па правай старане». Гэты продаж зафіксаваны ў актавых кнігах «места Яго Каралеўскае Міласці Полацака» (НГАБ у Мінску, ф. 1823, воп. 1, спр. 27, арк. 111—112).

I. 1. 210. **ЛУКАШЭВІЧ** Мацей (Macej Lukaszewicz), паходзіў з Полацка; у 1680 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 2 г. да віленскага злотніка М. Грэйтэра, пасля заканчэння вучобы запісаны ў падмайстры; у 1686 г. мясцовыя ўлады запісалі яго [падмайстрам?] на тэрмін у 4 г. да *Станіслава Даніловіча* (L—V, № 1.730).

I. 1. 211. **ЛУКАШЭВІЧ** Тэадор (Theador Lukaszewicz), паходзіў з Полацка; у 1718 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 5 г. да віленскага злотніка *Г. Сніткі*, пасля заканчэння вучобы запісаны ў падмайстры; 02.07.1724 атрымаў званне майстры віленскага злотніцкага цэха (L—V, № 1.731).

I. 1. 212. **ЛУКАШЭВІЧ** Цярэшка (Лукашевич Терешко), злотнік шклоўскі;

у 1579 г. скардзіцца ў Магілёўскі магістрат на Герасіма Максімовіча, што той паводле «закладу, таляра не отдавши над то еще и мой талер подхвативши до себе... отдати не хочет» (АВАК, т. 39, с. 482).

І. 1. 213. **ЛУК'ЯНАЎ** Ян (Лукьянов Ян), паходзіў з Вільні, «іншаземец-паляк», вучань у Срэбранай палаце г. Масквы; згадваецца ў 1660 г. у імянным роспісе срэбранай справы як старшы вучань (Троицкий, вып. 2, с. 72).

І. 1. 214. **ЛУНЕЎСКІ** Томаш (Tomasz Luniewski), мешчанін і злотнік гарадзенскі; згадваецца ў 1637 г. як старшы гарадзенскага злотніцкага цэха ў прывілеі на наданне цэха (КМФ-18, спр. 113, арк. 1 зв.); упамінаецца ў 1641 г. у маёмасных прэтэнзіях да яго збоку зямяніна Гарадзенскага пав. В. Абрэмскага (НГАБ у Мінску, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 68 зв.).

І. 1. 215. **ЛЮБАШЭЎСКІ** Казімір (Kazimerz Lubaszewski), паходзіў з Пружан; у 1716 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 3 г. да віленскага злотніка *В. Трояноўскага*, пасля заканчэння вучобы запісаны ў падмайстры (L—V, № 1.727).

І. 1. 216. **ЛЮТАВІЦКІ** Грыгорый Іваноў, месца паходжання не высветлена, маскоўскі срэбраных спраў майстра; згадваецца ў 1671 г. (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 45).

І. 1. 217. **ЛЯВОНЦЬЕЎ** Максім, нарадзіўся ў Смаленску; у 1655 г. «у малых летах» забраны з маткай, 3 г. жыў каля Чудава манастыра і вучыўся там срэбраніцкай справе, пазней адкупіўся ад уладальнікаў; у 1676 г. жыў у Мяшчанскай слабадзе г. Масквы (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 22).

І. 1. 218. **ЛЯХОЎСКІ** Іван (Ioannes Lachowski), брат *П. Ляхоўскага*, паходзіў з Віцебска, працаваў у Вільні злотнікам; двойчы, у 1746 і 1756 гг., прымаў віленскае падданства; у 1757 і 1758 гг. плаціў падаткі ў віленскі злотніцкі цэх (L—V, № 1.657).

І. 1. 219. **ЛЯХОЎСКІ** Пётра (Petrus Lachowski), брат *І. Ляхоўскага*, паходзіў з Віцебска, працаваў у Вільні злотнікам; двойчы, у 1746 і 1756 гг., прымаў віленскае падданства; у 1757 г. падмайстра віленскага злотніцкага цэха; у 1758 г. заплаціў уступны ўзнос у віленскі злотніцкі цэх (L—V, № 1.659).

І. 1. 220. **МАГРЭ** Якуб (Jakobus Mohre), злотнік (aurificus) віленскі; згадваецца ў 1634 г. крэдыторамі па іску да яго ўдавы Катарыны Арэнтавай Магровай (КМФ-18, спр. 312, арк. 62 — 63 зв., 100 зв. — 101).

І. 1. 221. **МАКАРОВІЧ** Іван (Iwan Makarowicz), злотнік і мешчанін магілёўскі;



*Адбітак пячаткі места майдэборскага Ваўкавыска. 1633 г.*

згадваецца ў 1629 г. у пастанове на стварэнне цэха (ИЮМ, т. 8, с. 426).

I. 1. 222. **МАКОЎСКІ** Андрэй (Jędrzey Makowski), паходзіў з Гародні; у 1686 г. запісаны вучнем на 3 г. да віленскага злотніцкага майстры *А. Скіндэра* (*Скіндэровіча*), пасля заканчэння вучобы запісаны падмайстрам (МЭ, с. 205; L—V, № 1.739).

I. 1. 223. **МАКСІЕВІЧ** Віктар Янавіч (Wiktor Maksiewicz, syn Jana), нарадзіўся ў 1767 г. у Лідзе; 18.03.1782 залічаны вучнем на тэрмін у 7 г. да віленскага злотніцкага майстры Б. Кейды; 21.09.1788 запісаны падмайстрам; фігуруе у віленскай падмайстроўскай кнізе пад 1795—1796 гг.; яго жонка Разалія Шалькевіч паходзіла з Мінска; памёр у 1801 (1806?) г. (L—V, № 1.744; № 826)[6].

I. 1. 224. **МАКСІМАЎ** Фёдар (Максимов Федор), «іншаземец-паляк» з Віцебска, вучань у Маскоўскай срэбранай палаце; у 1660 г. служыў у гэтым месцы (Троицкий, вып. 2, с. 72).

I. 1. 225. **МАЛХЕРОВІЧ** Павел, злотнік з Мядзеля; згадваецца ў 1538 г. (Łopaciński, № 29; L—V, № 1.746).

I. 1. 226. **МАЛЫ** Юрый (Юрей Малый), злотнік (каралеўскі?); згадваецца 06.12.1559 г. у інвентары «рэчаў», пасланых у інфлянцкія замкі; накіраваны ў замак «Боўска» (КМФ-18, спр. 37, арк. 402).

I. 1. 227. **МАЛЬТАН** Фрыдрых (Frydrych Maltan), злотнік берасцейскі, старшы цэха; згадваецца ў 1624 г. у справе *М. Гранастайскага* супраць цэха (КМФ-18, спр. 305, арк. 14 зв. — 15; АВАК, т. 6, с. 256—257); упамінаецца ў 1626 г. у справе цэха супраць парушальніка статута *С. Радванскага* (АВАК, т. 6, с. 268—269; L—V, № 1.748).

I. 1. 228. **МАНДРЫКА** Стэфан (Мандрыка Стефан), злотнік і мешчанін полацкі; 16.02.1650 набыў у Полацку агарод «за [гарадскім] парканам лежачый на пол пляца» каля вул. Вялікай (ИЮМ, т. 5, с. 127—128); 08.04 прыцягнуты да магістрацкага суда за адмову выплаціць пану Гарбузу 8 злотых, суд «учыніў яго вольным» ад гэтых прэтэнзій (тамсама, с. 205—206); 05.08 выступаў разам са злотнікам *С. Савіцкім* супраць полацкага злотніка *С. Хадыкі* (тамсама, с. 38).

I. 1. 229. **МАРКОВІЧ** Рыгор (Грегорей), згадваецца 12.01.1629 як злотнік і мешчанін м. Стары Быхаў Аршанскага пав. (AGAD, AR, dz. XXIII, t. 64, p. 11, dok. № 18).

I. 1. 230. **МАРЦЫМОВІЧ** Себасцьян (Sebestian Marcymowicz), злотнік віленскі; у 1592 г. абвінавачаны Л. Мамонічам у дачы хабару «ў кілька сот злотых» войту Вільні М. Бурмінскаму, а «жене его клейнот [на] ношение» (АВАК, т. 20, с. 72—74).

I. 1. 231. **МАРЦЫЯНОВІЧ** Геранім (Heranim Marcyanowicz), «літвін», злотнік; 10.06.1666 уступіў у езуіцкі ордэн; працаваў у Вільні і Варшаве; з 1674 г. — у Нясвіжы: для касцёла Божага Цела пазалаціў вялікі крыж, а для нясвіжскага касцёла Св. Міхаіла — манстрацыю; памёр 16.04.1688 у Нясвіжы (SJA, s. 157).

I. 1. 232. **МАСКОЎСКІ** Пётра (Московский Петр), злотнік і мешчанін віленскі;

[6] Нам здаецца, што пад двума рознымі нумарамі аўтарамі ўлічана адна і тая ж асоба, ды і іх біяграфіі супадаюць па храналогіі і добра дапаўняюць адна адну.




*Адбітак пячаткі ордэна кармелітаў Правінцыі Літоўскай, выразанай у 1766 г. (павялічаны)*

у 1593 г. меў ва ўтрыманні «пяты дом у фальварку Рай [каля Вільні], едучы да маста праз Веллю па левай руцэ» (АВАК, т. 8, с. 469; тамсама, т. 20, с. 92).

I. 1. 233. **МАТВІЦОВІЧ** Хама (Thoma Mathwiciowicz), злотнік віленскі; згадваецца ў 1634 г. у іску да спадкаемцаў *Я. Магрэ* (КМФ-18, спр. 312, арк. 100 зв.).

I. 1. 234. **МАТУЛЕВІЧ** Казімір (Kazimierz Matulewicz), паходзіў з Ліды; у 1696 г. залічаны вучнем на тэрмін у 2 г. да віленскага злотніцкага майстры Я. Александровіча (Łopaciński, № 478; МЭ, с. 203; L—V, № 1.770).

I. 1. 235. **МАТЫСАН** Пётра (Piotr Mattysen), злотнік і мешчанін нясвіжскі; 02.09.1616 купіў палову пляца «ў нясвіжскім рынку» за 80 коп грошаў літоўскіх у злотніка *М. Вітэмберга*; 10.08.1619 згадваецца ў лісце на продаж нясвіжскім радцам Я. Свістуновічам свайго дома, што каля дома П. Матысана; 13.03.1620 атрымаў згоду (за 85 злотых) свайго суседа, нясвіжскага войта В. Смалянскага, на «прымураванне» да сцяны яго дома сваёй прыбудовы (AGAD, AR, dz. XV, t. 5, s. 1—5).



*Адбітак пячаткі аршанскага Куцеінскага Богаяўленскага манастыра. XVII ст.*

I. 1. 236. **МЕЛЬНІКАЎ** Адмос Цімафеевіч (Мельников Адмос Тимофеевич), названы «поляк» з Неўля, нарадзіўся ў 1679 г.; фігуруе ў спісе майстраў залатых і срэбраных спраў «рускага» злотніцкага цэха ў Санкт-Пецярбургу; памёр у 1748 г. (РИБ, с. 276).

I. 1. 237. **МЕРГЕЛЬ** Аўгусцін (Augustinus Mergel), каралеўскі злотнік пры двары Стэфана Баторыя, працаваў у 1582—1587 гг.; найбольш вядомая работа — каралеўскія рэгаліі: карона, яблык і каралеўская ляска, зробленыя для С. Баторыя; у дакументальных матэрыялах называецца таксама гарадзенскім злотнікам: магчыма, рэшту жыцця правёў у Гародні (L—V, № 1.795).

I. 1. 238. **МІКАЛАЕЎ** Лаўрын, нарадзіўся ў Шклове, срэбраных спраў майстра; у 1669 г. выехаў у Маскву і жыў у свайго брата *Р. Мікалаева* ў Канюшэннай слабадзе, а пасля перасяліўся ў Новамяшчанскую слабаду (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2).

I. 1. 239. **МІКАЛАЕЎ** Воська, «шкловеленік» (паходзіў са Шклова), маскоўскі срэбранік; у 1656 г. «выехал на государево имя»; у 1676 г. жыве ў Мяшчанскай слабадзе г. Масквы, «прамышляе срэбраніцкім майстэрствам» (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 2).

I. 1. 240. **МІКАЛАЕЎ** Рыгор, месца паходжання не высветлена, маскоўскі срэбраных спраў майстра; у 1655 г. «прыняў на жыццё» пляменніка са Шклова *С. Філіп'ева*, у 1669 г. — брата

*Л. Мікалаева*; працаваў у Срэбранай палаце, да 1679 г. меў вучня *І. Шчукіна* (Материалы… купечества, т. 1, прил. 2, с. 69, 96).

І. 1. 241. **МІКУЛАЕЎ** Фёдар (Микулаев Федор), месца паходжання не высветлена, «іншаземец», Срэбранай палаты майстра чаканкі і чарнення; у 1663 г. прыняты ў «кормовые» майстры; у 1665 г. зрабіў цару талерку «черненскую осьмигранную»; у 1669 г. удзельнічаў у вырабе царкоўнага начыння для ўсяленскага патрыярха; у 1676 г. выразаў тры маскоўскія дзяржаўныя пячаткі; меў вучня *М. Андрэева* (1677); у лістападзе 1678 г. адхілены ад пасады, а яго дом за Срэценскай брамай апісаны за даўгі; у 1679—1680 гг. зноў працаваў у Срэбранай палаце (Троицкий, вып. 2, с. 77—78).

І. 1. 242. **МІКУНЕВІЧ** Рыгор, паходзіў з Навагародка; у 1689 г. запісаны вучнем да віленскага майстры *А. Скіндэровіча* на тэрмін у 2 г. (МЭ, с. 205).

І. 1. 243. **МІЛАДОЎСКІ** Міхал (Michal Miładowski), паходзіў з Навагародскага ваяв.; у 1683 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка Л. Юнковіча, пасля заканчэння вучобы запісаны падмайстрам (L—V, № 1.813).

І. 1. 244. **МІТНАХТ** Ганус (Hanus Mitnacht, Stokwisz), злотнік і мешчанін берасцейскі, арыянін; у 1642 г. абвінавачваецца *Ш. Сапальскім* у гвалтоўным перахопе лістоў і рэчаў, называецца «непрыяцелем касцёла Божага і веры святой каталіцкай» (АВАК, т. 6, с. 407—408, 411—414; Łopaciński, № 145; L—V, № 1.820).

І. 1. 245. **МІХАЙЛАЎ** Якушка, паходзіў з Талочына, маскоўскі майстра срэбраных спраў; у 1655 г. захоплены ў палон стралецкім маёрам, прададзены саладоўніку, ад якога адкупіўся; у 1674 г. перайшоў жыць у Мяшчанскую слабаду; у 1676 г. мае сына Барыску; у 1684 г. плаціць цягла 20 алтын (Материалы… купечества, т. 1, прил. 2).



*Адбітак пячаткі майдэборскага места Ліды, выразанай у 1792 г.*

І. 1. 246. **МІХАЛОЎСКІ** Антон (Antoni Michalowski), паходзіў з Лагойска; 14.07.1722 запісаны ў вучні на тэрмін у 3 г. да віленскага злотніка *В. Траяноўскага*; 30.09.1725 атрымаў званне падмайстры, працаваў як незалежны злотнік; 12.01.1738 атрымаў мескія правы, запісаны на атэстацыю на тэрмін у 3 г. да віленскіх злотнікаў Я. Гронемана і *Г. Сніткі*; у 1739 г. атрымаў званне майстры; у 1742 г. значыцца ў цэхавых дакументах як збяднелы; памёр да 1768 г., у гэтым годзе ў цэхавай капліцы адслужана абедня на ўспамін яго душы (L—V, № 1.802).

І. 1. 247. **МІХАЛОЎСКІ** Крыштаф (Krzysztoph Michalowski), злотнік віленскі; згадваецца ў 1675 г. у скарзе вілен-

скіх краўцоў на злотнікаў (АВАК, т. 10, с. 415).

I. 1. 248. **МІХНЕВІЧ** Захар, паходзіў з Менска; у 1688 г. запісаны вучнем да віленскага майстры *Я. Рагацэвіча* на тэрмін у 7 г. (МЭ, с. 205); запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка Я. Александровіча (L—V, № 1.807).

I. 1. 249. **МІХНОЎСКІ** Станіслаў (Stanislaw Michnowski), злотнік віленскі; у 1627 г. набыў дом Данілеўскай; у 1629 г. той жа дом на вул. Смілінскай заклаў П. Асінскаму (АВАК, т. 20, с. 421).

I. 1. 250. **МІШКЕВІЧ** Павел (Мишкевич Павел), злотнік менскі; у 1590 г. атрымаў ад шабельніка Іова Церашковіча «шаблю, оправную серебром» (АВАК, т. 36, с. 361).

I. 1. 251. **МУХНЕВІЧ** Грыгорый (Grzegorz Muchniewicz), паходзіў з Навагародка; у 1689 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 2 г. да віленскага злотніка *А. Скіндэра (Скіндэровіча)*; атрымаў віленскае грамадзянства; у 1692 г. выпісаны з цэхавых кніг у сувязі з ад'ездам у іншае места разам са злотнікам В. Шышам (L—V, № 1.810).

I. 1. 252. **МЯДЗВЕДЗЕЎ** Аніка Фралоў (Медведев Аника Фролов), «іншаземец-паляк» з Віцебска, Срэбранай палаты жалаваны майстра; згадваецца ў 1660 г. сярод майстраў Срэбранай палаты Маскоўскага Крамля, займаў 10 г. пасаду майстры, жыў у Броннай слабадзе; у 1663 г. па палітычных меркаваннях адхілены ад службы (Троицкий, вып. 2, с. 77).

I. 1. 253. **МЯНЧЫНСКІ** Стэфан, паходзіў з Ашмян; у 1675 г. запісаны вучнем да віленскага майстры *Я. Рагацэвіча* на тэрмін у 6 г. (МЭ, с. 205).

I. 1. 254. **НАСУЛЕВІЧ** Казімір (Kazimierz Nosulewicz); у 1791—1794 гг. вучыўся ў нясвіжскага злотніка *Кікенапа*; 16.09.1797 атрымаў кваліфікацыю падмайстры ў віленскім злотніцкім цэху (L—V, № 1.864).

I. 1. 255. **НЕАПАЛІТАНЧЫК** Пётра (Piotr Neapolitanczyk); у 1552 г. злотнік каралевы Боны, атрымаў ад яе пляц пад пабудову дома і агарод у Гародні (Lepszy, s. 96).

I. 1. 256. **НЯДЗВЕДСКІ** Марцін (Мікалай; Marcin Niedwedzki), паходзіў з Менска; у 1688 г. запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка *Л. Віланса*, пасля заканчэння вучобы запісаны падмайстрам; у 1698 г. атрымаў званне майстры віленскага злотніцкага цэха; меў жонку Дароту Вярбоўскую і дзвюх дачок (Łopaciński, № 352; L—V, № 1.847); нам здаецца, што ён быў улічаны двойчы — гл. L—V, № 1.845.

I. 1. 257. **НЯДЗВЕДСКІ** Марцін, паходзіў з Менска; у 1694 г. запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага майстры *Ю. Александровіча* (МЭ, с. 203).

I. 1. 258. **НЯЎГЛЕЎСКІ** Томаш (Tomasz Newglewski), гарадзенскі таварыш рамяства залатарскага; 21.09.1654 ахвяраваў гарадзенскаму Фарнаму касцёлу срэбраную таблічку, на якой выграviраваны «вочы на алтар Анёла захавальніка» (Łopaciński, № 131).

I. 1. 259. **ПАДОСКІ** Якуб (Jakub Podoski), паходзіў з Віцебска; у 1672 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 6 г. да віленскага злотніка М. Грэйтэра (L—V, № 1.887).

I. 1. 260. **ПАЛАЧАНІНАЎ** Давыд, месца паходжання не высветлена, срэбраных спраў майстра; у 1625—1626 гг. працаваў у Масковіі, рабіў «царицыны разные серебрянные дела» (Железнов, с. 45).

I. 1. 261. **ПАЛАЧАНІНАЎ** Іван Пракопаў (Полоченинов Иван Прокопьев), паходзіў з Полацка, брат *Ф. П. Палачанінава*; у 1660 г. лічыўся вучнем у Срэбранай палаце з жалаваннем у 5 рублёў на год; у 1679 г. пажалаваны «палукармазінавым» сукном як лепшы майстра (Троицкий, вып. 2, с. 106).

I. 1. 262. **ПАЛАЧАНІНАЎ** Фёдар (Полоченинов Федор), паходзіў з Віцебска; у 1660 г. фігуруе як вучань у Срэбранай палаце ў віцебскіх майстраў (Троицкий, вып. 2, с. 107); магчыма, сын *Ф. П. Палачанінава* ці яго брата.

I. 1. 263. **ПАЛАЧАНІНАЎ** Фёдар Пракопаў (Полочанинов Федор Прокопьев), «поляк» з Полацка; у 1660 г. жалаваны майстар, жыў у Маскве з жонкай і сынам, меў брата Івашку (*І. Палачанінава*); у 1664 г. атрымаў «для бедности» ўсе кармавыя грошы на год (Троицкий, вып. 2, с. 107).

I. 1. 264. **ПАЛЬЧЭЎСКІ** Стэфан, паходзіў з Геранёнаў Ашмянскага пав.; у 1669 г. запісаны вучнем да віленскага майстры *О. Петэрсана* на тэрмін у 6 г., пасля заканчэння вучобы запісаны падмайстрам (Łopaciński, № 286; МЭ, с. 204; L—V, № 1.889).

I. 1. 265. **ПАРХВЯНОВІЧ** Іван (Пархвянович Иван), атрымаў ад князя Ф. І. Яраславіча разам са сваімі братамі Трухонам і Лявонам дворышчы ў Пінскім пав. у сёлах Купятычы, Гарадзішча Куслоўскае і Пухначоўскае; атрымаў пацверджанне надання ў 1537 г. «зямяніну пінскаму І. Пархвяновічу ад каралевы Боны ў Пінску на два дворышчы» (Lepszy, s. 249); згадваецца ў 1554 г. у «Ревизии пущ...» (Ревизия пущ... с. 226—227).

I. 1. 266. **ПАЎЛАЎ** Адам (Павлов Адам), месца паходжання не высветлена, званы «поляк», жалаваны майстра Срэбранай палаты; у 1613—1614 гг. атрымаў «пожалованье» 4 аршыны «сукна лазоревага» (Троицкий, вып. 2, с. 92).

I. 1. 267. **ПАЎЛОВІЧ** Марцін (Martin Pawlowicz), паходзіў з Бярэсця; 16.08.1748 запісаны на 4 г. вучнем да віленскага майстры *І. Лары*, пасля заканчэння вучобы атрымаў званне падмайстры (Łopaciński, № 764; L—V, 1.896).

I. 1. 268. **ПАШКЕВІЧ** Канстанцін, паходзіў з Мсцібава; у 1695 г. запісаны вучнем да віленскага майстры *Станіслава Даніловіча* на тэрмін у 3 г. (МЭ, с. 204).

I. 1. 269. **ПАШТЭЎКА** Войцех (Wojtech Pasztewka), злотнік, нарадзіўся ў 1607 г. у Мазыры; 16.04.1633 уступіў у ордэн езуітаў; жыў і працаваў пры віленскім касцёле Св. Ігнація (SJA, s. 172; L—V, № 1.894).

I. 1. 270. **ПЕТЭРСАН** Олаф, злотнік віленскі; у 1663 г. абіраўся цэхмістрам



*Адбітак гарадзенскай лаўнічай пячаткі, выразанай у 1565 г.*

(МЭ, с. 204); меў вучняў: *П. Кахлеўскага* (1663), *С. Пальчэўскага* (1669), *Я. Філіповіча* (1673—1674) і інш.

І. 1. 271. **ПІГОРЦАЎ** Васіль Абакумаў (Пигорцев Василий Абакумов), месца паходжання не высветлена, «поляк», жалаваны майстра Срэбранай палаты; у 1660 г. атрымліваў 12 рублёў жалавання на год; у 1664 г. звольнены па палітычных меркаваннях (Троицкий, вып. 2, с. 105).

І. 1. 272. **ПІРХАЛА** Войцех (Пирхала Войтех), залатар віленскі; згадваецца ў 1594 г. у тэстаменце Л. Ратамскага, які прадпісвае вярнуць злотніку доўг у 21 капу 15 грошаў (АВАК, т. 8, с. 475).

І. 1. 273. **ПІЯТРОЎСКІ** Станіслаў (Stanislaw Piotrowski), злотнік берасцейскі; у 1626 г. разам з мясцовымі злотнікамі *Я. Дрэзнерам* і *Ф. Мальтанам* скардзіўся ў магістрат на злотніка *С. Радванскага* за «нягодныя» паводзіны і сістэматычнае парушэнне цэхавага статута (АВАК, т. 6, с. 268—269).



*Адбітак пячаткі епіскапа Тураўскага і Пінскага Ціхана. 1525 г.*

І. 1. 274. **ПІЯТРОЎСКІ** Юрэй (Jerzy Piotrowski), паходзіў з Ашмянскага пав.; 29.08.1730 запісаны на 8 г. да віленскага злотніцкага майстры Я. Боленса (L—V, № 1.907).

І. 1. 275. **ПЛАТЫН** Пётра (Платын Пётр), пробер віленскай мінцы; фігуруе 06.02.1592 у лісце Жыгімонта Аўгуста аб «вызваленні» яго з вязніцы і вяртанні яму «друку і інструментаў» (АВАК, т. 8, с. 258—259); 05.04.1592 згадваецца ў лісце таго ж манарха аб непадсуднасці П. Платына віленскаму земскаму і гродскаму судам (тамсама, с. 257—258).

І. 1. 276. **ПЛЯТ** Давід (Dawid Plat), злотнік віленскі; у 1696 г. меў дом «тылам» да вул. Латочкавай (АВАК, т. 20, с. 487); у 1705 г. старшы злотніцкага цэха (тамсама, т. 10, с. 61).

І. 1. 277. **ПОЗЕР** Крысціян (Chistian Pozer), запісаны ў 1793 г. вучнем да гарадзенскага злотніцкага майстры *Я. Колса* (L—V, № 1.935).

І. 1. 278. **ПРАКОФ'ЕЎ** Фёдар (Прокофьев Федор), «взят из Полоцка, поляк, знаменщик», срэбраных спраў майстра; у 1660—1678 гг. працаваў у Маскоўскай срэбранай палаце; зрабіў для царскіх дзяцей Іаана і Пятра Аляксеевічаў па срэбраным рукамыйніку, упрыгожаным фініфцямі (Собко, с. 446; Железнов, с. 49).

І. 1. 279. **ПРУС** Ісаяш (Isaiasz Prus), злотнік каралеўскі; згадваецца ў 1606 г. у каралеўскім лісце ад 29.04 да віленскіх злотнікаў аб прыняцці яго, І. Пруса, у цэх з выкананнем работы цэхавай (майстэрчыкаў), але са змяншэннем тэрмінаў, абгавораных статутам для прыёму ў цэх (КМФ-18, спр. 86, арк. 586).

I. 1. 280. **РАБЕ** Якуб Карл (Jakub Karl Rabbe), злотнік і ювелір гарадзенскі; у 1793 г. разам са сваім калегам гарадзенскім ювелірам *Д. Лангрыным* выступаюць у судовым працэсе аб залатой табакерцы (L—V, № 1.944).

I. 1. 281. **РАГАЦЭВІЧ** Ян (Jan Rohacewicz), паходзіў з Варшавы, упамінаецца як злотнік віленскі ў 1664—1701 гг.; у 1667—1672 гг. жыў разам з жонкай Катарынай Валчковічаўнай у царкоўнай камяніцы на вул. Шкляной каля Уваскрасенскай царквы (АВАК, т. 9, с. 225; тамсама, т. 10, с. 417, 418; тамсама, т. 20, с. 412, 424, 426, 428, 431, 444); згадваецца ў 1677 г. як «рочны» старшы цэха ў скарзе цэха на злотніка Ю. Барчынскага (тамсама, т. 10, с. 418); неаднаразова абіраўся цэхмістрам; да яго ў вучні запісаны *Г. Керсноўскі* (1664), *А. Барысовіч* (1697), *Я. Дожбах* (1667); *П. Санкоўскі* (1673); *М. Апановіч* (1675); *С. Мянчынскі* (1675), *С. Карпоўскі* (1676), *Я. Гальшавер* (1680), *К. Калікевіч* (1683), *З. Міхневіч* (1688) і інш.; у 1701 г. згадваецца як нябожчык (АВАК, т. 20, с. 499).

I. 1. 282. **РАДВАНСКІ** Станіслаў (Stanislaw Radwanski), злотнік, «прыстаўшы да цэха Берасцейскага»; у 1626 г. згадваецца як асоба, што парушае цэхавы статут, не прыняў «водлуг парадку мескія правы» і не прынёс гораду прысягу (АВАК, т. 6, с. 268—269).

I. 1. 283. **РАДВІЛА** Юрэй (Jerzy Radwilo), паходзіў з Ашмян; у 1695 г. запісаны на 5 г. у вучні да віленскага майстры-злотніка А. Дольфуса (МЭ, с. 204; L—V, № 1.947)

I. 1. 284. **РАДЗЕВІЧ** Ян (Jan Rodziewicz), злотнік віленскі; у 1671 г. жыў у камяніцы на вул. Шкляной каля Уваскрасенскай царквы; у 1690 г. меў дом у магістрацкай юрысдыкцыі (АВАК, т. 20, с. 424, 475).

I. 1. 285. **РАДКЕВІЧ** Марцін (Marcin Rodkewicz), злотнік з Гарадца Навагародскага ваяв.; згадваецца ў 1707 г. у справе *А. Зелянеўскага*, які называе яго «таварышам». Радкевіч гэта адмаўляе ў судзе, прызнаючы, што той частаваў яго гарэлкай і падараваў чвэрць чырвонага злотага (ИЮМ, т. 11, с. 257—258).

I. 1. 286. **РАЗЫНКЕВІЧ** Ігнацы (Ignacy Rozynkewicz), паходзіў з Полацка; у 1713 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка *В. Траяноўскага*, у 1715 г. — у падмайстры да таго ж майстры; у 1742 г. майстра віленскага злотніцкага цэха (L—V, № 1.979).

I. 1. 287. **РАМАНАЎ** Пашка, нарадзіўся ў Мсціслаўі, гранільшчык каштоўных камянёў («алмазнік»); у 1658 г. трапіў у Маскву, вучыўся 5 г. у «денежнага майстры» Ф. Ільіна, потым працаваў 5 г. у «алмазніка» Марціна Астаф'ева; у 1673 г. жыве ў Мяшчанскай слабадзе г. Масквы, у 1676 г. — там жа, займаецца агранкай каштоўных камянёў (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 18).

I. 1. 288. **РАМАНОВІЧ** Валянцін (Walenty Romanowicz), паходзіў з Меднікаў з-пад Вільні; у 1696 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 5 г. да віленскага злотніка *В. Шыша*; у 1707 г. атрымаў званне майстры віленскага злотніцкага цэха (L—V, № 1.950).

I. 1. 289. **РАМАНОВІЧ** Васко (Wasko), злотнік пінскі; у 1553—1555 гг. меў пляц на левым баку, «ідучы ад замка» па вул. Жыдоўскай (Писцовая книга Пинского и Клецкого княжеств, с. 23).

I. 1. 290. **РАСТКОВІЧ** Станіслаў (Stanislaw Rostkowicz), злотнік менскі; згад-

ваецца ў 1592 г. у прывілеі на цэх (БА, т. 3, с. 69, 213).

I. 1. 291. **РАХІЕВІЧ** Станіслаў, злотнік пінскі; у сярэдзіне XVI ст. меў пляц «у рынку» (Лозицкий, с. 39).

I. 1. 292. **РАЧКА** Якуб (Jakub Raczka), злотнік берасцейскі; згадваецца ў 1599 г. у прывілеі на цэх (КМФ-18, спр. 106, арк. 93); у 1624 г. яго ўдава Магдалена Якубава, «злотнічка берасцейская», прадала агарод «жыду берасцейскаму Шлёме Насонавічу» (НГАБ у Мінску, ф. 1786, воп. 1, спр. 1, арк. 167—168).

I. 1. 293. **РОНТАЛЬ** Ганус (Hanus Rontel), злотнік і мешчанін віленскі; згадваецца ў 1621—1630 гг. у кантракце па найме жылля ім разам з жонкай Ганнай Енкаўнай каля Уваскрасенскай царквы ў Вільні (КМФ-18, спр. 106, арк. 453 зв. — 454 зв.).

I. 1. 294. **РУЖЭЙНІКАЎ** Пётра Іваноў (Ружейников Петр Иванов), нарадзіўся ў 1714 г., месца паходжання не высветлена, названы «поляк»; фігуруе ў спісе майстраў залатых і срэбраных спраў «рускага» злотніцкага цэха ў Санкт-Пецярбургу; у 1764 г. звесткі аб ім адсутнічаюць (РИБ, с. 276).



*Адбітак пячаткі Мсціслаўскага Тупічаўскага манастыра. 1736 г.*

I. 1. 295. **РУСАК** Мікалай (Mikolaj Rusiak), чаляднік гарадзенскага злотніка *Л. Скрабякевіча*; у 1638—1639 гг. абвінавачваецца ў крадзяжы грошай у свайго гаспадара (КМФ-18, спр. 316, арк. 232 зв. — 233 зв.).

I. 1. 296. **РУФЕРТ** Ігнацы (Ignacy Ruffert), паходзіў з Рэжыцы; 19.04.1773 запісаны вучнем на тэрмін у 2 г. да віленскага злотніка Я. Ф. Фогеля (L—V, № 1.985).

I. 1. 297. **РЫК** Ян (Jan Ryk), злотнік берасцейскі; згадваецца ў 1599 г. у прывілеі на цэх (КМФ-18, спр. 106, арк. 93).

I. 1. 298. **РЫНЦЭВІЧ** Язэп, пахозіў з Паставаў Ашмянскага пав.; у 1684 г. запісаны да віленскага майстры *Станіслава Даніловіча* вучнем на тэрмін у 2 г., але вучобы не скончыў (МЭ, с. 203; L—V, № 1.964).

I. 1. 299. **РЫСТКОВІЦ** Станіслаў (Stanislaw Rystkowic, Rystkowicz), злотнік і мешчанін менскі, праваслаўны; згадваецца ў 1627 г. у лісце караля ў якасці «актора», які прыцягваў у суд духоўны і магістрацкі мешчаніна Конрада Іванавіча Курцовіча (КМФ-18, спр. 305, арк. 75 зв. — 77).

I. 1. 300. **РЭДЭР** Станіслаў (Stanislaw Reder), злотнік гарадзенскі; з 10.09.1628 па 1654 г. зарэгістраваны ў кнізе сяброў стралецкага брацтва Св. Антонія пры гарадзенскай Фары (Łopaciński, № 131; L—V, № 1.953).

I. 1. 301. **РЭЧЫНСКІ** Павел (Pawel Rzeczynski), злотнік і мешчанін віленскі;

згадваецца ў 1663 г. у дагаворы на арэнду ім і яго жонкай Зафеяй Лукашэвіч царкоўнай камяніцы на вул. Шкляной каля Уваскрасенскай царквы; фігуруе ў 1650 г. у іску яго злотніка Я. Граковіча (КМФ-18, спр. 342, арк. 4 зв.; АВАК, т. 9, с. 197—199).

І. 1. 302. **РЭЧЫНСКІ** Ян (Jan Rzeczynski), злотнік віленскі; у 1672 г. жыў у доме на вул. Шкляной разам са злотнікам *Я. Рагацэвічам* (АВАК, т. 9, с. 225).

І. 1. 303. **САБАЛЕЎСКІ** Валянцін (Sobolewski Walenty), паходзіў са Слоніма; 20.10.1724 запісаны ў вучні на тэрмін у 6 г. да віленскага злотніка Г. Траянскага, вучобы не скончыў (МЭ, с. 206; L—V, № 1.1041).

І. 1. 304. **САВІЦКІ** Масей (Moyżes Sawicki), паходзіў з Віцебска; 14.06.1722 запісаны ў вучні на тэрмін у 6 г. да віленскага злотніка *Г. Сніткі* (L—V, № 1.1003).

І. 1. 305. **САВІЦКІ** Стэфан, злотнік полацкі; 05.08.1650 выступае разам са злотнікам *С. Мандрыкам* «актарам» па іску да полацкага злотніка *С. Хадыкі* (ИЮМ, т. 5,с. 38).

І. 1. 306. **САМОЎСКІ** Міхал (Michael Somowski), злотнік з мяст. Баруны Ашмянскага пав.; згадваецца ў 1701 г. як сведка ў справе паміж Барунскай уніяцкай царквой і ўладальнікамі гэтага мястэчка Песлякамі (АВАК, т. 11, с. 320).

І. 1. 307. **САНКОЎСКІ** Павел, паходзіў з Заблудава; у 1673 г. запісаны вучнем да віленскага майстры *Я. Рагацэвіча* на тэрмін у 6 г. (МЭ, с. 205).

І. 1. 308. **САПАЛКОВІЧ** Адам (Adamus Sapalkowicz), злотнік і радца менскі, старшы цэха; згадваецца ў 1671 г. у



*Адбітак пячаткі Віленскага Свята-Троіцкага брацтва пры Віленскім манастыры Св. Духа. 1634 г.*

скарзе менскіх злотнікаў на віленскіх (АВАК, т. 10, ч. 2, с. 380).

І. 1. 309. **САПАЛКОВІЧ** Амброзі (Ambrozy Sapalkowicz), паходзіў з Менска; у 1680 г. запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка *Станіслава Даніловіча,* па заканчэнні вучобы запісаны падмайстрам (Łopaciński, № 429; L—V, № 1.998).

І. 1. 310. **САПАЛКОВІЧ** Андрэй, паходзіў з Менска; у 1688 г. запісаны вучнем да віленскага майстры В. Туркевіча на тэрмін у 4 г. (МЭ, с. 206).

І. 1. 311. **САПАЛКОВІЧ** Марцін (Marcin Sapalkowicz), паходзіў з Менска; у 1685 г. запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніцкага майстры *Станіслава Даніловіча*, пасля заканчэння вучобы запісаны падмайстрам (МЭ, с. 203; L—V, № 1.1045).

І. 1. 312. **САПАЛЬСКІ** Адам (Adamus Sapalski), паходзіў з Менска; у 1669 г. за-

пісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка *Станіслава Даніловіча*; па заканчэнні вучобы запісаны падмайстрам (Łopaciński, № 307; L—V, № 1.999).

I. 1. 313. **САПАЛЬСКІ** Шымон (Szymon Sapalski), злотнік і мешчанін берасцейскі; у 1642 г. выступае са скаргай на *Г. Стоквіша*, якога абвінавачвае ў гвалтоўным перахопе рэчаў і лістоў (АВАК, т. 6, с. 407—408, 411—414); на думку Э. Лапацінскага, пазней з'ехаў з Бярэсця ў Люблін (Łopaciński, № 144; L—V, № 1.100).

I. 1. 314. **САПЕЖКА** Юрэй (Jerzy Sopeżko), паходзіў з Менска; 05.06.1747 запісаны ў вучні на тэрмін 5 г. да віленскага злотніцкага майстры *А. Ганорскага*; 08.04.1753 запісаны ў падмайстры (L—V, № 1.1001).

I. 1. 315. **САРЫНІЧ** Стэфан (Stefan Sorinicz), злотнік і мешчанін магілёўскі; згадваецца ў 1729 г. у пастанове на стварэнне цэха (ИЮМ, т. 8, с. 426).

I. 1. 316. **САСНОЎСКІ** Бенедыкт (Benedykt Sosnowski), паходзіў са Слоніма; у 1690 г. запісаны вучнем да віленскага майстры *Станіслава Даніловіча* на тэрмін у 6 г., пасля заканчэння вучобы запісаны ў падмайстры (МЭ, с. 203; L—V, № 1.1047).

I. 1. 317. **САСНОЎСКІ** Валянцін (Walenty Sosnowski), паходзіў са Слоніма; 20.10.1724 запісаны вучнем на тэрмін у 6 г. да віленскага злотніцкага майстры *В. Траянскага* (L—V, № 1.1041).

I. 1. 318. **САСНОЎСКІ** Міхась (Michael Sosnowski), паходзіў са Слоніма; у 1681 г. запісаны вучнем да віленскага майстры *Станіслава Даніловіча* на тэрмін у 4,5 г. (МЭ, с. 203), пасля заканчэння вучобы запісаны ў падмайстры; згадваецца 21.09.1701 як злотнік у Барунах; у 1702 г. рабіў розныя работы для Барунскага базыльянскага манастыра (L—V, № 1.1050).

I. 1. 319. **САСНОЎСКІ** Якуб (Jakub Sosnowski), паходзіў з Менска; у 1670 г. запісаны вучнем на тэрмін у 5 г. да віленскага майстры *Станіслава Даніловіча*; у 1675 г., пасля заканчэння вучобы, — у падмайстры; у 1685 г. — на [майстроўскую] атэстацыю да таго ж злотніка (МЭ, с. 203; Łopaciński, № 300, 307; L—V, № 1.1047)

I. 1. 320. **САСНОЎСКІ** Ян (Jan Sosnowski), паходзіў са Слоніма; у 1662 г. запісаны вучнем да віленскага майстры М. Шнэйдэра на тэрмін у 2 г., пасля заканчэння вучобы запісаны ў падмайстры (L—V, № 1.1046).

I. 1. 321. **СВЕНЦІЦКІ** Якаб (Jakob Swęcicki), паходзіў з Полацка; у 1698 г. запісаны вучнем на тэрмін у 2 г. да віленскага злотніка Я. Славаковіча; у 1706 г. зафіксавана ў цэхавых кнігах, што Я. Свенціцкі ўнёс 20 залатых уступнога; у 1709 г. згадваецца як вучань Б. Васяровіча (L—V, № 1.1081).

I. 1. 322. **СВЕНЦІЦКІ** Якуб (Jakub Swęcicki), паходзіў з Полацка; у 1691 г. запісаны вучнем на тэрмін у 2 г. да віленскага злотніка В. Слаўковіча, паспяхова скончыў вучобу; згадваецца ў 1706 г. як віленскі злотніцкі падмайстра, у тым жа годзе — як майстра (Łopaciński, № 490, 546, 561).

I. 1. 323. **СВЯЦКІ** Павел (Pawel Swiacki), паходзіў з Суража; у 1721 г. запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка *Г. Б. Крыжаноўскага*; у 1725 г. атрымаў званне падмайстры; 29.06.1732 запісаны на атэстацыю на тэрмін у 3 г. да віленскіх злотнікаў *А. Эерлі* і Г. Шонберга; 11.07.1737

прынёс прысягу «месту Віленскаму» і прыняты майстрам у віленскі злотніцкі цэх (L—V, № 1.1083).

I. 1. 324. **СКАБЯТА** Ян (Jan Skobiata), паходзіў з Навагародскага ваяв.; у 1679 г. запісаны вучнем на тэрмін у 2 г. да віленскага злотніка *Я. Зейдэля* (L—V, № 1.1026).

I. 1. 325. **СКАРБОТА** Сава Міхайлавіч (Sawa Michailowicz Skarbota), злотнік магілёўскі; згадваецца ў 1639 г. у скарзе на магілёўскага мешчаніна Аўтушку Яцкевіча і яго паплечнікаў «о побитьи и забрании» сукна, 20 талераў і 2 залатых пярсцёнкаў з дыямантамі (КМФ-18, спр. 316, арк. 311).

I. 1. 326. **СКАРБОТА** Сямён (Семен Скарбота), злотнік магілёўскі; згадваецца ў 1641 г. як цэхмістр у судовай пастанове па скарзе на партачоў, што працуюць у горадзе; абвінавачваецца апошнімі, што «вандровки не одправовал», таму не можа быць майстрам цэха (ИЮМ, т. 9, с. 412—415); у 1643 г. выступае разам з іншымі адказчыкам па абвінавачванні магілёўскіх рамеснікаў ксяндзом Янам Змальскім у невыкананні імі воскавай павіннасці на карысць Фарнага касцёла (КМФ-18, спр. 320, арк. 743—744 зв.).

I. 1. 327. **СКЕНДЗЕРСКІ** Тадэвуш (Tadeusz Skedzierski), злотнік і мешчанін віленскі; згадваецца ў 1766 г. як старшы цэха ў супольнай скарзе цэхаў на Віленскі магістрат (АВАК, т. 10, с. 525—527); меў вучня *Я. Дама* (1781).

I. 1. 328. **СКІНДЭР (СКІНДЭРОВІЧ)** Аляксандр, злотнік віленскі, першапачатковую адукацыю атрымаў у Вільні; у 1682—1683 гг. злотніцкі таварыш у віленскага майстры *Станіслава Даніловіча*; у 1683 г. атрымаў статус майстры (МЭ, с. 205); сярод яго вучняў былі *Я. Кліноўскі* (1683), *А. Макоўскі* (1686), *Р. Мікуневіч* (1689), *Г. Мухневіч* (1689).

I. 1. 329. **СКРАБЯКЕВІЧ** Лукаш (Lukasz Skrobiakewicz), злотнік гарадзенскі; згадваецца ў 1638—1639 гг. у прэтэнзіях Бернарда Кірковіча Бернадскага на некалькі тысяч злотых (КМФ-18, спр. 316, арк. 232 зв. — 233 зв.); у 1638 г. фігуруе ў актах суда гайнай гарадзенскай ратушы, дзе «ў здаровым целе і розуме» выдае «пленіпотэнцыю» (даверанасць) на вядзенне яго спраў (НГАБ у Мінску, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 95).

I. 1. 330. **СЛІЖЫК** Аляксандр (Alexandr Slizyk), злотнік і мешчанін магілёўскі; у 1707 г. меў дом побач з брацкай царквой, у якой быў учынены крадзеж *А. Зелянеўскім* (ИЮМ, т. 11, с. 257).

I. 1. 331. **СЛІЖЫК** Аляксей (Слижиков Алексей), злотнік і мешчанін магілёўскі; згадваецца ў 1695 г. у магістрацкай прыходна-расходнай кнізе, выплаціў падаткаў «28 злотых 15 осьмаков» (ИЮМ, т. 10, с. 14).

I. 1. 332. **СЛІЖЫК** Ізідор (Izidor Slizyk), злотнік і мешчанін магілёўскі; згадваецца ў 1725 г. у сувязі з абвінавачваннем краўца Марка Скорабагатага ў крадзяжы ў Спаскай царкве і набыццём жонкай Еўдакіяй Аляксандравай Сліжыкавай некаторых крадзеных рэчаў (ИЮМ, т. 13, с. 173).

I. 1. 333. **СЛІЖЫК** Пётра (Piotr Slizyk), злотнік і мешчанін магілёўскі; фігуруе ў 1755—1774 гг. як аўтар каштоўных шатаў для некаторых абразоў, што захаваліся ў магілёўскіх цэрквах, у тым ліку шатаў да абраза Маці Божай (1749) у «малой мураванай царкве» (Дембовецкий, кн. 2, с. 20); у магілёўскай хроніцы падкрэслена, што 20.02.1745 прывезлі

і прыбілі срэбна-залацістыя шаты (абклад) на брацкі абраз Найсвяцейшай Панны. Важылі тыя шаты 62 фунты і спраўлены царкоўным коштам (ПСРЛ, т. 35, с. 280).

І. 1. 334. **СМАЛЕНСКІ** Стэфан (Stefan Smolenski), нарадзіўся ў 1609 г. у Польшчы, злотнік; 13.01.1633 уступіў у езуіцкі ордэн у Вільні; у 1636 г. жыве і працуе ў Нясвіжы; 16.04.1638 пакінуў ордэн (SJA, s. 200; L—V, № 1.1035).

І. 1. 335. **СНІТКА** Грыгорый (Gregory Snitka), паходзіў з Полацка; у 1707 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка *В. Траяноўскага*, у 1711 г. — у падмайстры; у 1713 г. віленскія ўлады запісалі яго [на атэстацыю] да майстраў *В. Траяноўскага* і Я. Г. Клесінза; у 1716 г. атрымаў званне майстры, прынёс прысягу «месту Віленскаму» і быў запісаны ў злотніцкі цэх; сярод яго вучняў былі: Я. Ракіцкі (1716), *Т. Лукашэвіч* (1718), М. Шынкевіч (1719), *М. Савіцкі* (1722), П. Тэрлецкі (1723); Я. Армацкі (1725), *С. Гузоўскі* (1725), *А. А. Хараткевіч* (1725); Я. Канарскі (1726), Д. Бабінскі (1726), П. Балесна (1726), П. Вершаловіч (1726), Б. Камінскі (1727), *М. Астафенка* (1730), І. Кудзіновіч (1736), Я. Гіслоўскі (1737), К. Бзікоўскі (1738), *Я. Снітка* (1743), І. Юнцэвіч (1743), Т. Радкоўскі (1748), *П. Грушчынскі* (1749); меў жонку — Барбару Шыпінскую, а таксама трох сыноў: Паўла-Адама (1718 г.н.), Якуба-Дамініка (1725 г.н.) і Тамаша-Езафата (1728 г.н.) (L—V, № 1.1037); згадваецца ў 1774 г. як былы старшы цэха ў дадатковых артыкулах да цэхавага статута (АВАК, т. 10, с. 60, 61).

І. 1. 336. **СНІТКА** Ян (Jan Snitka), паходзіў з Друі; 06.10.1743 запісаны ў вучні на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка *Г. Сніткі* (L—V, № 1.1038).

І. 1. 337. **СОКАЛ** Матыс, злотнік віленскі, «ураджоны пан»; 06.08.1639 скардзіцца ў Ашмянскі гродскі суд на зямянаў Ашмянскага пав. А. Сеніцкага і Т. Стрэльскага за напад на яго сенажаць на р. Узла каля вёскі Цешыніцы Ашмянскага пав. (НГАБ у Гродне, ф. 584, воп. 1, спр. 121, арк. 329 — 330 зв.).

І. 1. 338. **СПАДОБА** Мацей (Maciej Spodoba), паходзіў са Слоніма; у 1670 г. запісаны вучнем да віленскага майстры *Станіслава Даніловіча* на тэрмін у 2 г., пасля заканчэння вучобы запісаны ў падмайстры (МЭ, с. 203; L—V, № 1.1051).

І. 1. 339. **СПАРЫШЭВІЧ** Крыштаф (Krzysztof Sporyszewicz), злотнік навагародскі; згадваецца ў 1633 г. у прывілеі на цэх (КМФ-18, спр. 3, арк. 616).

І. 1. 340. **СТАНІСЛАВАЎ** Ян (Станиславов Ян), «поляк» з Віцебска, Срэбранай палаты майстра; у 1660 г. жыў у Маскве з жонкай і дачкой; у 1662 г. атрымліваў гадавое жалаванне 8 рублёў; памёр у 1665 г. (Троицкий, вып. 2, с. 124; Железнов, с. 50).

І. 1. 341. **СТАНІСЛАВОВІЧ** Андрэй, «залатар» гарадзенскі, 14.03.1541 заактыкаваў у судзе факт няяўкі ксяндза Яна, каплана [касцёла] Св. Мікалая, якога ён «паклікаў» у суд (АВАК, т. 17, с. 239; тамсама, т. 18, с. 289).

І. 1. 342. **СТАНІСЛАВОВІЧ** Якуб, злотнік і мешчанін пінскі; у 1553—1555 гг. атрымаў 1 валоку зямлі (Писцовая книга Пинского и Клецкого княжеств, с. 37) [магчыма, гэта тая ж асоба, што і пінскі злотнік *Якаў* у 1561—1566 гг.].

І. 1. 343. **СТАНКЕВІЧ** Мацвей (Matwej Stankewicz), паходзіў з Навагародка; у 1670 г. запісаны ў вучні на тэрмін у




*Адбітак пячаткі катэдры Магілёўскай беларускай епіскапіі (павялічаны). 1740 г.*

7 г. да віленскага злотніка М. Грэйтэра (L—V, № 1.1054).

I. 1. 344. **СТАНОВІЧ** Альберт (Albertum Stanowicz), злотнік віленскі; у 1579 г. згадваецца ў іску да яго з боку Матыса Дытрыхоўскага (КМФ-18, спр. 273, арк. 181 зв. — 182 зв.).

**СТОКВІШ**, гл. **МІТНАХТ**

I. 1. 345. **СТРУНК** Крыштаф (Krzysztoph Strunk), злотнік віленскі; 29.06.1634 атрымаў ад караля Уладзіслава IV прывілей, якім «за сваё ўмельства ў рамястве сваім» залічваўся ў каралеўскія слугі і вызваляўся ад юрысдыкцый усіх улад, акрамя падсуднасці каралеўскаму двару (КМФ-18, спр. 111, арк. 74 — 74 зв.).

I. 1. 346. **СУСАЧ** Рыгор (Grzegorz Susacz), паходзіў з Друі; у 1685 г. запісаны вучнем на тэрмін у 6 г. да віленскага злотніцкага майстры *В. Шыша*, пасля заканчэння вучобы запісаны ў падмайстры (L—V, № 1.1080).

I. 1. 347. **СЦЯПАНАЎ** Сенька, паходзіў з Полацка; згадваецца ў 1676 г. як маскоўскі гандляр срэбранымі вырабамі ў Срэбраным радзе (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 27).

I. 1. 348. **СЦЯПАНАЎ** Хрыстафор, паходзіў з Вільні, маскоўскі срэбраных спраў майстра; у 1661 г. у Віцебску «пристал добровольно» да маскоўскага палкоўніка і жыў у яго 5 г.; потым быў узяты ў Маскоўскую срэбраную палату, дзе жыў [вучыўся і працаваў] на працягу 8 г.; у 1673 г. жыве ў маскоўскай Новамяшчанскай слабадзе, «промышляе серебраным мастерством», мае сына Івашку (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 51).

I. 1. 349. **СЯМЁНАЎ** Якуб (Семенов Яков (Якуб)), з Віцебска, Срэбранай палаты майстра; у 1660 г. жыў у Маскве з жонкай і дзвюма дочкамі; у 1662 г. меў жалаванне 8 рублёў гадавых; у 1663 г. разам з іншымі майстрамі-«палякамі» звольнены па палітычных матывах (Железнов, с. 49; Троицкий, вып. 2, с. 122).

I. 1. 350. **СЯМОЎСКІ** Міхал, злотнік слуцкі канца XVII — пачатку XVIII ст., рабіў прадметы для аздаблення слуцкіх цэркваў (Палеес, с. 49—50).

I. 1. 351. **СЯНДКОВІЧ (ЧЭЛІНСКІ)** Ян (Jan Sędkowicz), нарадзіўся ў 1563 г. у Польшчы, злотнік; у 1601—1606 гг. працаваў у езуіцкім касцёле ў Нясвіжы, потым, з 1614 да 1627 г. (з некаторымі перапынкамі), — у Вільні; з 1627 г. пачаў працаваць у Гародні, дзе 05.04.1629 памёр (SJA, s. 196; L—V, № 1.1010).

I. 1. 352. **СЯЎГОНІЦ** Фама (Thoma Sewgonic), argentum controuersum; згадваецца ў 1650 г. у іску да злотніка Я. Граконіца (КМФ-18, спр. 342, арк. 4 зв. — 5).

I. 1. 353. **ТАРАСЕВІЧ** Севярын (Seweryn Tarasewicz), «вольны» злотнік глускі; згадваецца ў 1692 г. у інвентары места Глускага, жыве ў завулку Казарыцкай вул. «над возерам» (НГАБ у Мінску, ф. 694, воп. 7, спр. 846, арк. 7).

I. 1. 354. **ТАРАСЕВІЧ** Ян (Jan Tarasewicz), «вольны» злотнік глускі; згадваецца ў 1692 г. у інвентары места Глускага, жыве ў завулку вул. Казарыцкай «над возерам» (НГАБ у Мінску, ф. 694, воп. 7, спр. 846, арк. 7).

I. 1. 355. **ТОМКІН** Рыгор (Томкин Григорий), «поляк» з Віцебска, жалаваны майстра Срэбранай палаты; у 1660 г. фігуруе як вучань; у 1662 г. ужо значыцца майстрам з гадавым жалаваннем 8 рублёў, за выкананне «скорых ков-

чежных дел» атрымаў на корм «полтину»; у 1663 г. звольнены па палітычных матывах (Троицкий, вып. 2, с. 131).

I. 1. 356. **ТРАЯНОЎСКІ** Севярын (Seweryn Trojanowski), злотнік гарадзенскі; 10.09.1628 запісаны ў кнігу сяброў стралецкага брацтва Св. Антонія пры гарадзенскай Фары (Łopaciński, № 131).

I. 1. 357. **ТРАЯНСКІ (ТРАЯНОЎСКІ)** Васіль, паходзіў з Полацка, злотніцкі майстра віленскі; у 1693—1697 гг. вучыўся ў Вільні ў майстры *В. Шыша*; у 1698 г. атрымаў званне падмайстры; у 1699—1700 гг. злотніцкі таварыш у віленскага майстры І. Славаковіча; у 1701 г. атрымаў статус майстры; у 1707, 1712—1714, 1718 і 1724 гг. згадваецца як цэхмістр віленскага злотніцкага цэха; на працягу сваёй дзейнасці меў каля трыццаці вучняў, сярод якіх былі: *Г. Снітка* (1707), *М. Траянскі* (1707), *І. Разынкевіч* (1713, у 1715-м — падмайстра), *К. Любашэўскі* (1716), *Я. Відзіевіч* (1717), *Я. Карніловіч* (1718), *Т. Кардзянеўскі* (1719), *К. Яцкевіч* (1719), *А. Міхалоўскі* (1722), *В. Сасноўскі* (1724) і інш.; варштат гэтага злотніка працягваў працаваць у 1730—1732 гг. пад кіраўніцтвам яго ўдавы Люцыі Александровіч (МЭ, с. 205; L—V, № 1.1209).

I. 1. 358. **ТРАЯНСКІ** Мацей, паходзіў з Полацка; у 1707 г. запісаны вучнем на тэрмін у 6 г. да віленскага злотніцкага майстры *В. Траянскага*, пасля заканчэння вучобы запісаны ў падмайстры (L—V, № 1.1210).

I. 1. 359. **ТРУСОВІЧ** Павел (Pawel Trusowicz), паводле паходжання «русін», злотнік віленскі; 25.06.1667 уступіў у езуіцкі ордэн у Вільні; у 1676—1677 гг. працаваў у гаспадарчым калегіуме ордэна ў мяст. Мышы, у 1677—1679 гг. — у Пінску; у 1679—1682 гг. — у Віленскай акадэміі; у 1682 г. пакінуў ордэн (SJA, s. 212; L—V, № 1.1211).

I. 1. 360. **ТРЫЛЬНЕР** Ганус (Hanus Trilner), злотнік віленскі; згадваецца ў 1614—1616 гг. у іску яго бацькі *Я. Трыльнера* да віленскага цэха злотнікаў аб «неўпісанні» яго, Гануса, у цэхавы рэестр (КМФ-18, спр. 285, арк. 1 зв. — 2 зв., 103, 334 зв. — 335 зв.).

I. 1. 361. **ТРЫЛЬНЕР** Ян (Jan Trylner, Joannes Trilner), пробер віленскай мінцы, бацька *Г. Трыльнера*; у 1615 г. называецца злотнікам aurifabrum Skulptorenign Ferrarium (КМФ-18, спр. 294, арк. 1 зв. — 2 зв., 103 зв.); у 1616 г. называецца aurificem sculptorening monetarium (тамсама, арк. 334 зв.); у 1635 г. меў прывілей на жыллё ў будынку мінцы на вул. Нямецкай, дзе жыў з жонкай Барбарай Дзяметраўнай (тамсама, спр. 312, арк. 119 зв.);



*Адбітак пячаткі Слуцкага брацтва Супакаення Багародзіцы (Замкавай царквы). 1733 г.*

у 1637—1638 гг. скардзіцца ў асэсарскі суд на мешчаніна Я. Гроса за знявагу яго словамі (тамсама, спр. 315, арк. 134 — 136 зв.); у 1648 г. згадваецца ў працэсе аб правах слесара Гануса Цыменса на жыллё ў будынку мінцы (тамсама, спр. 316, арк. 135).

I. 1. 362. **ТУРКЕВІЧ** Аляксандр, сын *Л. Туркевіча*, брат *К. Туркевіча*, злотнік віленскі (1676—1699); першасную адукацыю атрымаў у свайго бацькі; у 1684—1685 гг. адбываў таварыскую службу ў віленскага злотніка *І. Барчынскага*; у 1687 г. атрымаў статус віленскага злотніцкага майстры (МЭ, с. 94, 206).

I. 1. 363. **ТУРКЕВІЧ** Казімір, сын *Л. Туркевіча*, брат *А. Туркевіча*, злотнік віленскі; згадваецца ў 1676 г. (МЭ, с. 94, 206).

I. 1. 364. **ТУРКЕВІЧ** Лукаш, бацька *А.* і *К. Туркевічаў*, злотнік віленскі, цэхмістр; згадваецца ў 1663—1679 гг. (МЭ, с. 94, 206).

I. 1. 365. **ТУРОВІЧ** Пётра (Petro Turovicz), злотнік берасцейскі; згадваецца ў 1585 г. у працэсе з *А. Бергелем* (КМФ-18, спр. 276, арк. 20 — 20 зв.).

I. 1. 366. **ТЫРЛЗЕ** Ян (Jan Tirlze), пробер віленскай мінцы; згадваецца ў 1601 г. у консэнсе Жыгімонта III, якім зацвярджае ліст падскарбія А. Завішы як «ад'ехаўшы» з Вільні ў Дамбровіцу (КМФ-18, спр. 86, арк. 287).

I. 1. 367. **ФАСКОВІЧ** Аўлас (Awlas Faskowicz), злотнік і мешчанін магілёўскі; згадваецца ў 1629 г. у пастанове на стварэнне цэха (ИЮМ, т. 8, с. 426).

I. 1. 368. **ФЕЙХНЕР** Георгі (Georgium Feychner), злотнік віленскі; у 1634 г. згадваецца ў іску да спадкаемцаў *Я. Магрэ* (КМФ-18, спр. 312, арк. 63 зв.).

I. 1. 369. **ФЁДАРАЎ** Лук'ян, родам са Смаленска, срэбраніцкі майстра, «узяты» ў Маскву разам «з Андрушкам, сынам Ірыкавым» (*А. Івановым*), срэбраніцкім майстрам; працаваў «кармавым майстрам» (атрымліваў жалаванне); абодва адпушчаны дамоў, але *А. Іваноў* застаўся ў Маскве (Материалы… купечества, т. 1, прил. 2, с. 65).

I. 1. 370. **ФЁДАРАЎ** Пётра, нарадзіўся ў Магілёве, маскоўскі срэбраных спраў майстра; у 1656 г. выехаў у Маскву; у 1676 г. жыў у Мяшчанскай слабадзе ў доме майстры В. Карпава (Материалы… купечества, т. 1, прил. 2, с. 3, 53; Абецедарский, с. 35).

I. 1. 371. **ФІЛІП'ЕЎ** Сенька, родам са Шклова, срэбранік; у 1655 г. «узяты» ў Маскву, жыў у свайго роднага дзядзькі срэбраніка *Р. Мікалаева*, потым 9 г. быў у наймах у іншых срэбранікаў; у 1673—1676 гг. жыў у Новамяшчанскай слабадзе г. Масквы (Материалы… купечества, т. 1, прил. 2, с. 69).

I. 1. 372. **ФІЛІПОВІЧ** Ян (Jan Filipowicz), паходзіў з Геранёнаў; у 1673—1674 гг. запісаны вучнем на тэрмін у 6 г. да віленскага злотніка *О. Петэрсана*, пасля заканчэння вучобы атрымаў званне падмайстры (Łopaciński, № 337; L—V, № 1.265).

I. 1. 373. **ФІШЭР** Пётра (Petro Fisser), старшы злотнік віленскі; у 1584 г. згадваецца ў працэсе злотнікаў супраць яго (КМФ-18, спр. 280, арк. 56 зв. — 58).

I. 1. 374. **ФЛАВІЮШ** Аляксандр (Alexander Flawiusz), злотнік, таварыш цэха берасцейскага; у 1624 г. абвінавачваецца *М. Гранастайскім* у нанясенні яму матэрыяльнай шкоды (АВАК, т. 6, с. 255—257).

I. 1. 375. **ФРОС** Марэк, паходзіў з Аўгсбурга, вучыўся ў Варшаве; у 1666 г. прыняў віленскае грамадзянства; у 1668 г. да яго ў вучні запісаны *Я. Буйніцкі*; у 1676—1681 гг. быў злотнікам у Слуцку (МЭ, с. 206).

I. 1. 376. **ФРЫДРЫК** Ян (Jan Frydrych), злотнік і мешчанін віленскі, згадваецца ў 1774 г. як старшы цэха ў дадатковых артыкулах парадку цэхавага (АВАК, т. 10, с. 61).

I. 1. 377. **ХАДАРОВІЧ** Філіп (Filip Chodarowicz), злотнік і мешчанін магілёўскі; у 1643 г. выступае разам з іншымі адказчыкам па абвінавачванні магілёўскіх рамеснікаў ксяндзом Янам Змальскім у невыкананні імі воскавай павіннасці на карысць Фарнага касцёла (КМФ-18, спр. 320, арк. 743 — 744 зв.).

I. 1. 378. **ХАДЫКА** Сымон, злотнік полацкі; 05.08.1650 выступае адказчыкам па іску да яго полацкіх злотнікаў *С. Мандрыкі* і *С. Савіцкага* (ИЮМ, т. 5, с. 38).

I. 1. 379. **ХАРАТКЕВІЧ** Андрэй Антон (Andrzey Antoni Haratkewicz), паходзіў з Менска; 10.10.1725 запісаны вучнем на тэрмін у 3 г. да віленскага злотніка *Г. Сніткі*, 11.10.1728 атрымаў званне падмайстры (L—V, № 1.374).

I. 1. 380. **ХАРКОВІЧ** Антон (Anton Charkowicz), злотнік магілёўскі; згадваецца ў 1615 г. у працэсе аб парушэнні яго спадчынных правоў на пляц па вул. Папнінскай і агарод на Ільінскай гары (КМФ-18, спр. 294, арк. 26).

I. 1. 381. **ХРЖАНОЎСКІ** Людвік (Ludwik Chrzanowski), паходзіў з Гародні; у 1669 г. вучыўся ў Вільні; у 1671 г. запісаны падмайстрам у віленскі злотніцкі цэх да *Ю. Александровіча* (МЭ, с. 202; L—V, № 1.162).

I. 1. 382. **ЦВІКЛІЧ** Станіслаў (Stanislaw Cwiklicz), злотнік гарадзенскі; у 1631 г. згадваецца як адзін з даўжнікоў прывальскага дзяржаўцы Крыштафа Гешкоўскага (КМФ-18, спр. 308, арк. 24); у 1632 г. на пагашэнне доўгу «паклаў... залатых пярсцёнкаў з рознымі камянямі 29 і гузікаў (?) тры і паўтара тузіна», якія аценіў у 1945 злотых, але ўрад, «узяўшы злотнікаў і рамеснікаў знаючых», знізіў іх кошт да 587 злотых і 15 грошаў (тамсама, арк. 46 зв. — 50 зв.); у 1637 г. фігуруе ў наданні прывілея гарадзенскім злотнікам як адзін са старшых цэха (тамсама, спр. 113, арк. 1); у 1650 г. у канфірмацыйным прывілеі цэха названы бурмістрам гарадзенскім (тамсама, спр. 123, арк. 299); у 1654 г. бурмістр гарадзенскі, меў дом на вул. Віленскай па суседстве з арганістам Фар-



*Адбітак пячаткі Зафеі Юр'еўны Алелькавічаўны, князёўны Слуцкай. 1602 г.*



*Срэбраны куфель, упрыгожаны біблейскімі сцэнамі. XVII ст.*

нага касцёла С. Чарноўскім; у 1673 г. згадваецца ў іску да яго спадкаемцаў ад удавы ваяводы Ю. К. Глябовіча аб выплаце 65 чырвоных злотых, таму што «шаблю не аправіўшы, пенендзы не аддаўшы, сам з таго свету пайшоў»; памёр да 25 верасня 1654 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 260—261).

I. 1. 383. **ЦВІКЛІЧ** Ян (Jan Cwiklicz), старшы гарадзенскага злотніцкага цэха; згадваецца ў 1637 г. у наданні прывілея цэху (КМФ-18, спр. 113); у 1659, 1661—1662, 1665—1666 гг. радца мескі (НГАБ у Мінску, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 1 зв.; тамсама, арк. 1 зв., 25); у 1667—1668 гг. бурмістр мескі (тамсама, арк. 1 зв., 38, 157); у 1671 г. фігуруе ў тэстаменце лентвойта гарадзенскага, яго пляменніка Казіміра Цвікліча, які «адпісаў» яму «кунтуш лазаравы, шапку з выдры і пенендзы» (тамсама, арк. 214); у 1673 г. — бурмістр (тамсама, арк. 254 зв.); у 1680 г. на правым баку вул. Падольскай жыве залатарка Янава [удава?] (тамсама, ф. 1882, воп. 1, спр. 3, арк. 71).

I. 1. 384. **ЦІШКОВІЧ** Масей (Moysey Ciszkowicz), злотнік і мешчанін магілёўскі; у 1629 г. згадваецца ў пастанове на стварэнне цэха (ИЮМ, т. 8, с. 426).

I. 1. 385. **ЦІШКОЎСКІ** Мікалай (Mikolay Ciszkowski), злотнік і мешчанін навагародскі; згадваецца ў 1633 г. у прывілеі на цэх (КМФ-18, спр. 111, арк. 616); у апошнія гады свайго жыцця быў абраны мескім радцам, памёр не пакінуўшы спадкаемцаў; яго рухомая і нерухомая маёмасць у 1657 г. была перададзена ва ўласнасць палкоўніку войскаў ВКЛ М. Абуховічу (ЛМ, кн. 131, № 53).

I. 1. 386. **ЦЫВІНСКІ** Фелікс (Felix Civinski), паходзіў з Ружан; у 1703 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 6 г. да віленскага злотніка Я. Славаковіча (L—V, № 1.167).

I. 1. 387. **ЦЭХ** Себасцьян (Sebastian Cech), злотнік, працаваў пры нясвіжскім двары князёў Радзівілаў; у 1756 г. атрымаў узнагароджанне за зробленую работу (L—V, № 1.148).

I. 1. 388. **ЧАРКОЎСКІ** Аляксандр (Alexander Czarkowski), паходзіў з Менска; у 1715 г. запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка Я. Ляхоўскага (L—V, № 1.170).

I. 1. 389. **ЧАРНЯЎСКІ** Мікола, паходзіў з Крэва; у 1688 г. запісаны вучнем на тэрмін у 5 г. да віленскага майстры І. Горвата, пасля заканчэння вучобы запісаны падмайстрам (L—V, № 1.171).

I. 1. 390. **ЧУРЫЛА** Станіслаў, паходзіў з Орлі; у 1686 г. запісаны вучнем на тэрмін



*Адбітак пячаткі майдэборскага места Крэва, выразанай у 1792 г.*

у 4 г. да віленскага майстры-злотніка Ф. Фельштынскага, пасля заканчэння вучобы запісаны падмайстрам (L—V, № 1.174).

I. 1. 391. **ЧЫЧКА** Бенядзікт (Benedikt Czyzko), злотнік віленскі; у 1592 г. аддаў у заставу дом на вул. Віленскай каля Віленскай брамы «в муре лежачом» за 40 коп грошаў (АВАК, т. 20, с. 71); у 1598 г. здаваў «господы для мешканья» ў сваім доме (тамсама, с. 132).

**ЧЭЛІНСКІ**, гл. **СЯНДКОВІЧ**

I. 1. 392. **ШАРАЎСКІ** Стэфан, паходзіў з Жызны; у 1715 г. запісаны ў вучні на тэрмін у 8 г. да віленскага злотніка Я. Мацэевіча (L—V, № 1.1101).

I. 1. 393. **ШАРАЎСКІ** Ян (Szarawski Jan), паходзіў з Гародні, злотнік гарадзенскі; у 1667 г. запісаны вучнем на 3 г. да віленскага злотніцкага майстры К. Дзігіяні, пасля заканчэння вучобы запісаны падмайстрам, вярнуўся ў Гародню; у 1680 г. жыў на правым баку вул. Язерскай, «калі ісці з рынку»; меў таксама пляц над р. Гараднічанкай (Horodnica), на якой было «15 халуп» (Писцовая книга Гродненской экономии, ч. 2, с. 192, 196); 20.03.1683 падаў скаргу на віленскага злотніцкага майстра Я. Горна (Łopaciński, № 260; L—V, № 1.1088).

I. 1. 394. **ШАШОК** Ян (Jan Szaszok), злотнік полацкі; у 1582 г. працаваў у Вільні (L—V, № 1.1184).

I. 1. 395. **ШЛІПІНСКІ** Тамаш (Tomasz Szlipynski), паходзіў з Мядзеля; у 1690 г. запісаны вучнем да віленскага майстры *А. Туркевіча* на тэрмін у 5 г., адукацыю не атрымаў (МЭ, с. 206; L—V, № 1.1116).

I. 1. 396. **ШОСТАК** Клім (Шостак Клим), злотнік віленскі; у 1594 г. прадаў за 70 залатых польскіх мсціслаўскаму маршалку Абраму Мялешку «шаблю, оправную серебром золотистую» (НГАБ у Мінску, ф. 1785, воп. 1, спр. 14, арк. 1 зв., 34 — 135 зв.).

I. 1. 397. **ШРЭЙДЭР** Альбрыхт (Albricht Schrieyder), злотнік віленскі; згадваецца ў 1634 г. у іску да спадкаемцаў *Я. Магрэ* (КМФ-18, спр. 312, арк. 63 зв.).

I. 1. 398. **ШРЭЙДЭР** Хрыпштап (Chropher Schrieyder), злотнік віленскі; згадваецца ў 1634 г. у іску да спадкаемцаў *Я. Магрэ* (КМФ-18, спр. 312, арк. 63 зв.).

I. 1. 399. **ШТЫЎТОЎСКІ** Ян (Jan Sztywtowski), нарадзіўся ў 1671 г. у Навагародку ў мяшчанскай сям'і; у 1686 г. запісаны ў рэестр вучняў віленскага злотніцкага цэха да майстры *В. Шыша*; у 1692 г. атрымаў званне віленскага злотніцкага майстры; у 1701 г. ад'ехаў у Чанстохаў, прыняў манаства і пад імем Макарыя жыў у Яснай Гуры (Польшча) да самай смерці; у 1726 г. меў вучня; памёр 14.10.1740 (Łopaciński, № 412; L—V, № 1.1161).

I. 1. 400. **ШУЛЬЦ** Ян (Jan Szulc), паходзіў з Гародні; у 1671 г. запісаны вучнем на 4 г. да віленскага злотніцкага майстры М. Гейтэра; у 1676 г. атрымаў званне падмайстры і застаўся працаваць у таго ж майстры (Łopaciński, № 313; L—V, № 1.1173).

I. 1. 401. **ШУЛЬЦ** Ян (Шульц Ян), злотнік віленскі; у 1598 г. меў доўг у 400 коп і ў 200 коп пад заклад уласнага дома зямянцы Віленскага пав. Дароце Творшчанцы, жонцы Яна Тарнаўскага (АВАК, т. 20, с. 139—141).

I. 1. 402. **ШУМЛЕНСКІ** Васіль Аляксандравіч (Vasileum Alexandrowicz Szumlenski), злотнік і мешчанін віленскі; згадваецца ў 1579 г. у іску супраць Ці-

мафея Вайніловіча і Данілы Вяльковіча, мяшчан віленскіх (КМФ-18, спр. 273, арк. 217 — 217 зв.).

І. 1. 403. **ШЧАСНЫ** Ян (Jan Szczasny), паходзіў з Менска; 30.08.1724 запісаны вучнем да віленскага майстры Крысціяна на тэрмін у 5,5 г., у 1729 г. запісаны ў падмайстры (L—V, № 1.1092).

І. 1. 404. **ШЧУКІН** Іван Якаўлеў, срэбранік, прывезены ў Маскву «в малых летах» у 1656 г. з «літоўскіх гарадоў»; срэбранаму майстэрству вучыўся ў майстры *Р. Мікалаева* ў Срэбранай палаце, у 1679 г. пакінуў майстра; у 1685 г. запісаны ў Мяшчанскую слабаду г. Масквы, плаціў цягла 5 алтын (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 96).

І. 1. 405. **ШЧЫРБА** Ян (Jan Szczyrba), злотнік і абывацель нясвіжскі; згадваецца 04.02.1726 у Магістрацкім дэкрэце па абвінавачванні яго рэктарам езуіцкага калегіума Л. Казарыным у тым, што, «атрымаўшы грыўны тры срэбра, без двух лотаў пробы 11», выканаў работу «подлую і фальшаваную». На частцы вырабу, акрамя 11-й, было срэбра 5-й і 4-й пробы. Абавязаны судовым выракам вярнуць срэбра і грошы, што атрымаў за працу. Злотнік тлумачыў свае дзеянні тым, што зрабіў з атрыманага срэбра яшчэ і шаты для абраза Найсвяцейшай Панны [Марыі] для Нясвіжскага езуіцкага касцёла (НГАБ у Мінску, ф. 1819, воп. 1, спр. 1, арк. 45 зв. — 46).

І. 1. 406. **ШЫМАНОВІЧ** Андрэй (Andrzej Szymanowicz), злотнік нясвіжскі XVIII ст. (L—V, № 1.1105).

І. 1. 407. **ШЫМКЕВІЧ** Марцыян (Marcyan Szymkewicz), паходзіў з Нясвіжа; у 1704 г. запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка Я. Мацэевіча, пасля заканчэння вучобы запісаны ў падмайстры; 04.12.1716 выдадзена пасведчанне аб хрышчэнні М. Шымкевіча ў віленскім касцёле Св. Яна; у 1721 г. скардзіцца віленскім гарадскім уладам на злотніка *Г. Б. Крыжаноўскага* (Łopaciński, № 534; L—V, № 1.1107).



*Адбітак пячаткі майдэборскага места Дзісна, выразанай у стылі барока ў 1669 г.*

І. 1. 408. **ШЫШ** Васіль (Bazyli Szysz), паходзіў з Дзісны; у 1675 г. запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка Я. Александровіча, у 1681 г. атрымаў званне падмайстры; у 1682 г. запісаны віленскімі ўладамі на 2 г. да таго ж злотніка, у 1685 г. атрымаў званне майстры і быў прыняты ў віленскі злотніцкі цэх (МЭ, с. 202; L—V, № 1.1109); сярод яго вучняў згадваюцца: *Р. Сусач* (1685), *Я. Штыўтоўскі* (1686), *С. Ясповіч* (1690), *В. Траянскі* (1693), *М. Шыш* (1693), *Валянцін Рамановіч* (1696).

І. 1. 409. **ШЫШ** Мікола (Mikolay Szysz), паходзіў з Дзісны; у 1693 г. запісаны

вучнем да віленскага злотніка *В. Шыша* (L—V, № 1.1112).

I. 1. 410. **ШЫШКО** Іван (Iwan Szyszko), злотнік і мешчанін магілёўскі; згадваецца ў 1629 г. у прашэнні магілёўцаў аб стварэнні цэха (ИЮМ, т. 8, с. 495; КМФ-18, спр. 111, арк. 51 — 55 зв.).

I. 1. 411. **ШЭНЕБЕРГ** Готфрыд Эрнэст (Godofridi Ernesti Szeneberg), злотнік віленскі, былы старшы цэхмістр; у 1774 г. згадваецца ў дадатковых артыкулах да цэхавага статута (АВАК, т. 10, с. 60–61).

I. 1. 412. **ЭЕРЛІ** Андрэй (Andreas Eierley), злотнік віленскі, былы старшы цэхмістр; згадваецца ў 1774 г. у дадатковых артыкулах да цэхавага статута (АВАК, т. 10, с. 60—61); у 1736 г. меў вучня *Я. Гартмана*.

I. 1. 413. **ЭЛЕС** Ян Павел (Jen Eles; Jan Paul Elles), злотнік і мешчанін віленскі; працаваў на замаўленне нясвіжскай лініі князёў Радзівілаў і 01.08.1717 г. атрымаў за гэта асігнацыю на атрыманне ўзнагароджання паводле рахунку ў памеры 245 злотых; памёр у 1735 г. (AGAD, AR, dz. XXI, w — 61; L—V, № 1.247).

I. 1. 414. **ЭС** Ежы (Jerzy Es), злотнік менскі; згадваецца ў 1634 г. у канфірмацыйным прывілеі на цэх (БА, т. 3, с. 144); магчыма, гэта тая ж асоба, што і *Юры Гес*.

I. 1. 415. **ЮРГЕВІЧ** Валяр'ян (Walerian Jurgewicz), паходзіў з Гародні; у 1691 г. запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка К. Помакся, паспяхова скончыў вучобу (Łopaciński, № 490; L—V, № 1.523).

I. 1. 416. **ЮР'ЕЎ** Іван, месца паходжання не высветлена, срэбраных спраў майстра; 04.01.1662 згадваецца як «жалаваны майстра Маскоўскай срэбранай палаты, паляк», меў «жалаванне» 8 рублёў на год; 27.12 атрымаў палціну «для скорых ковчежных серебряных дел для государевых больших печатей», якія ён разам з паплечнікамі рабіў на загад царскага двара; у 1663 г. адхілены ад пасады па палітычных матывах (Железнов, с. 21; Троицкий, вып. 2, с. 147).

I. 1. 417. **ЮР'ЕЎ** Казімір, нарадзіўся ў Смаленску; у 1654 г. вывезены ў Маскву, дзе вучыўся срэбраніцкай справе; у 1671—1676 гг. жыў у Мяшчанскай слабадзе г. Масквы (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 50).

I. 1. 418. **ЮР'ЕЎ** Мітрафан (Юрьев Митрофан), «поляк» з Віцебска, Срэбранай палаты майстра; у 1660 г. меў гадавое жалаванне 8 рублёў, атрымаў на «корм палціну для скорых ковчежных дел»; у 1663 г. адхілены ад пасады па палітычных матывах (Троицкий, вып. 2, с. 149).

I. 1. 419. **ЮРЦЭВІЧ** Валяр'ян (Walerin Jurcewicz), паходзіў з Гародні; у 1687 г. запісаны вучнем на тэрмін у 3 г. да віленскага злотніцкага майстры К. Паморскага (Łopaciński, № 597; L—V, № 1.523).

I. 1. 420. **ЮТРОЎСКІ** Станіслаў (Stanislaw Jutrowski), злотнік берасцейскі; у 1624 г. згадваецца ў сувязі са справай *М. Гранастайскага* супраць цэха (КМФ-18, спр. 305, арк. 14 зв. — 15).

I. 1. 421. **ЯКАЎЛЕЎ** Іван, паходзіў з Віленскага пав., срэбранік маскоўскі; у 1655 г. узяты ў палон маскоўскімі рэйтарамі, пасля смерці ўладальніка «ўчыніўся» вольным, пачаў вучыцца срэбраніцкай справе; у 1676 г. жыў у Мяшчанскай сла-

бадзе г. Масквы; у 1684 г. меў сына Яфімку і пасынка (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 14, 15, 80).

І. 1. 422. **ЯКАЎЛЕЎ** Мікіта Сямёнавіч (Яковлев Микишка), паходзіў з Полацка; у 1660 г. вучань у свайго бацькі *С. Якаўлева*; памёр у 1662 г. (Троицкий, вып. 2, с. 153).

І. 1. 423. **ЯКАЎЛЕЎ** Панцеляймон, паходзіў з Барысава, узяты дняпроўскімі казакамі ў Маскву, маскоўскі срэбраных спраў майстра; у 1672 г., пасля 17 г. пражывання ў розных гаспадароў, быў адпушчаны на волю; у 1676 г. жыў у Мяшчанскай слабадзе г. Масквы; «яго промысел — робіт каменне для завушніц» [агранка каштоўных камянёў] (Материалы... купечества, т. 1, прил. 2, с. 58).

І. 1. 424. **ЯКАЎЛЕЎ** Сямён (Яковлев Семен), «поляк», узяты з Полацка, Срэбранай палаты майстра; у 1660 г. жыў у Маскве разам з жонкай і «был сын Микишка в учениках» з жалаваннем у 5 рублёў на год; у 1662 г. сын памёр; у 1664 г. атрымаў кармавыя грошы (Железнов, с. 59; Троицкий, вып. 2, с. 153).

І. 1. 425. **ЯКАЎЛЕЎ** Якуб (Яковлев Якуб), «поляк» з Вільні; у 1660 г. згадваецца як старшы вучань Срэбранай палаты (Троицкий, вып. 2, с. 154).

І. 1. 426. **ЯНЕВІЧ** Францішак, паходзіў з Ашмян; у 1692 г. запісаны вучнем да віленскага майстры *В. Дольфуса* на тэрмін у 8 г., вучобы не скончыў (МЭ, с. 204).

І. 1. 427. **ЯСПОВІЧ** Самуэль (Samuel Jespowicz), паходзіў з Друі; у 1690 г. запісаны на 6 г. да віленскага злотніцкага майстры *В. Шыша* (L—V, № 1.484).

І. 1. 428. **ЯСЬКА** Ганус, злотнік берасцейскі; у 1629 г. абвінавачвае берасцейскага яўрэя Леўку Шмуйловіча ў «падмове» яго вучня, «хлопца», са Славатычаў «пакрасці» золата ў майстры (АВАК, т. 28, с. 119).

І. 1. 429. **ЯЦКЕВІЧ** Казімір (Kazimierz Jackewicz), паходзіў з Ашмянскага пав.; у 1676 г. запісаны на 5 г. да віленскага злотніцкага майстры *Станіслава Даніловіча* (МЭ, с. 203); атрымаў званне падмайстры, потым — майстры і быў прыняты ў віленскі злотніцкі цэх; працаваў у Вільні ў 1692—1705 гг., меў вучняў (L—V, № 1.455).

І. 1. 430. **ЯЦКЕВІЧ** Казімір, паходзіў з Глыбоцкай парафіі; у 1719 г. запісаны вучнем на тэрмін у 3 г. да віленскага злотніка *В. Траянскага*, у 1722 г. залічаны ў падмайстры (МЭ, с. 206; L—V, № 1.454).



*Адбітак пячаткі майдэборскага места Слуцкага. 1698 г.*

I. 1. 431. **ЯЦКЕЛІУС** Ян (Jan Jackielius), паходзіў з Ашмянскага пав.; у 1676 г. запісаны на 5 г. да віленскага злотніцкага майстры Я. Александровіча, пасля заканчэння вучобы атрымаў званне падмайстры (L—V, № 1.451).

I. 1. 432. **ЯЦКОВІЧ** Андрэй (Andrzey Jackowicz), злотнік і мешчанін магілёўскі; згадваецца ў 1629 г. у пастанове на стварэнне цэха (ИЮМ, т. 8, с. 426).

I. 1. 433. **ЯЦКОВІЧ** Косця (Костіа Іацковіч), залатар і мешчанін магілёўскі; у сакавіку 1577 г. выдае даўгавы ліст на 6 коп грошаў бурмістру А. Васілевічу, а ў чэрвені пагашае доўг (ИЮМ, т. 30, отд. 3, с. 16, 96—97); у ліпені абвінавачваецца ў абразе злотніка *У. Багдановіча* (тамсама, с. 108—110); у верасні залатар *Я. Захарыніч* абвінавачвае яго ў крадзяжы рэчаў і інструментаў (тамсама, с. 150—153); у 1578 г. упамінаецца залатарка «Костина Авдотья» [жонка?] (АВАК, т. 34, с 88); у маі 1579 г. згадваецца як уладальнік дома каля рога вул. Пакроўскай і Мікольскай (АВАК, т. 39, с. 247); у лістападзе меў свой «отчызны» дом у «паркане» на вул. Шклоўскай, «идучы з рынку до брамы Шкловскай по левой стороне» (тамсама, с. 442—443, 450, 470, 483); у 1588 г. абвінавачваецца ў тым, што «збіл і змордовал» слугу «справцы мыта» пана Л. Марэвіча (ИЮМ, т. 32, с. 104—105).

I. 1. 434. **ЯЦЫНКЕВІЧ** Мацей (Matheus Jacinkiewicz), злотнік віленскі; згадваецца ў 1634 г. у іску да спадкаемцаў *Я. Магрэ* (КМФ-18, спр. 312, арк. 62 зв.).

I. 2. 435. … **АЗЕАШ** (Озеаш), немец, злотнік; у 1641 г. рабіў у Магілёве «рамясло пакутне», не ўпісаўшыся ў цэх, яму прысуджана заплаціць 20 грывен штрафу (ИЮМ, т. 9, с. 413–416).

I. 2. 436. … **АМЕЛЬКА** (Омелько), са Смаленска, вучань *І. Андрэева*; у снежні 1659 г. прывезены ў Маскву, стаў прасіць дазволу на вяртанне і ў красавіку — маі 1660 г. атрымаў яго (Троицкий, вып. 1, с. 60).

I. 2. 437. … **АНДРЭЙ**, «залатар» берасцейскі; згадваецца ў 1566 г. у рэвізіі места, мае 1 валоку зямлі (Забела, т. 3, с. 95.)

I. 2. 438. … **АНДРЭЙ** (Jendrzey), злотнік берасцейскі; у 1662 г. выступае ацэншчыкам сталовага набора «асбурскай» работы з 40 прадметаў (АВАК, т. 5, с. 166—167).

I. 2. 439. … **АНДРЭЙ**, злотнік гомельскі; у 1765 г. жыў на вул. Чачэрскай (КМФ-19, воп. 1, спр. 2, арк. 1).

I. 2. 440. … **АНДРЭЙ** (Andrzej), злотнік слуцкі; у 1683 г. жыве «ў Старым месте па Іллінскай вул. ідучы з рынку па леваму боку» (КМФ-5, воп. 1, спр. 3834/1, арк. 3).

I. 2. 441. … **АНДРЭЙ** (Andreas), злотнік холмскі; згадваецца ў 1553 г. як сведка па справе Антона Шміта з біскупам холмскім Васілём Бакам (АВАК, т. 17, с. 108—117).

I. 2. 442. … **АНДРЭЙ** Іванаў(іч), злотнік гомельскі; 14.03.1776 жыве разам з жонкай Ірынай Афанасьеўнай, дачкой Праскоўяй, замужняй дачкой Ульянай, яе мужам Рыгорам «Сямёнавым» і ўнукам Міколам (НГАБ у Мінску, ф. 3014, воп. 1, спр. 1, арк. 2).



*Адбітак пячаткі Ёсіпа Нелюбовіча Тукальскага, Беларускага Епіскапа, Намесніка Мітрапаліта, Экзарха ВКЛ (павялічаны). 1663 г.*

I. 2. 443. ... **АНТОН** (Антон), залатар віленскі; у 1554 г. меў дом на Зарэччы над р. Вільняй (КМФ-18, спр. 34, арк. 221 зв. — 222).

I. 2. 444. **АРЦЮХОВІЧ** ... (Артехович), залатар магілёўскі; у 1578 г. выступаў сведкам па справе залатара *У. Багдановіча* да *П. Васілевіча* (АВАК, т. 39, с. 64).

I. 2. 445. ... **АФАНАСІЙ** Іванавіч (Афанасий Иванович), злотнік і мешчанін магілёўскі; згадваецца ў 1656 г., калі «з жоною и з детьми и зо всими своими животами... невестно куды» уцёк перад уваходам у Магілёў царскіх войскаў, пакінуўшы «два будынкі з пляцом в вале меньшом» (АВАК, т. 34, с. 91–93 ).

I. 2. 446. **БАРКОЎСКІ** ... (Borkowski), злотнік берасцейскі; згадваецца ў 1624 г. па справе *М. Гранастайскага* супраць цэха (КМФ-18, спр. 305, арк. 14 зв. — 15).

I. 2. 447. ... **БАРТАЛАМЕЙ** (Bartholomaeus), злотнік віленскі; у 1549 г. згадваецца ў рахунку Жыгімонта Аўгуста, паводле якога атрымаў 16 дынараў (БА, т. 1, с. 219).

I. 2. 448. **БУЛКА** ... (Bulka), злотнік слуцкі; 01.04.1650 маршалак ВКЛ Аляксандр Людвік, князь Радзівіл, звяртаецца да эканома слуцкага маёнтка, таму што злотнік Булка не мог «завершить украшение» (L—V, № 1.139).

I. 2. 449. ... **ВАСІЛЬ**, злотнік віцебскі, згадваецца ў 1667 г. (ВС, с. 372).

I. 2. 450. ... **ВАСІЛЬ**, злотнік ігуменскі (НГАБ у Мінску, ф. 1727, воп. 1, спр. 3, арк. 1308).

I. 2. 451. ... **ВАСКА**, злотнік магілёўскі; у 1606 г. згадваецца як адзін з абраных у месную раду падчас паўстання Стахора Мітковіча (БА, т. 1, с. 82).

I. 2. 452. ... **ВІНЦЭНТ** (Винцент), залатар і мешчанін віленскі; згадваецца ў 1524 г. як нябожчык, што пакінуў сваёй жонцы спадчыну, на якую прэтэндаваў яго брат Вольфганг (ЛМ, кн. 4, с. 43).

I. 2. 453. ... **ВОЛЬФГАНГ** (Вольфганг, Фольфканк), залатар і мешчанін віленскі; згадваецца ў 1524 г. у спрэчцы аб правах на спадчыну, што засталася пасля смерці яго брата Вінцэнта, з удавой нябожчыка (ЛМ, кн. 4, с. 43); у 1526 г. фігуруе ў якасці сведкі (тамсама, с. 283).

I. 2. 454. ... **ГАНУС** Матысаў (Hanus syn Matysa krawca z Wilna), кравецкі сын, злотнік віленскі; у 1559 г. меў дом каля дома Размуса; адпісаў у тэстаменце сваю маёмасць жонцы, дачцэ Дароце і другой, не названай; у 1579 г. удава Зафея звярнулася з прашэннем аб актыкацыі тэстамента (КМФ-18, спр. 272, арк. 164—165).

I. 2. 455. ... **ГАРВАЛЬ** (Harwal), злотнік віленскі; у 1688 г. жыве ў камяніцы, «ідучы з замку ў рынак на правай старане» (АВАК, т. 20, с. 474).

I. 2. 456. ... **ГАЎРЫЛКА** (Гаврилка), злотнік віцебскі; згадваецца ў 1665—1666 гг. у спісе мяшчан, што лічыліся ў Біскупскай сотні (ВС, т. 4, ч. 2, с. 319).

I. 2. 457. **... ГРЫГАРЭЙ**, мешчанін магілёўскі, злотнік у 1745—1746 гг. (ИЮМ, т. 30, с. 168—169).

I. 2. 458. ... **ГРЫЦ**, згадваецца ў 1569 г. як мешчанін і злотнік берасцейскі (Бершадский, с. 119).

I. 2. 459. ... **ГРЫШКА** (Гришка), злотнік віцебскі; у 1641 г. меў агарод на Узгорскім пасадзе (ВС, т. 1, с. 355).

I. 2. 460. ... **ДАМІНІК** (Доменік), злотнік гарадзенскі; у лістападзе 1539 г. згадваецца ў пісьмовых крыніцах аб зна-

ходцы страчанага срэбранага кальца, у снежні таго ж года абвінавачвае татарына Янчура ў крадзяжы срэбраных упрыгожанняў да абразоў (АВАК, т. 17, с. 53, 62).

І. 2. 460а. ... **ДЗІМІТР**, згадваецца ў 1647 г. як злотнік слуцкі; меў 2/3 пляца ў «першай кватэры рынка» (НГАБ у Мінску, ф. 146, дад. да воп. 2, спр. 24, арк. 252 зв.); меў таксама ½ пляца на вул. Затыльнай (тамсама, арк. 254).

І. 2. 461. ... **ДЗЯМІД** (Демід), залатар і мешчанін віцебскі; у 1530 г. жыў у доме за р. Віцьбай, атрымаў ад баярына К. Косава «пятьдесят золотников и два серебра, а шолку пятьдесят же золотников, и он, тое серебро и шолк втративши, втек до Москвы» (БА, т. 2, с. 20).

І. 2. 462. ... **ЗАХАРЫЯШ**, злотнік віленскі; згадваецца ў 1658 г. (Сторожев В. Н. Московское управление в Вильно XVII в., с. 24).

І. 2. 463. ... **ЗЯНКО** (Зенко), залатар «неякі»; меў «мешкане» ў фальварку за «милю» ад Магілёва; у 1585 г. згадваецца ў сувязі з абвінавачваннем зямяніна гаспадарскага магілёўскага Сасіна Скока ў шальмоўстве. Апошні паказаў, што манету атрымаў ад Зянко, які «тры дни тую монету робил и тое ж монеты дал десять коп за долг» (ИЮМ, т. 7, с. 366—368).

І. 2. 464. ... **ІВАН,** злотнік пінскі; у 1553—1555 г. «сидит на старой службе» (зямлі) свяшчэнніка Марціна Хведаровіча; меў пляц на левым баку, «ідучы ад замка» па вул. Жыдоўскай (Писцовая книга Пинского и Клецкого княжеств, с. 73, 77).

І. 2. 465. ... **ІВАН** (Иван), паходзіў з Полацка; у 1660 г. вучань у Маскоўскай срэбранай палаце, настаўнікам быў яго дзядзька *С. Астаф'еў*; атрымліваў жалаванне 5 рублёў на год (Троицкий, вып. 1, с. 49).

І. 2. 466. ... **ІОНА** (Jona), злотнік слуцкі; у 1728 г. жыў у доме каваля М. Залейкі на вул. Віленскай (НГАБ у Мінску, ф. 1825, вып. 1, спр. 16, арк. 1 зв. — 2).

І. 2. 467. ... **КАЗІМІР** (Kazimierz), злотнік мірскі; згадваецца ў 1693 г. у інвентары (НГАБ у Мінску, ф. 694, воп. 4, спр. 1305[а], арк. 101).

І. 2. 468. ... **КАНДРАТ** (Кондрат), залатар; жыў у с. Гальцы Пінскага пав., быў «пажалаваны» ў 20-х гг. XVI ст. князем Фёдарам Іванавічам Яраславічам баярыну Ігнату Пятровічу Ахмату (Ревизия пущ... с. 354—355).

І. 2. 469. ... **КРЫШТАФ** (Крыштоф), злотнік віленскі; у 1562 г. згадваецца як сведка ў судовым працэсе (КМФ-18, спр. 260, арк. 275 зв.).

І. 2. 470. **ЛАНДШУЦКІ** ... (Landshutski), злотнік; у 1776 г. працаваў пры нясвіжскім двары князёў Радзівілаў (L—V, № 1.665).

І. 2. 470а. **... ЛОРЭНЦ**, слуцкі злотнік канца XVII ст.; на пачатку XVIII ст. рабіў прадметы аздаблення слуцкіх цэркваў (Палеес, с. 49—50).

І. 2. 471. ... **ЛЯВОН** (Lewon), злотнік і радца віленскі; меў дом на вул. Гродскай, «ідучы ад замка ў рынак»; у 1588 г. згадваецца як нябожчык (АВАК, т. 20, с. 57).

І. 2. 472. ... **МАГДАЛЕНА** Якубава, злотнічка берасцейская, удава *Я. Рачкі*; у 1624 г. прадала агарод «жыду берасцейскаму Шлёме Насонавічу» (НГАБ у Мінску, ф. 1786, воп. 1, спр. 1, арк. 167—168).

I. 2. 473. **МАРЫНСКІ** ... злотнік менскі; у 1664 г. заплаціў 2 злотыя складкі на ўтрыманне г. Менскам каралеўскай харугвы (НГАБ у Мінску, ф. 1816, воп. 1, спр. 1, арк. 272 зв.).

I. 2. 474. ... **МАТЫС**, злотнік віленскі; да 1581 г. прадаў маршалку Яго Каралеўскай Міласці Яну Палуцкаму-Доўгіру пляц у «месте Віленскім на рацэ Вільні па правай руцэ»; згадваецца ў тэстаменце апошняга (НГАБ у Мінску, ф. 1785, воп. 1, спр. 1, арк. 176 зв.).

I. 2. 474а. ... **МАТЫЯС**, слуцкі злотнік, памёр да 1648 г.; яго ўдава «Матыясава золотнікова» прадавала дом «у рынку» Старога места (Минская Старина, вып. 4, № 85).

I. 2. 475. ... **МАЦВЕЙ** Іванавіч (Матфей Иванович), залатар і мешчанін віленскі; у красавіку — маі 1598 г. згадваецца як сведка па справе аб нападзе віленскіх студэнтаў-езуітаў на Свята-Духаў манастыр (АВАК, т. 8, с. 31, 35).

I. 2. 476. ... **МАЦЯШ** (Matyasz), злотнік віленскі; у 1672 г. згадваецца як вінаваты 40 злотых нябожчыку, віленскаму купцу Я. Поту (АВАК, т. 13, с. 319).

I. 2. 477. ... **МІКАЛАЙ**, залатар і мешчанін белзскі; 10.04.1628 згадваецца ў скарзе ўніяцкага мітрапаліта Вельяміна Руцкага на белзскіх мяшчан, якія не прызнаюць яго ўлады і не выконваюць яго загады (АВАК, т. 23, с. 62).

I. 2. 478. ... **МІХАЙЛА** (Михайло), залатар; у 1561 г. «чоловек похожий» жыў у Дзярэчыне ў князя А. Чартарыйскага, фігуруе ў скарзе А. Палубенскага, князя Дзярэчынскага, што, атрымаўшы «сребро на работу... не выдавшы того сребра, утек» (НГАБ у Мінску, ф. 1734, вып. 1, спр. 1, арк. 1 зв., 69 зв.).

I. 2. 479. ... **ПАВЕЛ**, злотнік гарадзенскі; у 1539—1541 гг. прыцягвае да суда дваraніна П. Зеляпугу за нявыплату 70 грошаў і па іншых грашовых і маёмасных справах з рознымі асобамі (АВАК, т. 17, с. 21, 78, 224, 248, 334).

I. 2. 480. ... **ПАВЕЛ** Рыгоравіч (Pawel Hrehorowicz), злотнік менскі; у 1667 г. меў дом «на вулочцы каля маста на Троіцкую гару» (НГАБ у Мінску , ф. 1816, воп. 1, спр. 1, арк. 387).

I. 2. 481. ... **ПЁТРА**, злотнік пінскі; у 1561—1566 г. жыў «у старым рынку» на ўласным пляцы «чалом на захад, а тылам да паркану» (Писцовая книга бывшего Пинского староства, ч. 1, с. 5).

I. 2. 482. **ПРЫСТЭР** ... (Prister), злотнік віленскі, таварыш майстры *Ю. Барчынскага*; у 1677 г. разам з майстрам абвінавачваецца ў парушэнні цэхавага статута (АВАК, т. 10, с. 418).

I. 2. 483. ... **СЕМІЁН**, злотнік гомельскі; у 1765 г. жыў у засценку Ціцянкі (КМФ-19, воп. 1, спр. 2, арк. 8).

I. 2. 484. ... **СЕМЯНЕЦ** (Семенец), залатар княжацкі; у 1456 г. згадваецца ў грамаце князя Юрыя Лугвенавіча як папярэдні «дзяржаўца» зямлі Данільцаў у двары Хахле Мсціслаўскага пав. (АСД, т. 7, с. 4).

I. 2. 485. ... **СТАНІСЛАЎ** (Станислав), злотнік менскі; у 1600 г. меў таварыша-«золотничка» *Ю. Геса* (НГАБ у Мінску, ф. 1727, вып. 1, спр. 1, арк. 309—310).

I. 2. 486. ... **СТАНІСЛАЎ**, злотнік пінскі; у 1561—1566 гг. валодаў агародам у 10 прэнтаў на вул. Фёдараўскай (Писцовая книга бывшего Пинского староства, ч. 1, с. 19).

I. 2. 487. ... **СТАНІСЛАЎ** ...боўскі (Станислав ...бовский), злотнік гарадзен-

скі; згадваецца 09.05.1596 як асоба, што жыла ў двары пісара ВКЛ Яраша Валовіча; у 1595 г. атрымаў ад шляхціца С. Хадакоўскага 10 коп грошаў літоўскіх, з якімі і знік у невядомым напрамку (КМФ-18, спр. 285, арк. 101 — 101 зв.).

I. 2. 488. ... **СТЭФАН**, злотнік нясвіжскі; у 1609 г. атрымаў за работу ў м. Белая 34 злотыя (НГАБ у Мінску, ф. 694, воп. 4, спр. 1343, арк. 126).

I. 2. 489. **ФЕДАРОВІЧ** ... (Federowicz), злотнік, нарадзіўся каля 1575 г. у «Літве»; 29.03.1599 уступіў у езуіцкі ордэн; працаваў у Любліне і Яраслаўі; у ліпені 1613 г. пакінуў ордэн, далейшы лёс невядомы (SJA, s. 110).

I. 2. 490. ... **ФЁДАР** (Федор), злотнік віцебскі; у 1667 г. меў дом на Узгорскім пасадзе (ВС, т. 1, с. 372).

I. 2. 491. ... **ФЁДАР** (Федор), злотнік ігуменскі; у 1648 г. разам з іншымі мяшчанамі і казакамі ўдзельнічаў у «пограбленні» тутэйных арандатараў Рабіновічаў, «прычыніў шкоды і пабраў рэчы». Скарга датавана 1649 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1727, воп. 1, спр. 3, арк. 1308).

I. 2. 492. ... **ФРАНЦІШАК** (Franciszek), злотнік менскі; у 1664 г. заплаціў складкі 3 злотыя на ўтрыманне Менскам каралеўскай харугвы (НГАБ у Мінску, ф. 1816, воп. 1, спр. 1, арк. 272 зв.); у 1665 г. арандаваў дом на «пляцу Марсаўскім у самом рынку супраць яткоў рэзніцкіх» (тамсама, арк. 214).

I. 2. 493. ... **ХАЦЯБЕЙ** (Хацебей), «кузнец серебряный»; каля 1440 г. атрымаў «угол з чашчом» (кавалак зямлі з лясным масівам) у Маладзечне (ЛМ, кн. 3, с. 25).

I. 2. 494. ... **ХОМА** (Хома, Фома), злотнік віцебскі; у 1618 г. жыў на царкоўным пляцы на Узгор'і (ВС, т. 1, с. 345); у 1641 г. меў агароды па Багаслоўскім завулку, «ідучы ўніз па р. Віцьбе», і ў Задунайскім пасадзе (тамсама, с. 357, 360).

I. 2. 495. ... **ХОРВАТ**, злотнік пінскі; у 1561 г. меў агарод каля яўрэйскіх могілак (Писцовая книга бывшего Пинского староства, ч. 1, с. 87).

I. 2. 496. **ЦВІКЛІЧ** ... злотнік гарадзенскі; 10.09.1628 запісаны ў кнігу сяброў стралецкага брацтва Св. Антонія пры гарадзенскай Фары (Łopaciński, № 131); магчыма, гэта адзін з братоў Цвіклічаў.

I. 2. 497. **ШАРАЎСКІ** П. Г., злотнік гарадзенскі; згадваецца ў 1561 г. (Писцовая книга Гродненской экономии, ч. 2, с. 192, 196).

I. 2. 498. ... **ЭРАЗМ** (Erazmi aurifabri, Размус), злотнік віленскі; у 1549 г. меў дом на вул. Вялікай; у 1554 г. згадваецца як нябожчык (АВАК, т. 20, с. 7, 8).

I. 2. 499. ... **ЮРЭЙ** (Юрко злотник), злотнік магілёўскі; у 1636 г. згадваецца як старшы цэха, у 1641 г. — як нябожчык (ИЮМ, т. 9, с. 415).

I. 2. 500. ... **ЯКАЎ**, злотнік пінскі; у 1561—1566 гг. валодаў пляцам у 2 прэнты на вул. Вялікай Спаскай, ідучы да маста на р. Піне па правым баку; валодаў домам і агародам на левым баку вул. Жыдоўскай, таксама сенажаццю за ракой Пінай каля сяла Кнубава памерам у 3 моргі (Писцовая книга бывшего Пинского староства, ч. 1, с. 9, 33, 95, 99, 104); меў валоку пашні каля фальв. Ся-

лец, тут жа названы Якавам Станіслававічам (тамсама, с. 105).

I. 2. 501. ... **ЯКУБ**, згадваецца ў 1565 г. як пінскі злотнік (Грушевский, с. 132, 136, 107).

I. 2. 502. ... **ЯКУБ** Б., у 1541 г. згадваецца як віленскі злотнік, у 1565 г. — як берасцейскі (Бершадский, с. 107, 246—248).

I. 2. 503. ... **ЯН**, злотнік віцебскі; у 1641 г. меў дом на Узгорскім пасадзе (ВС, т. 1, с. 356), дом і агарод на вул. Багародзіцкай (тамсама, с. 358) і пляц у Рускім пасадзе (тамсама, с. 366).

I. 2. 504. ... **ЯН**, злотнік кракаўскі, паводле паходжання літвін; згадваецца ў 1435 і 1441—1460 гг. (Lepszy, s. 132).

I. 2. 504а. ... **ЯН**, злотнік слуцкі; меў пляц каля царквы Св. Спаса ў Слуцку (НГАБ у Мінску, ф. 146, дад. да воп. 2, спр. 24, арк. 253).

I. 2. 505. ... **ЯНЭК**, злотнік віленскі; у 1658 г. (Сторожев В. Н. Московское управление в Вильно XVII в., с. 24; Труды Девятого Археологического съезда в Вильно, 1893, с. 152).

I. 2. 506. ... **ЯРЭЙ** (Ерей), немец, злотнік; у 1641 г. рабіў «пакутне рамясло» ў Магілёве, не ўпісаўшыся ў цэх, за што яму прысуджана «до скринки цеховое ... десять гривень, а другую на урад так же много» (ИЮМ, т. 9, с. 413—416).

I. 2. 507. ... ... згадваецца 03.02.1584 у іску К. Ю. Зенавічанкі ў Ашмянскі гродскі суд (AGAD, AR, dz. XXIII, t. 61, p. 1, s. 56—58).

I. 2. 508. ... ... злотнік друйскі; 28.10.1728 згадваецца яго жонка, якая выступае ў якасці сведкі пацярпелай у бойцы Ганны Каралевічаўны (НГАБ у Мінску, ф. 1797, воп. 1, спр. 1, арк. 99 зв.).

I. 2. 509. ... ... ювелір з Жоўквы, злотнік нясвіжскі; 12.12.1747 атрымаў за пару срэбраных падкоў для князя Радзівіла Ападчашага «11 злотых 15 грошаў, а за матэрыял — 69 злотых», за выраб «сыгнёту зялёнага» і аздобу яго золатам — 10 злотых, за выраб сыгнёту для луцкага біскупа і «даданне чвэрці золата» — 24 злотыя (НГАБ у Мінску, ф. 694, воп. 4, спр. 1921, арк. 270 зв.).

I. 2. 510. ... ... 14.03.1776 згадваецца ўдава злотніка Ганна, яе сыны Фёдар і Нікіфар, дачка Таццяна, другая, замужняя, дачка Варвара, яе муж Цімафей і іх дачка Алена (НГАБ у Мінску, ф. 3014, воп. 1, спр. 1, арк. 19 зв.).

I. 3. 511. **АБЕЛЬ** Якубовіч; згадваецца ў 1720 г. як берасцейскі злотнік і іўдзей (Łopaciński, № 606; L—V, № 1.484).

I. 3. 512. **АБРАМ** Шаломавіч, злотнік [дабрэнскі], абывацель м. Белая; 22.02.1742 даў падпіску і заруку ў тым, што ні ён, ні яго кампаньёны *Р. Берковіч* і *Г. Шапшовіч*, ні іх сем'і не будуць уцякаць з м. Белая і што яны добраахвотна паступілі на службу ў замак Белы (AGAD, AR, dz. XXI, b — 236).

I. 3. 513. **АРОН** ... злотнік нясвіжскі; згадваецца ў 1736 г. у «попісу падымнага»; 23.03 таго ж года заплаціў падатку 1 злоты, 11.12 — 1 злоты 15 грошаў (AGAD, AR, dz. XXI, t. 7, p. 1); у 1738 г. атрымаў за работу 17 злотых 15 грошаў (НГАБ у Мінску, ф. 694, воп. 2, спр. 4985, арк. 94—95).

I. 3. 514. **АРОН** Меяровіч (Aron Mejerowich), злотнік капыльскі; згадваецца ў інвентары 50—60-х гг. XVIII ст.: жыў ва ўласным доме на вул. Папярэчнай разам з сям'ёй, меў трох замужніх сясцёр у суседніх мястэчках (НГАБ у Мінску, ф. 1825, воп. 1, спр. 17, арк. 83 зв.).

І. 3. 515. **АЎСЕЙ** ... злотнік менскі; у 1774 г. жыў на «замчышчы места Менскага» (НГАБ у Мінску, ф. 332, воп. 2, спр. 1, арк. 3 зв.).

І. 3. 516. **БЕНЯ** Юдовіч (Benia Judowicz), злотнік слуцкі; у 1728 г. жыў ва ўласнай «халупе» ў завулку вул. Жыдоўскай (НГАБ у Мінску, ф. 1825, вып. 1, спр. 16, арк. 14).

І. 3. 517. **БЕРКА** ... злотнік менскі; у 1775 г. жыў у Менску на «пляцы па вул. Зыбіцкай», плаціў да скарбу «падымнага» 4 злотыя (НГАБ у Мінску, ф. 1756, воп. 1, спр. 156, арк. 10).

І. 3. 518. **БЕРКА** Юзэфовіч (Berko Jozefowicz), злотнік слуцкі; згадваецца ў інвентары 50—60-х гг. XVIII ст.: здымаў камору ў доме А. Ізраілевіча па правым баку вул. Навамескай (НГАБ у Мінску, ф. 1825, воп. 1, спр. 17, арк. 55 зв.).

І. 3. 519. **БОРУХ** ... (Boruch), злотнік дзісненскі; у 1775 г. значыцца ў рэестры дымоў места Дзісненскага, меў дом на вул. Каханоўскай, плаціў 7 злотых падымнага (НГАБ у Мінску, ф. 1757, вып. 1, спр. 9).

І. 3. 520. **БОРУХ** ... злотнік менскі; у 1774 г. жыў на вул. Замкавай (НГАБ у Мінску, ф. 332, воп. 2, спр. 1, арк. 2 зв.).

І. 3. 521. **ГЕРШОН** ... злотнік клецкі; у 1740 г. жыў на вул. Нясвіжскай, «ідучы з рынку» па левым баку (НГАБ у Мінску, ф. 694, воп. 2, спр. 3138, арк. 2).

І. 3. 522. **ГІРШ** ... (Hirsz), злотнік цімкавіцкі; у 1713 г. жыў у мястэчку каля рынку (НГАБ у Мінску, ф. 694, воп. 2, спр. 8424, арк. 11).

І. 3. 523. **ГІРША**, злотнік менскі; у 1774 г. жыў на вул. Школьнай (НГАБ у Мінску, ф. 332, воп. 2, спр. 1, арк. 5), заплаціў 22 грошы кагальнага збору (тамсама, арк. 19).

І. 3. 524. **ГІРША** (Hirsz), злотнік навагародскі; згадваецца ў сумарыушы аплаты мыта ў Гродзенскай эканоміі па навагародскім кагале; заплаціў у 1767 г. падатак 3 злотыя 26 грошаў, у 1768 г. — 12 злотых, у 1769 г. — 6 злотых (НГАБ у Мінску, ф. 1882, воп. 1, спр. 5, арк. 44, 46, 48).

І. 3. 525. **ГІРШОН** ... злотнік менскі; у 1775 г. жыў у Менску на «пляцы Базыльянаў па вул. Зборавай», плаціў да скарбу 4 злотыя «падымнага» (НГАБ у Мінску, ф. 1756, воп. 1, спр. 156, арк. 11 зв.).

І. 3. 526. **ДАВІД** Арановіч, злотнік берасцейскі, меў жонку Фрэду Леўкаўну Давыдаўну; 19.08.1663 памёр ад няправільнага, на думку яго родных, лячэння; згадваецца ў скарзе яго бацькі Арона Якубовіча на берасцейскага цырульніка Самуэля Шрэера (АВАК, т. 28, с. 398).



*Адбітак пячаткі Галоўнага Трыбунала ВКЛ, Менскай кадэнцыі. 1766 г.*

І. 3. 527. **ЕВЕЛЬ** ... (Jewel), злотнік навагародскі; згадваецца ў 1767 г. у сумарыушы аплаты мыта ў Гродзенскай эканоміі па навагародскім кагале, заплаціў 36 злотых (НГАБ у Мінску, ф. 1882, воп. 1, спр. 5, арк. 44 зв.); у верасні 1771 г. фігуруе ў пераліку даходаў навагародскага кагалу, у скарб якога ўнёс 4 злотыя (тамсама, ф. 1820, воп. 1, спр. 1, арк. 2 зв.), у сакавіку 1774 г. — 1 злоты 4 грошы (тамсама, арк. 9).

І. 3. 528. **ЕЛЬЯ** ... злотнік менскі; у 1774 г. жыў на вул. Рэзніцкай (НГАБ у Мінску, ф. 332, воп. 2, спр. 1, арк. 3 зв.); заплаціў 1 злоты і 15 грошаў кагальнага збору (тамсама, арк. 19).

І. 3. 529. **ЕЛЬЯ** Борухавіч (Jelia Boruchowicz), злотнік навагародскі; у верасні 1771 г. унёс у агульны скарб навагародскага кагалу 20 грошаў (НГАБ у Мінску, ф. 1820, вып. 1, спр. 1, арк. 1 зв.).

І. 3. 530. **ЕФРАІМ** Поляк (Ephraim Polak), злотнік слуцкі; у 1699 г. жыў у 2-й кватэры «ў рынку места Слуцкага» (НГАБ у Мінску, ф. 146, дад. да воп. 2, спр. 21, арк. 2529 зв.).

І. 3. 531. **ЁСЕЛЬ** [Аронаў] (Josel), злотнік слуцкі; згадваецца ў інвентары 50—60-х гг. XVIII ст.: жыў у доме маці Хасі Аронавай разам з уласнай сям'ёй, братам і каморнікамі на правым баку вул. Нясвіжскай (НГАБ у Мінску, ф. 1826, воп. 1, спр. 17, арк. 78 зв.).

І. 3. 532. **ЁСЕЛЬ** ... злотнік менскі; у 1773 г. жыў на Траецкай гары на вул. Вялікай (НГАБ у Мінску, ф. 332, воп. 2, спр. 1, арк. 1); заплаціў 24 грошы кагальнага збору (тамсама, 19).

І. 3. 533. **ЗАЛЬКО** ... (Zelko), злотнік нясвіжскі; згадваецца ў 1783 г. у інвентары места (НГАБ у Мінску, ф. 694, воп. 2, спр. 5001, арк. 29 зв.).

І. 3. 534. **ІДЭЛЬ** Абрамовіч (Idel Abramowicz), злотнік слуцкі; паводле інвентара 50—60-х гг. XVIII ст., здымаў камору на Новым Месцы каля скарбавай васкабойні на вул. Сенатарскай [Замкавай] (НГАБ у Мінску, ф. 1825, воп. 1, спр. 17, арк. 49 зв.).

І. 3. 535. **ІЗЕР** Ёселевіч, злотнік нясвіжскі; у 1801 г. згадваецца ў іску нясвіжскага катлярскага цэха да новастворанага нясвіжскага цэха злотнікаў (НГАБ у Мінску, ф. 530, воп. 3, спр. 1, арк. 23 зв. — 29).

І. 3. 536. **ІЗРАІЛЬ** ... «юбілер» менскі; у 1772 г. жыў «у завулку над Свіслаччу» (НГАБ у Мінску, ф. 332, воп. 2, спр. 1, арк. 2 зв.).

І. 3. 537. **ІЗРАІЛЬ** Лейбавіч, злотнік слуцкі; у 1682 г. фігуруе ў «Рэвізіі ўсіх слуцкіх жыдоў»; жыў разам з дзецьмі на вул. Спаскай; прыпісаны да сотні Філіпа Алайкевіча (AGAD, AR, dz. XXIII, t. 137, s. 459).

І. 3. 538. **ІСАК** Файшавіч (Ізаак Файшевич, Izaak Fayszeicz), «злотник места Городенского», каралеўскі фактар; у 1645 г. атрымаў ад караля, вялікага князя Уладзіслава IV, прывілей на 12 валокаў зямлі ў Гродзенскай эканоміі (L—V; № 1.252); у 1664 г. звяртаецца ў Гродзенскі земскі суд аб нявыплаце яму з 1654 г. доўгу памерам у «880 залотых», што застаўся пасля смерці ксяндза, каноніка віленскага рэгента Вялікай канцылярыі ВКЛ, М. Беліцкага (НГАБ у Мінску, ф. 1755, воп. 1, спр. 45, арк. 262 — 262 зв.); згадваецца ў 1649—1670 гг. (АВАК, т. 5, с. 198, 274, 275, 282).

І. 3. 539. **ІЦКА** ... (Icko), злотнік навагародскі; згадваецца ў сумарыушы аплаты мыта ў Гродзенскай эканоміі па навагародскім кагале, у скарб якога ўнёс у 1768 г. 60 злотых, у 1769 г. —

25 злотых (НГАБ у Мінску, ф. 1882, воп. 1, спр. 5, арк. 46, 48 зв.).

І. 3. 540. **ІЦКА** Шэндэровіч, злотнік менскі; у 1774 г. жыў на вул. Зыбіцкай (НГАБ у Мінску, ф. 332, воп. 2, спр. 1, арк. 4).

І. 3. 541. **ЛЕЙБА** Абрамовіч, злотнік нясвіжскі; 12.05.1762 выступае адным з паручыцеляў за нясвіжскага абываценя Б. Гершовіча (НГАБ у Мінску, ф. 694, воп. 4, спр. 1343, арк. 126).

І. 3. 542. **ЛЕЙБА** Давідовіч (Leiba Dawidowicz), злотнік слуцкі; у 1728 г. жыў у доме Шмойлы Моўшавіча каля «саскага касцелу» (НГАБ у Мінску, ф. 1825, воп. 1, спр. 16, арк. 2); у 1750 г. жыў «на левым баку» вул. Навамескай (КМФ-5, воп. 1, спр. 3837, арк. 40 зв.).

І. 3. 543. **ЛЕЙБА** Хаймовіч, злотнік менскі; у 1774 г. жыў на вул. Рэзніцкай (НГАБ у Мінску, ф. 332, воп. 2, спр. 1, арк. 3).

І. 3. 544. **ЛЕЙЗЕР**, злотнік слуцкі; у 1712 г. згадваецца ў «Рэвізіі места Слуцкага» (КМФ-5, воп. 1, спр. 3837, арк. 10).

І. 3. 545. **ЛІТМАН** Ванашэвіч (Litman Wonoszewicz), злотнік слуцкі; згадваецца ў інвентары 50—60-х гг. XVIII ст.: меў 45 гадоў, здымаў камору разам з жанатым сынам у доме Е. Фанхелевіча на рынку (НГАБ у Мінску, ф. [825?], воп. 1, спр. 17, арк. 3).

І. 3. 546. **ЛІТМАН** Манасовіч (Litman Monasowicz), злотнік слуцкі; у 1728 г. жыў у шынкоўным доме Гервічаў «на рагу ў рынку» (НГАБ у Мінску, ф. [825?], воп. 1, спр. 16).

І. 3. 547. **ЛІТМАН** Шакашэвіч, злотнік слуцкі; нарадзіўся ў 1705 г.; у 1750 г. жыў у «II кватэры рынку слуцкага», меў жанатага сына 22 гадоў (КМФ-5, воп. 1, спр. 3837, арк. 4 зв.).

І. 3. 548. **МЕЕР** Юзафовіч (Mejer Jozefowicz), злотнік слуцкі; згадваецца ў інвентары 50—60-х гг. XVIII ст.: меў 30 гадоў, жыў разам з сям'ёй у каморы скарбавай карчмы (alias Austeria) на вул. Навамескай (НГАБ у Мінску, ф. 1825, вып. 1, спр. 17, арк. 52 зв.).

І. 3. 549. **МЕЙТА** ... (Meyta), злотнік магілёўскі; у 1747 г., у сувязі з абвінавачваннем магілёўскага рамесніка мечніка А. Віславуха ў падпале, апошні тлумачыў сваю прысутнасць на месцы здарэння тым, што «ішоў да злотніка напіцца гарэлкі» (ИЮМ, т. 15, с. 164).

І. 3. 550. **МЕНДЭЛЬ** ... (Mendel), злотнік слонімскі; у 1754 г. меў у Слоніме пляц на вул. Сакалоўскай (НГАБ у Мінску, ф. 1928, воп. 1, спр. 217, арк. 16.); у 1755 г. удзельнічаў у таксацыі (ацэнцы) зэгарка і карабелі (шаблі) навагародскага войта Яна [Місовіча] (НГАБ у Мінску, ф. 1737, воп. 1, спр. 40, арк. 613 — 613 зв.); у 1764 г. фігуруе ў «Генеральным спісе жыдоў Слонімскай эканоміі», меў жонку Пельту і двух сыноў (імя аднаго — Залман), разам з імі жыла матка Бася (тамсама, ф. 1885, воп. 1, спр. 1, арк. 26 зв.).

І. 3. 551. **МІХАЛ** Іцковіч, злотнік і арандатар слуцкі; 05.03.1687 заключыў кантракт на арэнду паперні ў Клершчанах на тэрмін у 3 г. да 05.03.1690 з выплатай уладальніку 1500 злотых (AGAD, AR, dz. XXIII, t. 137, s. 4).

І. 3. 552. **МІХЕЛЬ** ... злотнік слуцкі; згадваецца ў 1687 г. у квітацыйным лісце слуцкага злотніка *С. Граковіча* на імя пана Станіслава Бавойны аб адсутнасці да апошняга прэтэнзій у сувязі са «зраненнем» *С. Граковіча* ў доме Міхеля (НГАБ у Мінску, ф. 694, воп. 4, спр. 1231, арк. 38 зв.).

І. 3. 553. **МОЙША** Ісаковіч (Mojżesz Izsakowicz), злотнік і абывацель менскі; 30.06.1639 кароль Уладзіслаў VI даў яму «за бегласць яго у злотнічым раместве» дазвол на вольную працу ў Менску, права трымаць у сябе таварыша «без жадной турбацыі з [боку] цэха», пад страхам «віны» ў 100 коп грошаў на карысць каралеўскага скарбу (КМФ-18, спр. 113, арк. 315 зв., 316; L—V, № 1.440).

І. 3. 554. **МОЎША** Аронавіч (Mowsza Aronowicz), злотнік капыльскі; згадваецца ў інвентары 50—60-х гг. XVIII ст.: меў 25 гадоў, разам з сям'ёй здымаў камору ў доме А. Гіршэвіча на рынку (НГАБ у Мінску, ф. 1825, воп. 1, спр. 17, арк. 64 зв.).

І. 3. 555. **МОЎША** Нахімовіч (Mowsza Nochimowicz), злотнік слуцкі; у 1728 г. жыў у доме кушнерскага цэха на правым баку вул. Навамескай (НГАБ у Мінску, ф. 1825, воп. 1, спр. 16, арк. 33 зв.); згадваецца ў інвентары 50—60-х гг. XVIII ст.: меў 34 гады, здымаў камору ў скарбавай карчме (alias Austeria) на баку вул. Навамескай разам з сынамі Лейбам і Ізраілем і 4 дочкамі (тамсама, спр. 17, арк. 49 зв.).

І. 3. 556. **НАХЕМ'Я** ... ювелір менскі; у 1775 г. жыў у Менску на вул. Нямізскай (БДАМЛіМ, ф. 382, спр. 624, № 5).

І. 3. 557. **НАХМАН** Абрамовіч (Nachman Abramowicz), злотнік капыльскі; згадваецца ў рэестры 50—60-х гг. XVIII ст.: меў 40 гадоў, здымаў каморы разам з сям'ёй у доме Л. Беркавіча на левым баку вул. Пясецкай (НГАБ у Мінску, ф. 1825, воп. 1, спр. 17, арк. 79 зв.).

І. 3. 558. **НЕХАМ'Я**, «юбілер» менскі; у 1772 г. жыў «у завулку над Свіслаччу» (НГАБ у Мінску, ф. 332, воп. 2, спр. 1, арк. 2 зв.).

І. 3. 559. **НОХІМ** Моўшавіч (Nexim Mowszowicz), злотнік слуцкі; у 1728 г. жыў у доме кушнерскага цэха на правым баку вул. Навамескай (НГАБ у Мінску, ф. 1825, воп. 1, спр. 16, арк. 33 зв.); згадваецца ў рэестры 50—60-х гг. XVIII ст.: меў 50 гадоў, жыў ва ўласным доме на правым баку вул. Навамескай разам з жанатым 18-гадовым сынам Лейбам (тамсама, спр. 17, арк. 56).

І. 3. 560. **НОХІМ** Юдковіч (Nohim Judkowicz), злотнік слонімскі; у 1754 г. меў у мескім рынку пляц, за які плаціў 6 грошаў чыншу; меў пляц даўжынёй 4 прэнты і шырынёй 1 прэнт на вул. Сакалоўскай (НГАБ у Мінску, ф. 1928, воп. 1, спр. 217, арк. 2, 14).

І. 3. 561. **РАФАЛ** Беркавіч, абывацель і злотнік м. Белая; 22.02.1742 дае падпіску і заруку ў тым, што ні ён, ні яго кампаньёны *А. Шаломавіч* і *Г. Шапшовіч*, ні іх сем'і не будуць уцякаць з м. Белая і што яны добраахвотна паступілі на службу ў замак Белы (AGAD, AR, dz. XXI, b — 236).

І. 3. 562. **РУБІН** ... злотнік пінскі; у 1650 г. жыве ў «новабудаваным» доме «на Рошчы» (АВАК, т. 28, с. 343).

І. 3. 563. **РУБІН** ... (Rubin), злотнік навагародскі; згадваецца ў сумарыушы аплаты мыта ў Гродзенскай эканоміі па навагародскім кагале, у скарб якога заплаціў у 1767 г. 61 злоты 25 грошаў, у 1768 г. — 68 злотых, у 1769 г. — 42 злотыя (НГАБ у Мінску, ф. 1882, воп. 1, спр. 5, арк. 45, 47 зв., 48 зв.); у 1774 г. унёс у агульную касу навагародскага кагалу 10 злотых 9 грошаў (тамсама, ф. 1820, воп. 1, спр. 1, арк. 8 зв.).

І. 3. 564. **СТЭФАН** ... злотнік нясвіжскі; у 1609 г. атрымаў за работу ў м. Белая

34 злотыя (НГАБ у Мінску, ф. 694, воп. 4, спр. 1343, арк. 126).

І. 3. 565. **ТЭЦ** Яхновіч (Tiec Jochnowicz), злотнік слуцкі; у 1728 г. жыў у 4-й кватэры «дома шынкоўнага» на рынку ў Гіша Юзафовіча (НГАБ у Мінску, ф. 1825, воп. 1, спр. 16, арк. 4).

І. 3. 566. **УРА** ... злотнік менскі; у 1774 г. жыў на вул. Францысканскай (НГАБ у Мінску, ф. 332, воп. 2, спр. 1, арк. 7).

І. 3. 567. **ФАЙБІШ** ... злотнік нясвіжскі; у 1783 г. згадваецца ў інвентары места (НГАБ у Мінску, ф. 694, воп. 2, спр. 5001, арк. 29 зв.).

І. 3. 568. **ФАЙВІШ** ... (Fajwisz), злотнік слуцкі; згадваецца ў рэестры 50—60-х гг. XVIII ст. як нежывы, у тым жа дакуменце фігуруе «пляц без забудавання, пусты, пасля Файвіша-злотніка на вул. Навамескай на правым баку вул. Надрэчнай» (НГАБ у Мінску, ф. 1825, воп. 1, спр. 17, арк. 54 зв.).

І. 3. 569. **ФАЙК** ... [Faik], злотнік клецкі; у 1747 г. жыў на рынку з боку вул. Цэперскай (НГАБ у Мінску, ф. 694, воп. 2, спр. 3138, арк. 16).

І. 3. 570. **ФІШАР** ... злотнік ковенскі; згадваецца ў 1747 г. як адзін з пакупнікоў скрадзеных у арандатара карчмы (Дарсунішскае староства Ковенскага пав.) Саламона Ляўковіча рэчаў: срэбраных пярсцёнкаў на 4 злотыя, срэбраных гузікаў 8 штук і срэбранага футлярыка для зэгарка коштам у 11 злотых і 25 грошаў (НГАБ у Мінску, ф. 694, воп. 4, спр. 2, арк. 97).

І. 3. 571. **ФІШЭЛЬ** ... (Fiszel), злотнік м. Янішкі; у 1752 г. вырабіў на заказ Ганны і Ігнацыя (былога эканома Янішскага) Лясецкіх збрую вагой у 3 грыўны і 6 лотаў. За работу, з уключэннем кошту 14 лотаў дададзенага ім срэбра, належала выплаціць 24 тынфы і 20 грошаў (НГАБ у Мінску, ф. 1711, воп. 1, спр. 41, арк. 29 — 30 зв.).

І. 3. 572. **ХАЙМ** Гіршовіч (Chaim Hirszowicz), «юбілер» нясвіжскі; 20.08.1806 атрымаў узнагароджанне за 2 выразаныя медныя пячаткі [для курадымных і сургучных адбіткаў] для эканамічнага аддзела Генеральнага ўрада маёнткаў князёў Радзівілаў (AGAD, AR, dz. XXI h — 132).

І. 3. 573. **ХАЦКЕЛЬ** ... (Chackiel), злотнік ражанскі; у 1761 г. меў «у месце ¼ пляца на вул. Замкавай (НГАБ у Мінску, ф. 1928, воп. 1, спр. 1209, арк. 4).

І. 3. 574. **ШАПКА** ... (Szapka ...), злотнік менскі; у 1773 г. заплаціў 6 грошаў у



*Адбітак пячаткі Георгія (Юрыя) Алелькавіча, князя Слуцкага. 1583 г.*

кагальны збор (НГАБ у Мінску, ф. 332, воп. 2, спр. 1, арк. 19).

І. 3. 575. **ШАПШОВІЧ** Гершка, злотнік і абывацель м. Белая; 22.02.1742 даў падпіску і заруку ў тым, што ні ён, ні яго кампаньёны *А. Шаломавіч* і *Р. Берковіч*, ні іх сем'і не будуць уцякаць з м. Белая і што яны добраахвотна паступілі на службу ў замак Белы (AGAD, AR, dz. XXI, b — 236).

І. 3. 576. **ШЛОМА** ... злотнік менскі; у 1774 г. жыў на Высокім рынку (НГАБ у Мінску, ф. 332, воп. 2, спр. 1, арк. 6 зв.).

І. 3. 577. **ШМОЙЛА** ... злотнік менскі; у 1772 г. жыў на вул. Замкавай (НГАБ у Мінску, ф. 332, воп. 2, спр. 1, арк. 2 зв.).

І. 3. 578. **ШМОЙЛА** ... злотнік менскі; у 1772 г. жыў «у завулку над Свіслаччу» (НГАБ у Мінску, ф. 332, воп. 2, спр. 1, арк. 2 зв.).

І. 3. 579. **ШМОЙЛА** ... злотнік слуцкі; разам з саўдзельнікамі абакраў касцёл у Цімкавічах; адпаведна дэкрэту ад 01.11.1681, злодзеі прыгавораны да выплаты «віны» памерам у 12 804 злотыя і 20 грошаў і спалення жывымі (АВАК, т. 29, с. 114—117).

І. 3. 580. **ШМОЙЛА** ... «юбілер» менскі; у 1772 г. жыў на вул. Школьнай (НГАБ у Мінску, ф. 332, воп. 2, спр. 1, арк. 5); у 1774 г. заплаціў 1 злоты і 20 грошаў у кагальны збор (тамсама, арк. 19).

І. 3. 581. **ШМУЙЛА** Ёселевіч (Szmujla Joselewicz), злотнік віленскі; каля 1667 г. рэзаў пячаткі паводле заказаў князёў Радзівілаў і адначасова рабіў сабе дубальтовыя экзэмпляры; выкарыстоўваючы іх, разам са сваім кампаньёнам пачаў фальшаваць грашовыя дакументы князёў; у пачатку 90-х гг. XVII ст. уцёк за мяжу, а ў 1694 г. добраахвотна вярнуўся і здаўся «на міласць і пад пратэкцыю» Людавікі Караліны князёўны Радзівіл (Цітоў А. Пячаткі старажытнай Беларусі. С. 163—165).

І. 3. 582. **ЮДЭЛЬ** Ёселевіч (Judel Joselewicz), абывацель і злотнік навагародскі; 24.03.1807 заключыў кантракт з Марцінам Радзівілам аб перадачы Ёселевічу ў арэнду на 1 г. будынка з 3 крамкамі з выплатай па 7 злотых і 20 грошаў за кожны тыдзень (AGAD, AR, dz. XXI, j — 133).

І. 3. 583. **ЮЗАФ** Гершановіч (Jozef Gerszanowicz), злотнік слуцкі, меў жонку Расю Якабаўну; у 1703 г. разам з ёй пазычыў грошы і выдаў ліст (облігі) слуцкаму абывацелю Ф. Шчырскаму на 200 злотых (Матэрыялы Слуцкага Трайчанскага архіва, № 253).

І. 3. 584. **ЯКУБ** ... злотнік пінскі; у 1650 г. жыве ў «новабудаваным» доме (АВАК, т. 28, с. 343).

І. 3. 585. **ЯНКЕЛЬ** ... (Jankel), злотнік дзісненскі; згадваецца ў 1775 г. у рээстры дымоў; меў дом на вул. Каханоўскай, плаціў падымнага 7 злотых (НГАБ у Мінску, ф. 1757, воп. 1, спр. 9, арк. 393).

І. 3. 586. **ЯНКЕЛЬ** Лейбавіч (Jankiel Lejbowicz), злотнік нясвіжскі; у 1765 г. працаваў пры двары князёў Радзівілаў; 08.10.1777 атрымаў за зробленую работу 1 чырвоны злоты (AGAD, AR, dz. XXI, l — 107; L—V, № 1.682).

І. 3. 587. **ЯХІМ** (Jachim), злотнік віленскі; 09.06.1654 атрымаў узнагароджанне «за работу для ваяводы і Вялікага гетмана» ў памеры 650 злотых і 10 грошаў, якія былі выплачаны каштоўнымі камянямі (рубінаў — 43, дыяментаў — 16) і белым срэбраным кубкам з каралеўскім гербам і ініцыяламі Z·A (AGAD, AR, dz. XXI, j — 112).

# РЭЕСТР ПРОБЕРАЎ І ІХ КЛЕЙНЫ (II)

II. 1. 588. **АНТАШКЕВІЧ** Сямён Герасімаў, паводле паходжання тутэйшы мешчанін, першы менскі проберных спраў майстра; адпаведна рашэнню 1819 г. Мінскай грамадзянскай камісіі «обще» з гарадскім магістратам, было пастаноўлена паслаць аднаго чалавека «хорошего поведения, имеющего грамоту» ў Маскву для вывучэння пробернай справы (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 1, спр. 165, арк. 196); «по окончании наук», у 1827 г., С. Анташкевіч вярнуўся ў свой горад на гэтую пасаду, якую ён займаў да дня сваёй смерці — 14 сакавіка 1850 г.[7] (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 964).







II. 1. 589. **АРДЫБАШАЎ** Анатоль, згадваецца як проберны майстра ў 1886—1898 гг.; кіраўнік Віленскай пробернай акругі з 1898 да 1912 г. (РЗиСД, с. 153).

II. 1. 590. **АФЕНДЗІК ДРУГІ**, згадваецца як менскі проберны майстра ў 1854 г.; у 1853 г., паводле таго ж аўтара, займаў такую ж пасаду ў Пскове (РЗиСД, с. 200, 238); згодна з нашымі даследаваннямі — калежскі рэгістратар, да чэрвеня 1850 г. быў проберам ва Уладзімірскай мясцовай казённай палаце; у сувязі з «аднаўленнем дзейнасці Мінскай палаткі» з 1 ліпеня таго ж года выконваў абавязкі пробера ў Менску, «знаходзіўся пры пасадзе» да лістапада — снежня 1851 г. (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 1, спр. 480, арк. 273; тамсама, спр. 492, арк. 128; тамсама, спр. 498, арк. 281 зв.).

II. 1. 591. **БАБКОЎСКІ** Феліцыян, згадваецца як менскі [проберны] злотніцкі майстра ў 1822 г. (РЗиСД, с. 172, 200).




II. 1. 592. **БАГАМОЛАЎ** Феліцыян Якаўлевіч, менскі проберных спраў майстра; прыступіў да «исполнения должности» 6 лістапада 1851 г. (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 1, спр. 497, арк. 449); згадваецца ў 1854—1860 гг. (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 691, 770, 911, 1084, 1595; РЗиСД, с. 200).




II. 1. 593. **БАЛАБАНАЎ** Лаўрэн, гарадзенскі проберны злотніцкі майстра; паколькі, верагодна, Л. Балабанаў быў гарадзенскім проберам з 1851 г. і яго прозвішча фігуруе да красавіка 1862 г., можна меркаваць, што ён займаў гэтую пасаду ў 1852—1861 гг. (РЗиСД, с. 159); трэба адзначыць, што былы гарадзенскі майстра залатых і срэбраных спраў дваранін *Ф. Венглеўскі* 10 мая 1862 г. звярнуўся з прашэннем прызначыць яго на пасаду пробера ў Гарадзенскую казённую палату, але яго кандыдатура была адхілена (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 2180, арк. 67).

---

[7] М. М. Поснікава-Лосева падае памылковую дату яго смерці — 1854 г. (РЗиСД, с. 200).

II. 1. 594. **БЯЛОЎ** Аляксандр, вучань Маскоўскай пробернай палаткі; у 1839 г. прыняў справы ў віцебскага пробера *В. Розета* і часова выконваў яго абавязкі (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 8174, арк. 5); у 1841 г. знаходзіцца на пасадзе пробернага майстры, абвінавачаны «в утайке трех слитков серебра» і пасаджаны пад варту (тамсама, арк. 44).




II. 1. 595. **ВАКАР** Юзаф (Іозеф), віленскі проберны майстра і срэбраных спраў майстра (РЗиСД, с. 153).

II. 1. 596. **ГУРЭВІЧ** Гірша Гамшавіч, магілёўскі проберны майстра; да 1821 г. ужо займаў пасаду «пробермейстера» Магілёўскай губ.; у 1821 г. абраны яўрэйскім старастам г. Магілёва (НГАБ у Мінску, ф. 1297, воп. 1, спр. 7613); у 1825 г., паводле даклада магілёўскага губернатара генерал-губернатару віцебскаму, магілёўскаму і смаленскаму, Г. Гурэвіч рэгулярна «без ведома начальства отлучается в другие губернии и города» (тамсама, спр. 41, арк. 1— 2); у 1829 г. атрымаў пісьмовую падзяку ад магілёўскага губернатара М. М. Хаванскага за «устройство быта евреев» у горадзе; у 1830 г. просіць губернскае начальства звольніць яго з пасады старасты; 2 траўня 1831 г. накіраваны начальнікам галоўнага штаба расійскай арміі з паліцэйска-шпіёнскай місіяй у г. Ігумен і мяст. Пагост Менскай губ. для «выведованія» настрояў сярод насельніцтва. Тайная інструкцыя патрабавала сачыць і дакладаць аб размовах і думках на сходах тутэйшых дваран і шляхты, а таксама рымскага духавенства. «Барацьбіт з крамолай» атрымаў ад расійскага ўрада 250 рублёў на выдаткі і 50 рублёў на раз'езды (тамсама, спр. 7613, арк. 40); 14 снежня 1831 г., паводле даручэння генерала Клейнміхеля, узнагароджаны медалём «За усердіе» на Аненскай стужцы; у 1833 г. прадстаўлены да нагрsucceeded медалём «За человеколюбивые подвиги» на Андрэеўскай стужцы (тамсама, спр. 7613); у 1847 г. просіць начальства «аб задавальненні грашыма магілёўскага пробернага майстры» (тамсама, спр. 18496, арк. 1—2).

II. 1. 597. **ДУЛІН** ... згадваецца 19.07.1868 як пробер Віцебскай пробернай палаткі, пазней прызначаны на месца пробера ў Вільні (L—V, p. 8).

II. 1. 598. **ЗАБУРДЗІН** Ягор Дзімітрыевіч, згадваецца як менскі проберных спраў майстра ў 1860, 1862 і 1873 гг. (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 1595; РЗиСД, с. 200).




II. 1. 599. **ЗАГАЕЎСКІ** Клімент Антонавіч, віленскі пробер, срэбраных спраў майстра ў 1891—1908 гг. (РЗиСД, с. 153).

II. 1. 600. **ЗІМІН** В., з чэрвеня 1862 да 1873 г. займаў пасаду пробера Гарадзенскай пробернай палаткі; яму належалі проберныя клейны з ініцыяламі **В · З** і датамі 1862, 1863 ... унізе, а таксама з тымі ж лічбамі і літарамі або без іх, але з гербам Гародні; у часы яго проберства былі асобныя авальныя клейны з літарай П. і Ш і адпаведнымі пробамі: 94, 91, 88, 84, 72-й ці 56-й.

II. 1. 601. **КАБЫЛІН** Раман, вучань віцебскага пробера *С. Палякова* ў 1853—1854 гг. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 10295, арк. 1 — 10 зв.).




II. 1. 602. **КАЛПАКОЎ** Канстанцін, пробер віленскі і срэбраных спраў майстра ў 1896 г. (РЗиСД, с. 153).

II. 1. 603. **КЕЛЬН** Янкель, «пробермейстер» Магілёўскай пробернай палаткі; у 1852 г. згадваецца ў справе бабруйскіх злотнікаў, якія гандлявалі нізкапробнымі, кантрабанднымі залатымі і срэбранымі вырабамі без клейнаў (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 3923, арк. 62).

II. 1. 604. **МАГАЗІНЭР** Воля, менскі срэбраных спраў майстра; пробер у 1827—1828 гг. (РЗиСД, с. 172, 200), але гэтая высноваа расійскіх аўтараў не пацвярджаецца дакументальнымі дадзенымі (гл. *С. Анташкевіч*).

II. 1. 605. **МІХАЭЛІС** Іван Крыштапавіч (J[ochan] C[hrystian] Michaelis), майстра злотніцкі; атрымаў званне майстры ў віленскім злотніцкім цэху, працаваў у Гародні; меў падмайстраў і вучняў: Я. Прэйцыга (1811), Памоту (1814), В. Скарунку і інш.; паводле няпэўных звестак, працаваў некаторы час і ў Варшаве (L—V, № 2.663); у 1821—1828 гг. згадваецца як гарадзенскі проберны майстра (РЗиСД, с. 159); у ліпені-жніўні 1822 г. прадставіў да забароны дзейнасць майстры *М. Лефая*, які займаўся рамяством без дазволу Пробернай палаткі (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 1, спр. 2670); у кастрычніку 1822 г. прыняў да разгляду прашэнне майстры *І. Гудзярлея* і яго калегаў (тамсама, ф. 2, воп. 3, спр. 499).




II. 1. 606. **МЯНОЎСКІ** Аляксандр, пробер віленскі і срэбраных спраў майстра ў 1854—1861 гг. (РЗиСД, с. 153).

II. 1. 607. **ПАВАРНАЎ** Іван, выконваў абавязкі пробера Віцебскай пробернай палаткі; у 1856 г. скардзіцца віцебскаму грамадзянскаму губернатару аб невыкананні яго распараджэнняў і загадаў Суражскай і Веліжскай гарадскімі думамі, а таксама Полацкім гарадскім праўленнем (НГАБ у Мінску, ф. 1430, воп. 1, спр. 28259, арк. 1—2).




II. 1. 608. **ПАЛЯКОЎ** Сямён [Сцяпан]; «Унтер Шихтмейстер»; у 1844 г. пачаў працаваць на пасадзе выконваючага абавязкі пробера Віцебскай пробернай палаткі замест *В. Розета* (НГАБ у Мінску, ф. 2620, воп. 1, спр. 186, арк. 1); у 1849 г. згадваецца ў скарзе майстры *Я. Запрудскага* (тамсама, ф. 1430, воп. 1, спр. 17469, арк. 1зв.); у 1853—1854 гг. меў вучня *Р. Кабыліна*; у гэты ж час скардзіцца на злотніка *М. Розета* за ўчыненае апошнім «буйства» (тамсама, ф. 1416, воп. 2, спр. 10295, арк. 1 — 10 зв.); у 1852 г. у «донясенні» ў Дэпартамент горных і саляных «дел» адзначаў, што «в городе Витебске мастера-евреи склонны к обману» (тамсама, ф. 1416, воп. 2, спр. 9866, арк. 7).




II. 1. 609. **РАХІЛІН** Лука Пятоў, смаленскі пробер, срэбраных спраў майстра ў 1854—1861 гг. (РЗиСД, с. 244).

II. 1. 610. **РОЗЕТ** Вульф Іцкавіч, проберны майстра і мешчанін віцебскі; 4 снежня 1818 г. «прызначаны» (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4,

спр. 837, арк. 60) і ў 1819 г. накіраваны за казённы кошт для абучэння пробернаму «мастацтву» ў Маскоўскае горнае праўленне; у 1820 г. адпраўлены на працу ў Віцебск; да 1824 г. утрымліваў Проберную палатку ва ўласным доме (тамсама, ф. 1297, воп. 1, спр. 786, арк. 1—2); у 1842 г. падаў прашэнне аб звальненні яго з пасады ў сувязі з хваробай, а справы часова перадаў *А. Бялову* (тамсама, ф. 1416, воп. 2, спр. 8174, арк. 1—94); у 1844 г. атрымаў загад падрыхтаваць «дела, книги, инструменты и прочее имущество Пробирной палатки...» для перадачы пераемніку — *С. Палякову* (НГАБ у Мінску, ф. 2620, воп. 1, спр. 186, арк. 1); у 1883 г. меў 87 гадоў ад нараджэння (тамсама, ф. 2496, воп. 1, спр. 2483, арк. 99—100).




II. 1. 611. **РЭДЗЬКІН** Сцяпан, смаленскі пробер, срэбраных спраў майстра ў 1821—1845 гг. (РЗиСД, с. 244).




II. 1. 612. **САЕЎСКІ** Пётра, Віцебскай пробернай палаты майстра ў 1858 г. (у РЗиСД на с. 238 гэтае кляйно памылкова прыпісана да Полацкай пробернай палаткі, якая ніколі не існавала).




II. 1. 613. **САК** Карл, віленскі пробер, срэбраных спраў майстра ў 1857—1858 гг. (РЗиСД, с. 153).




II. 1. 614. **САРАПУЛЬЦАЎ** А., віленскі пробер, срэбраных спраў майстра ў 1857—1858 гг. (РЗиСД, с. 153).




II. 1. 615. **СТАРАДОМСКІ** Мікалай (Николай), віленскі срэбраных спраў майстра ў 1857—1858 гг. (РЗиСД, с. 153).




II. 1. 616. **ТРЫПЕЦКІ** Цімох (Тимофей), віленскі пробер, срэбраных спраў майстра ў 1854—1879 гг., пераведзены з Волагды (РЗиСД, с. 153).



II. 1. 617. **УШАКОЎ** Мікалай (Николай), менскі проберны майстра; фігуруе ў дакументальных крыніцах са жніўня 1871 па снежань 1874 г. (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 3352, арк. 1 зв.; тамсама, спр. 2962, арк. 18—31); у М. М. Поснікавай-Лосевай гэты майстра запісаны як Ушатаў Аляксандр Васільевіч, проберных спраў майстра, прызначаны ў Менск у 1870 г. (РЗиСД, с. 201).

II. 1. 618. **ФРАЛОЎ** ... менскі проберных спраў майстра ў 1869 г. (РЗиСД, с. 201); звольнены ў 1870 г. (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 2092, арк. 30; РЗиСД, с. 201).

II. 1. 619. **ЯНОВІЧ-ЧАІНСКІ** ... згадваецца ў 1897 г. як калежскі асэсар, бухгалтар, выконваў абавязкі «па пробернай частцы» ў Беластоцкім павятовым казначэйстве (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 1680,

арк. 27); 13 красавіка 1898 г. узнагароджаны 15 рублямі за добрую працу (тамсама, арк. 28).




II. 2. 620. … … неўдакладнены менскі проберны майстра з ініцыяламі **I · S**, фігуруе ў 1874—1890 гг. (РЗиСД, с. 201).




II. 2. 621. … … неўдакладнены менскі проберны майстра з ініцыяламі **W · K**, фігуруе ў 1856—1877 гг. (РЗиСД, с. 200).




II. 2. 622. … … неўдакладнены менскі проберны майстра з ініцыяламі **П · Г**, фігуруе ў 1844—1848 гг. (РЗиСД, с. 200).



II. 2. 623. … … неўдакладнены [гродзенскі] проберны майстра з ініцыяламі **А · К** і датай 186[3]; зафіксаваны на срэбраным кадзіле, якое захоўваецца ў Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі.




II. 2. 624. … … неўдакладнены віцебскі проберны майстра з ініцыяламі **П · К** і датай 1877 (у РЗиСД на с. 238 гэтае кляйно памылкова прыпісана да Полацкай пробернай палаткі, якая ніколі не існавала).




II. 2. 625. … … неўдакладнены майстра Віцебскай (?) пробернай палаткі з ініцыяламі **Я · К**, фігуруе ў 1840—1842 гг. (у РЗиСД на с. 238 дадзенае кляйно памылкова прыпісана да Полацкай пробернай палаткі, але «жадныя» дакументальныя крыніцы не згадваюць пра яе існаванне); варта адзначыць, што ініцыялы супадаюць з блізкім па часе проберам Магілёўскай губ. *Я. Кельнам* (гл. вышэй). Для больш грунтоўных высноў бракуе пэўных матэрыялаў.




II. 2. 626. … … неўдакладнены віцебскі проберны майстра з ініцыяламі **А · М** і датай 1855.




II. 2. 627. … … неўдакладнены майстра Віцебскай (?) пробернай палаты з ініцыяламі **О · П** і датай 1847 (у РЗиСД на с. 238 гэтае кляйно памылкова прыпісана да Полацкай пробернай палаткі, якая ніколі не існавала).



II. 2. 628. … … неўдакладнены віцебскі проберны майстра з ініцыяламі **И · С** і датай 1861, фігуруе на абкладзе да абраза, зробленага майстрам *М. Татарскім*.




II. 2. 629. … … неўдакладнены менскі проберны майстра з ініцыяламі **О · С**, фігуруе ў 1874—1890 гг. (РЗиСД, с. 200).




II. 2. 630. … … неўдакладнены віцебскі проберны майстра з ініцыяламі **М · П** і датай 1889.

# ПРОБЕРНЫЯ КЛЕЙНЫ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ

## Віленскія мескія цэхі (клейны) да далучэння да Расійскай імперыі


1637 г.


XVI–XVII стст.


XVIII ст.


XVIII ст.

## Клейны Віленскай пробернай палаткі



1845–1847 гг.


1845–1873 гг.


1855 г.


1875 г.


1895–1896 гг.

## Клейны Віцебскай пробернай палаткі


1842–1848 гг.


1852 г.



1875–1880 гг.

## Гарадзенскія мескія клейны канца XVIII — пачатка XIX ст.



XVIII – пачатак XIX ст.



Пачатак XIX ст.

## Клейны Гарадзенскай пробернай палаткі




1854 г.




1861–1862 гг.

## Клейны Менскай пробернай палаткі




1848 г.



1860 г.



1873 г.



1874 г.



1889 г.



1891 г.



1895 г.

## Клейны Смаленскай пробернай палаткі



1738–1767 гг.



1844–1845 гг.




1855–1875 гг.




*Кадзіла*
*з гродзенскай сінагогі.*
*60-я гг. XIX ст.*

# РЭЕСТР ЗЛОТНІКАЎ І РЭЗЧЫКАЎ ПЯЧАТАК канца XVIII — пачатку XX ст. (III)

III. 1. 631. **АБАМ** Аляксандр, шклоўскі мешчанін, рэзчык пячатак; фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў 1877—1886 гг. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2).

III. 1. 632. **АБРАМОВІЧ** Абрам Лейбавіч, гарадзенскі злотніцкі майстра; 03.09.1878 запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніцкага майстры *В. Брытэнскага* (L—V, № 2.1).

III. 1. 633. **АБРАМОВІЧ** Моўша, майстра залатых і срэбраных спраў мяст. Чашнікі; у 1818 г. працаваў без штэмпеля для клеймавання вырабаў (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 44).

III. 1. 634. **АДАМОВІЧ** Балеслаў Іпалітаў, залатых спраў майстра; у 1893 г. унесены ў спісы асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу, дзе напісана: менскі мешчанін, пражывае ў г. Мітава на вул. Каталіцкай у доме І. Шаблоўскага, нарадзіўся ў 1874 г., пісьменны (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 3009, арк. 48 зв. — 49).

III. 1. 635. **АДАШКА** М., віленскі ювелір; у 1893 г. меў вучня, валожынскага мешчаніна *Ё. Рудэнку* (L—V).

III. 1. 636. **АДЭЛЬСОН** Г., віленскі ювелір; у 1886 г. меў вучня, навагародскага мешчаніна *Л. Немзера* (L—V, № 2.697).

III. 1. 637. **АЗЕРСКІ** Моўша Нотавіч, шклоўскі мешчанін, бабруйскі злотніцкі майстра, рэзчык пячатак да 1844 г.; менскі майстра злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1); у 1849 г. значыцца майстрам ювелірнага цэха г. Менска (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49); у канцы 40-х — пачатку 50-х гг. XIX ст. займаўся вырабам і рэалізацыяй нізкапробных залатых і срэбраных вырабаў, пры гэтым накладваў фальшывае кляйно з лічбамі «84»; не зарэгістраваны ў Пробернай палатцы (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 3923, арк. 3—5).

III. 1. 638. **АЗЕРСКІ** Шмуйла Айзікавіч, бабруйскі злотніцкі майстра, рэзчык пячатак; у 1851 г. «отлучился в Великорусские губернии»; у 1852 г. згадваецца ў сувязі з тым, што займаўся вырабам і рэалізацыяй нізкапробных залатых і срэбраных вырабаў, пры гэтым накладваў фальшывае кляйно з лічбай «84»; не зарэгістраваны ў Пробернай палатцы (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 3923, арк. 3—5).

III. 1. 639. **АЙЗЕНШТАТ** Беньямін Мееравіч, мешчанін м. Шклоў Магілёўскай губ., майстра віцебскай злотніцкай управы; нарадзіўся ў 1812 г.; у 1840—1850-я гг. жыў у Віцебску на Падзвінні ў доме Марголіна (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 12 зв.); у 1863 г. рэзчык пячатак, пражываў у Віцебску разам з сям'ёй; у 1860—1868 гг. жыў на вул. Падзвінскай у доме купца II гільдыі М. С. Марголіна (тамсама, ф. 2631, воп. 2, спр. 2, арк. 116 зв.); у 1868 г. жыў на вул. Сма-

ленскай (тамсама, ф. 116, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.; ф. 2505, воп. 1, спр. 123, арк. 44 зв.).

III. 1. 640. **АЙЗЕНШТАТ** Генэз Мееравіч, мешчанін Магілёўскай губ.; у 1849 г. значыцца майстрам менскага срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20); у снежні 1853 г. атрымаў пасведчанне на «производство в Минске мастерства золотых и серебряных изделий... на приготовление волочения... и сусального золота и серебра» (тамсама, спр. 770, арк. 9); у 1854 г. фігуруе як майстра (тамсама, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 641. **АЙЗЕНШТАТ** ... мешчанін Віцебскай губ., рэзчык пячатак; у 1872 г. выразаў пячатку для Себежскай гарадской думы (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр.14763).

III. 1. 642. **АЙЗІНБАРГ** Арон Нотаў, срэбранік мяст. Лагішына Пінскага пав.; у 1816 г., паводле рэвізскай казкі цэхавых, яму 56 гадоў, меў жонку Міндлю Ёселеву (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 1144, арк. 669 зв. — 670).

III. 1. 643. **АЙЗІНБАРГ** Ехіэль Аронаў, срэбранік мяст. Лагішына Пінскага пав.; у 1816 г., паводле рэвізскай казкі цэхавых, яму 28 гадоў, а яго жонцы Юдэс 27 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, д. 1144, арк. 669 зв. — 670).

III. 1. 644. **АЙЗІНБАРГ** Іцка Давідаў, згадваецца як срэбранік мяст. Пагост Пінскага пав. у 1816 г.; паводле рэвізскай казкі цэхавых, у 1811 г. «перайшоў» з Мазырскага пав. у мяст. Давыд-Гарадок (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 1144, арк. 669 зв. — 670).

III. 1. 645. **АЙЗІНБАРГ** Шалом Ёселеў, срэбранік мяст. Лагішына Пінскага пав.; у 1816 г., паводле рэвізскай казкі цэхавых, яму 33 гады, меў жонку Юдэс 32 гадоў і дачку Сорку 12 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 1144, арк. 669 зв. — 670).

III. 1. 646. **АКСЕКРУ...** Файбіш, майстра менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха; памёр каля 1844 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1 зв.).

III. 1. 647. **АКСЕЛЬРОД** Ёсель Вульфаў (Вульфавіч); 23.11.1844 паступіў у вучні тэрмінам на 1 г. да менскага майстры *Г. Гарфінкеля* (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 3 — 4 зв.).

III. 1. 648. **АЛЕСКЕР** Сімон Вульфаў, віцебскі мешчанін; у 1893 г. вучань у майстры *Х. Алескера*, жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Смаленскай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 84).

III. 1. 649. **АЛЕСКЕР** Хайм Арон (Аронаў), віцебскі мешчанін; жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Смаленскай у доме Шнеерсона; 08.12.1886 залічаны ў падмайстры віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 4 зв.); 10.12.1886 атрымаў пасведчанне падмайстры віцебскай злотніцка-срэбраніцкай управы; 01.02.1891 атрымаў атэстат «вечнага» майстры «золатасрэбраных» спраў, жыў ва ўласным доме (тамсама, спр. 343, арк. 4 зв. — 5; тамсама, спр. 457, арк. 71—76); у 1892 г. фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў (тамсама, спр. 522, арк. 5), у спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голаса на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50); меў падмайстру *Ш. Барэнбаума* (1893) і вучняў: *С. Алескера* (1893; НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 84), *Б. Міркіна* (1898), *І. Гілерсона* (1902); у 1894 г. атрымаў гадавы



*Пячатка Льва Яравоўскага, грэка-ўніяцкага епіскапа Уладзімірскага і Брэсцка-Літоўскага, выразаная да 30-х гг. XIX ст. (павялічана)*

дазвол на права гандлю залатымі і срэбранымі вырабамі (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 505, арк. 45); 03.06.1897 згадваецца ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 10 зв.).

III. 1. 650. **АЛІХОЎСКІ** Абрам Беркаў, віцебскі мешчанін; прыняты ў майстры золатасрэбраных спраў у 1884 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1 спр. 249, арк. 3); у 1892 г. фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў (тамсама, воп. 1, спр. 522, арк. 5 зв.); згадваецца ў спісе майстраў срэбраніцка-злотніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50); у 1893 г. разам з братам Хаймам жыў у 3-й частцы г. Віцебска на вул. Вакзальнай у доме Казанга і меў вучня *Г. Драпкіна* (тамсама, спр. 510, арк. 84); 11.03.1894 атрымаў гадавы дазвол на права гандлю залатымі і срэбранымі вырабамі (тамсама, спр. 505, арк. 94); у 1895—1898 гг. меў у вучнях свайго сына *Б. Аліхоўскага*; 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 10 зв.).

III. 1. 651. **АЛІХОЎСКІ** Берка Еўзер Абрамаў, віцебскі мешчанін; жыў у 3-й частцы г. Віцебска па вул. Вакзальнай у доме Перальмана; з 01.01.1895 па 01.01.1898 вучань у свайго бацькі *А. Аліхоўскага*; 04.06.1902 атрымаў званне падмайстры віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 819, арк. 43).

III. 1. 652. **АЛІХОЎСКІ** Нохім Шлёма Беркаў, віцебскі мешчанін; у 1885 г. паступіў вучнем да свайго бацькі *Х. Аліхоўскага*, пасля 3 г. вучобы працаваў у яго падмайстрам; 16.05.1891 атрымаў пасведчанне майстры віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха з адтэрміноўкай на 3 мес. выплаты «ўступнага» (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 458, арк. 26—27); у 1892 г. фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў як майстра злотніцкай справы (тамсама, спр. 522, арк. 5); згадваецца ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50); у 1893 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Смаленскай у доме Гурыновіча (тамсама, спр. 510, арк. 84); у 1894 г. атрымаў гадавы дазвол на права гандлю залатымі і срэбранымі вырабамі (тамсама, спр. 505, арк. 48).

III. 1. 653. **АЛІХОЎСКІ** Нохім Шлёмаў, віцебскі майстра; 20.05.1891 атрымаў атэстат «вечнага» майстры золата-срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 343, арк. 4 зв. — 5); у 1892 г. згадваецца ў спісе майстраў срэбраніцка-злотніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 10 зв.).

III. 1. 654. **АЛІХОЎСКІ** Хайм Беркаў, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай справы; фігуруе ў спісе майстраў 1877—1886 гг. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2); у 1885—1888 і 1891 гг. меў у вучнях, а потым — у падмайстрах свайго сына Нохіма (тамсама, спр. 458, арк. 27); 11.02.1887 атрымаў гадавы дазвол на выраб і гандаль золата-срэбранымі вырабамі (тамсама, спр. 405, арк. 7); у 1892 г. фігуруе ў спісе

віцебскіх майстраў (тамсама, спр. 476, арк. 82 зв.; тамсама, спр. 522, арк. 5 зв.) і ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50); жыў разам з братам Абрамам у 3-й частцы г. Віцебска на вул. Вакзальнай у доме Казанга; у 1893 г. разам з братам Абрамам трымаюць вучня *Г. Драпкіна* (тамсама, спр. 510, арк. 84); 11.03.1894 атрымаў гадавы дазвол на права гандлю залатымі і срэбранымі вырабамі (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 505, арк. 93); 24.05.1894 абраны на пасаду таварыша старшыні віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (тамсама, спр. 522, арк. 1 — 1 зв.); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 10); цалкам верагодна, што з 25.02.1899 па 25.02.1902 менавіта ў яго быў вучань — сын *Берка Эўзер Альхоўскі* (тамсама, спр. 819, арк. 33 — 37 зв.).

III. 1. 655. **АЛЬКЕНІЦКІ** Лейба Давід Янкелевіч Эйшышскі, мешчанін Лідскага пав., нарадзіўся ў 1863 г.; 26.12.1877 запісаны вучнем на тэрмін у 3 г. і 3 мес. да віленскага ювеліра *С. Перліна* (L—V, № 2.715).

III. 1. 656. **АЛЬПЕРТ** Міхаіл, аршанскі мешчанін, срэбраніцкі майстра; згадваецца ў 1874 г., меў аднаго вучня (НГАБ у Мінску, ф. 2096, воп. 1, спр. 45, арк. 21 зв.).

III. 1. 657. **АЛЬСОН** Берка Абрамавіч, менскі мешчанін; 06.08.1852 у менскі ювелірны цэх заплаціў уступнага 1,5 рубля (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 4 зв.).

III. 1. 658. **АЛЬТШУЛЕР** Ізраіль, падмайстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41 зв.).

III. 1. 659. **АЛЬХОЎСКІ** [Аліхоўскі] Берка, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1840—1850 гг. жыў на вул. Замкавай у доме Барэнбаума (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13); у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41); у 1868 г. трымаў у горадзе майстэрню ў доме Позіна, працаваў «без наёмных работнікаў» (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 123, арк. 44 зв.); у спісе майстраў 1877—1886 гг. значыцца як памерлы да 1877 г. (тамсама, спр. 249, арк. 1 зв.).

III. 1. 660. **АЛЬХОЎСКІ** [Аліхоўскі] Берка Эўзер Хаймаў Іцкаў, віцебскі мешчанін; жыў у 3-й частцы г. Віцебска па вул. Вакзальнай у доме Яхніна; з 25.02.1899 па 25.02.1902, верагодна, вучань у свайго бацькі, віцебскага майстры *Х. Альхоўскага*; 30.05.1902 атрымаў званне падмайстры віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 819, арк. 33 — 37 зв.).

III. 1. 661. **АЛЯКСАНДАР (АЛЕКСАНДЭР)** Юда Абрамаў, шклоўскі мешчанін, віцебскі майстра; 01.03.1889 атрымаў пасведчанне «часовага майстры» як гравёр і рэзчык пячатак віцебскай злотніцка-срэбраніцкай управы «на тэрмін дзеяння яго пашпарта» да 30.01.1890 (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 343, арк. 2 зв. — 3); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, спр. 659, арк. 12); 12.09.1897 старшынёй шклоўскай рамеснай упра-

вы выдадзена пасведчанне віцебскім уладам аб тым, што Ю. Аляксандар не быў пад судом (тамсама, арк. 26).

III. 1. 662. **АМЕЛЬСКІ** Л., віленскі майстра; у 1891 г. меў вучня *Моўшу Бейліна* (L—V, № 2.67).

III. 1. 663. **АМЕЛЬСОН** Лейба Янкелевіч, паходзіў з Навагародка; 23.01.1873 прызнаны майстрам і прыняты ў віленскі яўрэйскі злотніцкі цэх; у 1877—1890 гг. фігуруе ў віленскіх проберных запісах як ювелір; меў шэраг вучняў і падмайстраў (L—V, № 2.19), сярод апошніх у 1879 г. згадваецца *І. Афрон*.

III. 1. 664. **АМПІЛАЎ** Беньямін, магілёўскі мешчанін, майстра віцебскага злотніцкага цэха; трымаў майстэрню ў Рэзніцкім завулку ў доме Марцэля, працаваў «без наёмных работнікаў» (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 108, арк. 29 зв. — 30).

III. 1. 665. **АНГЛІК** Шлёма, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г., паводле адных звестак, жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.), а паводле другіх — у 3-й (тамсама, спр. 11540, арк. 41).

III. 1. 666. **АРАНОВІЧ** Меер, віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў у 1818 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 57).

III. 1. 667. **АРАНОВІЧ** Ш., віленскі ювелір; у 1887 г. мае вучня, новагародскага мешчаніна *А. Нахімоўскага* (L—V, № 2.691), у 1891 г. — падмайстру, гарадзенскага мешчаніна *М. Штэйберга* (L—V, № 2.978).

III. 1. 668. **АРЛОЎСКІ** Ельяш Вульфавіч, лідскі мешчанін; 28.06.1849 запісаны ў падмайстры на тэрмін 4 г. да віленскага злотніка Я. Хазана; 16.08.1853 працягнуў дагавор з тым жа майстрам на 2 г., 24.07.1855 — яшчэ на 2 г. (L—V, № 2.721).

III. 1. 669. **АРЭХАЎ** Берка Гіршаў, нарадзіўся ў 1799 г., «старинный здешний» мешчанін г. Веліжа, майстра срэбранага майстэрства; у 1827 г. меў дом у Новай Слабадзе г. Веліжа (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 1, спр. 240, арк. 149 зв. — 150).

III. 1. 670. **АСТРОЎСКІ** Берка, віцебскі майстра злотніцкага цэха; у 1866 г. трымаў майстэрню ў Віцебску на вул. Замкавай у доме М. Барэнблата, працаваў «без наёмных работнікаў» (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 108, арк. 28 зв. — 29).

III. 1. 671. **АФРОН** Ізраіль Іцкавіч, паходзіў з Мінскай губ.; 21.06.1879 запісаны падмайстрам да віленскага ювеліра *Л. Амельсона*; 08.05.1896 атрымаў дазвол на працу ў Вільні злотнікам (L—V, № 2.15).

III. 1. 672. **БАБІНОВІЧ** Ізраіль, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41).

III. 1. 673. **БАВІНСКІ** Матэвуш, гарадзенскі злотніцкі майстра; без далучэння да цэха авалодаў рамяством; 09.03.1799 запісаны вучнем да віленскага злотніцкага цэхавага старшыні В. Ястржэмскага; 05.08.1799 прызнаны годным звання майстры (L—V, № 2.62).

III. 1. 674. **БАГАРАД** Залман Моўшаў, віцебскі мешчанін; жыў у 2-й частцы г. Віцебска па вул. Смаленскай у майстэрні *П. Кабака*; з 01.03.1898 па 01.03.1902 вучань гэтага майстры; 31.05.1902 атрымаў званне падмайстры віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха

(НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 819, арк. 28 — 32 зв.).

III. 1. 675. **БАГАЦІК** Невах Гіршавіч, менскі майстра злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага цэха; у сакавіку 1898 г. атрымаў пасведчанне на права займацца рамяством (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 797, арк. 1).

III. 1. 676. **БАЙМАН** Цодык Меераў, мешчанін Пінскага пав. Менскай губ., залатых, бляхарных і медных спраў майстра, нарадзіўся ў 1813 г.; у 1852 г. меў сына Юдэля (17 гадоў); жыў у Пінску (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2482, арк. 114 зв. — 115).

III. 1. 677. **БАКШТ** Мейлах, ашмянскі мешчанін; 12.10.1888 запісаны вучнем на тэрмін у 3 г. да віленскага ювеліра А. Шліёзберга (L—V, № 2.49).

III. 1. 678. **БАЛАЙЛА** Янкель Зельманавіч Лейбавіч, паходзіў з Ашмянскага пав.; 14.06.1860 запісаны ў вучні на тэрмін 4 г. і 5 мес. да віленскага злотніка Е. М. Аса (L—V, № 2.51).

III. 1. 679. **БАЛЕВІЧ** Аляксандр Язэпавіч; 21.06.1895 запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка М. Невядомскага (L—V, № 2.52).

III. 1. 680. **БАМДАС** Уры Хаймаў, менскі мешчанін; у 1897—1898 гг. вучыўся ў гандлёвым доме Л. Фішэра ў Антверпене; у лютым 1898 г. пакінуў фірму «ў якасці вопытнага майстры» (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 818, арк. 4—6); у 1898 г. прыняты майстрам у менскі злотніцка-срэбраніцкі і ювелірны цэх як гранільшчык каштоўных камянёў (тамсама, арк. 3).

III. 1. 681. **БАМШТЭЙН** Абрам Зэлікавіч, менскі мешчанін; у 1849 г. значыцца майстрам злотніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, арк. 2).

III. 1. 682. **БАМШТЭЙН** Зэлік Лейбавіч, менскі мешчанін, «ювилерскі» майстра; нарадзіўся ў 1792 г.; у 1849 г. значыцца ў спісе майстраў менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 333, арк. 20); у 1852 г. меў сыноў Ханона (35 гадоў) і Абрама (33 гады), унука Моўшу Ханонава (15 гадоў), якія жылі ў драўляным доме на Ляхаўцы (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 288 зв. — 289).

III. 1. 683. **БАМШТЭЙН** Ханон Зэлікавіч, менскі мешчанін; згадваецца ў 1849 г. як майстра цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20), у 1854 г. — як майстра (тамсама, арк. 2); у 1870 г. мае майстэрню на Саборнай плошчы г. Менска (тамсама, ф. 1, воп. 3, спр. 1, арк. 42 зв. — 43); у 1870—1874 гг. майстра злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства (тамсама, ф. 10, воп. 1, спр. 164, арк. 1—9); у 1890 г. майстра цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1); настаўнік менскага майстры *В. Кушэля*.

III. 1. 684. **БАНЦЭВІЧ** І., у 1798—1804 гг. быў вучнем ці падмайстрам у *В. Бродскага* (L—V, № 2.123).

III. 1. 685. **БАРУХОВІЧ** Ёсель, майстра ювелірнага цэха г. Менска да 1844 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1); у 1849 г. майстра злотніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49).

III. 1. 686. **БАРЫНБЛАТ** Хайм Іцкаў, віцебскі мешчанін; у 1893 г. вучань майстры *П. Кабака*, жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Смаленскай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 84).

III. 1. 687. **БАРЭЛІ** Я., віленскі злотніцкі майстра; у 1852 і 1855 гг. меў падмай-



*Злотнік у сваім варштаце. Нямецкі дрэварыт. 1536 г.*

стру, гарадзенскага мешчаніна *Х. Ціпографа* (L—V, № 2.1011), у 1852 г. — падмайстру *Ю. Мeяровіча*.

III. 1. 688. **БАРЭНБАУМ** Шлёма Шаеў, віцебскі мешчанін; у 1893 г. падмайстра ў *Х. Алескера*; жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Смаленскай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 84).

III. 1. 689. **БАРЭНБЛАТ** Абрам, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1840—1850 гг. жыў ва ўласным доме (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13); у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (тамсама, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.).

III. 1. 690. **БАСКІНД** Моўша, 07.01.1898 атрымаў пасведчанне на права займацца злотніцка-срэбраніцкім і ювелірным рамяством у Менску на 1 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 797, арк. 1).

III. 1. 691. **БАХМАН** Пётра, менскі грамадзянін, майстра залатых спраў, нарадзіўся ў 1802 г.; у 1845 г. жыў з сынам Міхаілам, якому 16 гадоў, у арандаваным доме (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 127, арк. 21 зв. — 22).

III. 1. 692. **БАЦВІНІК** Мордух Файшэлевіч, койданаўскі мешчанін; у снежні 1853 г. прыняты ў падмайстры менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 5 зв.); 20.05.1883 атрымаў пасведчанне на права займацца рамяством на тэрмін у 1 г. (тамсама, ф. 1, воп. 3, спр. 115, арк. 30 зв.).; у 1890 г. — мінскі майстар (тамсама, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 693. **БАЦВІНІК** Файтэль, койданаўскі мешчанін, менскі майстра залатых і срэбраных спраў у 1890 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 694. **БЕЙЛІН** Арон Іцкавіч, менскі мешчанін, майстра залатых спраў; у 1845 г. прыняў для навучання ювелірнай справе менскага жыхара *С. Нейфаха* на тэрмін у 1 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 4 зв. — 5).

III. 1. 695. **БЕЙЛІН** Ельяш Борухавіч, паходзіў з Менска; 27.11.1889 запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка Х. Каца; у 1894 г. атрымаў дазвол працаваць у Вільні ювелірам (L—V, № 2.66).

III. 1. 696. **БЕЙЛІН** Мордух (Мотка) Аўсеевіч, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1816 г.; у 1849 г. значыцца майстрам срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20); у 1852 г. меў сына Гіршу, якому быў 21 год (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 290 зв. — 291); у снежні 1853 г. ат-

рымаў пасведчанне на «производство в Минске мастерства золотых и серебряных изделий… на приготовление волочения… и сусального золота и серебра» (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 9); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, арк. 2).

III. 1. 697. **БЕЙЛІН** Моўша Борухавіч, паходзіў з Менска; 06.02.1891 запісаны вучнем на тэрмін у 4,5 г. да віленскага майстры *Л. Амельскага*; 30.11.1895 атрымаў дазвол працаваць у Вільні ювелірам (L—V, № 2.67).

III. 1. 698. **БЕЙЛІН** Яўсей Абрамавіч, менскі мешчанін; 11.01.1847 прыняты падмайстрам менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп 1, спр. 32, арк. 2 зв.); у 1854 г. фігуруе як майстра (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 3).

III. 1. 699. **БЕЙЛІНСОН** Залман, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40).

III. 1. 700. **БЕЛАГУРСКІ** Вульф Ёселеў, лідскі майстра; 20.06.1855 запісаны вучнем на тэрмін у 3 г. да віленскага ювеліра М. Л. Поляка (L—V, № 2.93).

III. 1. 701. **БЕЛІКАЎ** Абрам, віцебскі майстра злотніцкага цэха; у 1866 г. трымае майстэрню ў Віцебску на вул. Смаленскай ва ўласным доме, працуе «без наёмных работнікаў» (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 108, арк. 27 зв. — 28).

III. 1. 702. **БЕЛІНШТЭЙН** Анісім Мендэлеў, віцебскі мешчанін; у 10.08.1886 залічаны ў падмайстры віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 4).

III. 1. 703. **БЕЛІНШТЭЙН** [Залман (Солом) Мендэлеў] (прозвішча і імя напісаны неразборліва) Рубінаў, невельскі залатых і срэбраных спраў майстра, у 1817 г. мае сына (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 36).

III. 1. 704. **БЕЛІНШТЭЙН** Іцка Абрамавіч, віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў у 1818 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 57).

III. 1. 705. **БЕЛІНШТЭЙН** Сроль (Ханон) Зэлікавіч, менскі залатых спраў майстра; 26.11.1844 заключыў з *Я. Фітэрсэнам* дагавор аб прыёме яго ў вучні на тэрмін у 3 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 4 зв.); у снежні 1853 г. атрымаў пасведчанне на «производство в Минске мастерства золотых и серебряных изделий… на приготовление волочения… и сусального золота и серебра» (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 9).

III. 1. 706. **БЕЛЬНІК** Вульф Юдэлевіч (Мендэлевіч), менскі мешчанін; 28.12.1845 прыняты падмайстрам у ювелірны цэх (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 2); у 1849 г. значыцца майстрам срэбранага цэха (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2); у 1870 г. трымае майстэрню ў Менску на вул. Петрапаўлаўскай (тамсама, ф. 1, воп. 3, спр. 1, арк. 72 зв. — 73); у 1873—1874 гг. меў вучня *Г. Раманава* (тамсама, воп. 1, спр. 164); у снежні 1886 г. названы «былым старшынёй», перадаў усю цэхавую маёмасць *З. Тапазу* (тамсама, спр. 326, арк. 1); у 1890 г. майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха (тамсама, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 707. **БЕНЛІК** Яўсей Абрамавіч, менскі мешчанін; у 1849 г. падмайстра ювелірнага цэха г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.).

III. 1. 708. **БЕРАНШТАЙН** Літман Файвішавіч, у 1863 г. слонімскі майстра залатых і срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 2180, арк. 205).

III. 1. 709. **БЕРАНШТЭЙН** Ерухім Даніэлевіч, нарадзіўся ў 1795 г. у Зэльве; у 1814 г. прыехаў у Вільню; у 1816 г. унесены ў віленскія яўрэйскія пасямейныя спісы як ювелір, меў на той момант жонку і сына; 06.08.1838 запісаны ў віленскі яўрэйскі злотніцкі цэх як злотнік; 02.07.1849 падаў прашэнне аб прызнанні яго майстрам; у 1854 г. памёр (L—V, № 2.80).

III. 1. 710. **БЕРГМАН** Шлёма Юдкаў, пінскі мешчанін, нарадзіўся ў 1828 г.; у 1852 г. займаўся «бляхарскай» і злотніцкай справай, меў брата Сроля, якому было тады 24 гады (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 2482, арк. 113 зв. — 114).

III. 1. 711. **БЕРЛІН** Насон Шмеркаў, віцебскі мешчанін; 27.04.1889 атрымаў атэстат «вечнага» майстры залата-срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 343, арк. 2 зв. — 3); у 1897—1898 гг. фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, спр. 659, арк. 11 зв.).

III. 1. 712. **БЕРМАН** Сроль Беркаў, мешчанін Пінскага пав. Менскай губ., нарадзіўся ў 1803 г.; залатых, бляхарных і медных спраў майстра; у 1852 г. меў сына Меера (14 гадоў), жыў у Пінску (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2482, арк. 115 зв. — 116).

III. 1. 713. **БЕРНІКОЎСКІ** Іцка Гіршавіч, у 1863 г. слонімскі майстра залатых і срэбраных спраў (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 2180, арк. 205).

III. 1. 714. **БЕРЫЛЬМАН** Абрам Пейсахаў, віцебскі мешчанін; у 1893 г. вучань майстры *Залмана Фішэлева Кручковіча*, жыў у 2-й частцы г. Віцебска на вул. Замкавай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 84 зв.).

III. 1. 715. **БЕРЫНШТЭЙН** Гірш Елікавіч, менскі мешчанін; 12.07.1850 разам з братам *Ё. Берынштэйнам* заключыў з майстрам *В. Вільнікам* дагавор аб прыёме яго на вучобу на тэрмін у 6 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 6 зв.).

III. 1. 716. **БЕРЫНШТЭЙН** Ёсель Елікавіч, менскі мешчанін; 12.07.1850 *Г. Берынштэйнам* заключыў з майстрам *В. Вільнікам* дагавор аб прыёме яго на вучобу на тэрмін у 6 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 6 зв.).

III. 1. 717. **БЕСЕВІЧ** Сроль Хонанавіч, мешчанін Пінскага пав. Мінскай губ., нарадзіўся ў 1819 г.; залатых, бляхарных і медных спраў майстра; у 1852 г. жыў у Пінску (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2482, арк. 114 зв. — 115).

III. 1. 718. **БЕСЯДЗЬ** Давыд, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.).

III. 1. 719. **БЕСЯДЗЬ** Лейба, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40).

III. 1. 720. **БЖЭЗІНСКІ** Мацей (Maciey Brzezinski), сын Антонія, нарадзіўся ў 1780 г. у Лідскім пав.; у 1795 г. паступіў на вучобу да віленскіх злотнікаў Скіндэрскіх; 10.02.1802 атрымаў званне злотніцкага падмайстры (L—V, № 2.135).

III. 1. 721. **БЛІННІК** Вульф, віцебскі злотніцкі падмайстра ў 1840—1850-я гг.

(НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13 зв.).

III. 1. 722. **БЛОХ** Вульф Лейба Іцкавіч, нарадзіўся ў Ашмянах; 02.08.1865 запісаны вучнем да віленскага злотніка А. Закіна; 04.06.1867 перайшоў на 4 г. да ўдавы віленскага злотніка Л. О. Дрохенса (L—V, № 2.103).

III. 1. 723. **БЛОХ** Шмуйла Давідавіч, у 1851 г. вучань у менскага майстры *Царфіна* (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 29, арк. 1), у 1852 г. — у *Л. Цырфера*.

III. 1. 724. **БЛЮДНІКАЎ** Моўша, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 1154, арк. 40).

III. 1. 725. **БЛЮДНІКАЎ** Шмуйла, віцебскі майстра; 24.07.1888 атрымаў атэстат «вечнага майстры» золата-срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 343, арк. 1 зв. — 2); у 1892 г. згадваецца ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50 зв.); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, арк. 11).

III. 1. 726. **БЛЮМКІН** (**МАЙЗЭЛЬ**) Шымель Борухаў, паходзіў са Свіслачы; 30.08.1883 запісаны ў вучні на тэрмін у 2 г. да віленскага злотніка А. Глейзера, заплаціў уступнага 40 капеек (L—V, № 2.102).

III. 1. 727. **БОРАТ** Елья Мендэлевіч, менскі мешчанін; у 1849 г. значыцца майстрам срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 333, арк. 49); 20.03.1852 прыняты майстрам цэха (тамсама, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 5).

III. 1. 728. **БРАНШТЭЙН** Юдка Шлёмаў, пінскі мешчанін, нарадзіўся ў 1796 г.; у 1852 г. займаўся бляхарнай і злотніцкай справай і выразкай пячатак; меў сыноў Лейбу (13 гадоў) і Мендэля (10 гадоў) (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 2482, арк. 113 зв. — 114).

III. 1. 729. **БРОДСКІ** Вінцэнт Пятровіч, нарадзіўся ў 1759 г. у Гародні; у 1774 і 1777 гг. запісаны вучнем на тэрмін у 8 г. да гарадзенскага злотніка *Я. Колса*; 21.11.1778 віленскі злотніцкі цэх прызнаў яго за падмайстру, з таго ж года працаваў падмайстрам у *Я. Колса*; у 1788 г. запісаўся на трохгадовую «атэстацыю» да віленскіх злотніцкіх майстраў Бурхарда і Гёрыца; у 1790 г. прыняў віленскае падданства і атрымаў званне віленскага злотніцкага майстры; 30.12.1794 прынёс прысягу расійскай імператрыцы Кацярыне II; памёр у 1812 г.; меў шэраг вучняў і падмайстраў: Энгельфедра (1791), Шэля (1795), А. Рэдэльмана (1798), *І. Банцэвіча* (1798—1804), К. Кастжунскага (1799), Р. Вольфа (1799), Віберса (1803), Крума (1805), А. Райніса (1809) і І. Паўлоўскага (1812; L—V, № 2.123).

III. 1. 730. **БРОЙДА** Ізраэль Іцкавіч, ашмянскі мешчанін; 19.06.1895 запісаны вучнем на 2 г. да віленскага злотніка Х. Каца; у 1897 г. атрымаў дазвол віленскай рамеснай управы працаваць злотнікам (L—V, № 2.124).

III. 1. 731. **БРУШКАНЦ** Берка, свянцянскі злотнік; працаваў там у 1868 г. (L—V, № 2.133).

III. 1. 732. **БРЫКСМАН** Залман Шаломаў, петрыкаўскі рэзчык пячатак, нарадзіўся ў 1824 г.; у 1852 г. меў сына Хайма 4 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2439, арк. 93 зв. — 94 ).

III. 1. 733. **БРЫЛЬ** Гірша Лейбавіч, віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў у 1818 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 57).

III. 1. 734. **БРЫЛЬ** Янкель Нохімаў, віцебскі мешчанін, нарадзіўся ў 1826 г., рэзчык пячатак; у 1863 г. меў сыноў Шлому (13 гадоў), Бейля (10 гадоў), Нохіма (6 гадоў) і Гіршу (1 год); пражываў на вул. Смаленскай у доме купчыхі Зэльцаравай (НГАБ у Мінску, ф. 2631, воп. 2, спр. 2, арк. 108 зв.).

III. 1. 735. **БРЫСКІН** Нахем'я Іцкаў, майстра залатых і срэбраных спраў, запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу рэвізскіх казак Мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 40 гадоў, меў жонку Хану Шэвелеву (38 гадоў), сыноў Самуіла (17 гадоў) і Копеля (10 гадоў) і дачку Цыну (1 год) (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 70 зв. — 71).

III. 1. 736. **БРЫТЭНСКІ** В., віленскі злотніцкі майстра; у 1893 г. меў падмайстру *В. Зака*, у 1896 г. — вучня з Ліды, у 1878 г. — вучня *А. Абрамовіча* з Гародні (L—V, № 2.1).

III. 1. 737. **БРЭНШТЭЙН** Моўша, мешчанін Мінскай губ.; 07.09.1888 запісаны вучнем на тэрмін у 3 г. да віленскага ювеліра А. Шліёзберга (L—V, № 2.112).

III. 1. 738. **БРЭЎТМАН** Міхель Шмойлаў, злотнік м. Нясвіж; у 1811 г., паводле рэвізскай казкі мяшчан-яўрэяў, яму 25 гадоў; «отлучился неведома куды з 1812 г.» (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 220, арк. 662 зв. — 663).

III. 1. 739. **БЯЛІНСКІ** Абрам, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1840—1850-я гг. жыў на вул. Трынітарскай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 12 зв.); у 1860 г. жыў у 2-й частцы г. Віцебска (тамсама, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41); у спісе майстраў 1877—1886 гг. значыцца як памерлы (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 1 зв.).

III. 1. 740. **БЯЛІНСКІ** Шалом, віцебскі мешчанін, падмайстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 2-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41 зв.).

III. 1. 741. **БЯРКОВІЧ** Абрам, фігуруе як слуцкі майстра срэбраных спраў у 1817 г., зрабіў даразахавальніцу для Менскага кафедральнага касцёла і падазраваўся ў перарасходзе срэбра для яе (НГАБ у Мінску, ф. 757, воп. 1, спр. 60).

III. 1. 742. **БЯРКОВІЧ** Мордух, менскі мешчанін; 22.06.1844 даў пісьмовае абавязацельства служыць вучнем 4 г. і 2 мес. у майстры залатых спраў *Я. Родкіна* (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 1).

III. 1. 743. **БЯРКОВІЧ** Нохім, дзінабургскі майстра залатых і срэбраных спраў; у 1821 г., паводле рапарта дзінабургскага гарадавога ў Віцебскую праберную палатку, працуе без штэмпеля для клеймавання вырабаў (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 242).

III. 1. 744. **БЯРКОВІЧ** Ш., у 1844 г. паступіў вучнем да менскага майстры *Я. Родкіна* (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 1 зв.).

III. 1. 745. **ВАГЕР** Моўша Іонаў, навагародскі мешчанін; 26.05.1900 жыў у Менску на вул. Юр'еўскай у доме Сухоцкага, меў 26 гадоў; прасіў менскую рамесную ўправу прыпісаць яго да менскага ра-

меснага таварыства і выдаць пасведчанне на права адкрыць майстэрню; просьба была задаволена (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 911, арк. 7—8).

III. 1. 746. **ВАЙЛЬ** Берка Файбішаў, веліжскі мешчанін Віцебскай губ. (да 22 снежня 1879 г.), віцебскі майстра золата-срэбраных спраў; унесены ў спіс віцебскіх майстраў у 1881 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2 зв.); 03.06.1897 згадваецца ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 12 зв.); 20.09.1897 гарадскім старастам выдадзена пасведчанне мясцовым уладам аб тым, што ён не быў пад судом (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 659, арк. 24).

III. 1. 747. **ВАКСІН** Залман, віцебскі мешчанін, злотніцкай управы майстра; у 1860 г. жыў у 2-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41).

III. 1. 748. **ВЕІНЕР** Давід Хаймавіч, віленскі мешчанін; 04.09.1874 атрымаў атэстат майстры злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага цэха ў Менску (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 164, арк. 11 зв. — 12).

III. 1. 749. **ВЕНГЛЕЎСКІ** Франц Пятровіч, былы гарадзенскі майстра залатых і срэбраных спраў, дваранін; у красавіку 1860 г. пакінуў рамяство «ў сувязі з малым збытам» (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 2180, арк. 73); 10.05.1862 звяртаецца з прашэннем да начальства прызначыць яго на пасаду пробера ў Гарадзенскую казённую палату (тамсама, арк. 67); у лістападзе ўдзельнічае ў таргах Гарадзенскай пробернай установы (тамсама, арк. 1 зв., 173—174).

III. 1. 750. **ВЕРГЕР** Лейба Ёселевіч, да 1844 г. запісаны ў вучні ў менскі ювелірны цэх (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 1).




*Пячатка гродзенскага ганчарска-мулярскага цэха, выразаная ў першай палове XIX ст.*

III. 1. 751. **ВЕРНЕР** Т., менскі майстра срэбраных спраў у 1875—1894 гг.; у Дзяржаўным гістарычным музеі Расіі ў Маскве захоўваюцца наступныя яго работы: падшкляннік, ліхтар, кольцы для сурвэтак і сталовы відэлец (РЗиСД, с. 201).

III. 1. 752. **ВЕСТФІЛЬД** Янкель, люцынскі (Віцебская губ.) залатых і срэбраных спраў майстра ў 1817 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 51 зв.).

III. 1. 753. **ВІГДОРЧЫК** Вігдор, менскі мешчанін; у 1849 г. значыцца майстрам ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, спр. 770, арк. 3); 10.12.1871 хадайнічае аб прыёме ў цэх злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства свайго сына *Ш. Вігдорчыка* (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 164, арк. 4 зв.).

III. 1. 754. **ВІГДОРЧЫК** Меер Лазаравіч, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1809 г., «ювилерскі» майстра; у 1849 г. значыцца майстрам ювелірнага цэха г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20); у 1852 г. меў сына Хайма 21 года (тамсама, спр. 462, арк. 286 зв. — 287); у снежні 1853 г. атрымаў пасведчанне на «производство в Минске мастерства золотых и серебряных изделий... на приготовление волочения... и сусального золота и серебра» (тамсама, воп. 1, спр. 770, арк. 9); у 1854 г. майстра (тамсама, арк. 2).

III. 1. 755. **ВІГДОРЧЫК** Шмуйла Вігдаравіч, менскі мешчанін; у 1870 г. трымае майстэрню ва ўласным доме, работнікаў не мае (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 3, спр. 1); 10.12.1871 прыняты ў лік майстраў злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства, вучыўся ў свайго бацькі *В. Вігдорчыка* (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 164, арк. 4 зв.); у 1890 г. майстра цэха (тамсама, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 756. **ВІЛЬМАН** Абрам Іцкавіч, менскі мешчанін; у 1849 г. значыцца падмайстрам ювелірнага цэха г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 333, арк. 20).

III. 1. 757. **ВІЛЬМАН** Невах Абрамавіч, менскі мешчанін; 17.12.1845 прыняты падмайстрам у цэх, у сувязі з беднасцю вызвалены ад уплаты ўступнага ўзносу (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 1); у 1849 г. значыцца майстрам срэбраніцкага цэха г. Менска (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20).

III. 1. 758. **ВІЛЬНІК** Вульф Лейбавіч, менскі мешчанін, «юбилерских дел» майстра; 12.07.1850 заключыў дагавор з братамі *Берынштэйнамі,* што будзе іх вучыць ювелірнаму майстэрству 6 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 6 зв.).

III. 1. 759. **ВІЛЬПАН** Абрам Іцкаў, менскі мешчанін, ювелір; у 1854 г. згадваецца як майстра (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2); у 1870 г. жыў ва ўласным доме на вул. Захар'еўскай, меў аднаго работніка, пасведчання на права займацца рамяством не меў (тамсама, ф. 1, воп. 3, спр. 1, арк. 58 — 59 зв.).

III. 1. 760. **ВІНАГРАДАЎ** Іцка Аўсееў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 57 гадоў, яго жонцы Эндзіі Ар'евай — 48, маюць сына Давыда 4 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 73 зв. — 74; тамсама, спр. 46, арк. 56 зв. — 57).

III. 1. 761. **ВІНЧА** ... гарадзенскі майстра залатых спраў; 26.11.1863 удзельнічае ў таргах Гарадзенскай пробернай установы (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 2180, арк. 174 зв.).

III. 1. 762. **ВОЛ** Моўша, аршанскі мешчанін Магілёўскай губ., залатых спраў майстра; згадваецца ў 1875 г., меў 2 падмайстраў (НГАБ у Мінску, ф. 2096, воп. 1, спр. 45, арк. 21 зв.).

III. 1. 763. **ВЫСОЦКІ** Шмуйла Яўсееў, злотнік мяст. Хойнікі Рэчыцкага пав.; значыцца ў рэвізскай казцы цэхавых рамеснікаў за 1811 г., на той час яму 48 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 261, арк. 360).

III. 1. 764. **ГАЛЬПЕРЫН** Гірша Аронавіч, ігуменскі мешчанін Менскай губ.; 20.10.1892 запісаны вучнем на тэрмін у 3 г. да віленскага майстры Е. Л. Малкуса; 04.09.1895 атрымаў даз-

вол працаваць ювелірам у Вільні (L—V, № 1.271).

III. 1. 765. **ГАЛЬПЕРЫН** Зоруль (Зорак), віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 3-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41), працаваў у той жа частцы горада; унесены ў Памятную кнігу Віцебскай губерніі на 1861 г.

III. 1. 766. **ГАНАН** ..., віцебскі мешчанін; у 1868 г. цэхавы старшыня віцебскай злотніцкай управы (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 123, арк. 45).

III. 1. 767. **ГАНКІН** Хайм, бабінавіцкі мешчанін, майстра золата-срэбраных спраў, фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў 1877—1886 гг. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2).

III. 1. 768. **ГАНТМАН** Зэлік Шломавіч, смілавіцкі мешчанін; 02.04.1850 абраны на тэрмін у 1 г. на пасаду падстаршыні срэбраніцкага цэха г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 42, арк. 1 зв.); 18.03.1852 прыняты ў лік майстраў срэбраніцкага цэха (тамсама, спр. 33, арк. 4 зв.) і абраны яго старшынёй (тамсама, спр. 29, арк. 1 зв.); у 1854 г. менскі срэбраніцкі майстра (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 769. **ГАНТМАН** Норык Шмуйлавіч, менскі мешчанін; у 1845 г. залічаны на 3 г. вучнем да старшыні цэха *А. Цырфера*; згадваецца таксама ў 1852 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 29, арк. 1 зв.).

III. 1. 770. **ГАРДОН** Хайм Мейлахавіч, лідскі майстра; 25.09.1896 вучыўся ў віленскага ювеліра Б. Брытэнскага; 30.10.1896 віленская рамесная ўправа выдала яму пасведчанне на права працы ювелірам (L—V, № 2.328).

III. 1. 771. **ГАРОХАВІЦ** Евель, стаўпецкі мешчанін, злотнік; у 1819 г. на час складання рэвізскай казкі яму і яго жонцы Хаве 38 гадоў, іх дачцэ Шоры — 12 (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 96, арк. 675 зв. — 676).

III. 1. 772. **ГАРТЭЛЬ** Гірш Янкелевіч, менскі мешчанін; у 1849 г. фігуруе ў спісе майстраў ювелірнага цэха г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 333, арк. 20); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, арк. 2).

III. 1. 773. **ГАРУБІН** Давід Борухавіч, менскі мешчанін; 23.05.1890 залічаны ў падмайстры менскага срэбраніцкага цэха; рамеснай управе ён прадставіў пасведчанне аб занятках, выдадзенае 08.12.1889 у палтаўскай агульнай рамеснай управе, і пасведчанне ад 25.11.1889 аб адбыцці вайсковай павіннасці (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 519, арк. 2).

III. 1. 774. **ГАРФІНКЕЛЬ** Гесэль (Гешыль) Зэлікавіч, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1819 г., майстра залатых спраў; 23.11.1844 падпісаў дамову аб прыёме ў вучні на тэрмін у 1 г. і 1 мес. радашковіцкага мешчаніна *Ё. Аксельрода* (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 3 зв. — 4); у 1849 г. згадваецца сярод майстраў ювелірнага цэха г. Менска (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20); у 1850 г. таварыш цэха; у 1850 г. разам з майстрам *М. Глазам* прыняў у вучні Я. Мішкінда на тэрмін у 5 г. (тамсама, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 6); у 1852 г. меў сыноў: Берку 12 гадоў і Зэліка 2 гадоў (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 290 зв. — 291); у 1854 г. згадваецца як майстра.

III. 1. 775. **ГАРФУНКЕЛЬ** Берка, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Ві-

цебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40).

III. 1. 776. **ГАРФУНКЕЛЬ** Зэлік Гіршавіч, віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў у 1818 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 57).

III. 1. 777. **ГАРФУНКЕЛЬ** Лейба, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40).

III. 1. 778. **ГАРФУНКЕЛЬ** Янкель Гіршавіч, віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў у 1818 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 57).

III. 1. 779. **ГЕВУШ** Шмуэль Беньямін Іцкавіч, паходзіў з Заблудава, ювелір; у 1867 г. зарэгістраваны ковенскай рамеснай упраўай (L—V, № 2.287).

III. 1. 780. **ГЕЙЛІНГ** Іцка Кадышавіч, слонімскі майстра залатых і срэбраных спраў у 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 2180, арк. 205).

III. 1. 781. **ГЕЛДЗІН** Ерухом, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41 зв.).

III. 1. 782. **ГЕЛЬФАНД** Іцка Ізраілеў (Сролеў), менскі мешчанін; у 1870 г. трымае майстэрню на Саборнай плошчы г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 3, спр. 1, арк. 42 зв.); у 1875 г. згадваецца як майстра і рэзчык пячатак (тамсама, ф. 10, воп. 1, спр. 164, арк. 1 зв. — 2 зв.).

III. 1. 783. **ГЕЛЬЦІНАЎ (ГЕЛЬГУМН)** Зорах, віцебскі мешчанін, майстра залата-срэбраных спраў; у 1840—1850-я гг. жыў на вул. Шырокай у доме Зака (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 12 зв.); у спісе майстраў 1877—1886 гг. значыцца як памерлы (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 1 зв.).

III. 1. 784. **ГЕНШАФТ** Міхель Шахнавіч, віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў у 1818 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 57).

III. 1. 785. **ГЕНЬКІН** Евель Абрамаў, мсціслаўскі мешчанін мяст. Шамова; у 1880—1883 гг. вучыўся разам з сынам *С. Генькіным* у майстры *А. Ланіна*, атрымаў пасведчанне на права работы на працягу 1 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 7, арк. 66—68); 19.04.1884 прыняты майстрам залатых і гадзіннікавых спраў тэрмінам у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (тамсама, спр. 14, арк. 6 зв.); 14.05.1884 атрымаў пацвярджэнне запісу мсціслаўскай агульнай рамеснай управы на права займацца рамяством на тэрмін у 1 г. (тамсама, арк. 5); 25.02.1888 атрымаў пасведчанне аб запісе ў майстры «навсегда»; 15.10.1888 выключаны з цэха (тамсама, арк. 8 зв.).

III. 1. 786. **ГЕНЬКІН** Сімха Евелеў (Ельеў), мсціслаўскі мешчанін мяст. Шамова; у 1880—1883 гг. вучыўся разам з бацькам *Е. Генькіным* у майстры *А. Ланіна*, атрымаў пасведчанне на права работы на працягу 1 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 7, арк. 66—68); 19.04.1884 прыняты майстрам залатых і гадзіннікавых спраў тэрмінам у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (тамсама, спр. 14, арк. 6 зв.); 14.05.1884 атрымаў пацвярджэнне папярэдняга запісу мсціслаўскай агульнай рамеснай управы на права займацца рамяством на тэрмін у 1 г. (тамсама, арк. 5); 25.10.1888 атрымаў

пасведчанне аб запісе на 1 г. у майстры; 25.01.1888 званне пацверджана на 1 г.; 15.10.1888 выключаны з цэха (тамсама, арк. 8 зв.).

III. 1. 787. **ГЕНЬКІН** Шмойла Абрамаў, мсціслаўскі мешчанін; 07.01.1885 запісаны майстрам гадзіннікавых спраў у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў мсціслаўскай агульнай рамеснай управы на тэрмін у 1 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 5 зв.).

III. 1. 788. **ГЕРМАН** Шлома Моўшаў, мешчанін Пінскага пав. Менскай губ., нарадзіўся ў 1830 г.; залатых, бляхарных і медных спраў майстра; у 1852 г. меў брата Схар'ю 10 гадоў, жыў у Пінску (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2482, арк. 114 зв. — 115).

III. 1. 789. **ГЕРШАНОВІЧ** Ханон Завулен Мордухавіч, мешчанін Ашмянскага пав.; 20.08.1856 запісаны ў вучні на тэрмін у 2,2 г. да віленскага злотніка М. Саковіча (L—V, 2. 284).

III. 1. 790. **ГЕРШОВІЧ** Давід, злотнік нясвіжскі, цэхмістр; у 1801 г. згадваецца ў іску нясвіжскага катлярскага цэха да новастворанага нясвіжскага цэха злотнікаў (НГАБ у Мінску, ф. 530, воп. 3, спр. 1, арк. 23 зв. — 29); у 1807—1808 гг. працаваў пры двары князёў Радзівілаў (L—V, № 2.370).

III. 1. 791. **ГЕРШОВІЧ** Хайм, злотнік нясвіжскі; у 1801 г. згадваецца ў іску нясвіжскага катлярскага цэха да новастворанага нясвіжскага цэха злотнікаў (НГАБ у Мінску, ф. 530, воп. 3, спр. 1, арк. 23 зв. — 29); у 1806 г. працаваў пры двары князёў Радзівілаў (L—V, № 2.370).

III. 1. 792. **ГІЛЕРСОН** Ізрол Шмуйлаў, ушацкі мешчанін Лепельскага пав. Віцебскай губ.; 01.01.1899 жыў у г. Віцебску па вул. 3-й Ветранай у доме свайго бацькі; 01.01.1902 вучань свайго брата віцебскага майстры *Х. Алескера*; 05.05.1902 падаў заяву аб запісанні яго падмайстрам у віцебскі злотніцка-срэбраніцкі цэх, 16.05 атрымаў пасведчанне аб прыняцці ў цэх (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 819, арк. 18 — 22 зв.).

III. 1. 793. **ГІЛІНСКІ** Хайм Моўша Лявонавіч, свянцянскі мешчанін; 12.05.1899 запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка А. Ш. Дрохеса (L—V, № 2.291).

III. 1. 794. **ГІЛЬДБЕРГ** Хонан Беркавіч, лідскі майстра, нарадзіўся ў 1852 г.; 20.02.1879 звярнуўся ў віленскі злотніцкі цэх з прашэннем, каб яго атэставалі на званне майстры цэха (L—V, № 2.290).

III. 1. 795. **ГІЛЬКІН** Шмуйла-Лейба, віцебскі майстра, мешчанін Лядненскага грамадства Горацкага пав. Магілёўскай губ.; 26.05.1897 горацкім старостам выдадзена пасведчанне віцебскім уладам аб тым, што ён не быў пад судом (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 659, арк. 13).

III. 1. 796. **ГІМЕЙН** Міхель Мордухаў, віцебскі мешчанін; 04.10.1902 атрымаў пасведчанне майстры віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 819, арк. 23—24).

III. 1. 797. **ГІМПЕЛЬСОН** Мендэль Шаломаў, віцебскі мешчанін, пражываў у г. Туле па вул. Кіеўскай у доме Кальцова; 29.11.1901 просіць віцебскую рамесную ўправу, каб яму выслалі копію пасведчання майстры злотніцка-срэбраніцкага цэха, якое ён атрымаў 08.02.1901 (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 819, арк. 1).



*Адбітак пячаткі менскага мулы. Сярэдзіна XIX ст.*

III. 1. 798. **ГІНВІН** Ерухім Ізраілеў, віцебскі мешчанін; прыняты ў майстры залата-срэбраных спраў 01.05.1884 (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 3).

III. 1. 799. **ГІНДЗІНГ** Ярухін, невельскі мешчанін Віцебскай губ., майстра залата-срэбраных спраў; фігуруе ў спісе майстраў 1877—1886 гг. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2).

III. 1. 800. **ГІНКІН** Лейба Ельеў, горацкі мешчанін, віцебскі майстра; 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 12 зв.).

III. 1. 801. **ГІНЦБЕРГ** Моўша Вульфаў, мешчанін Пінскага пав. Менскай губ., нарадзіўся ў 1830 г.; у 1852 г. меў брата Ошэра 20 гадоў, жыў у Пінску, займаўся «доставкой припасов и материалов для православных училищ мастерством золотых, бляхарных и медных дел» (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2482, арк. 114 зв. —115).

III. 1. 802. **ГІРШОВІЧ** Моўша, менскі мешчанін, падмайстра злотніцкага цэха; памёр да 1844 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 1).

III. 1. 803. **ГІТЭЛЬМАН** Іцка, віцебскі мешчанін, злотніцкай управы майстра; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.).

III. 1. 804. **ГІЦІН** Залман Евелеў, мсціслаўскі мешчанін; 27.08.1884 запісаны майстрам залатых і гадзіннікавых спраў у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў мсціслаўскай агульнай ramеснай управы на тэрмін у 1 г.; 08.02.1887 пацверджана званне майстры залатых спраў на тэрмін у 1 г.; пазнейшая пазнака — «за истечением года … из сего цеха» выключаны (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 5, 7 зв.).

III. 1. 805. **ГЛАЗ** Вульф Мееpаў, менскі мешчанін; 10.12.1871 прыняты ў майстры злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага цэха, да гэтага быў вучнем і падмайстрам у свайго бацькі *М. Глаза* (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 164, арк. 4).

III. 1. 806. **ГЛАЗ** Меер Вульфавіч, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1817 г.; у 1849 г. названы ў спісе майстраў ювелірнага цэха г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20); у 1850 г. названы «товарищем цеха», разам з *Г. Гарфінкелем* прыняў у вучні на 5 г. *Я.Мішкінда* (тамсама, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 6); у 1852 г. меў сына *Вульфа* 13 гадоў, жыў у каменным доме на

вул. Рэзніцкай (тамсама, спр. 462, арк. 290 зв. — 291); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2); у 1870 г. меў майстэрню на Саборнай плошчы г. Менска (тамсама, ф. 1, воп. 3, спр. 30, арк. 6); 10.12.1871 хадайнічае аб прыёме ў майстры цэха свайго сына *В. Глаза* (тамсама, ф. 10, воп. 1, спр. 164, арк. 1), які да гэтага быў у бацькі вучнем і падмайстрам; з 03.12.1879 па 1890 г. згадваецца як майстра (тамсама, арк. 1 зв.; тамсама, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 807. **ГОЛЦМАН** Іцка Гершавіч, мешчанін Пінскага пав. Менскай губ., нарадзіўся ў 1817 г.; залатых, бляхарных і медных спраў майстра; у 1852 г. меў брата Схар'ю 10 гадоў, жыў у Бердзічаве (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2482, арк. 114 зв. — 115).

III. 1. 808. **ГОЛЬДБАРГ** Ёсель Меераў, мешчанін Пінскага пав. Менскай губ., нарадзіўся ў 1816 г.; залатых, бляхарных і медных спраў майстра; у 1852 г. жыў у Пінску (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2482, арк. 115 зв. — 116).

III. 1. 809. **ГОЛЬДБАРГ** Лейба Лейзераў, срэбранік мяст. Пагост Пінскага пав.; у 1816 г., паводле рэвізскай казкі цэхавых, меў 35 гадоў; падчас ваенных дзеяў 1812 г. «был в бегах, воротілся»; меў жонку Штэру 40 гадоў і дачку Гольду 4 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 1144, арк. 692 зв. — 693).

III. 1. 810. **ГОЛЬДБЕРГ** Абрам Ёселевіч, менскі мешчанін; 24.11.1858 унесены ў кнігу майстраў: яму 38 гадоў, жонцы Мар'яне 28 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 105, арк. 3 зв. — 4).

III. 1. 811. **ГОЛЬДЗІН** Міхель Мордухавіч, ляхавіцкі мешчанін; 01.01.1854 заключыў з менскім майстрам *Б. Тапазам* дагавор аб прыёме яго, М. Гольдзіна, у вучні на тэрмін у 1 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 8).

III. 1. 812. **ГОЛЬДМАН** Айзік Меераў, мазырскі срэбраных спраў майстра; значыцца ў рэвізскай казцы Мазырскага пав. за 1811 г.; на той час яму 44 гады, мае сына 7 гадоў; яго бацька, Меер Айзікавіч, памёр у 60-гадовым узросце ў 1799 г. (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 215, арк. 53 зв.).

III. 1. 813. **ГОЛЬДМАН** Лейба Копелеў, срэбранік мяст. Пагост Пінскага пав.; у 1811 г., паводле рэвізскай казкі цэхавых, яму 19 гадоў; падчас ваенных дзеяў 1812 г. «збёг»; на час рэвізіі 1816 г. месца знаходжання невядома (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 1144, арк. 692 зв. — 693).

III. 1. 814. **ГОЛЬЦ** Абрам Ёселеў, ашмянскі мешчанін; 06.05.1854 запісаны на тэрмін у 2 г. да віленскага ювеліра М. Залкінда (L—V, № 2.307).

III. 1. 815. **ГОЛЬШМІД** Борух Мордух Абеліевіч, у 1811 г. «серебрянік» мяст. Петрыкаў Мазырскага пав., на той час яму 30 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 215, арк. 127).

III. 1. 816. **ГОНШ** Шлёма Моўшавіч, менскі мешчанін; 01.08.1850 пераведзены ў падмайстры злотніцкага цэха; пазнейшая недатаваная заўвага на палях (запіс № 51) — «перайшоў у званне майстры» (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 3 зв.).

III. 1. 817. **ГОРБУЛЬ** Едыд'я Іцкаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 58 гадоў, яго жонцы Росі Гіршаўне 57 гадоў, маюць дзяцей: дачку Міну

20 гадоў і сыноў Лейбу і Янкеля 16 гадоў; разам з імі жыла сям'я швагера *Ш. Залінкоўскага*; Е. Горбуль памёр у 1875 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 69 зв. — 70; тамсама, спр. 46, арк. 51 зв. — 53 зв.).

III. 1. 818. **ГОРБУЛЬ** Лейба Едыд'еў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 24 гады, мае жонку Лею 22 гадоў, дачку Росю 1 года і сына Янкеля (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 69 зв. — 70; тамсама, спр. 46, арк. 51 зв. — 53 зв.).

III. 1. 819. **ГОРДЗІН** Енахон Ёселеў, полацкі купец 2-й гільдыі; жыў на вул. Віцебскай ва ўласным доме; трымаў магазін гадзіннікаў, залатых і срэбраных вырабаў і абутку; 30.12.1894 прайшоў рэгістрацыю на права займацца сваёй дзейнасцю на наступны 1895 г.; меў гадавы абарот 2000 рублёў, рэнтабельнасць — 10% з кожнага рубля; плаціў штогадова за памяшканне 200 рублёў і за кватэру 70 рублёў; на час праходжання рэгістрацыі яму 43 гады ад нараджэння, меў жонку Хаю Айзікаву 54 гадоў, дзяцей — Году-Гліку 17 гадоў, Н...я 13 гадоў і 10 месяцаў, Моўшу 12 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 2523, воп. 1, спр. 6, арк. 57 зв. — 58).

III. 1. 820. **ГРОЎБЕН** Давід Борухаў, вучыўся ў Менску; 30.12.1898 віленская рамесная ўправа выдала яму дазвол на працу ювелірам у Вільні (L—V, № 2.335).

III. 1. 821. **ГРЫНГАУЗ** Ліпман Еўнавіч, радашковіцкі мешчанін; 05.05.1850 прыняты падмайстрам у менскі злотніцкі цэх (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 1 зв.).

III. 1. 822. **ГУДЗЯРЛЕЙ** Іван (Ян), майстра срэбраных спраў Гарадзенскай губ.; у кастрычніку 1822 г. звярнуўся з калегамі ў Літоўскае губернскае праўленне за дазволам рабіць у Гародні вырабы 72-й пробы замест 84-й, як патрабавалі ўлады (НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 3, спр. 499).

III. 1. 823. **ГУРВІЧ** Берка, свянцянскі злотнік; працаваў там у 1868 г. (L—V, № 2.351).

III. 1. 824. **ГУРВІЧ** Давыд, віцебскі мешчанін, падмайстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41 зв.).

III. 1. 825. **ГУРЭВІЧ** Копель Перцавіч, свянцянскі мешчанін, нарадзіўся ў 1870 г.; 12.06.1885 запісаны вучнем на тэрмін у 5 г. да віленскага злотніка А. Ёхельсона (L—V, № 2.349).

III. 1. 826. **ГУРЭВІЧ** Менька Міхелеў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 62 гады, яго жонцы Леі Аўсееўне — 60, іх нежанатаму сыну Мордуху — 36 (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 70 зв. — 71).

III. 1. 827. **ГУРЭВІЧ** Мордух Менькаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 36 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 70 зв. — 71).

III. 1. 828. **ГУРЭВІЧ** Нота Меераў, віцебскі мешчанін; у 1897—1898 гг. фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 659, арк. 11 зв.); 04.07.1889 атры-

маў атэстат «вечнага» майстры залата-срэбраных спраў (тамсама, воп. 1, спр. 343, арк. 3 зв. — 4).

III. 1. 829. **ГУРЭВІЧ** Юдка Моўшаў, клімавіцкі мешчанін, майстра залатых і гадзіннікавых спраў; у 1878—1883 гг. меў вучняў *Абрама Таўбіна* і *Г. Чарняка* (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 7, арк. 69—71).

III. 1. 830. **ГУТНІК** Том'я Залманаў, мсціслаўскі мешчанін; 03.09.1885 прыняты майстрам залатых спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 5 зв.).

III. 1. 831. **ДАБРЫНІН** Гірша Іцкаў, віцебскі мешчанін, падмайстра ў майстры злотніцкай управы *І. Дабрыніна*; у 1893 г. жыў у 3-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 84).

III. 1. 832. **ДАБРЫНІН** Іцка Хаймаў (Хакімаў), віцебскі мешчанін, майстра срэбрана-пазалотніцкай справы; у 1893 г. жыў у 3-й частцы г. Віцебска на вул. Вакзальнай, меў падмайстру *Г. Дабрыніна* (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 84).

III. 1. 833. **ДАВІДОВІЧ** Шалом, ігуменскі мешчанін; у 1844—1849 гг. падмайстра менскага срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 1; тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49).

III. 1. 834. **ДАВЫДАЎ** Абрам Залманаў, мешчанін мяст. Колышкі Віцебскай губ., рэзчык пячатак; 23.10.1884 залічаны ў падмайстры віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 4); пасля атэстацыі ў майстры Давыдава атрымаў ад віцебскай злотніцка-срэбраніцкай управы пасведчанне «часовага майстры», рэзчыка пячатак, да сканчэння тэрміну дзеяння пашпарта 17.09.1889 (тамсама, спр. 343, арк. 3 зв. — 4); у 1892 г. фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў (тамсама, спр. 522, арк. 5), 03.06.1897 — у спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 12); 12.09.1897 гарадскім старостам выдадзена пасведчанне на імя віцебскіх улад аб тым, што А. Давыдаў не быў пад судом (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 659, арк. 16 — 16 зв.).

III. 1. 835. **ДАВЫДАЎ** Ёсель Залманаў, віцебскі мешчанін; у 1893 г. падмайстра злотніка *З. Н. Давыдава* (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 83).

III. 1. 836. **ДАВЫДАЎ** Залман, суражскі мешчанін; у 1868 г. майстра віцебскага злотніцкага цэха, жыў у Віцебску на вул. Замкавай у доме Барэнблата (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 123, арк. 45).

III. 1. 837. **ДАВЫДАЎ** Залман Нохімаў, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы, гравёр; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Смаленскай (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.); фігуруе ў спісе майстраў 1877—1886 гг. (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2); у 1892 г. майстра віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха, жыў па вул. Смаленскай (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 476, арк. 83; тамсама, спр. 522, арк. 5); у 1893 г. жыў там жа, меў двух падмайстраў [уласных сыноў?] — *Ё. Давыдава* і *М. Давыдава* (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 83).

III. 1. 838. **ДАВЫДАЎ** Меер Залманаў, мешчанін мяст. Капыцк Віцебскага

пав., майстра золата-срэбраных спраў; у 1892 г. фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 522, арк. 5), а таксама ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50); у 1893 г. падмайстра ў свайго бацькі, злотніка *З. Давыдава* (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 83); 24.05.1894 абраны «прысяжным экспертам» злотніцка-срэбраніцкага цэха (тамсама, спр. 522, арк. 1 — 1 зв.); 08.06.1894 далучаны да Віцебскага яўрэйскага грамадства (тамсама, спр. 249, арк. 2 зв.); 03.06.1897 згадваецца ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 10 зв.).

III. 1. 839. **ДАЛІНКО** Моўша Ёселеў, срэбранік мяст. Любешаў Пінскага пав.; у 1816 г., паводле рэвізскай казкі цэхавых, яму 35 гадоў, меў жонку Бейлю Гітлю і дачку Двоўру (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 1144, арк. 647 зв. — 648).

III. 1. 840. **ДАНІШЭЎСКІ** І., віленскі майстра срэбраных спраў у 1844—1893 гг. (РЗиСД, с. 153).

III. 1. 841. **ДЗЯКОЎСКІ** Станіслаў, свянцянскі мешчанін; 15.11.1895 запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка М. Невядомскага; працаваў у XX ст. у Вільні (L—V, № 2.182).

III. 1. 842. **ДОБІН** Беньямін Гершанавіч, мсціслаўскі мешчанін мяст. Хіславічы; 09.05.1886 запісаны майстрам гадзіннікавых спраў у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў мсціслаўскай агульнай рамеснай управы на тэрмін у 1 г.; 12.11.1887 запісаны майстрам гадзіннікавых і залатых спраў; 20.11.1888 выключаны з цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 5 зв., 6 зв., 7, 8).

III. 1. 843. **ДОБРЫН** Ёсель, віцебскі мешчанін, падмайстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41 зв.); фігуруе ў спісе майстраў 1877—1886 гг. (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2).

III. 1. 844. **ДОБРЫН** Іцка, віцебскі злотніцкі майстра; у 1840—1850-я гг. жыў на вул. Дварцовай у доме Роніна (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13).

III. 1. 845. **ДОБРЫН** Іцка Хонанаў, віцебскі мешчанін, майстра золата-срэбраных спраў; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40); у 1868 г. жыў на вул. Смаленскай у доме Дрэмлінга (тамсама, спр. 123, арк. 45); фігуруе ў спісе майстраў 1877—1886 гг. (тамсама, спр. 249, арк. 1 зв.); у 1892 г. згадваецца ў спісе віцебскіх майстраў (тамсама, спр. 522, арк. 5 зв.), а таксама ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50), пражываў у 3-й частцы г. Віцебска на вул. Вакзальнай у доме Шапіры (тамсама, спр. 476, арк. 82 зв.); 08.07.1894 атрымаў гадавы дазвол на права гандлю залатымі і срэбранымі вырабамі (тамсама, спр. 505, арк. 134); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, спр. 659, арк. 10).

III. 1. 846. **ДОБРЫН** Пейсах, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у

1840—1850-я гг. жыў на вул. Смаленскай у доме Барэнблата (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13), у 1860 г. — у 1-й частцы г. Віцебска (тамсама, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40); у 1868 г. майстра віцебскага злотніцкага цэха, жыў на вул. Смаленскай у доме Зельцара (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 123, арк. 45); у спісе майстраў 1877—1886 гг. значыцца як памерлы (тамсама, спр. 249, арк. 1 зв.).

III. 1. 847. **ДРАПКІН** Гірша Іцка, віцебскі мешчанін; у 1893 г. вучань братоў *Аліхоўскіх*, жыў у 3-й частцы г. Віцебска на вул. Вакзальнай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 84).

III. 1. 848. **ДРЭЙЗІН** Янкель Іцка Гершанавіч, менскі мешчанін; 15.01.1882 запісаны вучнем на тэрмін у 2 г. да віленскага майстры Г. Нодэльмана (L—V, № 2.186).

III. 1. 849. **ДРЭЙЗІНАЎ** Хайм, менскі мешчанін; 04.02.1877 запісаны вучнем на тэрмін у 2 г. і 8 мес. да віленскага майстры М. А. Левінсона (L—V, № 2.187).

III. 1. 850. **ДУБІЛЯРТ** Айзік Хаймаў, злотнік м. Нясвіж Слуцкага пав.; у 1811 г., паводле рэвізскай казкі мяшчан-яўрэяў, яму 24 гады; згінуў без вестак падчас ваенных дзеянняў 1812 г. (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 220, арк. 662 зв. — 663).

III. 1. 851. **ДУБІЛЯРТ** Лейба Хаймаў, злотнік м. Нясвіж Слуцкага пав.; у 1816 г., паводле рэвізскай казкі мяшчан-яўрэяў, яму 39 гадоў, жонцы Перлі — 35 (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 220, арк. 662 зв. — 663).

III. 1. 852. **ДУБІЛЯРТ** Шмойла Хаймаў, злотнік м. Нясвіж Слуцкага пав.; у 1811 г., паводле рэвізскай казкі мяшчан-яўрэяў, яму 45 гадоў, «невядома



Ё. Аман. *Злотніцкі варштат. Дрэварыт. XVI ст.*

дзе знаходзіцца з 1812 г.» (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 220, арк. 662 зв. — 663).

III. 1. 853. **ДУГОЎСКІ** Моўша Мордухавіч, паходзіў з Навагародка; 05.03.1878 запісаны ў вучні на тэрмін у 4 г. да віленскага ювеліра Г. Замечыка (L—V, № 2.202).

III. 1. 854. **ДУКАРЭВІЧ** Іцка, віцебскі злотніцкі майстра; у 1840—1850-я гг. рамеством не займаецца (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 12 зв.).

III. 1. 855. **ДУНАЕЎСКІ** Францішак, слуцкі аднадворца; у 1846 г. паступіў у вучні да менскага майстры *Ф. Родэ*; 13.07.1849 пераведзены ў падмайстры ў сувязі з тым, што «рукоделие юбилерское достаточно по званию подмастера знает,

[таму] з сего числа щитать его подмастером» (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 3).

III. 1. 856. **ДУЭЛЬ (ДЭЎЭЛЬ)** Берка Іцкавіч, ашмянскі мешчанін; 24.02.1881 запісаны вучнем на тэрмін у 5 г. да віленскага злотніка Л. Нодэльмана з 1885 па 1891 г.; працаваў падмайстрам у віленскага майстры Я. Борэля; 20.04.1892 падаў прашэнне аб залічэнні яго ў майстры і прыёме ў цэх, 02.05.1892 заява задаволена (L—V, № 2.198).

III. 1. 857. **ДУЭЛЬ (ДЭЎЭЛЬ)** Берка Пінхасавіч, ашмянскі мешчанін; 21.06.1851 запісаны на 1 г. падмайстрам да віленскага ювеліра Ё. Борэля; 10.09.1855 атрымаў званне майстры і быў прыняты ў [віленскі яўрэйскі злотніцкі] цэх, меў шэраг вучняў; апошняя згадка аб ім датуецца 1892 г. (L—V, № 2.199).

III. 1. 858. **ДУЭЛЬ (ДЭЎЭЛЬ)** Борух Ельяшэвіч, ашмянскі мешчанін; 02.05.1883 запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да злотніцкага майстры Л. Нодэльмана (L—V, № 2.200).

III. 1. 859. **ДУЭЛЬ** Янкель Мендэль Моўшавіч, ашмянскі мешчанін; у 1859 г. запісаны вучнем на 2 г. да віленскага ювеліра Г. Кляйштэйна, 16.10.1861 працягнуў у яго вучобу яшчэ на 2 г.; з 10.10.1863 працуе падмайстрам (L—V, № 2.201).

III. 1. 860. **ДЫМАНСКІ** Лаўрэн, паходзіў з Гародні; 08.08.1801 запісаны вучнем на 7 г. да гарадзенскага злотніцкага майстры *Я. Т. Колса* (L—V, № 2.178).

III. 1. 861. **ДЫМАНШТЭЙН** Янкель Лейбавіч, віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў у 1818 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 57).

III. 1. 862. **ДЫМЕНБОРТ** Мордух Зэлікаў, брат *Ш. Дыменборта*, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 51 год, ён меў жонку Рохлю Вульфаўну 51 года, сына Зэліка 22 гадоў і аддадзенага ў 1854 г. у рэкруты сына Моўшу (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 68 зв. — 69).

III. 1. 863. **ДЫМЕНБОРТ** Шлёма Зэлікаў, брат *М. Дыменборта*, нарадзіўся каля 1806 г., майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны як памерлы ў 1857 г. у кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства; у 1858 г. яго сыну Абраму 22 гады, дачцэ Эстэр — 19 (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 68 зв. — 69).

III. 1. 864. **ДЫМЕНШТЭЙН** Берка, віцебскі злотніцкі майстра; у 1840—1850-я гг. валодае ўласным домам каля полацкай заставы (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13).

III. 1. 865. **ДЫМЕНШТЭЙН** Берка, віцебскі мешчанін; у 1892 г. згадваецца ў спісе майстраў віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 522, арк. 5; тамсама, спр. 659, арк. 50).

III. 1. 866. **ДЫМЕНШТЭЙН** Берка Янкелеў, віцебскі мешчанін; падмайстра *Ш. Л. Роніна* ў 1893 г., жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Дварцовай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 83).

III. 1. 867. **ДЫМЕНШТЭЙН** Давід Гіршаў, злотнік м. Нясвіж Слуцкага пав.; у 1816 г., паводле рэвізскай казкі мяшчан-яўрэяў, яму 43 гады, яго жонцы Райне 40 гадоў, дачцэ Хайцы 1 год (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 220, арк. 662 зв. — 663).

III. 1. 868. **ДЫНКІН** Ёсель, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40).

III. 1. 869. **ДЫПЕНШТЭЙН** Берка, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.).

III. 1. 870. **ДЭРМАЕР** Берка, новагародскі мешчанін; 27.04.1909 новагародскае губернскае праўленне звярнулася ў Віцебскую гарадскую ўправу аб выдачы яму пасведчання на права жыхарства і ведання ім злотніцка-срэбраніцкага рамяства (НГАБ у Мінску, ф. 2496, воп. 1, спр. 2460).

III. 1. 871. **ДЭРМАЕР** Гірша Янкелеў, віцебскі мешчанін; 24.03.1909 просіць віцебскую гарадскую ўправу выдаць яму пасведчанне на права жыхарства і заняткаў злотніцка-срэбраніцкім рамяством (НГАБ у Мінску, ф. 2496, воп. 1, спр. 2460, арк. 20 зв.).

III. 1. 872. **ДЭРЫНГ** Яфім Ягораў, віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў; у 1820 г. просіць віцебскага грамадзянскага губернатара А. П. Бутовіча дазволіць яму скончыць пачаты ім заказ у 50-й пробе срэбра замест новаўведзенай 84-й (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 168).

**ДЭЎЭЛЬ**, гл. **ДУЭЛЬ**

III. 1. 873. **ЕВЕЛЕЎ** Гаўшэй, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 3-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41).

III. 1. 874. **ЕВЕЛЕЎ** Шмерка Мееравіч, віцебскі майстра; пасля іспытаў мясцовымі экспертамі і паводле пасведчання разанскай рамеснай управы 16.08.1888 атрымаў атэстат «вечнага» майстры золата-срэбраных спраў; 16.07.1896 дублікат пасведчання высланы прыставу маскоўскай часткі г. Разані (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 343, арк. 1 зв. — 2); 12.09.1893 атрымаў атэстат часовага (без абмежавання тэрміну) майстры віцебскай злотніцка-срэбраніцкай управы (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 343, арк. 6 зв. — 7); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха, атрымаў пасведчанне аб тым, што не быў пад судом (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 12).

III. 1. 875. **ЕЙДЭЛЬМАН** Ёсель Ельевіч, клецкі майстра срэбраных спраў, нарадзіўся ў 1830 г. (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2480, арк. 152 зв. — 153).

III. 1. 876. **ЕЛІМАН** Арон Шаломаў, пінскі мешчанін, нарадзіўся ў 1818 г.; у 1852 г. займаецца бляхарнай і злотніцкай справай, мае брата Моўшу 27 гадоў, сыноў: Шмуля 12 гадоў, Іцку 6 гадоў і паўгадовага Абрама (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 2482, арк. 113 зв. — 114).

III. 1. 877. **ЕЎЛЕЎ** Ёсель, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 2-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41).

III. 1. 878. **ЁСЕЛЕВІЧ** Берка, лідскі майстра; 12.11.1883 запісаны падмайстрам да віленскага злотніка Ш. Заскінда (L—V, № 2.408).

III. 1. 879. **ЁСЕЛЕВІЧ** Госей (Hosiey Ioseliowicz), злотнік; жыў у Міры на вул. 2-й Высокай; у 1805—1808 гг. плаціў штогадова ў нясвіжскую касу па-



*Пячатка піцейных збораў 1-й часткі г. Магілёва. Пачатак XIX ст.*

датак у памеры 8 злотых 24 грыўны (НГАБ у Мінску, ф. 694, воп. 2, спр. 4484, арк. 284, 316).

III. 1. 880. **ЁСЕЛЕВІЧ** Ёсель, да 1844—1849 гг. майстра цэха злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1 зв.; тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49).

III. 1. 881. **ЁСЕЛЬ** Шмерль Абрамавіч, гарадзенскі злотнік; у 1897 г. жыве на вул. Мяшчанскай (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 1584, арк. 7).

III. 1. 882. **ЖАК** Ханес Лейба Беркавіч, мсціслаўскі мешчанін мяст. Шамова; 16.09.1886 прыняты майстрам, рэзчыкам пячатак, на неабмежаваны час у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 6 зв.); 15.10.1888 выключаны з цэха (тамсама).

III. 1. 883. **ЖЭЛМАНОВІЧ** Давід, злотнік нясвіжскі; у 1801 г. згадваецца ў іску нясвіжскага катлярскага цэха да новастворанага нясвіжскага цэха злотнікаў (НГАБ у Мінску, ф. 530, воп. 3, спр. 1, арк. 23 зв. — 29).

III. 1. 884. **ЗАБАЛІНСКІ** Вігдэр Шмеркавіч, слонімскі майстра залатых і срэбраных спраў у 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 2180, арк. 205).

III. 1. 885. **ЗАБАЛІНСКІ** Хайм Гірш Шмеркавіч, слонімскі залатых і срэбраных спраў майстра ў 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 2180, арк. 205).

III. 1. 886. **ЗАБЕЦКІ** … менскі майстра срэбраных спраў у 1891 г. (РЗиСД, с. 200).

III. 1. 887. **ЗАБЦЫЦКІ** Тувей, віцебскі майстра злотніцкага цэха; у 1866 г. трымае майстэрню ў Віцебску ў «Блохінным» завулку ў доме Зактэрсіна, працуе «без наёмных работнікаў» (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 108, арк. 28 зв. — 29).

III. 1. 888. **ЗАК** Вульф Ёселеў, навагародскі мешчанін; 16.08.1889 запісаны ў вучні на тэрмін у 4 г. да віленскага ювеліра Е. М. Ерусалімскага, потым вучыўся ў А. М. Дрохеса; у 1893 г. працуе падмай-страм у *В. Брытэнскага*; 05.04.1897 віленская рамесная ўправа дазваляе яму працаваць у Вільні ювелірам (L—V, № 2.1083).

III. 1. 889. **ЗАК** Шмуйла, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 3-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41 зв.).

III. 1. 890. **ЗАЛІНКОЎСКІ** Шлёма Гіршаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 51 год, ён меў жонку Хаю Геселеву 45 гадоў і дачку Міню 20 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 69 зв. — 70).

III. 1. 891. **ЗАЛКІНД** Моўша Іцкавіч, свянцянскі мешчанін; 22.01.1890 запісаны вучнем на тэрмін у 2 г. да віленскага ювеліра; у 1896 г. віленская рамесная ўправа выдала яму пасведчанне на права работы злотнікам; у 1899 г. трымае падмайстру А. Каца; 12.04.1900 запісаны вучнем на тэрмін у 1 г. да віленскага ювеліра Я. Рабіновіча (L—V, № 2.1095).

III. 1. 892. **ЗАЛУМАН** Зэлік Шалоймавіч, менскі мешчанін; у 1849 г. майстра срэбраніцкага цэха, дадаткова пазначана: «у старых кнігах запісаны медніцкім майстрам» (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49).

III. 1. 893. **ЗАПРУДНІК** Янкель, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.).

III. 1. 894. **ЗАПРУДСКІ (ЗАПРУЦКІ)** ... віцебскі майстра золата-срэбраных спраў; фігуруе ў спісе майстраў у 1877—1886 гг. (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2).

III. 1. 895. **ЗАПРУДСКІ (ЗАПРУЦКІ)** Ёсель Янкелеў-Тувелеў, віцебскі мешчанін; 19.07.1888 быў вучнем у свайго бацькі *Я.-Т. Запрудскага* (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 455, арк. 1—5); 06.09.1891 атрымаў атэстат «вечнага» майстры золата-срэбраных спраў па атэстацыі яго бацькі (тамсама, спр. 343, арк. 5 зв. — 6); у 1892 г. фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў (тамсама, спр. 522, арк. 5); у 1892 г. згадваецца ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50); у 1893 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Смаленскай (тамсама, спр. 476, арк. 83; тамсама, спр. 510, арк. 83); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 11).

III. 1. 896. **ЗАПРУДСКІ (ЗАПРУЦКІ)** Тэвель, віцебскі мешчанін, нарадзіўся ў 1818 г. у мяст. Любавічы Аршанскага пав. Магілёўскай губ., залатых і срэбраных спраў майстра; з 1839 г. жыў у Віцебску па вул. Дварцовай, 4 у флігелі домаўладання Я. Нямойціна (НГАБ у Мінску, ф. 2631, воп. 2, спр. 2, арк. 796 зв.).

III. 1. 897. **ЗАПРУДСКІ (ЗАПРУЦКІ)** Тэве-Янкель, аршанскі мешчанін; у 1868 г. майстра віцебскага злотніцкага цэха; жыў у Віцебску на вул. Шасейнай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 123, арк. 44 зв.).

III. 1. 898. **ЗАПРУДСКІ (ЗАПРУЦКІ)** Янкель-Тэвель Хаймаў, віцебскі мешчанін, золата-срэбраніцкі майстра; з 1888 па 19.07.1891 меў у вучнях свайго сына *Ё. Запрудскага* (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 455, арк. 1—5; тамсама, спр. 476, арк. 83); 02.08.1890 за махлярства прыгавораны да 5 мес. турмы (тамсама, спр. 522, арк. 5); у 1892 г. фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў (тамсама, спр. 476, арк. 83), згадваецца ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на



*Пячатка Галоўнага суда Менскага ваяв. 1793 г.*

грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50 зв.), жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Смаленскай у доме Добрына; 10.01.1894 атрымаў гадавы дазвол на права гандлю залатымі і срэбранымі вырабамі (тамсама, спр. 505, арк. 83).

III. 1. 899. **ЗАПРУДСКІ (ЗАПРУЦКІ)** Янкель Хаймаў, любавіцкі мешчанін (Аршанскі пав.); майстра золата-срэбраных спраў у 1840—1850-я гг. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 12 зв.); у 1849 г. жыў з маці, падаў скаргу віцебскаму грамадзянскаму губернатару на віцебскага пробера *С. Палякова* і віцебскую яўрэйскую ўправу залатых і срэбраных спраў за тое, што на працягу 1847—1848 гг. яму не выдалі дазвол займацца рамяством і не ўключылі ў спісы цэхавых майстраў. Прашэнне было вырашана станоўча (тамсама, ф. 1430, воп. 1, спр. 17469, арк. 1—3); згадваецца як віцебскі мешчанін, значыцца ў спісе асоб, што сталі майстрамі да 1877 г. (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2); фігуруе ў спісе майстраў у 1877—1886 гг. (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2).

III. 1. 900. **ЗАХАРОВІЧ** Віктар, віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў у 1818 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 57).

III. 1. 901. **ЗЕЛЬЦЭР** Абрам-Лейзер Беркаў Гіршаў, навагародскі мешчанін (Менская губ.); жыў у Менску на вул. Захар'еўскай у доме Вайцахоўскага; 21.07.1900 падаў прашэнне аб прыпісцы яго да цэха работнікам злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства; пасля майстроўскай «экспертызы» аб веданні ім рамяства атрымаў «звание ремесленного работніка» (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 911, арк. 11—12).

III. 1. 902. **ЗЕЛЬЦЭР** Міхель Літманаў, віцебскі мешчанін; 17.09.1885 прыняты ў майстры золата-срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 3; тамсама, спр. 193, арк. 176); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 10).

III. 1. 903. **ЗІЛЬБЕРГЛЕЙТ** Абрам Лазаравіч, менскі мешчанін; у 1844 г. падмайстра цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1); 27.03.1852 прыняты ў лік майстраў злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства (тамсама, арк. 5); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 3).

III. 1. 904. **ЗІЛЬБЕРГЛЕЙТ** Абрам Смешавіч, нарадзіўся ў 1813 г.; у 1849 г. прыняты майстрам у злотніцка-срэбраніцкі цэх г. Менска, «па беднасці» быў вызвалены ад уплаты ўступнага ўзносу (НГАБ

у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 3); у 1852 г. меў сыноў: Бендара 15 гадоў і Сендара 10 гадоў (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 286 зв. — 287).

III. 1. 905. **ЗІЛЬБЕРГЛЕЙТ** Лейзер Шмеркавіч, менскі мешчанін; 18.08.1850 прыняты майстрам у ювелірны цэх г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 3 зв.).

III. 1. 906. **ЗІЛЬБЕРГЛЕЙТ** Моўша Шмеркавіч, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1817 г.; 05.06.1850 прыняты майстрам у ювелірны цэх г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 3); у 1852 г. меў сына Шмерку 9 гадоў і брата Абрама 40 гадоў (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 291 зв. — 292).

III. 1. 907. **ЗІЛЬБЕРГЛЕЙТ** Пейсах Борухавіч, прыпісаны да менскага яўрэйскага грамадства; 03.04.1852 прыняты ў майстры менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 6); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 3).

III. 1. 908. **ЗІЛЬБЕРГЛЕЙТ** Шмуйла Лейбавіч; у 1844 г. майстра ювелірнага цэха г. Менска; памёр у 1852 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1).

III. 1. 909. **ЗІЛЬБЕРШТАТ** Элья Борухавіч, 12.04.1852 прыняты падмайстрам у срэбраніцкі цэх г. Менска, у сувязі з беднасцю вызвалены ад уступнага ўзносу (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 4).

III. 1. 910. **ЗІЛЬБЕРШТЭЙН** Арон Лейбавіч, майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха г. Менска; памёр каля 1844 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1).

III. 1. 911. **ЗІМАЛІН** Моўша, віцебскі злотніцкі майстра; у 1853—1854 гг. абвінавачваецца віцебскім проберам *С. Паляковым* у тым, што «накладывал фальшивые клейма» на нізкаякасныя залатыя і срэбраныя вырабы (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 10295, арк. 1 — 10 зв.).

III. 1. 912. **ЗЛАТНІКОВІЧ** Іцка Янкелеў, срэбранік мяст. Горваль Рэчыцкага пав., «калека»; у 1795 г. яму 53 гады; у 1811 г. яго сыну Давыду 20 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 261, арк. 383).

III. 1. 913. **ЗЛОТНІК** Лейба Моўшаў, навагародскі мешчанін, нарадзіўся ў 1771 г., срэбранік; у 1806 г. меў жонку Цыру 35 гадоў, сыноў Ёселя 5 гадоў і Моўшу 2 гадоў, жыў у Навагародку (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 184, арк. 5 зв.).

III. 1. 914. **ЗОМБЕГРЭАТ** Абрам Лазаравіч, менскі мешчанін; у 1849 г. майстра срэбраніцкага цэха, дадаткова пазначана: «у старых кнігах запісаны медніцкім майстрам» (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49).

III. 1. 915. **ЗУСМАНОВІЧ** Абель Мордухавіч, мешчанін мяст. Жупраны Ашмянскага пав. Віленскай губ.; з 1895 г. унтэр-афіцэр у адстаўцы, да прызыву ў войска працаваў у г. Дзвінску Віцебскай губ. у гравёрнай установе Файтэля Гольдберга (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 9, спр. 828, арк. 1—2); 6 чэрвеня атрымаў пасведчанне на права трымаць установу для рэзкі пячатак, вырабу гумавых штэмпеляў і гравёрных прац (тамсама, арк. 12); 4 лістапада ў сувязі з матэрыяльнымі цяжкасцямі просіць дазволу адкрыць майстэрню разам з беластоцкім мешчанінам *Г. Неймаркам* у доме апошняга (тамсама, арк. 6).

III. 1. 916. **ЗЫЛЬБЕРМАН** Абрам Лейзераў, мешчанін Пінскага пав. Мен-

скай губ., нарадзіўся ў 1810 г.; залатых, бляхарных і медных спраў майстра; у 1852 г. меў сына Ехаэля 12 гадоў, братоў: Насона 32 гадоў і Гірша 20 гадоў, жыў у Пінску (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2482, арк. 114 зв. — 115).

III. 1. 917. **ЗЫЛЬБЕРМАН** Гірш Элііеў, мешчанін Пінскага пав. Менскай губ., нарадзіўся ў 1804 г.; у 1852 г. залатых, бляхарных і медных спраў майстра, займаўся «равно вырезкою печатей», жыў у Пінску, меў сына Сроля 7 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2482, арк. 114 зв. — 115).

III. 1. 918. **ЗЫЛЬБЕРМАН** Ёсель Іцкаў, нарадзіўся каля 1793 г., майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны як памерлы ў 1854 г. у кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г., меў сына Фіселя (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 67 зв. — 68).

III. 1. 919. **ЗЫЛЬБЕРМАН** Фісель Ёселеў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 31 год, меў жонку Хаю Янкелеву, дзяцей — сына Абрама 11 гадоў і дачку Рохлю 2 гадоў, з імі жыла маці Фіселя Рыўка Фіселева (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 67 зв. — 68).

III. 1. 920. **ЗЫСМАН** Сроль Герш Іцкавіч, магілёўскі мешчанін; 30.06.1898 запісаны вучнем на тэрмін у 3 г. да віленскага злотніка А. Н. Глезера (L—V, № 1.1120).

III. 1. 921. **ЗЭЛЬКІН** Сімон Неўхаў, віцебскі мешчанін; 10.08.1910 атрымаў пасведчанне на права займацца срабрэннем металёвых рэчаў (НГАБ у Мінску, ф. 2496, воп. 1, спр. 2458, арк. 18 зв.).

III. 1. 922. **ІДЭЛЬЧЫК** Ідэль Іцкавіч, дукорскі мешчанін; 12.03.1852 прыняты вучнем у срэбраніцкі цэх г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 2 зв.); у 1854 г. майстра (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 923. **ІЗАКАЎ** Берка Абрамаў, менскі мешчанін, жыў на вул. Мясніцкай у доме Мінькоўскага; 04.07.1900 падаў прашэнне аб прыпісцы яго да цэха работнікам злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 911).

III. 1. 924. **ІЗАКАЎ** Ісак Зэлікаў, менскі мешчанін, жыў на вул. Крашчэнскай у доме Гохмана; на 1900 г. меў 25 гадоў; 13.12.1893 атрымаў пасведчанне менскай управы на званне падмайстры; 04.06.1894 харкаўская рамесная ўправа выдала яму пасведчанне падмайстры гравёрнага рамяства (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 955, арк. 1 зв. — 2); 24.04.1900 атрымаў званне майстры і запрасіў у менскай рамеснай управы дазволу на адкрыццё гравёрнай майстэрні (тамсама, арк. 1 зв. — 1).

III. 1. 925. **ІЗГУР** Вульф Янкелеў Гіршаў, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1868 г., залатых спраў майстра; у 1894 г. пражываў на вул. Губернатарскай у доме Саламонава, пісьменны, унесены ў спісы асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 2744, арк. 152 зв. — 153).

III. 1. 926. **ІЗГУР** Лейба Лейзеравіч, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1810 г.; у 1844 г. значыцца майстрам цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 1; тамсама, спр. 33, арк. 1); у снежні 1847 г. абраны старшынёй менскага срэбраніцкага цэха (тамсама, спр. 42, арк. 1); у 1849 г. у спісах цэха дадат-

кова пазначана: «у старых кнігах запісаны медніцкім майстрам» (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49); у 1852 г. меў сына Лейзера 10 гадоў, брата Мордуха 24 гадоў і пляменніка Іцку 4 гадоў (тамсама, спр. 462, арк. 287 зв. — 288); 25.03.1855 прыняў у вучні на тэрмін у 3 г. свайго брата *М. Ізгура* (тамсама, спр. 29, арк. 1 зв.); 25.03.1852 цэх выдаў В. Ізгуру пісьмовае пасведчанне аб тым, што ён мае званне майстры (тамсама, спр. 49, арк. 5); згадваецца як майстра ў 1854 г. (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 3).

ІІІ. 1. 927. **ІЗГУР** Мордух Лейзеравіч, менскі мешчанін; 25.03.1852 прыняты вучнем на тэрмін у 3 г. сваім братам майстрам *Л. Ізгурам* (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 29, арк. 1 зв.).

ІІІ. 1. 928. **ІЗГУР** Моўша, менскі майстра залатых спраў; у 1844 г. заключыў дагавор з *Х. Кажданам* аб прыёме апошняга ў вучні на тэрмін у 2 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 2 — 2 зв.); у 1851 г. меў сына Янкеля-Гіршу 8 гадоў (тамсама, спр. 31, арк. 10).

ІІІ. 1. 929. **ІЗГУР** Моўша Янкелеў-Гіршаў, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1868 г., залатых спраў майстра, пісьменны; у 1887 г. пражывае на вул. Губернатарскай у доме Саламонава, унесены ў спісы асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 1696, арк. 12).

ІІІ. 1. 930. **ІЗГУР** Моўша-Янкель Гіршавіч, менскі мешчанін; у 1890 г. майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1); 30.12.1894 атрымаў пасведчанне на права рабіць у Менску залата-срэбраныя і ювелірныя вырабы ў 1895 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 721, арк. 11); 07.01.1898 атрымаў пасведчанне на права займацца рамяством у 1898 г. (тамсама, арк. 1 зв.).

ІІІ. 1. 931. **ІЗГУР** Янкель Моўшавіч, менскі мешчанін; 10.12.1871 прыняты ў лік майстраў менскага злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 164, арк. 5 зв.); у 1872 г. абвінавачваецца ў незаконнай скупцы золата і срэбра ў менскага дэкана Сенчыкоўскага (Минская Старина, т. 3, ч. 1, с. 267); у 1886 г. таварыш старшыні цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 326, арк. 1); 06.08.1887 і 02.11.1889 выконвае абавязкі старшыні менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (тамсама, спр. 337, арк. 1; тамсама, спр. 467, арк. 1); у 1890 г. згадваецца як майстра (тамсама, спр. 577, арк. 1).

ІІІ. 1. 932. **ІОШПА** Лейзер Ёселеў, срэбранік мяст. Пагост Пінскага пав.; у 1816 г., паводле рэвізскай казкі цэхавых, яму 50 гадоў, меў жонку Цыву 40 гадоў і дачку Рыўку Рохлю 8 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 1144, арк. 692 зв. — 693).

ІІІ. 1. 933. **ІОШПА** Сроль Лейзераў, срэбранік мяст. Пагост Пінскага пав.; у 1816 г., паводле рэвізскай казкі цэхавых, яму 21 год, меў жонку Бейлю 20 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 1144, арк. 692 зв. — 693).

ІІІ. 1. 934. **ІЦІН** Літман Лейбаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 59 гадоў, яго жонцы Леі Герцаўне 56 гадоў; яго сын Копель, які нарадзіўся каля 1837 г., памёр у 1852 г.; другі сын, Герцэль, меў сям'ю (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 70 зв. — 71).

III. 1. 935. **КАБАК** Моўша Пінхусаў, віцебскі мешчанін; 05.06.1902 атрымаў званне падмайстры віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха, 04.11.1911 — паўторнае пасведчанне на званне падмайстры (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 819, арк. 38 — 38 зв.).

III. 1. 936. **КАБАК** Пінхус Моўшаў, крэўскі мешчанін Ашмянскага пав. Віленскай губ., майстра віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха; далучаны да віцебскага яўрэйскага грамадства ў 1883 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2 зв.); 11.02.1887 атрымаў гадавы дазвол на выраб і гандаль золата-срэбранымі вырабамі (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 405, арк. 12); 27.10.1889 залічаны ў віцебскія мяшчане (тамсама, спр. 659, арк. 35); у 1892 г. фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў (тамсама, спр. 522, арк. 5), згадваецца ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50); жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Смаленскай у доме Гінзбурга; 13.01.1893 атрымаў ад віцебскай управы майстраў дазвол на гадавы тэрмін заняцца рамяством; 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 659, арк. 12 зв.); 10.09.1897 бешанковіцкім мяшчанскім старостам выдадзена віцебскім уладам пасведчанне аб тым, што ён не быў пад судом (тамсама, арк. 31—33); сярод яго вучняў былі *Х. Барынблат* (1893) і *З. Багарад* (1898—1902); у 1893 г. меў падмайстру *А. Шахіна*.

III. 1. 937. **КАБАКОЎ** Залман, бабруйскі жыхар, майстра срэбраных спраў; у канцы 40-х — пачатку 50-х гг. XIX ст. займаўся вырабам і гандлем некляймёнымі і сфальшаванымі вырабамі (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 3923, арк. 50).

III. 1. 938. **КАВАРСКІ** Лейзер Моўшавіч, свянцянскі мешчанін, нарадзіўся ў 1884 г.; 12.04.1900 запісаны вучнем на тэрмін у 1 г. да віленскага ювеліра З. Гурвіча (L—V, № 2.507).

III. 1. 939. **КАГАН** Залман, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1840—1850-я гг. жыў ва ўласным доме на вул. Рэжыцкай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13); у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.), працаваў у 2-й, унесены ў «Памятную книжку Витебской губ.» на 1861 г.; 24.03.1870 атрымаў пасведчанне на права займацца залатымі і срэбранымі работамі, заплаціў за яго 2 рублі 50 капеек (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 147, арк. 1 зв.); у спісе майстраў 1877—1886 гг. значыцца як памерлы (тамсама, спр. 249, арк. 1 зв.).

III. 1. 940. **КАГАН** Сімон Цалкаў, віцебскі мешчанін; у 1893 г. вучань у майстры *Я. Сіліцкага*, жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Дварцовай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 84 зв.).

III. 1. 941. **КАГАН** Файбіш, менскі мешчанін; у 1846 г. значыцца майстрам срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 1 зв.).

III. 1. 942. **КАГАНЧЫК** Файбіш Мордухавіч, менскі мешчанін; у 1849 г. майстра срэбраніцкага цэха; у спісах дадаткова пазначана: «у старых кнігах запісаны медніцкім майстрам» (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49).

III. 1. 943. **КАЖДАН** Давід Сролевіч, менскі мешчанін; у 1844—1849 гг. падмайстра срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 1; тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49).

III. 1. 944. **КАЖДАН** Хайм Моўшавіч, менскі мешчанін; у лістападзе 1844 г. заключыў дагавор з майстрам залатых спраў *Моўшам Ізгурам* аб прыёме яго, Х. Каждана, у вучні; пазнейшая недатаваная прыпіска на дакуменце сведчыць, што вучань паступіў на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 2 зв.).

III. 1. 945. **КАЖДАН** Янкель Ёселевіч; у 1844 г. майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1).

III. 1. 946. **КАЗАЛЁЎ** Ізраіль, віцебскі мешчанін, злотніцкай управы майстра; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.).

III. 1. 947. **КАЗАЛЁЎ** Ханем, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.).

III. 1. 948. **КАЗІЦКІ** Ліпа Рубінавіч; у 1863 г. слонімскі майстра залатых і срэбраных спраў (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 2180, арк. 205 зв.).

III. 1. 949. **КАЙДАН** Елья Ліпнаў, менскі «ювилерскі» майстра, нарадзіўся ў 1820 г.; у 1852 г. меў сына Вульфа 3 гадоў, жыў у драўляным доме на вул. Траецкай (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 290 зв. — 291).

III. 1. 950. **КАЛАНЧЫК** Файбіш Мордухавіч, менскі мешчанін; у 1849 г. майстра срэбраніцкага цэха г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49).

III. 1. 951. **КАЛМАНОВІЧ** Іцка, мешчанін менскі; 26.12.1846 прыняты падмайстрам менскага ювелірнага цэха, «па беднасці» вызвалены ад уплаты ўступнага ўзносу (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 2 зв.).

III. 1. 952. **КАЛЬНЕР** Абрам-Іцка Хаймаў, панявежскі мешчанін; унесены ў спіс віцебскіх майстраў золата-срэбраных спраў у 1881 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2 зв.).

III. 1. 953. **КАЛЬФІС** Людвік, нарадзіўся ў 1785 г. у Гародні; 04.03.1801 запісаны вучнем на тэрмін у 6 г. да віленскага злотніцкага майстры Т. К. Шульца; 06.06.1804 выпісаны з віленскіх злотніцкіх цэхавых рэестраў (L—V, № 2.444).

III. 1. 954. **КАНДАК** Елья, менскі мешчанін; у 1849 г. значыцца майстрам ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.).

III. 1. 955. **КАНІН** Залман Мендэлеў, полацкі мешчанін; каля 1848 г. атрымаў дазвол займацца злотніцка-срэбраніцкім рамяством у Віцебску (НГАБ у Мінску, ф. 1430, воп. 1, спр. 17469, арк. 1 зв.).

III. 1. 956. **КАНТАРОВІЧ** Ёсель Львовіч, ашмянскі мешчанін; 26.11.1866 вызвалены ад адпрацоўкі паловы вучнёўскіх гадоў віленскім злотнікам Ё. Рабіновічам (L—V, № 2.450).

III. 1. 957. **КАНТАРОВІЧ** Зісля Янкелевіч, мешчанін івянецкага яўрэйскага грамадства мяст. Ракаў, рэзчык пячатак; 18.03.1852 прыняты падмайстрам менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 4 зв.).

III. 1. 958. **КАПЛАН** Абрам Смуйлавіч, барысаўскі мешчанін; 02.04.1848 паступіў вучнем да менскага ювелірнага майстры *Я. Роткіна* на тэрмін у 2 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 5 — 5 зв.).



Ё. Аман. *Злотніцкі варштат. Вытворчы працэс вырабу срэбранага посуду і інш. Дрэварыт. XVI ст.*

III. 1. 959. **КАПЛАН** Вульф Шмуйлаў, менскі «ювілерскі» майстра, нарадзіўся ў 1817 г.; у 1852 г. меў сына Іцку 7 гадоў, брата Меера 28 гадоў і пляменніка Шмуйлу 4 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 287 зв. — 288); у 1854 г. згадваецца як менскі злотніцка-срэбраніцкі майстра (тамсама, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 960. **КАПЛАН** Зусь Мордухавіч, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1818 г.; у 1849 г. значыцца майстрам менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20); у 1852 г. меў сына Мордуха 11 гадоў, брата Сроля 33 гадоў з сынамі Янкелем 9 гадоў і Вульфам 5 гадоў; жылі ў Ляхаўцы (тамсама, спр. 462, арк. 288 зв. — 289); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 961. **КАПЛАН** Моўша Елья Аронавіч, нарадзіўся ў 1814 г.; да 1844 г. запісаны ў падмайстры менскага злотніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 1); у 1852 г. менскі «ювілерскі» майстра, меў сына Еллю 3 гадоў (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 287 зв. — 288).

III. 1. 962. **КАПЛАН** Янкель Беркавіч, менскі мешчанін; нарадзіўся ў 1813 г.; у 1844—1849 гг. залатых спраў майстра; у 1849 г. падстаршыня цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 288 зв. — 289); у 1852 г. згадваецца як «ювілерскі» майстра, у 1853 г. — таварыш старшыні [?] (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 — 20 зв.; тамсама, ф. 10, воп. 1, спр. 30—31), у 1854 г. — майстра (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 963. **КАПЛАЧ** Меер Шмуйлавіч, менскі мешчанін; да 1844 г. запісаны ў падмайстры злотніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 1).

III. 1. 964. **КАРЧЭЎСКІ** Просіф [?], 10.12.1871 па хадайніцтве майстры *Л. Стаброўскага* пераведзены з вучняў у падмайстры цэха злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 164, арк. 5).

III. 1. 965. **КАРЭЛІЦКІ** Арон Ёхелевіч, паходзіў з Навагародскага пав.; 01.11.1879 запісаны ў вучні да віленскага злотніка *М. Літмана* (L—V, № 2.502).

III. 1. 966. **КАЎНЕР (КОЎНЕР)** Міхель Абелевіч, ашмянскі злотнік; у 1869 г. знойдзена золата і срэбра, пазначанае фальшывымі клейнамі, да якіх ён меў дачыненне (L—V, № 2.513).

III. 1. 967. **КАФЕЛЬ** Рафал Міхелевіч, дзінабургскі майстра залатых і срэбраных спраў; у 1821 г. дзінабургскім гарадавым у яго забраны і адпраўлены ў Віцебскую проберную палатку штэмпель для кляймення вырабаў (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 242).

III. 1. 968. **КАХАМЕЙЗЕР** Меер, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 2-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41).

III. 1. 969. **КАЦ** Мендэль Файвішаў, віцебскі мешчанін; у 1893 г. «хлопчык» (вучань) у майстры *Б. Мезінскага*, жыў у 2-й частцы г. Віцебска на вул. Замкавай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 84 зв.).

III. 1. 970. **КАЦ-КАГАН** Мендэль Гіршаў, дзвінскі мешчанін Віцебскай губ.; у 1907 г. атрымаў пасведчанне на права займацца гравёрным рамяством (НГАБ у Мінску, ф. 2496, воп. 1, спр. 2458, арк. 23); 18.02.1908 просіць віцебскую гарадскую ўправу аб выдачы яму пасведчання на права займацца гравёрным рамяством у 1908 г. (тамсама, спр. 2460, арк. 2 зв.).

III. 1. 971. **КАЦНЕЛЬСОН** Зэлік Юдэлевіч, бабруйскі злотніцкі майстра, рэзчык пячатак; у канцы 40-х — пачатку 50-х гг. XIX ст. згадваецца ў сувязі з тым, што вырабляў «сфальшаваныя» клейны з лічбай пробы «84» для «приготовления» і рэалізацыі нізкапробных срэбраных вырабаў; у 1851 г. «отлучился в Великорусскіе губернии» (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 3923, арк. 3—5).

III. 1. 972. **КАЧАР** Зэлік, бабруйскі злотніцкі майстра; у канцы 40-х — пачатку 50-х гг. XIX ст. займаўся вырабам і рэалізацыяй нізкапробных залатых і срэбраных вырабаў, пры гэтым накладваў на іх фальшывае кляйно з лічбай «84» (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 3923, арк. 3—5).

III. 1. 973. **КАШЭДЗІН** Нохім Шлёмавіч, віцебскі мешчанін, злотніцкай управы майстра; у 1831 г. падаў заяву віцебскаму грамадзянскаму губернатару аб выдачы яму пашпарта для паездкі ва ўнутраныя губерні Расіі (НГАБ у Мінску, ф. 1430, воп. 1, спр. 3463, арк. 12); у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (тамсама, ф. 1416, воп. 1, спр. 11540, арк. 39 зв.); унесены ў «Памятную книжку Витебской губ. на 1861 г.».

III. 1. 974. **КАШЭДЗІРСКІ** Залман, віцебскі мешчанін, падмайстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41 зв.).

III. 1. 975. **КЕЁРЫН** ... у 1890 г. майстра менскага злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага цэха, меў вучня *Д. Самсонава* (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 519, арк. 3 зв.).

III. 1. 976. **КЕЙТЭР** Іонаш Шмуйлавіч, нарадзіўся ў Ашмянах у 1775 г., віленскі злотнік, удавец, згадваецца ў 1813 г. (L—V, № 2.464).

III. 1. 977. **КЕНІН** Абрам, бабінавіцкі мешчанін Магілёўскай губ., злотніцкі майстра; у 1821 г. жыў у Веліжы (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 217).

III. 1. 978. **КЛІМОВІЧ** ... гарадзенскі майстра залатых спраў; 23—26 лістапада 1863 г. удзельнічаў у таргах Гарадзенскай пробернай установы (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 2180, арк. 173 зв. — 174).

III. 1. 979. **КЛІМОВІЧ** ... менскі майстра срэбраных спраў у 1899 г. (РЗиСД, с. 201).

III. 1. 980. **КМОРЫН** Моўша Іцкаў, менскі мешчанін; у 1890 г. майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1); памёр да 1900 г.; пасля смерці майстры яго ўдава Перла трымала майстэрню і яго вучня *М. Эвенчыка* (тамсама, спр. 995, арк. 8—9).

III. 1. 981. **КНІЖНІК** Габрыэль Беркаў, у 1882 г. паступіў вучнем да мсціслаўскага гадзіннікавага майстры І. І. Агаронта; у 1886—1889 гг. падмайстра гадзіннікавых спраў у віцебскага майстры Г. Левіна; атрымаў пасведчанне маскоўскай рамеснай управы маскоўскага срэбраніцкага цэха на права займацца гадзіннікавым рамяством з 01.02.1891 па 27.11.1891; у кастрычніку 1891 г. віцебская рамесная ўправа выдала яму атэстат на права займацца гадзіннікавым рамяством (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 455, арк. 53—56); 02.12.1891 прасіў віцебскую рамесную ўправу аб «пералічэнні» яго з віцебскага гадзіннікавага ў срэбраніцкі цэх, прашэнне было задаволена (тамсама, арк. 105—110); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 659, арк. 10).

III. 1. 982. **КОГАН** Гірша Ізраілевіч, навагародскі мешчанін, нарадзіўся ў 1865 г.; 24.05.1879 запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага ювеліра *Л. Эпштэйна* (L—V, № 2.488).

III. 1. 983. **КОПЕЛЕЎ** Шлёма, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 2-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41).

III. 1. 984. **КОСЕЛЬ** Абрам Штэр Лейбаў, «во...ломірскі» мешчанін; 01.05.1890 запісаны «па гравёрным рамястве» ў майстры менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха; прадставіў ва ўправу цэха пасведчанне харкаўскай рамеснай управы аб званні падмайстры і пробную працу (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 519, арк. 1 зв.).

III. 1. 985. **КОЎНАН** Даніэль Моўшавіч, рэжыцкі майстра залатых і срэбраных спраў, жыў у мяст. Люцын; у 1824 г. люцынскім гарадавым адпраўлены рапарт у Віцебскую пробірную палатку аб тым, што Д. Коўнан працуе без штэмпеляў для кляймення вырабаў (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 245).

**КОЎНЕР**, гл. **КАЎНЕР**

III. 1. 986. **КРАВЕЦ** Абрам Хайм Вульфаў, свянцянскі мешчанін; 18.07.1889 запісаны вучнем на тэрмін у 3 г. да віленскага ювеліра Б. Рафелькса (L—V, № 2.515).

III. 1. 987. **КРУМ** Ян, сын Яна, нарадзіўся ў 1773 г. у Гародні; 05.07.1790 запісаны вучнем да віленскага злотніцкага майстры Я. Гёрыца; у 1795 г. атрымаў званне падмайстры, у 1806 г. — майстры, прыняты ў віленскі злотніцкі цэх; памёр у 1809 г. (L—V, № 2.529).

III. 1. 988. **КРУЧКОВІЧ** Абрам-Янкель Залманаў, мсціслаўскі мешчанін; у 1880—1883 гг. вучыўся ў *Б. Таўбіна*; 08.08.1883 атрымаў пасведчанне з правам работы на 1 г. майстрам залатых і срэбраных спраў у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 7, арк. 156—158);

30.06.1885 — яшчэ на 1 г. (тамсама, спр. 14, арк. 5 зв.); 07.02.1888 атрымаў пасведчанне майстры гадзіннікавых і залатых спраў на тэрмін у 1 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 24, арк. 37).

III. 1. 989. **КРУЧКОВІЧ** Залман Нохем'еў, мсціслаўскі мешчанін; 09.12.1884 прыняты майстрам гадзіннікавых і залатых спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 5); 04.01.1886, 03.02.1887 і 07.02.1888 атрымліваў пасведчанне аб прыналежнасці да цэха (тамсама, арк. 7 зв., 8 зв., 9 зв.).

III. 1. 990. **КРУЧКОВІЧ** Залман Фішэлеў, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 2-й частцы г. Віцебска на вул. Замкавай (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41); у 1893 г. мае вучня *А. Берыльмана* (тамсама, спр. 510, арк. 84 зв.); у 1897—1898 гг. фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 11).

III. 1. 991. **КРУЧКОВІЧ** Лейба (Лейзік) Залманаў, мсціслаўскі мешчанін; 28.05.1887 прыняты майстрам залатых і срэбраных спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 9); 16.12.1888 атрымаў пасведчанне аб сваім знаходжанні ў цэху; 15.07.1890 выключаны з цэха (тамсама, арк. 9 зв.).

III. 1. 992. **КРУЧКОВІЧ** Янкель Залманаў, мсціслаўскі мешчанін; 30.06.1885 запісаны майстрам залатых і гадзіннікавых спраў у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў мсціслаўскай агульнай рамеснай управы на тэрмін у 1 г.; 04.01.1886 званне пацверджана (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 5, 6).

III. 1. 993. **КРЭЙДЭЛЬ (КРЭЙДЗІН)** Абрам Ёсіпавіч, менскі мешчанін; у 1847 г. прыняты майстрам менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха, у сувязі з беднасцю вызвалены ад уступнага ўзносу; прыняў на сябе абавязкі не браць вучняў і чаляднікаў (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 2 зв.); у 1849 г. значыцца ў спісе майстраў цэха (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 2 зв.); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, спр. 770, арк. 2); у 1870 г. працаваў без работнікаў, меў установу ва ўласным доме на вул. Захар'еўскай (тамсама, ф. 1, воп. 3, спр. 1, арк. 61 зв. — 62); у 1890 г. фігуруе як майстра цэха злотніцка-срэбраніцкага рамяства (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1); 30.12.1894 атрымаў пасведчанне на права рабіць залата-срэбраныя і ювелірныя вырабы ў Менску ў 1895 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 721, арк. 12); у студзені 1898 г. атрымаў пасведчанне на права займацца рамяством у 1898 г. (тамсама, спр. 797, арк. 1).

III. 1. 994. **КРЭЙДЭЛЬ (КРЭЙДЗІН)** Ёсель Сролеў, менскі срэбраных спраў майстра, нарадзіўся ў 1804 г.; у 1852 г. мае сыноў Абрама 28 гадоў і Зэльмана 8 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 844 зв. — 845).

III. 1. 995. **КРЭЙДЭЛЬ** Лейба Зусеў, залатых спраў майстра, нарадзіўся ў 1879 г., пісьменны; у 1899 г. менскі мешчанін, пражываў на вул. Захар'еўскай у доме Гольдберга; унесены ў спісы

асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 3618, арк. 190 зв. — 191).

III. 1. 996. **КРЭЙНДЭЛЬ** Зусель Ёселеў, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1834 г.; у 1890 г. майстра цэха злотніцка-срэбраніцкага рамяства (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1), таварыш старшыні менскага злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага цэха (тамсама, спр. 519, арк. 1 — 1 зв.).

III. 1. 997. **КРЭСЮК** Моўша Лейбаў, мешчанін Пінскага пав. Менскай губ., нарадзіўся ў 1808 г.; залатых, бляхарных і медных спраў майстра; у 1852 г. меў сына Хайма 11 гадоў, брата Давіда 39 гадоў, жыў у Пінску (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2482, арк. 115 зв. — 116).

III. 1. 998. **КУГЕЛЬ** Абрам Вульф Янкелеў, нарадзіўся ў 1883 г., залатых спраў майстра, пісьменны; у 1904 г. менскі мешчанін, пражываў на вул. Багадзельнай у доме Іргера; унесены ў спісы асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 4150, арк. 84 зв. — 85).

III. 1. 999. **КУГЕЛЬ** Рубін Абрамавіч, менскі мешчанін; у 1849 г. значыцца майстрам ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, арк. 2).

III. 1. 1000. **КУЗЬМЕНКА** Леў Міхайлавіч, полацкі купец II гільдыі; жыў на вул. Віцебскай ва ўласным доме, трымаў лаўку залатых і срэбраных вырабаў, меў аднаго прыказчыка; 30.12.1894 прайшоў рэгістрацыю на права займацца сваёй дзейнасцю на наступны 1895 год; штогадовыя траты на памяшканне — 600 рублёў, на кватэру — 200 рублёў (НГАБ у Мінску, ф. 2523, воп. 1, спр. 6, арк. 62 зв. — 63).

III. 1. 1001. **КУКІН** ... гарадзенскі майстра залатых спраў; 26.11.1863 удзельнічаў у таргах Гарадзенскай пробернай установы (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 2180, арк. 1 зв.).

III. 1. 1002. **КУПОРБІН** Залман Шаломавіч, мешчанін Пінскага пав. Менскай губ., нарадзіўся ў 1825 г.; залатых, бляхарных і медных спраў майстра; у 1852 г. жыў у Пінску (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2482, арк. 115 зв. — 116).

III. 1. 1003. **КУСЕЛЬ** Кушэль Гіршаў, менскі «ювилерскі» майстра, нарадзіўся ў 1803 г.; у 1852 г. меў сына Мойшу 28 гадоў, жыў у Рагачове (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 291 зв. — 292).

III. 1. 1004. **КУФМАН** Гірша Хацкелевіч, смілавіцкі мешчанін Ігуменскага пав.; 23.01.1847 прыняты падмайстрам ювелірнага цэха г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 2 зв.); у 1849 г. значыцца падмайстрам (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.).

III. 1. 1005. **КУШЭЛЬ** Вульф, радашковіцкі мешчанін; 15.06.1874 прыняты майстрам у цэх злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства г. Менска, вучыўся ў майстры *Х. Бамштэйна* (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 164, арк. 9 зв.).

III. 1. 1006. **ЛАЗЕРСОН** Абрам, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.).

III. 1. 1007. **ЛАНІН** Аўсей Ёселеў, мсціслаўскі мешчанін, майстра; у 1880—1883 гг. у яго вучыліся «часовых и золотых дел мастерству» мсціслаўскія мяшчане *Е. Генькін* і яго сын *С. Генькін*

(НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 7, арк. 66—68).

III. 1. 1008. **ЛАНІН** Аўсей Ёсіфаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на час рэвізіі меў 36 гадоў, яго жонка Геня Гілкаўна — 27 гадоў, іх дачка Хая Рохля — 8 гадоў і сын Гілька — 1 год, меў брата Беньяміна (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 75 зв. — 76).

III. 1. 1009. **ЛАНІН** Беньямін (Веньямін) Аўсееў, мсціслаўскі мешчанін, запасны радавы 115-га пяхотнага Вяземскага палка; 25.03.1885, пасля іспытаў у мсціслаўскага майстры *Б. Таўбіна*, прыняты ў цэх; 02.08.1886 залічаны майстрам залатых і срэбраных спраў тэрмінам на неабмежаваны час у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў; у 1888 г. «старшыня гадзіннікавых і залатых спраў» (тамсама, спр. 24, арк. 30, 37, 40), 15.10 выключаны з цэха (тамсама, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 6 зв.).

III. 1. 1010. **ЛАНІН** Беньямін Ёсіфаў, нарадзіўся каля 1817 г., майстра залатых і срэбраных спраў; у кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г. запісана, што памёр у 1855 г.; на час рэвізіі яго сыну Янкелю 14 гадоў; другі сын, Сымон, нарадзіўся каля 1847 г., памёр у 1852 г.; меў брата Аўсея (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 75 зв. — 76).

III. 1. 1011. **ЛАНІН** Гілька Аўсееў, мсціслаўскі мешчанін; у 1878—1883 гг. вучыўся прафесіі на працягу 5 г. у майстры *Е. Ланіна*; 11.06.1883 атрымаў пасведчанне з дазволам работы майстрам-злотнікам на 1 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 7, арк. 162—164).

III. 1. 1012. **ЛАНІН** Евель Ёселеў, мсціслаўскі мешчанін, майстра залатых спраў мсціслаўскага цэха залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў; у 1878—1883 гг. меў вучня з тутэйшых мяшчан — *Г. Ланіна* (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 7, арк. 162—164).

III. 1. 1013. **ЛЕАНОВІЧ** Мікалай, полацкі мешчанін, майстра залатых і срэбраных спраў у 1817 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 37 зв.).

III. 1. 1014. **ЛЕВІК** Абрам-Шмуйла Лейбавіч, менскі мешчанін; 06.08.1887 запісаны падмайстрам у злотніцка-срэбраніцкі цэх пад «удостоверение» свайго бацькі (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 337, арк. 1); у 1890 г. майстра цэха злотніцка-срэбраніцкага рамяства (тамсама, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 1015. **ЛЕВІК** Лейба Абрамавіч; з 01.12.1851 вучань майстры *Шмуйлы Левіка* (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 29, арк. 1); 01.12.1852 прыняты майстрам у срэбраніцкі цэх г. Менска (тамсама, спр. 33, арк. 6 зв.); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2); 06.08.1887 хадайнічае аб запісе ў злотніцка-срэбраніцкі цэх свайго сына *А.-Ш. Левіка* (тамсама, спр. 337, арк. 1); у 1890 г. таварыш старшыні цэха (тамсама, спр.519, арк. 2).

III. 1. 1016. **ЛЕВІК (ЛЕВІН)** Шая Лейбавіч, менскі мешчанін; у 1844—1849 гг. майстра ювелірнага і злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1; тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49); у 1849 г. майстра срэбраніцкага цэха, у спісах дадаткова

пазначана: «у старых кнігах запісаны медніцкім майстрам» (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49); у 1854 г. майстра (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 1017. **ЛЕВІК** Шмуйла Лейбавіч, менскі мешчанін; у 1847—1849 гг. майстра, падстаршыня ювелірнага цэха г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 2 зв. — 3); у 1849 г. у спісах дадаткова пазначана: «у старых кнігах запісаны медніцкім майстрам» (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49); у 1851 г. меў вучня *Л. Левіка* (тамсама, ф. 10, воп. 1, спр. 29, арк. 1); 04.04.1852 прыняты майстрам у срэбраніцкі цэх (тамсама, спр. 33, арк. 6 — 6 зв.).

III. 1. 1018. **ЛЕВІН** Абрам Шмуйла, менскі мешчанін; у 1890 г. падмайстра менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 1019. **ЛЕВІН** Берка Ёселеў, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1867 г., залатых спраў майстра, пісьменны; у 1887 г. пражывае ў г. Менску на вул. Аляксандраўскай у доме Ялені, унесены ў спісы асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 1696, арк. 9).

III. 1. 1020. **ЛЕВІН** Борух, менскі мешчанін; у 1849 г. старшыня майстраў ювелірнага цэха г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.).

III. 1. 1021. **ЛЕВІН** Гірша Сролевіч, маладзечанскі мешчанін; 06.06.1889 запісаны вучнем на тэрмін у 5 г. да віленскага ювеліра А. Ёхельсона, заплаціў вучнёўскія ўступныя ў памеры 50 капеек (L—V, № 2.563).

III. 1. 1022. **ЛЕВІН** Давід, менскі мешчанін; у 1849 г. значыцца падмайстрам ювелірнага цэха г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.).

III. 1. 1023. **ЛЕВІН** Ёсель Хаймавіч, менскі мешчанін, злотнік; у 1851 г. меў узрост 33 гады (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 6); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 3).

III. 1. 1024. **ЛЕВІН** Іцка, ашмянскі мешчанін; 03.01.1891 запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага ювеліра А. Шліёзберга (L—V, № 2.564).

III. 1. 1025. **ЛЕВІН** Лейба Еўнаў, нарадзіўся ў 1806 г., менскі «ювилерскі» майстра (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 287 зв. — 288).

III. 1. 1026. **ЛЕВІН** Хайм Аўсееў, менскі «ювилерскі» майстра, нарадзіўся ў 1798 г.; у 1852 г. меў сыноў Ёселя 35 гадоў і Сроля 16 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 288 зв. — 289).

III. 1. 1027. **ЛЕВІН** Цэмах Давідавіч, паходзіў з Воранава Лідскага пав.; 24.05.1884 запісаны вучнем на тэрмін у 4,5 г. да віленскага злотніка М. Ш. Медайскага (L—V).

III. 1. 1028. **ЛЕВІН** Шмуйла Лейбаў, менскі «ювилерскі» майстра, нарадзіўся ў 1814 г. (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 286 зв. — 287); магчыма, гэта тая ж асоба, што і *Левік Шмуйла Лейбавіч*.

III. 1. 1029. **ЛЕВІТ** Лейба Шмуйлаў, полацкі купец ІІ гільдыі, жыў на вул. Віцебскай у доме Мінкова, трымаў магазін гадзіннікаў, залатых і срэбраных вырабаў; прайшоў рэгістрацыю на права займацца сваёй дзейнасцю на наступны 1895 год; 30.12.1894 меў гадавы абарот 2000 рублёў, рэнтабельнасць 10% з кожнага рубля; плаціў штогадова за памяшканне 70 рублёў і наём кватэры 80 рублёў; на час праходжання рэгістрацыі ён і яго жонка Шыфра мелі




*Адбітак пячаткі полацкіх евангелістаў (павялічаны). Сярэдзіна XIX ст.*

па 44 гады, іх дзеці: Нохім 21 года, Меер 18 гадоў, Рохля-Лея 16 гадоў, Сімха 14 гадоў, Шмуйла 10 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 2523, воп. 1, спр. 6, арк. 51 зв. — 52).

III. 1. 1030. **ЛЕДЭР** Фрым Ёселевіч; у 1850—1852 гг. вучань старшыні менскага злотніцкага ювелірнага цэха *М. Тэйсава* (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 29, арк. 1).

III. 1. 1031. **ЛЕЕР** Абрам Копель Ёселеў, менскі мешчанін 22 гадоў, жыў на вул. Садовай у доме Барысевіча; 19.01.1900 просіць выдаць яму сведчанне майстры гравёра-літографа; экспертная камісія прысвоіла яму званне рамеснага работніка (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 955, арк. 4—6).

III. 1. 1032. **ЛЕЙКІН** Іцка, віцебскі мешчанін, падмайстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41 зв.).

III. 1. 1033. **ЛЕЙТЭС** Берка Рафаілаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 35 гадоў, меў жонку Зыслю Лейбаўну 33 гадоў і трох дачок: Сіму 7 гадоў, Бейлю 6 гадоў і Іту 3 гадоў, а таксама брата Янкеля (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 72 зв. — 73).

III. 1. 1034. **ЛЕЙТЭС** Янкель Рафаілаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 38 гадоў, меў жонку Гісю Беркаўну 39 гадоў, дачок — Хаю-Песю 18 гадоў і Мерыім 7 гадоў і сына Сымона 6 гадоў, а таксама брата Берку 35 гадоў; у 1859 г. уся сям'я «пералічана» ў крэменчужскія мяшчане (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 72 зв. — 73; тамсама, спр. 46, арк. 55 зв. — 56).

III. 1. 1035. **ЛЕЙЧЫН** Берка Шмуйлаў, віцебскі майстра; 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 10 зв.).

III. 1. 1036. **ЛЕЙЧЫН** Гірша Лейбаў, віцебскі мешчанін, жыў у 2-й частцы Віцебска па вул. Смаленскай; 20.02.1899 па 20.02.1902 вучань у свайго бацькі, віцебскага майстры *Л. Лейчына*; 20.05.1902 атрымаў званне падмайстры віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 819, арк. 48 — 52 зв.).

III. 1. 1037. **ЛЕЙЧЫН** Еўна Лейбаў, віцебскі мешчанін; у 1887 г. атрымаў у віцебскай агульнай рамеснай управе пасведчанне падмайстры злотніцка-срэбраніцкага майстэрства (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 335, арк. 261); 08.02.1890 яму выдалі атэстат «вечнага» майстры золата-срэбраных спраў (тамсама, спр. 343, арк. 4 зв. — 5); у 1892 г. згадваецца ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50); у 1893 г. падмайстра свайго бацькі *Л. Х. Лейчына*, з якім жыў разам (тамсама, спр. 510, арк. 83); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 10 зв.).

III. 1. 1038. **ЛЕЙЧЫН** Ёсель, у 1892 г. фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 522, арк. 5).

III. 1. 1039. **ЛЕЙЧЫН** Лейба Есманаў, янавіцкі мешчанін Віцебскай губ., май-

стра віцебскай злотніцка-срэбраніцкай управы; 06.09.1897 гарадскім старастам выдадзена пасведчанне віцебскім уладам аб тым, што ён не быў пад судом (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 659, арк. 30).

III. 1. 1040. **ЛЕЙЧЫН** Лейба Залманаў, віцебскі мешчанін, майстра злотніцка-срэбраніцкай управы; 09.09.1897 абраны старшынёй цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 659, арк. 38); 03.06.1897 адхілены ад пасады па заяве майстраў, якія не прымалі ўдзел у працэдуры абрання (тамсама, арк. 38 зв.).

III. 1. 1041. **ЛЕЙЧЫН** Лейба Хаймаў, віцебскі мешчанін, майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха; запісаны ў цэх 13.03.1877 (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2 зв.); у 1892 г. фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў (тамсама, спр. 476, арк. 83; тамсама, спр. 522, арк. 5 зв.); згадваецца ў спісе майстраў цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50); у 1893 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Смаленскай, трымаў падмайстру — свайго сына *Е. Леўчына* (тамсама, спр. 510, арк. 83); у 1889—1892 гг. меў вучня, а ў 1892—1895 гг. — падмайстру *З. Фішкінда*, 16.03.1894 атрымаў гадавы дазвол на права гандлю залатымі і срэбранымі вырабамі (тамсама, спр. 505, арк. 96); 24.05.1894 абраны на пасаду таварыша старшыні віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (тамсама, спр. 522, арк. 1 — 1 зв.); 26.05.1895 прысутнічаў падчас канфіскацыі рэчаў і прылад працы рамесніка *І.-Ю. Шэфтэля* (тамсама, спр. 626, арк. 4).

III. 1. 1042. **ЛЕНБЕРГ** Нахман Лейбаў, віцебскі мешчанін; у 1909 г. атрымаў пасведчанне на права займацца злотніцка-срэбраніцкім рамяством у г. Віцебску (НГАБ у Мінску, ф. 2496, воп. 1, спр. 2458, арк. 27).

III. 1. 1043. **ЛЕСНІК** Іцка Калманавіч, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1825 г.; у 1849 г. значыцца майстрам ювелірнага цэха г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.); у 1852 г. меў сына Калмана «2 ¾ года» (тамсама, спр. 462, арк. 288 зв. — 289); у 1854г. згадваецца як майстра (тамсама, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 1044. **ЛЕСНІК** Хонан, менскі мешчанін, у 1890 г. майстра менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1); 30.12.1894 атрымаў дазвол на права займацца рамяством у 1895 г. (тамсама, спр. 721, арк. 9).

III. 1. 1045. **ЛЕФАЙ** Міхаэль, гарадзенскі майстра залатых спраў; у ліпені-жніўні 1822 г. па прадстаўленні гарадзенскага пробера *І. Міхаэліса* яму забаронена займацца рамяством, таму што ён працаваў без дазволу пробернай палаткі (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 1, спр. 2670).

III. 1. 1046. **ЛІБЕРАЙХШТАТ** Іцка Мееравіч, віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў у 1818 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк.57).

III. 1. 1047. **ЛІБСОН (ЛІБЕНСОН)** Абрам Ізраілеў, віцебскі мешчанін; у 1907 г. атрымаў пасведчанне на права займацца злотніцка-срэбраніцкім рамяством (НГАБ у Мінску, ф. 2496, воп. 1, спр. 2458, арк. 26 зв.).

III. 1. 1048. **ЛІБСОН** Берка, менскі мешчанін, майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха ў 1890 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 1049. **ЛІБСОН** Залман, віцебскі злотніцкі майстра; у 1840—1850-я гг.

рамяством не займаўся (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 12 зв.).

III. 1. 1050. **ЛІБСОН** Шая, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 3-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41).

III. 1. 1051. **ЛІПКОВІЧ** Шлёма Саламон Ярухавіч, крэўскі мешчанін; 03.03.1895 запісаны вучнем на 4 г. да віленскага ювеліра М. Адэльсона; у 1900 г. пачынае працаваць падмайстрам у майстэрні А. Дзіка (L—V, № 2.595).

III. 1. 1052. **ЛІПМАН** Мордух Рэ... мсціслаўскі мешчанін мяст. Зафрына; 19.09.1887 прыняты майстрам залатых і срэбраных спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 9 зв.).

III. 1. 1053. **ЛІПМАН** Моўша Ёселеў, нарадзіўся ў 1841 г. у Радашковічах, вучыўся ў Вільні; 31.12.1862 атрымаў дазвол працаваць з дыяментамі; у 1875—1881 гг. рэгулярна фіксуецца Віленскай пробернай палаткай; у 1882 г. зарэгістраваны ў Ковенскай пробернай палатцы; пасля 1884 г. яго імя фігуруе ў дакументах віленскага яўрэйскага злотніцкага цэха (L—V, № 2.597).

III. 1. 1054. **ЛІТАРГАН** Вульф Літманаў, «старинный здешний» мешчанін г. Веліжа, нарадзіўся ў 1777 г., майстра злотніцкага рамяства; у 1827 г. меў драўляны дом у Веліжы (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 1, спр. 240, арк. 145 зв.— 146).

III. 1. 1055. **ЛІТМАН** Іцка Фо...аў, мсціслаўскі мешчанін мяст. Захарына; 18.11.1885 прыняты майстрам залатых спраў тэрмінам у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 6).

III. 1. 1056. **ЛІТМАН** Кушэль, [вілейскі] мешчанін; у 1890 г. менскі майстра залатых і срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 1057. **ЛІТМАН** Мордух Рафаілаў, мсціслаўскі мешчанін мяст. Зофрына; у 1879 г. да яго ў вучні запісаны *А. Карэліцкі*; 19.09.1888—18.08.1889 запісаны майстрам залатых і срэбраных спраў у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў мсціслаўскай агульнай рамеснай управы на тэрмін у 1 г.; 15.10.1888 выключаны з цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 9 зв.).

III. 1. 1058. **ЛІФШЫЦ** Сроль Фрайман, мешчанін Пінскага пав. Менскай губ., нарадзіўся ў 1819 г.; залатых, бляхарных і медных спраў майстра; у 1852 г. жыў у Пінску (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2482, арк. 115 зв. — 116).

III. 1. 1059. **ЛІХТЭНШТЭЙН** Янкель Ёсіфавіч; у 1818 г. віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 57).

III. 1. 1060. **ЛІЦВІН** Захары... Іцка... мсціслаўскі мешчанін, 18.11.1885 прыняты майстрам залатых спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 6).

III. 1. 1061. **ЛОКЛІН** Янкель Абрамавіч, клімавіцкі мешчанін мяст. Шумятычы; 14.07.1888 атрымаў пасведчанне на званне падмайстры залатых і срэбраных спраў на тэрмін у 1 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 24, арк. 113).

III. 1. 1062. **ЛУКОМНІК** Іцка, віцебскі мешчанін, майстра золата-срэбраных

спраў; фігуруе ў спісе майстраў 1877—1886 гг. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2).

III. 1. 1063. **ЛУКОМНІК** Янкель, мешчанін Магілёўскай губ., нарадзіўся ў 1818 г.; каля 1848 г. атрымаў дазвол займацца злотніцка-срэбраніцкім рамяством у Віцебску (НГАБ у Мінску, ф. 1430, воп. 1, спр. 17469, арк. 1 зв.); віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1840—1850-я гг. жыў ва ўласным доме на вул. Афіцэрскай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13); у 1860 г. жыў у 3-й частцы г. Віцебска (тамсама, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41 зв.); у 1863 г. пражываў ва ўласным драўляным доме на вул. Афіцэрскай, 418; меў жонку Фейгу 40 гадоў, сына Іцку 16 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 2631, воп. 2, спр. 2, арк. 733 зв.); у 1866 г. трымаў майстэрню ў тым жа доме, працаваў «без наёмных работнікаў» (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 108, арк. 27 зв. — 28).

III. 1. 1064. **ЛУР'Е** Орлік Абрамавіч, магілёўскі абывацель, рэзчык пячатак; у 1799 г. выразаў 132 пячаткі для «прысутных месцаў» [афіцыйных, дзяржаўных устаноў] Беларускай губ.

III. 1. 1065. **ЛУР'Е** Хайм Аронаў, шклоўскі мешчанін Магілёўскай губ.; 29.09.1885 запісаны ў падмайстры віцебскага злотніцкага цэха рэзчыкам пячатак (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 7); 02.10.1885 атрымаў пасведчанне на права займацца рамяством (тамсама, спр. 314, арк. 193).

III. 1. 1066. **ЛУР'Е** Хайм-Шая Шмуйлаў-Іцкаў, віцебскі майстра ў 1897—1898 гг.; фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 11 зв.).



*Адбітак пячаткі места Шклова, выразанай у 1792 г.*

III. 1. 1067. **ЛЮБАЛІН** Шлёма Мееравіч, менскі мешчанін; да 1844 г. згадваецца як майстра злотніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1), у 1844—1846 гг. — як старшы цэха (тамсама, арк. 1 зв., 4 зв.), у 1854 г. — як майстра (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 3).

III. 1. 1068. **ЛЮБАЛЬ** Шлома, менскі мешчанін; у 1849 г. значыцца майстрам ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49).

III. 1. 1069. **ЛЮБАНІН** Шмойла Мееравіч, менскі мешчанін, майстра срэбраніцкага цэха; у 1846 г. падстаршыня менскага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 1 зв.); 28.03.1852 мае вучня *Е. Файна* (тамсама, арк. 3—4).

III. 1. 1070. **ЛЮТАСТАНСКІ** Іосіф Вікенцьевіч, жыхар Беластоцкай вобл., майстра залатых спраў; называе сябе

«дваранінам Бельскага пав.»; жыў у Пецярбурзе разам з жонкай Фёклай; 11.08.1866 просіць Гарадзенскае губернскае праўленне выдаць яму пасведчанне аб дваранскім паходжанні для запісу «навечна» ў пецярбургскі цэх срэбраніцкага рамяства; праўленне раіць яму як «незацверджанаму ў дваранстве» запісацца ў падатковае саслоўе (НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 38, арк. 1301—1311).

III. 1. 1071. **ЛЯЙБОВІЧ** Невах, злотнік нясвіжскі; у 1801 г. згадваецца ў іску нясвіжскага катлярскага цэха да новастворанага нясвіжскага цэха злотнікаў (НГАБ у Мінску, ф. 530, воп. 3, спр. 1, арк. 23 зв. — 29).

II. 1. 1072. **ЛЯНДА** Абрам-Янкель Шаломаў, нясвіжскі мешчанін, вучань менскага майстры *Е. Цэйтліна*; 09.08.1890 прыняты падмайстрам у менскі цэх злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 519, арк. 2 зв.).

III. 1. 1073. **МАГІЛЕНСКІ** Нохім Ёселеў, нясвіжскі мешчанін, рамеснік злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства; 11.07.1885 запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да ўдавы віленскага злотніка Ш. Золігмана, заплаціў 30 капеек уступнага (L—V, № 2.680); 17.01.1894 звярнуўся з прашэннем у менскую спрошчаную рамесную ўправу аб выдачы яму пасведчання на права займацца рамяством, якое атрымаў 19.01.1894 (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 721, арк. 1—3); 19.01.1898 яму выдалі пасведчанне займацца рамяством на гэты год (тамсама, спр. 791, арк. 1).

III. 1. 1074. **МАЗІЯ** Ісер Ёселевіч, злотнік м. Нясвіж Слуцкага пав.; у 1816 г., паводле рэвізскай казкі мяшчан-яўрэяў, яму 38 гадоў, яго жонцы Вітцы — 36 (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 220, арк. 662 зв. — 663).

**МАЙЗЭЛЬ**, гл. **БЛЮМКІН**

III. 1. 1075. **МАЙМІН** Копель Лейбаў, віцебскі мешчанін, майстра залатых і срэбраных спраў; у 1840—1850-я гг. жыў ва ўласным доме на вул. Каменнай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13); у спісе майстраў 1877—1886 гг. значыцца як памерлы да 1877 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 1 зв.).

III. 1. 1076. **МАЙМІН** Копель Лейбаў, віцебскі мешчанін, майстра золата-срэбраных спраў у 1892 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 476, арк.82 зв.; тамсама, спр. 522, арк. 5 зв.); у 1893 г. жыў у 2-й частцы г. Віцебска на вул. Магілёўскай (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 84).

III. 1. 1077. **МАКЕЕЎ** Фройм Капланаў, менскі «ювилерскі» майстра, нарадзіўся ў 1812 г.; у 1852 г. меў сына Абрама 14 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 288 зв. — 289).

III. 1. 1078. **МАЛКІН** Гірша, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.).

III. 1. 1079. **МАЛКІН** Танкель, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 39 зв.).

III. 1. 1080. **МАЛКІН** Яўсей, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.).

III. 1. 1081. **МАМІН** Лейба Мееравіч, віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў у 1818 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 57).

III. 1. 1082. **МАРГОЛІН** Гендэль Залманаў, менскі «ювилерскі» майстра, нарадзіўся ў 1810 г.; у 1852 г. меў сына Мордуха 23 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 290 зв. — 291); у 1854 г. згадваецца як менскі срэбраніцкі майстра (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 3).

III. 1. 1083. **МАРДУХОВІЧ** Файвіш, менскі мешчанін, падмайстра; памёр да 1844 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 1).

III. 1. 1084. **МАРДУХОВІЧ** Якаў, лепельскі мешчанін, срэбраных спраў майстра ў 1844 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2620, воп. 1, спр. 186, арк. 2).

III. 1. 1085. **МАРШАК** Кушэль Гершавіч, мешчанін мяст. Пухавічы Ігуменскага пав.; у лістападзе 1844 г. прыняты ў майстры злотніцка-срэбраніцкага цэха г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1 зв.).

III. 1. 1086. **МАСАЛАФ** Ізраіль Іцкаў, майстра залатых і срэбраных спраў, запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г., яго сям'я «пералічана ў купцы» (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 76 зв. — 77).

III. 1. 1087. **МАТЭСОВІЧ** Хайм, менскі мешчанін; 27.03.1852 заключыў дагавор з майстрам *Г. Рубенчыкам* на тэрмін у 2 г. і 9 мес. для абучэння «ювилерскіх дел мастерству» (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 7).

III. 1. 1088. **МАЎШОВІЦ** Ёсель Давідаў, стаўпецкі мешчанін, злотнік; у 1819 г., на час складання рэвізскай казкі, яму 19 гадоў, яго жонцы Рохлі — 18 (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 96, арк. 673 зв. — 674).

III. 1. 1089. **МАЎШОВІЧ** Хайм Іцкавіч, навагародскі мешчанін, менскі майстра залатых і срэбраных спраў у 1890 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1); 30.12.1894 атрымаў пасведчанне на права выпрацоўваць золата-срэбраныя і ювелірныя вырабы ў г. Менску ў 1895 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 721, арк. 14).

III. 1. 1090. **МАЎШОВІЧ** Юдэль Іцкавіч, майстра золата-срэбранага рамяства; 30.12.1894 атрымаў пасведчанне на права займацца рамяством у 1895 у г. Менску (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 721, арк. 16).

III. 1. 1091. **МАФЛІН** Вігдор Гіршаў, чэрыкаўскі мешчанін мяст. Крычаў, майстра, рэзчык пячатак; 07.02.1887 прыняты майстрам залатых спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў; пазнейшая пазнака — «за истечением года … из сего цеха» выключаны (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 7 зв.).

III. 1. 1092. **МАЦАКАНАЎ** Абрам, бабруйскі злотніцкі майстра; у 1845—1846 гг. абвінавачваецца менскім проберам *С. Анташкевічам* у тым, што разам з калегамі-землякамі ўхіляўся ад кляймення сваіх вырабаў, чым наносіў шкоду Казённай палаце і «обманывал публику»; на абвінавачванне ён тлумачыў, што ў сувязі з блізкасцю Магілёва ён знаходзіцца на ўліку ў тамтэйшай пробернай палатцы; апошняя не пацвердзіла гэтага факта (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 2500).

III. 1. 1093. **МАЦАНАЎ (МАЧАНАЎ)** Абрам Ёселеў, менскі мешчанін, нарадзіўся ў

1813 г., майстра цэха залатых спраў; у канцы 40-х — пачатку 50-х гг. XIX ст. фігуруе ў справе аб гандлі некаторымі бабруйскімі майстрамі некляймёнымі і сфальшаванымі вырабамі; быў у «ховрусе или товариществе» з *Ё. Протасам*; данёс уладам на свайго кампаньёна, які займаўся вырабам і рэалізацыяй нізкапробных залатых і срэбраных вырабаў (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 3923); у 1852 г. меў сыноў 8 гадоў і 6 гадоў, жыў у Бабруйску (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 291 зв. — 292).

III. 1. 1094. **МАЦКЕВІЧ** Янкель, ваўкавыскі майстра залатых і срэбраных спраў у 1862 г. (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 2180, арк. 182 зв.).

III. 1. 1095. **МАШКІН** Копель, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 2-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41).

III. 1. 1096. **МАШЭВІЦКІ** Шая Лейбавіч, навагародскі злотніцкі майстра, працаваў з віленскім ювелірам А. Шліёзбергам; пазней адбыў у Сібір; у 1894 г. атрымаў атэстат майстры; 26.10.1897 віленская рамесная ўправа выдала яму пасведчанне на права работы ў Вільні злотнікам (L—V, № 2.633).

III. 1. 1097. **МЕЕРАЎ** Шлома, злотнік нясвіжскі; у 1801 г. згадваецца ў іску нясвіжскага катлярскага цэха да новастворанага нясвіжскага цэха злотнікаў (НГАБ у Мінску, ф. 530, воп. 3, спр. 1, арк. 23 зв. — 29).

III. 1. 1098. **МЕЗГІСЕР** Ёсель Мордухаў, нарадзіўся каля 1838 г.; паводле рэвізіі 1850 г., фігуруе ў спісах сяброў мсціслаўскага злотніцка-срэбраніцкага цэха; меў брата *М. Мезгісера*; у 1854 г. прыняў хрысціянства (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 74 зв. — 75).

III. 1. 1099. **МЕЗГІСЕР** Моўша Мордухаў, нарадзіўся каля 1819 г., майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; у 1850 г. згадваецца яго сын Ізраіль; каля 1854 г. М. Мезгісер прыняў хрысціянства; меў брата *Ё. Мезгісера* (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 74 зв. — 75; тамсама, спр. 46, арк. 57 зв. — 58).

III. 1. 1100. **МЕЗІНСКІ** Берка Абрамаў, віцебскі мешчанін; у 1877—1880 гг. вучань у майстры *Я. Сіліцкага*; у 1880—1884 гг. падмайстра ў майстры Е. Гінты; у пачатку 1884 г. «подвергался испытанию через экспертов», майстраў *В. Свердлава, Б. Фактаровіча* і інш.; прыняты майстрам золата-срэбраных спраў 01.02.1884, з гэтага часу меў сваю майстэрню і вучняў; у 1893 г. жыў у 2-й частцы г. Віцебска на вул. Замкавай, трымаў падмайстру *М. Прускіна* (у 1888 г. — вучань у гэтага ж майстры) і вучняў *М. Каца* і *Ё. Шура* (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 84 зв.); у 1892 г. фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў (тамсама, спр. 522, арк. 5 зв.), згадваецца ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, што маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50); «ювелір г. Віцебска», цэхавы майстра, жыў у 2-й частцы г. Віцебска на вул. Замкавай у доме Вішняка; 13.01.1894 атрымаў гадавы дазвол на права гандлю залатымі і срэбранымі вырабамі (тамсама, спр. 505, арк. 44); 24.05.1894 абраны на пасаду старшыні віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (тамсама, арк. 1 — 1 зв.); атры-

маў дазвол на гандаль у 1895 г. (тамсама, арк. 114); 26.05.1895 прысутнічаў пры канфіскацыі рэчаў і прылад працы рамесніка *І.-Ю. Шэфтэля* (тамсама, спр. 626, арк. 4); у 1896 г. атрымаў атэстат на заняцце рамяством; у 1897—1898 гг. фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 10 зв.); з 01.03.1899 па 01.03.1902 вучыць свайго сына *В. Мезінскага*; у 1902 г. старшы віцебскага злотніцкага цэха, просіць віцебскую рамесную ўправу аб выданні атэстата, яго кваліфікацыю пацвердзілі майстры *П. Кабак, Р. Окунеў, Л. Лейчын, Я. Сіліцкі, Х. Лур'е, Н. Аліхоўскі* (тамсама, спр. 249, арк. 2 зв., 2а, 2б; тамсама, спр. 476, арк. 82 зв.).

III. 1. 1101. **МЕЗІНСКІ** Вульф Беркаў, віцебскі мешчанін; з 01.03.1899 па 01.03.1902 вучань свайго бацькі, віцебскага майстры *Б. Мезінскага*; атрымаў званне падмайстры віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха ў ліпені 1902 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 819, арк. 58 — 62 зв.).

III. 1. 1102. **МЕНДЗЕЛЕЎ** Моўша, бабруйскі майстра срэбраных спраў; у 1852 г. згадваецца ў справе аб гандлі некаторымі бабруйскімі майстрамі некляймёнымі і сфальшаванымі вырабамі (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 3923, арк. 3).

III. 1. 1103. **МЕНДЗЯЛЁВІЧ** Абрам, менскі майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха; памёр да 1844 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1).

III. 1. 1104. **МЕНКМАН** Хайм Шмуйлаў, дзісненскі мешчанін, майстра залата-срэбраных спраў; фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў 1877—1886 гг.; памёр каля студзеня 1878 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2 зв.).

III. 1. 1105. **МЕЯРОВІЧ** Юдэль, лідскі мешчанін; у 1849 г. унёс у віленскі яўрэйскі злотніцкі цэх 1,5 вучнёўскага ўступнага; 28.04.1852 запісаны на тэрмін у 3 г. падмайстрам да віленскага ювеліра А. Тэйца, 27.06.1852 — падмайстрам на тэрмін у 3 г. да віленскага ювеліра *Я. Барэлі* (L—V, № 2.645).

III. 1. 1106. **МІГАЛЬ** Раман Сямёнаў, «давідгародскі» злотнік; у 1795 г. яму 40 гадоў, яго жонцы Антаніне Піліпаўне — 30, маюць сыноў: Сямёна 6 гадоў і Пятра 3 гадоў; «подданыя тубыльцы» (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 57, арк. 135 зв. — 136).

III. 1. 1107. **МІЛІЙ** Моўша Ізраілевіч, менскі мешчанін; у 1849 г. значыцца майстрам менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20).

III. 1. 1108. **МІНО...** Моўша Сролеў, менскі «ювилерскі» майстра, нарадзіўся ў 1820 г.; у 1852 г. меў сына Хайма 3 гадоў і брата Шмойлу 27 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 287 зв. — 288).

III. 1. 1109. **МІНЦ** Зусман Сролевіч, менскі срэбраніцкі майстра ў 1854 г. (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 1110. **МІНЦ** Моўша, менскі мешчанін, майстра залатых і срэбраных спраў; у 1870 г. меў майстэрню на вул. Петрапаўлаўскай у доме Румянцавых (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 3, спр. 1, арк. 72 зв. — 73).

III. 1. 1111. **МІРКІН** Беньямін Зейдэль Ізраілеў, веліжскі мешчанін; з 20.05.1898 па 20.05.1901 вучань віцебскага майстры *Х. Алескера*; у пачатку чэрвеня 1902 г. атрымаў званне падмайстры віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха

(НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 819, арк. 53 — 57 зв.).

III. 1. 1112. **МІРКІН** Лейба, веліжскі мешчанін, «злотнік», нарадзіўся ў 1838 г.; у 1865 г. пражывае на вул. Новая Слабодка, 45; меў жонку Хану 23 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 2640, воп. 1, спр. 747, арк. 186 зв.).

III. 1. 1113. **МІТРАПАЛІТАНСКІ** Юнэс, падмайстэрскае пасведчанне атрымаў у Новагародку; 30.12.1898 віленская рамесная ўправа выдала яму пасведчанне на права работы ў Вільні ювелірам (L—V, № 2.678).

III. 1. 1114. **МІШКІНД** Айзік Давідаў, менскі «ювилерскі» майстра, нарадзіўся ў 1809 г.; у 1852 г. жыў у Бабруйску (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 291 зв. — 292).

III. 1. 1115. **МІШКІНД** Ёсель Насанаў, менскі «ювилерскі» майстра, нарадзіўся ў 1828 г.; у 1852 г. меў брата Шмуйлу (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 291 зв. — 292).

**МІШКІНД** Я., гл. **МУШКІН**

III. 1. 1116. **МОРЫТЦ** Фрыдрых, злотнік; у 1807 г. працаваў на нясвіжскі двор князёў Радзівілаў (L—V, № 2.686).

III. 1. 1117. **МОЎЧАН** Файбіш Шмуйлаў, новагародскі мешчанін, срэбранік, нарадзіўся ў 1778 г.; у 1806 г. меў жонку Мінку 26 гадоў, дачку Рыўку 2 гадоў; вучыўся ў Слоніме, жыў у Новагародку (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 184, арк. 6.).

III. 1. 1118. **МОШКІН** Шэба, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 2-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41).

III. 1. 1119. **МУЛЬНЕ** Гірша [Гуга] Шлаўмаў, нарадзіўся 19.06.1882, галадзічанскі мешчанін Курляндскай губ.; жыў у Менску на вул. Губернатарскай у доме Саламонава; 18.01.1900 атрымаў пасведчанне «рызкага» ювеліра І. Елістама аб тым, што адбыў у апошняга 3 г. вучнем і атрымаў кваліфікацыю майстры (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 911, арк. 6); 04.05.1900 Г. Мульне выдалі пасведчанне работніка злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства ў Менску (тамсама, арк. 5).

III. 1. 1120. **МУРАВІЧ** Беніцыян Мeeраў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 21 год, меў жонку Малку Залкінаву 20 гадоў, дачку Цыўю 2 гадоў і брата Ёселя (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 72 зв. — 73).

III. 1. 1121. **МУРАВІЧ** Ёсель Мeeраў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 29 гадоў, меў жонку Гіту 25 гадоў і брата Беніцыяна 23 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 72 зв. — 73).

III. 1. 1122. **МУШКІН (МІШКІНД)** Якаў Абрамавіч; у 1850 г. паступіў у вучні да майстраў *Г. Гарфінкеля* і *М. Глаза* на тэрмін у 5 г. (НГАБ у Минску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 6).

III. 1. 1123. **НАЙФАХ (НЕЙФАХ)** Іохіэль, менскі мешчанін; у 1890 г. майстра менскага цэха злотніцка-срэбраніцкага рамяства (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 1124. **НАСТ** ... менскі майстра срэбраных спраў у 1856—1877 гг. (РЗиСД, с. 201).

III. 1. 1125. **НАХІМОВІЧ** Леў Шмуйлаў, івянецкі мешчанін, жыў у Менску на вул. Падгорнай у доме Поляка; 15.10.1901 просіць аб прыпісцы яго да Менскага рамеснага таварыства і выдачы яму пасведчання на права адкрыцця майстэрні; хадайніцтва было задаволена 16.01.1902 (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 928, арк. 1—2).

III. 1. 1126. **НАХІМОЎСКІ** Абель, навагародскі мешчанін, нарадзіўся ў 1873 г.; 09.09.1887 запісаны ў вучні на тэрмін у 4,5 г. да віленскага ювеліра *Ш. Арановіча* (L—V, № 2.691).

III. 1. 1127. **НАХІМОЎСКІ** Шмуэль Язэпавіч, навагародскі мешчанін; 09.07.1875 запісаны ў вучні на тэрмін у 5 г. да віленскага ювеліра Д. Табачніка (L—V, № 2.692).

III. 1. 1128. **НЕЙМАРК** Гдаль Ісакавіч, беластоцкі мешчанін; «меў жыхырства» на вул. Купецкай у доме нашчадкаў Неймарка; 04.11.1898 просіць у гарадзенскага губернатара адкрыць на «общее имя» з *А. Зусмановічам* майстэрню для рэзкі пячатак і гравёрную ўстанову (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 9, спр. 828, арк. 6—7).

III. 1. 1129. **НЕЙФАХ** Айзік Ізраэлавіч, даўгінаўскі мешчанін; 25.12.1845 прыняты ў лік падмайстраў менскага ювелірнага цэха, у сувязі з беднасцю вызвалены ад уплаты ўступнага ўзносу (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 2); у 1849 г. значыцца майстрам менскага срэбраніцкага цэха (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.); у 1854 г. згадваецца як майстра (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2); 28.01.1898 атрымаў пасведчанне на права займацца рамяством у гэтым годзе (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 797, арк. 1).



*Адбітак пячаткі земскага суда Менскага пав.*

**НЕЙФАХ** І., гл. **НАЙФАХ**

III. 1. 1130. **НЕЙФАХ** Ізраэль Айзікавіч, менскі майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха; у 1854 г. згадваецца як майстра (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 1131. **НЕЙФАХ** Іохель Айзікаў, нарадзіўся каля 1874 г., залатых спраў майстра, пісьменны; у 1897 г. менскі мешчанін, пражывае на вул. Койданаўскай у доме Г. Гольдзіна; унесены ў спісы асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 3, спр. 53, арк. 99 зв. — 100).

III. 1. 1132. **НЕЙФАХ** Сроль Айзікавіч, менскі жыхар; 26.11.1845 паступіў у вучні на тэрмін у 1 г. да менскага майстры *А. Бейліна* (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 4 зв. — 5); у 1849 г. значыцца майстрам цэха (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20).

III. 1. 1133. **НЕЙФАХ** Сроль Айзікаў, койданаўскі мешчанін, нарадзіўся ў 1874 г., залатых спраў майстра, пісьменны; у 1890 г. пражывае ў г. Менску на «вул. Прэабражэнскай» у доме Вендорфа; унесены ў спісы асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 2744, арк. 164 зв. — 165).

III. 1. 1134. **НЕМЗЕР** Абрам, навагародскі мешчанін; 09.01.1891 запісаны ў вучні на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка А. Ш. Дрохнеса (L—V, № 2.695).

III. 1. 1135. **НЕМЗЕР** Лазар Хаймавіч, новагародскі мешчанін; 09.12.1886 запісаны ў вучні на тэрмін у 3,3 г. да віленскага ювеліра *Г. Адэльсона* (L—V, № 2.697).

III. 1. 1136. **НІСФАХ** Ізраэль, менскі мешчанін; у 1849 г. падстаршыня менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.).

III. 1. 1137. **НОВІКАЎ** Гершон Мееравіч, мсціслаўскі мешчанін; 24.06.1888 атрымаў пасведчанне на званне падмайстры залатых спраў у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў; раней быў запісаны вучнем маскоўскага ювелірнага цэха ў майстры Кагана (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 24, арк. 152—154).

III. 1. 1138. **НЯБОГА** [Небаго] Ёзаф Паўлаў, «старинный здешний» мешчанін г. Веліжа, нарадзіўся ў 1802 г.; у 1817 г. майстра срэбраніцкага рамяства (НГАБ у Мінску, ф.1416, воп. 4, спр. 837, арк. 10); у 1827 г. меў дом на вул. Крутой г. Веліжа (тамсама, ф. 1416, воп. 1, спр. 240, арк. 148 зв. — 149).

III. 1. 1139. **НЯМОЙЦІН** Мендэль Янкелеў, віцебскі мешчанін; у 1911 г. атрымаў пасведчанне на права срабрэння металічных рэчаў (НГАБ у Мінску, ф. 2496, воп. 1, спр. 2458, арк. 33).

III. 1. 1140. **НЯМЧОНАК** Меер, 24.05.1894 абраны малодшым майстрам віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 522, арк.1 — 1 зв.).

III. 1. 1141. **НЯМЧОНАК** (Немченко) Мендэль Файвішаў, віцебскі мешчанін, майстра золата-срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 476, арк. 83); у 1892 г. згадваецца ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50); у 1893 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Кавальнай (тамсама, спр. 510, арк. 83; тамсама, спр. 522, арк. 5); 16.01.1897 разам з майстрам *Я. Сіліцкім* падаў пратэст віцебскаму губернатару і патрабаванне адмяніць вынікі выбараў цэхавага старшыні ў сувязі з парушэннем працэдуры (тамсама, арк. 38 зв.); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 11).

III. 1. 1142. **ОКУНЕЎ** Абрам Нафтальеў, віцебскі мешчанін; у 1885 г. атрымаў пасведчанне ржэўскай рамеснай управы аб прызнанні яго майстрам; у 1876 г. запісаны майстрам залатых і срэбраных спраў і рэзчыкам пячатак у цэх г. Вышні Валачок; у 1885 г., пасля іспытаў[8] «в сложно иконописном» цэху

---

[8] Ржэўскія срэбраніцка-злотніцкія майстры, якія былі ў экзаменацыйнай камісіі: Сцяпан Пятроў Сафронаў, Самуіл Янкелеў Кузняцоў, Васіль Цімафеевіч Анісімаў; старшыня «сложно-иконописного» цэха — Ягор Захараў (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 455, арк. 29—30).

г. Ржэва, прызнаны майстрам залатых і срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 455, арк. 29—30); 09.10.1891 атрымаў атэстат «вечнага» майстры золата-срэбраных спраў віцебскай злотніцка-срэбраніцкай управы (тамсама); у 1897—1898 гг. фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 11 зв.); 21.12.1898, паводле прадпісання віцебскай рамеснай управы, выключаны з ліку майстраў за скупку крадзеных рэчаў (тамсама, спр. 343, арк. 5 зв. — 6).

III. 1. 1143. **ОКУНЕЎ** Елья Мендэлеў, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1840—1850 гг. жыў на вул. Афіцэрскай у доме Перальмана (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13); у 1853—1860 гг. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (тамсама, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40); у 1866—1868 гг. трымаў майстэрню на вул. Афіцэрскай у доме Перліна, працаваў «без наёмных работнікаў» (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 123, арк. 44 зв.); у спісе майстраў 1877—1886 гг. значыцца як памерлы (тамсама, спр. 249, арк. 2); у 1892 г. яго ўдава Шэйна Іцкаўна трымае падмайстру *Р. Окунева* (тамсама, спр. 510, арк. 83).

III. 1. 1144. **ОКУНЕЎ** Ліндан, віцебскі майстра злотніцкага цэха; у 1866 г. трымае майстэрню на вул. Афіцэрскай у доме Цэхавага (?), працуе «без наёмных работнікаў» (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 108, арк. 28 зв. — 29).

III. 1. 1145. **ОКУНЕЎ** Мендэль Мордухаў, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1841 г. фігуруе як цэхмістр залатых і срэбраных спраў у прашэнні віцебскіх злотнікаў на імя міністра фінансаў, каб быў пакінуты пры пасадзе проберны майстра *В. Розет* (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 8174, арк. 5); у 1840—1850-я гг. жыў на вул. Смаленскай у доме Цырыльсона (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 12 зв.); у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (тамсама, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 39 зв.); у 1868 г. трымаў майстэрню на вул. Смаленскай, працаваў «без наёмных работнікаў» (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 123, арк. 44 зв.); у спісе майстраў 1877—1886 гг. згадваецца як памерлы (тамсама, спр. 249, арк. 1 зв.).

III. 1. 1146. **ОКУНЕЎ** Мордух-Берка Ельеў, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40); 27.03.1885 прыняты ў майстры золата-срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 3); у 1892 г. фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў (тамсама, спр. 522, арк. 5 зв.), згадваецца ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 10 зв.).

III. 1. 1147. **ОКУНЕЎ** Нафталі Шлёмаў, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.); у 1892 г. згадваецца ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50); 03.06.1897 фігуруе

ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 11).

III. 1. 1148. **ОКУНЕЎ** Рувін Ельеў, віцебскі мешчанін, падмайстра ў свайго бацькі *Е. Окунева*; у 1893 г. жыў разам з маткай у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Смаленскай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 83).

III. 1. 1149. **ОКУНЕЎ** Ханон Мордухаў, нарадзіўся ў 1847 г.; у 1863 г. у Расіі на працягу 3 г. вучыцца на рэзчыка пячатак, пражывае разам з сям'ёй дзядзькі *Шломы Окунева* (НГАБ у Мінску, ф. 2631, воп. 2, спр. 2, арк. 109 зв.).

III. 1. 1150. **ОКУНЕЎ** Шлома Мендэлевіч, віцебскі мешчанін, нарадзіўся ў 1826 г., рэзчык пячатак; у 1863 г. пражывае разам з сям'ёй і пляменнікам *Х. Мордухавым* на вул. Смаленскай у доме А. М. Гінцбурга (НГАБ у Мінску, ф. 2631, воп. 2, спр. 2, арк. 109 зв.); у 1868 г. жыў на вул. Загацьевай (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 123, арк. 45); у спісе майстраў 1877—1886 гг. значыцца як памерлы (тамсама, спр. 249, арк. 2).

III. 1. 1151. **ОКУНЕЎ** Шмойла (Саламон), віцебскі злотніцкі майстра; у 1840—1850-я гг. жыў на вул. Смаленскай у доме Зельцэра (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13), працаваў у 1-й частцы горада; унесены ў «Памятную книжку Витебской губернии на 1861 г.».

III. 1. 1152. **ОРСІК** Антон Мікалаевіч, менскі рамеснік злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства; жыў на вул. Захар'еўскай у доме Чапскага; 28.03.1894 звярнуўся ў менскую спрошчаную рамесную ўправу за пасведчаннем на права займацца рамяством, якое атрымаў 30.03.1894 (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 721, арк. 4—6).

III. 1. 1153. **ПАГАРЭЛЬСКІ** ... менскі майстра срэбраных спраў у 1862—1866 гг. (РЗиСД, с. 201).

III. 1. 1154. **ПАГОЗІН** Моўша-Хайм Лейбаў, віцебскі мешчанін; каля 1885 г. запісаны ў лік падмайстраў віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 7).

III. 1. 1155. **ПАЗНЯК** Берка Файбішаў, веліжскі мешчанін, майстра залатых і срэбраных спраў у 1817 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 10).

III. 1. 1156. **ПАЗНЯК** Ёсіф Файбішавіч [Берка Файбішаў], «старинный здешний» мешчанін г. Веліжа, нарадзіўся ў 1799 г.; у 1817 г. майстра срэбраніцкага рамяства (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 10); у 1827 г. жыў у горадзе, свайго дома не меў (тамсама, воп. 1, спр. 240, арк. 149 зв. — 150).

III. 1. 1157. **ПАЗНЯК** Файбіш, веліжскі мешчанін, майстра залатых і срэбраных спраў; меў сына Берку 1817 г.н. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 10).

III. 1. 1158. **ПАЙКІН** Невух Руманавіч, у 1863 г. полацкі мешчанін, падмайстра «золотых дел мастеру», жыў на вул. Яўрэйскай у доме полацкай мяшчанкі ўдавы Бейлі Пайкінай; на той час яму 30 гадоў, яго жонцы Рэйзі — 24, дачцэ Басі — 6, Расі — 3, Росі — паўгода (НГАБ у Мінску, ф. 2523, воп. 1, спр. 5, арк. 44 зв.).

III. 1. 1159. **ПАЛІВА** Фрайм Калманавіч, менскі срэбраніцкі майстра ў 1854 г. (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 1160. **ПАЛЮТА** Антоні, майстра срэбраных спраў Гарадзенскай губ.; у кастрычніку 1822 г. звярнуўся разам з калегамі ў Літоўскае губернскае праўленне за дазволам выпускаць у

Гародні вырабы 72-й пробы замест 84-й, якую патрабавалі ўлады (НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 3, спр. 499).

III. 1. 1161. **ПАЛЯКОЎ** Берка Ельеў, клімавіцкі мешчанін мяст. Шумятычы; 20.01.1888 прыняты майстрам залатых спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў; 15.10.1888 выключаны з цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 8 зв.).

III. 1. 1162. **ПАЛЯКОЎ** Елья Шымонаў, клімавіцкі мешчанін мяст. Шумятычы; 17.03.1884 прыняты майстрам залатых спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 5).

III. 1. 1163. **ПАЛЯЧЭК** Мордух Хонавіч, лідскі мешчанін; 08.12.1881 запісаны ў вучні на тэрмін у 2 г. і 10 мес. да віленскага ювеліра Д. А. Гендлера; 01.10.1880 праз 1 г. і 2 мес. скончыў вучобу без наступнага працягу (L—V, № 2.762).

III. 1. 1164. **ПАНАРСКІ** Гілька Міхелеў, нарадзіўся каля 1812 г., майстра залатых і срэбраных спраў; у 1854 г. у кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства запісаны як памерлы; на час перапісу 1858 г. яго сыну Юдку 18 гадоў, брату *Ё. Панарскаму* — 44 (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 70 зв. — 71; тамсама, спр. 46, арк. 53).

III. 1. 1165. **ПАНАРСКІ** Гірша Міхелеў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на час рэвізіі яму 54 гады, яго жонцы Хаве — 30; у 1862 г. «пераліčаны» ў мелітопальскія купцы (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 73 зв. — 74; тамсама, спр. 46, арк. 56 зв. — 57).

III. 1. 1166. **ПАНАРСКІ** Ёсель Міхелеў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; брат *Гількі Міхелева*, на час перапісу яму 44 гады, меў жонку Рохлю Файбішаву і дачок: Лею — 9 гадоў і Фрэйгу — 3 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 70 зв. — 71).

III. 1. 1167. **ПАНЕС** Абрам Янкелевіч, мешчанін мяст. Рубяжэвічы Менскага пав., нарадзіўся ў 1833 г.; у 1852 г. пражывае ў Менску, 07.04 прыняты падмайстрам у тамтэйшы злотніцка-срэбраніцкі цэх (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 3 зв.).

III. 1. 1168. **ПАНСЕЎ** Еўфраім, менскі мешчанін; у 1849 г. значыцца майстрам менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20).

III. 1. 1169. **ПАРФЕНАЎ** Кірыла, суражскі мешчанін; займаўся нелегальна срэбраніцкай работай («немалым количеством») на даму ў віцебскага медніцкага майстры Юдкі Белінштэйна (разам з ім); у «кампаньёнаў» знойдзена срэбраная засцібка ад Евангелля, «деланная» К. Парфенавым, што належала да маёмасці Віцебскай Петрапаўлаўскай царквы (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 5, спр. 661, арк. 2, 15).

III. 1. 1170. **ПАШКОВІЧ** Германо... Іванавіч, дваранін; 20.10.1876 пераведзены ў падмайстры пасля шасцігадовага вучэння ў майстры *Л. Стаброўскага* (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 164, арк. 13).

III. 1. 1171. **ПЕ[ЗСН]АКОЎ** Ёсель, веліжскі мешчанін, майстра залатых

і срэбраных спраў у 1817—1821 гг. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 217); у 1821 г. згадваецца як злотніцкіх і срэбраных спраў майстра (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 217).

III. 1. 1172. **ПЕЙСАХОВІЧ** Ханон, у 1818 г. віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 57).

III. 1. 1173. **ПЕРАЛЬМАН** Моўша Шмуйлавіч, менскі мешчанін; у 1849 г. значыцца майстрам ювелірнага цэха г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 333, арк. 20).

III. 1. 1174. **ПЕРАЛЬМАН** Рафаіл Файбішаў, уздзенскі мешчанін, меў 26 гадоў ад нараджэння; 23.01.1890 атрымаў званне вучня ў маскоўскага майстры З. Рыўліна, скончыў вучобу 23.01.1891 (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 911, арк. 1 зв., 5); 27.11.1900 просіць менскую рамесную ўправу аб прыпісцы яго да рамеснага таварыства ў якасці рамесніка злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства і выдачы яму пасведчання на права адкрыцця майстэрні (тамсама, арк. 1 зв., 3—14).

III. 1. 1175. **ПЕРЛІН** Давід Моўшаў, мешчанін Пінскага пав. Менскай губ., нарадзіўся ў 1798 г.; залатых, бляхарных і медных спраў майстра; у 1852 г. меў сыноў: Цодыка 30 гадоў, Юдэля 24 гадоў, Меера 20 гадоў і Янкеля 14 гадоў, пляменнікаў: Зусьмана 31 года і Сроля 14 гадоў; жыў у Пінску (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2482, арк. 115 зв. — 116).

III. 1. 1176. **ПЕРЛІН** Самсон Шэвелевіч, слуцкі мешчанін; 09.12.1874 запісаны ювелірам у віленскі яўрэйскі злотніцкі цэх; меў вучняў і падмайстраў: у 1875 г. — *М. Разоўскага*, у 1877 г. — Х. Рэхеза, з канца таго ж года — *Л. Алькеніцкага*, у 1878 г. — С. Уцяна і Ё. Гальперына; з 1880 г. — Е. Ерусалімскага (L—V, № 2.751).

III. 1. 1177. **ПЕРНАЎСКІ** Іера... Шмуйлаў, веліжскі мешчанін, нарадзіўся ў 1834 г., «рещик» пячатак; у 1865 г. пражывае ў Веліжы на вул. Смаленскай разам з бацькамі і братамі (НГАБ у Мінску, ф. 2640, воп. 1, спр. 747, арк. 439 зв.).

III. 1. 1178. **ПЕСІН** Гірша Танхелеў, нарадзіўся каля 1807 г., майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; памёр у 1855 г.; на час рэвізіі яго ўдаве Хане Гількавай 43 гады, іх сыну Гільку — 15, дочкам Зэльдзе — 21, Гіце — 18, Басе — 9 (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 73 зв. — 74).

III. 1. 1179. **ПЕЎЗНЕР** Берка, веліжскі мешчанін, майстра залатых і срэбраных спраў у 1817—1821 гг. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 10, 217).

III. 1. 1180. **ПІКЕР** Хайм Невах Янкелевіч, нарадзіўся ў 1875 г., залатых спраў майстра, пісьменны; у 1887 г. менскі мешчанін, пражывае на вул. Замкавай у доме ваданоснай школы; унесены ў спісы асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 3009, арк. 139 зв. — 140).

III. 1. 1181. **ПІНХАСІК** Залман Шломавіч; 02.04.1850 абраны на тэрмін у 1 г. на пасаду падстаршыні менскага срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 42, арк. 1 зв.).

III. 1. 1182. **ПІНХАСІК** Зэлік Гіршавіч, пухавіцкі мешчанін; у лістападзе 1844 г. прыняты ў майстры злотніцка-срэбраніцкага цэха г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1 зв.);

у 1850 г. падстаршыня цэха (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 3 зв. — 4).

III. 1. 1183. **ПІПКІН** Пейсах, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 2-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41).

III. 1. 1184. **ПОЗІН** Берка Ёселевіч, у 1818 г. віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 57).

III. 1. 1185. **ПОЗІН** Моўша-Хайм Лейбаў, віцебскі мешчанін, майстра залата-срэбраных спраў; унесены ў 1881 г. у спіс віцебскіх майстраў (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2 зв.).

III. 1. 1186. **ПРОТАС** Елья Лейбаў, абывацель мяст. Новы Свержань Менскай губ.; у 1842 г. запісаны майстрам залатых спраў, бабруйскі злотніцкі майстра; у канцы 40-х — пачатку 50-х гг. XIX ст. абвінавачаны ў падробцы і гандлі залатымі вырабамі з фальшывымі клейнамі (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 1, спр. 4701, арк. 1—4); у 1852 г. узяты разам з бацькам *Л. Ё. Протасам* і братам *Ё. Протасам* «пад стражу» за выраб сфальсіфікаваных і некляймёных вырабаў і гандаль імі, а таксама напад на кватэру чыноўніка А. Ціханоўскага з мэтай захопу рэчавых доказаў (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 3923).

III. 1. 1187. **ПРОТАС** Ёсель Лейбаў, бабруйскі злотніцкі майстра; у 1845—1846 гг. абвінавачваецца менскім праберам *Анташкевічам* у тым, што разам з землякамі ўхіляўся ад кляймення сваіх вырабаў, чым наносіў шкоду Казённай палаце і падманваў «публіку»; на абвінавачанне ён тлумачыў, што ў сувязі з блізкасцю Магілёва ён знаходзіцца на ўліку ў тамтэйшай пробернай палатцы; апошняя не пацвердзіла гэты факт (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 2500); у 1852 г. узяты разам з бацькам *Л. Ё. Протасам* і братам *Е. Протасам* «пад стражу» за выраб сфальсіфікаваных і некляймёных вырабаў і гандаль імі, а таксама напад на кватэру чыноўніка А. Ціханоўскага з мэтай захопу рэчавых доказаў; меў жонку Цыву Вульфаву (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 3923, арк. 28); у 1853 г. гандляваў нелегальна фальшывымі нізкапробнымі «галантереямі» (рэчамі) у доме А. Ратнэра на Шасэйнай вул. у г. Бабруйску (тамсама, арк. 131).

III. 1. 1188. **ПРОТАС** Лейба Гемшавіч, менскі майстра залатых і срэбраных спраў; у снежні 1853 г. атрымаў пасведчанне на «производство в Минске мастерства золотых и серебряных изделий… на приготовление волочения… и сусального золота и серебра» (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 9).

III. 1. 1189. **ПРОТАС** Лейба Ёселеў, менскі мешчанін свержаньскага яўрэйскага грамадства г. Бабруйска; аселы жыхар, «старшыня бабруйскага цэха залатых і срэбраных спраў», майстра; у 1845—1846 гг. абвінавачваецца менскім проберам *Анташкевічам* у тым, што разам з землякамі ўхіляўся ад кляймення сваіх вырабаў, чым наносіў шкоду Казённай палаце і падманваў «публіку»; на абвінавачанне ён тлумачыў, што ў сувязі з блізкасцю Магілёва ён знаходзіцца на ўліку ў тамтэйшай пробернай палатцы; апошняя не пацвердзіла гэты факт (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2 спр. 2500); у 1852 г. узяты разам з сынамі *Ё.* і *Е. Протасамі* «пад стражу» за выраб сфальсіфікаваных і некляймёных вырабаў і гандаль імі, а



*Пячатка нясвіжскага гарадскога галавы*

таксама за напад на кватэру чыноўніка А. Ціханоўскага з мэтай захопу рэчавых доказаў (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 3923, арк. 28, 36).

III. 1. 1190. **ПРОТАС** Невух [Невох] Лейбаў, бабруйскі злотніцкі майстра, нарадзіўся ў 1825 г.; у канцы 40-х — пачатку 50-х гг. XIX ст. абвінавачаны ў падробцы і гандлі залатымі вырабамі з фальшывымі клейнамі (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 1, спр. 4701, арк. 1—4); у 1851 г. яму 28 гадоў, атрымаў пасведчанне бабруйскай рамеснай управы на права займацца злотніцкім і срэбраніцкім рамяством; паводле яго слоў, у сакавіку 1852 г. адаслаў яго ў менскую рамесную ўправу (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 4217, арк. 57 зв.).

III. 1. 1191. **ПРУДКІН (ПРУСКІН)** Мендэль Янкелеў, віцебскі мешчанін; 22.10.1888 прыняты вучнем да майстры *Б. Мезінскага* на тэрмін у 3 г. з дамоўленасцю ўплаты яму 75 рублёў за вучобу (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 5 зв.); у 1893 г. падмайстра ў *Б. Мезінскага*, пражывае ў 2-й частцы г. Віцебска на вул. Замкавай (тамсама, воп. 1, спр. 510, арк. 84 зв.).

III. 1. 1192. **ПРЭЙЦЫХ** Якаў (Якуб), майстра срэбраных спраў Гарадзенскай губ.; у кастрычніку 1822 г. звярнуўся ў Літоўскае губернскае праўленне за дазволам рабіць у Гародні вырабы 72-й пробы замест 84-й, якую патрабаваў урад (НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 3, спр. 499).

III. 1. 1193. **ПРЭПІС (ПРЫПІС)** Лазар Пінхусаў, люцынскі мешчанін; у 1888 г. запісаны на 3 г. у г. Луга да майстры Аляксея Сцяпанава Міхайлоўскага; у 1891 г. прызнаны падмайстрам злотніцка-срэбраніцкага рамяства ў віцебскай злотніцка-срэбраніцкай управе (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 458, арк. 170—174).

III. 1. 1194. **ПРЭС** Янкель Моўшавіч, у 1862 г. ваўкавыскі майстра залатых і срэбраных спраў (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 2180, арк. 182 зв.).

III. 1. 1195. **ПУРЭС** [?] Ёсель Янкель Нахімовіч, злотнік мяст. Камень Менскага пав. паводле рэвізскай казкі 1811 г.; меў на той час 17 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 195, арк. 671 зв.).

III. 1. 1196. **ПУРЭС** Лейба Нохамавіч, злотнік мяст. Камень Менскага пав. паводле рэвізскай казкі 1811 г.; меў на той час 18 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 195, арк. 671 зв.).

III. 1. 1197. **РАБІНОВІЧ** Ізраіль, віцебскі злотніцкі майстра; у 1840—1850-я гг. рамяством не займаецца (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13).

III. 1. 1198. **РАБІНОВІЧ** Сроль Герш Іцкавіч, магілёўскі мешчанін; 03.09.1894 запісаны вучнем на тэрмін у 3 г. да

віленскага злотніка А. Н. Глезера (L—V, № 2.799).

III. 1. 1199. **РАДКІН** Янкель Шмуйлаў, нарадзіўся ў 1818 г., менскі «ювілерскі» майстра; у 1852 г. меў сына Аўсея 10 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 291 зв. — 292); у 1892 г. у Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве захоўваліся яго работы: сталовыя лыжкі і відэлец.

III. 1. 1200. **РАДШТЭЙН** Бер[ка] Моўшаў, нарадзіўся ў 1875 г., залатых спраў майстра, пісьменны; у 1904 г. менскі мешчанін, пражываў у Ковенскім «уездзе»; унесены ў спісы асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 2912, арк. 12 зв. — 13).

III. 1. 1201. **РАЗОЎСКІ** Матыс Шмуйлавіч, нясвіжскі мешчанін; 09.07.1875 запісаны вучнем на тэрмін у 2,5 г. да ўдавы віленскага злотніка *С. Перліна* (L—V, № 2.821); у 1890 г. менскі майстра залатых і срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 1202. **РАЙХШТАТ** Янкель, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40).

III. 1. 1203. **РАКАЎШЧЫК** Мордух Меeравіч; у 1845 г. трапіў на вучобу да *А. Цырфера*; у 1852 г. залічаны вучнем да менскага майстры А. Царфера на тэрмін у 6 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1. спр. 29, арк. 1 зв.).

III. 1. 1204. **РАКОЎСКІ** Мендэль Гдальевіч, новагародскі майстра; 30.07.1879 запісаны ў вучні на тэрмін у 3 г. да віленскага ювеліра М. Адэльсона (L—V, № 2.815).

III. 1. 1205. **РАКОЎСКІ** Юдэль Ёселеў, новагародскі мешчанін, нарадзіўся ў 1770 г., срэбранік; у 1806 г. меў жонку Міну 37 гадоў і сына Мордуха 4 гадоў; пасяліўся ў Новагародку ў 1801 г., на той час знаходзіўся ў Вількаміры (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 186, арк. 2).

III. 1. 1206. **РАКОЎСКІ** Юдэль Лазаравіч, новагародскі мешчанін; 15.05.1884 запісаны ў вучні на тэрмін у 3 г. да віленскага ювеліра М. Ш. Медайскага (L—V, № 2. 814).

III. 1. 1207. **РАКОЎСКІ** Янкель Ёселеў, новагародскі мешчанін, нарадзіўся ў 1761 г., срэбранік; у 1806 г. меў сына Лейзера 5 гадоў і дачку Рыўку 2 гадоў; вучыўся ў Менску, жыў у Новагародку з 1801 г. (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 184, арк. 6 зв.).

III. 1. 1208. **РАМАНАЎ (РУМАНАЎ)** Гірш Моўшавіч, менскі мешчанін; у 1873—1874 гг. быў вучнем у майстры *В. Бельніка*; 03.01.1874 прыняты майстрам у цэх злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 164, арк. 9); у 1890 г. майстра цэха злотніцка-срэбраніцкага рамяства (тамсама, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 1209. **РАНЕС** Сроль Шмуйлавіч, у 1854 г. менскі срэбраніцкі майстра (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 1210. **РАОЛЬ** [?] Моўша, аршанскі мешчанін, срэбраніцкі майстра; у 1874 г. меў аднаго вучня (НГАБ у Мінску, ф. 2096, воп. 1, спр. 45, арк. 21 зв.).

III. 1. 1211. **РАСІНЦОЎ** Елья Сепелеў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 54 гады, меў жонку Хану Шмеркаўну 50 гадоў, сына Янкеля 23 гадоў, дачку Марыям 19 гадоў і Сару 10 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 70 зв. — 71).

III. 1. 1212. **РАСТКІН (РАШКІН)** Арон Гершанавіч, менскі мешчанін, майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха, рэзчык пячатак; у жніўні 1889 г. у пасведчанні, выдадзеным менскай рамеснай управай, згадваюцца Расткін А. Г. 47 гадоў, яго жонка Лея 43 гадоў і дочкі: Блюма 25 гадоў, Ціпа 20 гадоў і Блюма — 15 (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 467, арк. 6); 23.12 атрымаў білет на 1 мес. з дазволам наведваць іншыя губерні (тамсама, арк. 5 зв. — 6); у 1890 г. згадваецца як майстра цэха (НГАБ у Мінску, тамсама, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 1213. **РАСТКІН** Грыгарэй Аронаў, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1882 г., гравёр, рэзчык пячатак, пісьменны; пражываў на вул. Старамясніцкай у доме свайго бацькі; у 1903 г. унесены ў кнігу ваенна-абавязаных (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 4063, арк. 98 зв. — 99).

III. 1. 1214. **РАФАЛОВІЧ** Янкель, менскі мешчанін; у 1844—1849 гг. падмайстра срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 1 зв.; тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49).

**РАШКІН** А., гл. **РАСТКІН**

III. 1. 1215. **РАШКІН** Зуся Аронавіч, да 1844 г. майстра менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1 зв.); у 1852 г. падстаршыня цэха (тамсама, спр. 31, арк. 1 зв.).

III. 1. 1216. **РОДКІН (РОТКІН)** Янкель Шмуйлавіч, менскі мешчанін, майстра залатых спраў, ювелір; 22.06.1844 прыняў на вучобу *М.* і *Ш. Бярковічаў* (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 1 — 1 зв.); 02.04.1848 прыняў у вучні на 3 г. барысаўскага мешчаніна *А. Каплана* (тамсама, арк. 5 — 5 зв.); у 1849 г. значыцца майстрам ювелірнага цэха (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 3).

III. 1. 1217. **РОДМАН** Лейба Борухаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 63 гады, меў сына Гіршу 25 гадоў; на час рэвізіі знаходзіцца «в отлучке с давнего времени» (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 74 зв. — 75).

III. 1. 1218. **РОДШТЭЙН** Сроль-Гірша Янкелеў, менскі мешчанін; 26.03.1890 запісаны ў лік майстраў менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха як гравёр (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 519, арк. 1 зв.).

III. 1. 1219. **РОДЭ** Фрыдрых Эрнестаў, рыжскі мешчанін; у 1849 г. значыцца майстрам менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20); 13.07.1849 яго вучань *Ф. Дунаеўскі* (што служыў «мальчиком») пераведзены ў падмайстры (тамсама, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 3); у 1853 г. Ф. Родэ згадваецца як старшыня менскага цэха (тамсама, спр. 31, арк. 4 зв.); у снежні таго ж года атрымаў пасведчанне на «производство в Минске мастерства золотых и серебряных изделий... на приготовление волочения... и сусального золота и серебра» (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 9); у 1854 г. фігуруе як майстра (тамсама, арк. 2) [9].

---

[9] Друкаваныя крыніцы згадваюць пра майстраў залатых спраў Петэра Родэ, які атрымаў у 1712 г. правы грамадзяніна мяст. Кулдзіга (Курляндыя), і яго сына Якаба-Петэра, што жыў там жа ў 1777 г. (Серебряных дел мастера Латвии: клейма и работы, ч. 2. с.165).

III. 1. 1220. **РОЗЕНБЕРГ** Моўша Янкелевіч, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1822 г.; у 1849 г. значыцца майстрам менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20); у 1852 г. жыў у драўляным доме на Ляхаўцы (спр. 462, арк. 288 зв. – 289); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 1221. **РОЗЕНБЕРГ** Цодзік Нісевіч, гарадзенскі злотнік; у 1897 г. займаўся рамонтам рэчаў, пражываў на вул. Саборнай (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 1584, арк. 7).

III. 1. 1222. **РОЗЕНБЕРГ** Янкель Іцкавіч, менскі мешчанін; у 1849 г. значыцца майстрам менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20).

III. 1. 1223. **РОЗЕНБЛЮМ** Нафталія Айзікаў, горацкі мешчанін; пасля іспытаў у копыскай рамеснай управе 09.06.1887 запісаны майстрам гадзіннікавых і залатых спраў у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў мсціслаўскай агульнай рамеснай управы; 15.06.1890 выключаны з ліку цэхавых майстраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 2 зв.).

III. 1. 1224. **РОЗЕТ** Арон, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 2-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41).

III. 1. 1225. **РОЗЕТ** Вульф Іцкавіч, віцебскі мешчанін, проберны майстра; 04.12.1818 «назначаны» для абучэння пробернаму мастацтву (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 60); у 1819 г. меў жонку Хайку Абрамаву; накіраваны за казённы кошт для вучобы пробернаму «мастацтву» ў Маскоўскае горнае праўленне; вучыўся ў обер-берг-пробера Карпінскага (тамсама, арк. 105, 107, 124); у 1820 г. накіраваны ў Віцебск (тамсама, ф. 1297, воп. 1, спр. 786, арк. 1—2); у тым жа годзе меў імяннік «на 1820 з літерай 84 і гербом города» (тамсама, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 128); 10.10 адпаведна з указам Віцебскага губернскага праўлення прызначаны проберным майстрам у адкрытай Віцебскай пробернай палатцы; да 1840 г. утрымоўваў проберную палатку ва ўласным доме (тамсама, ф. 1416, воп. 2, спр. 8174, арк. 5); у верасні 1839 г. падаў заяву ў сувязі з «грудной болезнью и будучи одержим сильным нервическим расслаблением», у якой просіць «уволить его для пользования минеральной водой в Лепельском уезде на три месяца», справы па пробернай частцы часова перадаў *А. Бялову* (тамсама, арк. 5); у кастрычніку 1839 г. абвінавачаны ў «кормчестве» (незаконным гандлі гарэлкай), але «от суда и взысканий оставлен свободным» (тамсама, арк. 38 – 38 зв.); у 1841 г. віцебскія злотнікі звяртаюцца да міністра фінансаў з прашэннем пакінуць В. Розета на пасадзе (тамсама, арк. 41 зв.); у 1844 г. атрымаў загад здаць «дела, книги, инструменты и прочее имущество Пробирной палатки...» для перадачы свайму пераемніку *С. Палякову* (тамсама, ф. 2620, воп. 1, спр. 186, арк. 1); у 1883 г. меў 87 гадоў ад нараджэння (тамсама, ф. 2496, воп. 1, воп. 1, спр. 2483, арк. 99—100).

III. 1. 1226. **РОЗЕТ** Іцка Шмуйлавіч, у 1818 г. віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 57); меў сына *В. Розета*.

III. 1. 1227. **РОЗЕТ** Мордух, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1840—1850-я гг. жыў у доме Зельцэра (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13); у 1853—1854 гг. правіў «буйство» ў дачыненні да віцебскага пробера *С. Палякова* (схапіў за грудзі і парваў сурдут) падчас выканання апошнім сваіх абавязкаў (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 10295, арк. 1 — 10 зв.); у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (тамсама, спр. 11540, арк. 40); у 1866 г. трымаў майстэрню ў Віцебску на вул. Смаленскай у доме Зельцэра, працаваў «без наёмных работнікаў» (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 108, арк. 29 зв. — 30); у 1867 г. цэхавы старшыня злотніцкай управы (тамсама, спр. 114, арк. 36—37, 103); фігуруе ў спісе майстраў 1877—1886 гг. (тамсама, спр. 249, арк. 2).

III. 1. 1228. **РОЗІНМАН (РОЗМАН)** Гдаль Залманаў, шклоўскі мешчанін; 01.03.1889 запісаны сваім бацькам у вучні да віцебскага майстры Б. Межынскага да 01.06.1892 з аплатай за вучэнне 100 рублёў срэбрам і з «адзеннем за свой кошт» (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 6); віцебскі мешчанін, жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Дварцовай; у 1893 г. падмайстра ў майстры *Я. Сіліцкага* (тамсама, спр. 510, арк. 84 зв.); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, воп. 1, спр. 659, арк. 11).

III. 1. 1229. **РОЙЗМАН** ... менскі майстра срэбраных спраў у 1878 г. (РЗиСД, с. 201).

III. 1. 1230. **РОНІН** Абель, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 3-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41 зв.).

III. 1. 1231. **РОНІН** Абрам, віцебскі мешчанін, майстра золата-срэбраных спраў; у спісе майстраў 1877—1886 гг. значыцца як памерлы да 1877 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 1 зв.); меў сына (?) Моўшу (тамсама, спр. 335, арк. 450).

III. 1. 1232. **РОНІН** Берка Шмуйлаў, віцебскі мешчанін, майстра золата-срэбраных спраў; у 1881 г. фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2 зв.); у 1892 г. згадваецца ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, арк. 10 зв.).

III. 1. 1233. **РОНІН** Іцка, віцебскі злотніцкі майстра; у 1840—1850-я гг. жыў на вул. Смаленскай у доме Марковіча (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 12 зв.); у 1860 г. падмайстра злотніцкай управы, жыў у 1-й частцы г. Віцебска (тамсама, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41 зв.); у 1866 г. трымае майстэрню на вул. Смаленскай у доме Марковіча, працуе «без наёмных работнікаў» (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 108, арк. 29 зв. — 30); фігуруе ў спісе майстраў 1877—1886 гг. (тамсама, спр. 249, арк. 2).

III. 1. 1234. **РОНІН** Іцка Літманаў, віцебскі мешчанін, злотніцкі падмайстра ў 1840—1850-я гг. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13 зв.); у 1868 г. жыў на вул. Афіцэрскай у доме Дагель-

сона (тамсама, спр. 123, арк. 44 зв.); 04.05.1889 атрымаў атэстат «вечнага» майстры золата-срэбраных спраў (тамсама, спр. 343, арк. 2 зв. — 3); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, спр. 659, арк. 11 зв.).

III. 1. 1235. **РОНІН** Лейба, падмайстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41 зв.); віцебскі мешчанін, майстра золата-срэбраных спраў, фігуруе ў спісе майстраў 1877—1886 гг. (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2).

III. 1. 1236. **РОНІН** Моўша Абрамаў, 08.12.1887 атрымаў пасведчанне на званне часавога майстры (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 335, арк. 450).

III. 1. 1237. **РОНІН** Шмуйла Ізраілеў, віцебскі майстра, злотніцкі цэхмістр; у 1840—1850-я гг. жыў на вул. Смаленскай у доме Марковіча (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 12 зв.); у 1860 г. жыў у 3-й частцы г. Віцебска (тамсама, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41); у 1866 г. меў «заведеніе» ў Віцебску на вул. Смаленскай у доме Марковіча, працуе «без наёмных работнікаў» (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 108, арк. 28 зв. — 29); 02.09.1870 атрымаў пасведчанне на права займацца залатымі і срэбранымі работамі, заплаціў за яго 2 рублі 50 капеек (тамсама, спр. 147, арк. 10); фігуруе ў спісе майстраў 1877—1886 гг. (тамсама, арк. 2 зв.); у 1887 г. старшыня віцебскай злотніцка-срэбраніцкай управы (тамсама, спр. 335, арк. 261); 04.01.1889 старшыня віцебскай яўрэйскай злотніцка-срэбраніцкай цэхавай управы, просіць віцебскую рамесную ўправу выдаць «дозволительные виды» на права гандлю залатымі і срэбранымі вырабамі віцебскім купцам А. Паташку, Н. Трывасу, А. Сераднякову, Ф. Волкаву і Н. Розенфельду (тамсама, спр. 405, арк. 4); у 1892 і 1893 гг. цэхавы старшыня (тамсама, спр. 476, арк. 83; тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 83), жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Дварцовай; 15.03.1894 атрымаў гадавы дазвол на права гандлю залатымі і срэбранымі вырабамі (тамсама, спр. 505, арк. 95); 24.05.1894 падаў прашэнне аб вызваленні яго з пасады старшыні цэха ў сувязі з тым, што «по старости лет» не можа «продолжать службу в должности цехового старшины» (тамсама, спр. 522, арк. 6); у той жа дзень вызвалены з пасады і абраны прысяжным экспертам злотніцка-срэбраніцкага цэха (тамсама, арк. 1 — 1 зв.); фігуруе ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах, значыцца як памерлы да 1897 г. (тамсама, спр. 659, арк. 50).

III. 1. 1238. **РОНІН** Шмуйла Лейбаў, віцебскі мешчанін, майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха; у 1860 г. жыў у 3-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41); фігуруе ў спісе майстраў 1877—1886 гг.; напісана, што ўступіў у цэх да 1877 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 1 зв.); у 1893 г. цэхавы старшыня, жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Дварцовай, меў падмайстру *Б. Дыменштэйна* (тамсама, спр. 510, арк. 83).

III. 1. 1239. **РОНКІН** Абрам, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Ві-

цебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40).

III. 1. 1240. **РОНКІН** Шмуйла, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40).

III. 1. 1241. **РОТКІН** Шмуйла Янкелеў, менскі мешчанін; жыў на вул. Маскоўскай у доме Крылова; 16.07.1899 мае 42 гады; 14.01.1900 просіць менскую рамесную ўправу аб далучэнні яго да цэха золата-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства і выдачы пасведчання на адкрыццё майстэрні (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 911, арк. 1 зв. — 2).

**РОТКІН** Я., гл. **РОДКІН**

III. 1. 1242. **РУБАНАЎ** Іцка Хаймавіч, менскі мешчанін; 29.03.1852 прыняты падмайстрам у менскі ювелірны цэх (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 3).

III. 1. 1243. **РУБАНАЎ** Шлёма Хаймавіч, менскі мешчанін; 02.03.1852 прыняты падмайстрам у менскі ювелірны цэх (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 2 зв.).

III. 1. 1244. **РУБЕНЧЫК** Арон Танхум Мордухаў, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1872 г., пісьменны; у 1890 г. падмайстра менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1); у 1894 г. жыў на вул. Губернатарскай у доме Дворжаца; унесены ў спісы асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 2744, арк. 4 зв. — 5).

III. 1. 1245. **РУБЕНЧЫК** Борух Яўсеевіч, мешчанін менскага яўрэйскага грамадства, майстра; 21.10.1857 унесены ў кнігу ювелірнага цэха, 29 гадоў ад нараджэння, меў жонку Лідзію 28 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 105, арк. 1 зв. — 2).

III. 1. 1246. **РУБЕНЧЫК** Гец Лейбавіч, менскі майстра; у 1844 г. заключыў дагавор аб прыёме ў вучні *Лейбы Нохімавіча Цэйтліна* на тэрмін у 4 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 2 зв. — 3); у 1849 г. значыцца майстрам (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20); 27.03.1852 заключыў дагавор з *Х. Матэсовічам* аб прыёме яго ў вучні на тэрмін у 2 г. і 9 мес., паручыцелем апошняга выступіў В. Аксельрод (тамсама, арк. 7).

III. 1. 1247. **РУБІНАЎ** Моўша, віцебскі мешчанін, злотнік; працаваў у 1-й частцы горада, унесены ў «Памятную книжку Витебской губернии на 1861 г.».

III. 1. 1248. **РУБІНАЎ** Салом [Шалом?], невельскі мешчанін; у 1817 г. віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў, меў сына (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 36).

III. 1. 1249. **РУБІНОВІЧ** Нохім Янкелевіч, гарадзенскі мешчанін, нарадзіўся ў 1864 г.; 05.07.1874 запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага ювеліра Н. Тайца (L—V, № 2.864).

III. 1. 1250. **РУБІНШТЭЙН** Лейба Боруxаў, новагародскі мешчанін, нарадзіўся ў 1881 г.; 02.10.1896 запісаны вучнем на тэрмін у 3 г. да віленскага ювеліра А. Шліёзберга (L—V, № 2.207).

III. 1. 1251. **РУДЭНКА** Ёсель Янкелевіч, валожынскі мешчанін; 25.01.1893 запісаны вучнем на тэрмін у 3 г. і 3 мес. да віленскага ювеліра *М. Адашкі*; 28.05.1897 віленская рамесная ўправа выдала яму пасведчанне на права работы ў Вільні ювелірам (L—V, № 2.867).

III. 1. 1252. **РУМАН** Ошэр Моўшаў, мешчанін Пінскага пав. Менскай губ., на-

радзіўся ў 1830 г.; залатых, бляхарных і медных спраў майстра; у 1852 г. меў брата Схар'ю 10 гадоў, жыў у Пінску (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2482, арк. 114 зв. — 115).

**РУМАНАЎ** Г., гл. **РАМАНАЎ**

III. 1. 1253. **РУМАНАЎ** Гірша Моўшавіч, менскі мешчанін; 28.03.1852 прыняты падмайстрам у менскі ювелірны цэх (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 5).

III. 1. 1254. **РУМАНАЎ** Іцка Геселевіч, менскі мешчанін; у 1849 г. значыцца майстрам менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20).

III. 1. 1255. **РУХАМОЎСКІ** Хацкель Янкелеў, мазырскі залатых спраў майстра, нарадзіўся ў 1819 г.; згадваецца ў 1852 г. (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2439, арк. 16 зв. — 17).

III. 1. 1256. **РЫВІНСОН** Рахман…х Янкелевіч, у 1818 г. віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 57).

III. 1. 1257. **РЫВІНСОН** Шмуйла Залманаў, злотнік, бешанковіцкі мешчанін лепельскай рамеснай управы (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2 зв.).

III. 1. 1258. **РЫДЭЛЬ** А., менскі майстра срэбраных спраў у 1891 г. (РЗиСД, с. 201).

III. 1. 1259. **РЫЗЕНБЕРГ** Борух Хаймавіч, у 1852 г. старшыня менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 29, арк. 1).

III. 1. 1260. **РЫЎКІН** Арон, менскі мешчанін, рэзчык пячатак; 12.05.1870 працаваў без работнікаў, меў майстэрню ў доме Тапаза па вул. Захар'еўскай (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 3, спр. 1, арк. 67 зв. — 68).

III. 1. 1261. **РЫЎКІН** Елья Юдовіч, мсціслаўскі мешчанін; 20.10.1886 прыняты майстрам срэбраных спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 7).

III. 1. 1262. **РЫЎКІН** Кушэль Аронавіч, менскі срэбраніцкі майстра; у 1854 г. атрымаў дазвол на права гандлю залатымі і срэбранымі вырабамі (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 505, арк. 65); у 1893 г. мае падмайстру *А. Шахіна* і вучня Х. Барэнбаума (тамсама, спр. 510, арк. 84); 17.01.1894 атрымаў гадавы дазвол на права гандлю залатымі і срэбранымі вырабамі (тамсама, арк. 66); 24.05.1894 абраны на пасаду «гласнага» віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (тамсама, спр. 522, арк. 1); 08.10.1897 гарадскім старостам выдадзена пасведчанне віцебскім уладам аб тым, што ён не быў пад судом (тамсама, спр. 659, арк. 35); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, арк. 12).

III. 1. 1263. **РЫЎКІН** Лейба Ангелеў, у 1852 г. койданаўскі залатых спраў майстра (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 522).

III. 1. 1264. **РЫЎКІН** Масей Янкелеў, мсціслаўскі мешчанін; 06.05.1887 прыняты майстрам залатых і срэбраных спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў; 15.10.1888 выключаны з цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 9).

III. 1. 1265. **РЭЙНГОЛЬД** Давід Нохімавіч, мешчанін мяст. Ціханец Рага-

чоўскага пав.; працаваў у Бабруйску, не быў запісаны ў бабруйскі злотніцка-срэбраніцкі цэх; паводле слоў родных, вырабляў тампакавыя рэчы; па даручэнні іншых майстраў рабіў дробны рамонт срэбраных вырабаў; у 1852 г. падазраецца ў тым, што займаўся іх вырабам і рэалізацыяй з нізкапробнага срэбра, пры гэтым накладваў фальшывае кляйно з лічбай «84»; не зарэгістраваны ў пробернай палатцы (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 3923, арк. 3—5).

III. 1. 1266. **РЭМ** Сроль, самахвалавіцкі мешчанін; у 1890 г. менскі майстра залатых і срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 1267. **РЭПІН** Хайм Шмуйла, віцебскі злотніцкі майстра; у 1845 г. згадваецца ў справе паміж віцебскім проберам *С. Паляковым* і былым проберам *В. Розетам;* у доме апошняга знойдзены рэчы, «заклеймённыя в разное время» клейнамі, што належалі Х. Рэпіну (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 9866, арк. 14).

III. 1. 1268. **РЭСЕРГ** Ізраіль Шмуйлаў, менскі мешчанін; у 1844—1849 гг. майстра менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1 зв.); у 1849 г. майстра срэбраніцкага цэха, у спісах дадаткова пазначана: «у старых кнігах запісаны медніцкім майстрам» (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49).

III. 1. 1269. **РЭШАЛЬ** Сроль Шмуйлавіч, 28.03.1852 прыняты ў майстры менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 5 зв.).

III. 1. 1270. **САБАНОВІЧ** Нахемій Іцкавіч, у 1849 г. значыцца ў спісе майстраў менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 333, арк. 20).

III. 1. 1271. **САГАЛАЎ** ... Іцкаў, менскі «ювилерскі» майстра, нарадзіўся ў 1796 г.; у 1852 г. меў сыноў Іцку 35 гадоў і Абрама 9 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 291 зв. — 292).

III. 1. 1272. **САГАЛАЎ** Абрам Фіменавіч, ракаўскі мешчанін; 25.01.1847 прыняты падмайстрам менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 3); у 1849 г. значыцца падмайстрам цэха (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.).

III. 1. 1273. **САГАЛАЎ** Нахемій, у 1854 г. менскі срэбраніцкі майстра, згадваецца «ў гэтым годзе» як памерлы (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 1274. **САГАЛОВІЧ** Мойша Аронаў, залатых спраў майстра, нарадзіўся ў 1883 г., пісьменны; у 1903 г. івянецкі мешчанін, пражывае ў г. Мазыры на вул. Слуцкай у доме Чорнага; унесены ў спісы асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 4062, арк. 21 зв. — 22).

III. 1. 1275. **САГАЛОВІЧ** Мордух Лейзераў, ракаўскі мешчанін, меў 16 гадоў ад нараджэння; у 1896—1899 гг. вучыўся рэзцы пячатак у менскага майстры *Міхеля Тапаза*; 10.01.1900 просіць менскую рамесную ўправу далучыць яго да цэха злотніцка-срэбраніцкага рамяства як работніка (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 955, арк. 1—3).

III. 1. 1276. **САЕЎСКІ** П., полацкі майстра ў 1858 —1869 гг. (РЗиСД, с. 238).

III. 1. 1277. **САКАЛОЎСКІ** Восіп, менскі майстра злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства; 09.03.1898 атрымаў пасведчанне на права займацца рамяством у 1898 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 797, арк. 1).

III. 1. 1278. **САЛАДУХА** Борух Шмуйлавіч, ашмянскі мешчанін, нарадзіўся ў 1890 г.; 19.01.1899 запісаны вучнем на тэрмін у 3 г. і 9 мес. да віленскага ювеліра І. Цвіркі-Сіраты (L—V, № 2.902).

III. 1. 1279. **САЛАМОНАЎ** Гірш Берка Янкелеў, веліжскі мешчанін, «злотнік», нарадзіўся ў 1843 г.; у 1865 г. пражывае на вул. Новая Слабодка, мае жонку Шэйну 20 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 2640, воп. 1, спр. 747, арк. 184 зв.).

III. 1. 1280. **САЛАМОНІК** Шалом, віцебскі мешчанін, майстра віцебскай злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.).

III. 1. 1281. **САЛАНТА** Габрыэль, дрызенскі майстра залатых і срэбраных спраў; у 1821 г. гарадавым у яго забраны і адпраўлены ў Віцебскую проберную палатку 2 штэмпелі для кляймення вырабаў (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 223).

III. 1. 1282. **САМСОНАЎ** Давід Беркавіч, менскі мешчанін, вучань майстры *Кеёрына*; 17.10.1890 запісаны ў лік падмайстраў гравёрнага рамяства (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 519, арк. 3 зв.).

III. 1. 1283. **САПІР** Шая Яхілаў, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкасрэбраніцкай справы ў 1892 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 476, арк. 82 зв.); у 1893 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Замкавай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 84).

**САПІРА**, гл. **ШАПІРА**

III. 1. 1284. **САПІРА** Моўша Ёселеў, стаўпецкі мешчанін, злотнік; у 1816 г. на час складання рэвізскай казкі яму 35 гадоў, яго жонцы Гітлі — 34, іх сыну Берку-Давіду — 12 (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 96, арк. 664 зв. — 665).




*Палкавы знак 7-га Гусарскага Беларускага палка*

III. 1. 1285. **САПІРА** Шмерка, віцебскі мешчанін, падмайстра злотніцкай управы; у 1860 г. пражывае ў 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41 зв.).

III. 1. 1286. **САРОКІН** Мацвей, менскі майстра срэбраных спраў у 1876 г. (РЗиСД, с. 201).

III. 1. 1287. **СВАЖЫНСКІ** Павел, купецкі сын, полацкі майстра залатых і срэбраных спраў у 1817 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 37 зв.).

III. 1. 1288. **СВЕРДЛАЎ** Вульф, віцебскі мешчанін, нарадзіўся ў 1835 г., залатых і срэбраных спраў майстра; у 1863 г. пражывае разам з сям'ёй на вул. Дварцовай у доме А. М. Гінцбурга (НГАБ у Мінску, ф. 2631, воп. 2, спр. 2, арк. 804 зв.).

III. 1. 1289. **СВЕРДЛАЎ** Вульф Гдальеў, віцебскі мешчанін, майстра золатасрэбраных спраў; у 1840—1850-я гг. жыў на вул. Смаленскай у доме Па-

процкага (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13); у 1866 г. трымаў майстэрню ў доме Цырыльсона (тамсама, спр. 108, арк. 28 зв. — 29), у 1868 г. — на вул. Афіцэрскай у доме Перліна, працаваў «без наёмных работнікаў» (тамсама, спр. 123, арк. 44 зв.); 12.06.1870 атрымаў пасведчанне на права займацца залатымі і срэбранымі работамі, заплаціў за яго 2 рублі 50 капеек (тамсама, спр. 147, арк. 7); фігуруе ў спісе майстраў 1877—1886 гг. (тамсама, спр. 249, арк. 1 зв.; тамсама, спр. 522, арк. 5), згадваецца ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50); у 1893 г. жыў у 3-й частцы г. Віцебска на вул. Вакзальнай, меў вучня *Г. Свердлава* (тамсама, спр. 510, арк. 84 зв.); 17.01.1894 атрымаў гадавы дазвол на права гандлю залатымі і срэбранымі вырабамі (тамсама, спр. 505, арк. 63); 24.05.1894 абраны на пасаду «гласнага» віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (тамсама, спр. 522, арк. 1 — 1 зв.); 26.05.1895 прысутнічаў пры канфіскацыі рэчаў і прылад працы рамесніка *І.-Ю. Шэфтэля* (тамсама, спр. 626, арк. 4); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, спр. 659, арк. 10).

III. 1. 1290. **СВЕРДЛАЎ** Гдаль Вульфаў, віцебскі мешчанін; у 1893 г. вучань у майстры *В. Свердлава*, жыў у 3-й частцы г. Віцебска на вул. Вакзальнай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 84 зв.).

III. 1. 1291. **СВЕРДЛАЎ** Ёсель Гіршавіч, віцебскі мешчанін, майстра золатасрэбраных спраў; у жніўні 1817 г. згадваецца як полацкі срэбраніцкі майстра (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 37 зв.); у 1840—1850-я гг. жыў на вул. «Грязной» у доме Шубы (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13); у спісе майстраў 1877—1886 гг. значыцца як памерлы да 1877 г. (тамсама, спр. 249, арк. 1 зв.).

III. 1. 1292. **СВЕРДЛАЎ** Хайм, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 3-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41).

III. 1. 1293. **СВІНЯРСКІ** М., менскі майстра срэбраных спраў у 1874 г. (РЗиСД, с. 201).

III. 1. 1294. **СВІРСКІ** Бенцэль Іцкавіч, навагародскі майстра; 04.07.1856 запісаны ў вучні на тэрмін у 1 г. да віленскага злотніка Е. Хазана; 26.09.1861 заключыў дамову на падмайстэрства на тэрмін у 1 г. з віленскім майстрам М. А. Левінсонам (L—V, № 2.931).

III. 1. 1295. **СЕГЕНЬ** Андрэй Сямёнаў, «давідгарадоцкі» злотнік; у 1795 г. меў 40 гадоў, яго жонцы Фядоры Ільіной — 30; сыну Івану — 12, Васілю — 3, дачцэ Адары — 7, «Татяне» — 5 гадоў; разам з імі жыла цешча Марыя Іванаўна 60 гадоў; «подданыя тубыльцы» (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 57, арк. 135 зв. — 136).

III. 1. 1296. **СЕЛІСКІ (СЕЛІЦКІ)** Мордух Янкелеў, гарадоцкі мешчанін; жыў у Віцебску на вул. Смаленскай у доме Бама; 31.01.1891 атрымаў пасведчанне падмайстры золата-срэбраных спраў віцебскай злотніцка-срэбраніцкай управы; вучыўся на працягу 6 г. у свайго бацькі, майстры *Я. Селіцкага* (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 457, арк. 23).

III. 1. 1297. **СЕЛІСКІ** Шлёма Мікелеў, гарадоцкі мешчанін Віцебскай губ.;

прыняты ў майстры віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха 16.08.1886 (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 3).

III. 1. 1298. **СЕЛІЦКІ** Шмуйла Янкелеў, гарадоцкі мешчанін Віцебскай губ.; 12.11.1883 залічаны ў падмайстры віцебскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 4).

III. 1. 1299. **СЕЛІЦКІ** Янкель Шломаў, гарадоцкі мешчанін Віцебскай губ., залатых спраў майстра; фігуруе ў спісе майстраў 1877—1886 гг. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2), жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Смаленскай у доме Файнберга; 11.02.1887 атрымаў гадавы дазвол на выраб золата-срэбраных рэчаў і гандаль імі (тамсама, спр. 405, арк. 5); у 1891 г. меў у вучнях свайго сына *М. Селіцкага*; у 1892 г. значыцца ў спісе віцебскіх майстраў (тамсама, спр. 522, арк. 5) і майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50 зв.); 13.01.1893 і 17.01.1894 атрымліваў гадавы дазвол на права гандлю залатымі і срэбранымі вырабамі (тамсама, спр. 505, арк. 6; тамсама, арк. 67); 24.05.1894 абраны «прысеглым» экспертам злотніцка-срэбраніцкага цэха (тамсама, спр. 522, арк. 1 — 1 зв.); 16.01.1897 разам з майстрам *Я. Сіліцкім* падаў пратэст і патрабаванне адмяніць вынікі выбараў цэхавага старшыні ў сувязі з парушэннем працэдуры (тамсама, арк. 38 зв.).

III. 1. 1300. **СЕНКМАН** Давыд, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41).

III. 1. 1301. **СЕНКМАН** Шмуйла, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41).

III. 1. 1302. **СЕРШАН** Залман, менскі майстра залатых спраў; 01.08.1844 заключыў дамову з юрбаргскім мешчанінам *Л. Абрамсонам* аб прыёме апошняга «да ўслужэння» на тэрмін у 1 г. і 10 мес. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 1 зв. — 2).

III. 1. 1303. **СІЛІЦКІ** Шлёма Янкелеў, гарадоцкі мешчанін, віцебскі майстра; 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 659, арк. 12 зв.); 15.09 гарадскім старостам выдадзена пасведчанне віцебскім уладам аб тым, што ён не быў пад судом (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 659, арк. 23).

III. 1. 1304. **СІЛІЦКІ** Янкель Шлёмаў, віцебскі мешчанін; у 1877—1880-я гг. меў вучня *Б. Мезінскага*; згадваецца як майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха ў 1892 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 476, арк. 83); у 1893 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Дварцовай, меў падмайстру *Г. Розмана* і вучня *С. Кагана* (тамсама, спр. 510, арк. 84 зв.); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, спр. 659, арк. 12).

III. 1. 1305. **СІНОЛАФ** Хонан Айзікаў, мсціслаўскі мешчанін; 10.06.1885 прыняты майстрам залатых і срэбраных спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 5 зв.).

III. 1. 1306. **СЛІЖЫКАЎ** Іцка, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1840—1850-я гг. рамяством не займаўся (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 12 зв.); у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (тамсама, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40).

III. 1. 1307. **СЛОМІХ** Невах Мееraў, мешчанін Пінскага пав. Менскай губ., нарадзіўся ў 1819 г.; залатых, бляхарных і медных спраў майстра; у 1852 г. жыў у Пінску (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2482, арк. 114 зв. — 115).

III. 1. 1308. **СЛУЦКІН** Аўсей Лейбаў, нарадзіўся каля 1826 г., майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны як памерлы ў 1854 г. у кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; меў брата *С. Слуцкіна* (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 67 зв. — 68).

III. 1. 1309. **СЛУЦКІН** Беньямін Сымонаў, майстра залатых і срэбраных спраў, нарадзіўся каля 1804 г.; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; памёр у 1855 г.; меў брата *І. Слуцкіна* (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 74 зв. — 75).

III. 1. 1310. **СЛУЦКІН** Ідэль Сымонаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на час рэвізіі яму 51 год, яго жонцы Рыўцы Шлёмавай 49 гадоў, яны маюць дачку Дзвеўру 6 гадоў і жанатага сына Файбіша Сімху, які быў «пералічаны» ў земляробы Екацярынаслаўскай губ.; таксама І. Слуцкін меў брата *Б. Слуцкіна* і пляменніка Ізраіля Мордухава Слуцкіна 10 гадоў, з імі жыла маці апошняга — Гіся (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 73 зв. — 74, 74 зв. — 75).

III. 1. 1311. **СЛУЦКІН** Лейба Мордухаў, майстра залатых і срэбраных спраў, нарадзіўся каля 1821 г.; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; памёр у 1851 г.; у 1858 г. жыла яго маці Цыля Міхелева 62 гадоў і яго брат Рафал з сям'ёй (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 67 зв. — 68).

III. 1. 1312. **СЛУЦКІН** Рафал Мордухаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 27 гадоў, яго жонцы — 22, іх дачцэ Хаі 1 год; з імі жыла яго маці Цыля Міхелева 62 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 67 зв. — 68).

III. 1. 1313. **СЛУЦКІН** Смугель Лейбаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 34 гады, меў жонку Басю Моўшаўну і 5 дачок; яго брат *А. Слуцкін*, які нарадзіўся ў 1826 г., памёр у 1854 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 67 зв. —68).

III. 1. 1314. **СЛУЦКІН** Файбіш Ідэлеў, майстра залатых і срэбраных спраў, запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 30 гадоў, меў жонку Рыўку, іх дачцэ Бяломе [?] 9 гадоў, Леі — 6, Іце — паўгода (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 73 зв. — 74).

III. 1. 1315. **СМАЛЯВІЦКІ** Вольф, вучань бабруйскага майстры І. Протаса; у

1852 г. згадваецца ў справе аб гандлі некаторымі некляймёнымі і фальшывымі вырабамі: пад кіраўніцтвам свайго настаўніка зрабіў завушніцы са шклом, якое выдавалі за брыльянты (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 3923, арк. 52 зв.).

III. 1. 1316. **СОНКІН** Ёсель, камінскі (?) мешчанін; у 1890 г. менскі майстра залатых і срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 1317. **СОРКІН** Пінхус Давідаў, мсціслаўскі мешчанін; 30.11.1886 прыняты майстрам — рэзчыкам пячатак і гравёрам — на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў; у сувязі са сканчэннем тэрміну выключаны з цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 7).

III. 1. 1318. **СОСКІН** Ёсель Залманаў, віцебскі мешчанін; 11.07.1889 атрымаў атэстат «вечнага» майстры залата-срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 343, арк. 2 зв. — 3).

III. 1. 1319. **СОСКІН** Ёсель Залманаў Шмерка Мееравіч, віцебскі майстра; 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 659, арк. 11 зв.).

III. 1. 1320. **СОСКІН** Іцка Лейбавіч, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1804 г.; у 1849 г. згадваецца як майстра менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20; тамсама, спр. 462, арк. 291 зв. — 292), у 1854 г. — як менскі срэбраніцкі майстра (тамсама, спр. 770, арк. 3).

III. 1. 1321. **СОСКІН** Моўша, віцебскі мешчанін, падмайстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41 зв.).

III. 1. 1322. **СОСКІН** Шлёма-Янкель, майстра віцебскай злотніцка-срэбраніцкай управы; 16.09.1897 гарадскім старостам выдадзена пасведчанне віцебскім уладам аб тым, што ён не быў пад судом (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 659, арк. 20).

III. 1. 1323. **СОСКІН** Янкель, віцебскі злотніцкі майстра ў 1840—1850-я гг. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13).

III. 1. 1324. **СОСКІН** Янкель, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40).

III. 1. 1325. **СОШЭН** Ёсель, менскі мешчанін, залатых спраў майстра; у 1870 г. меў майстэрню на Саборнай плошчы г. Менска, працаваў без наёмных работнікаў (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 3, спр. 1, арк. 55 зв. — 56).

III. 1. 1326. **СРЭБРАНІК** Аўсей Ёселеў, злотнік, жыхар мяст. Мір; «желает быть записанным» у мірскія мяшчане ў 1806 г.; на той час яму 50 гадоў, меў жонку Шэйну 40 гадоў і жанатага сына Зэліка (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 184, арк. 58).

III. 1. 1327. **СРЭБРАНІК** Аўсей Ёселеў, навагародскі мешчанін, злотнік, нарадзіўся ў 1771 г.; у 1806 г. меў жонку Цыру 35 гадоў і сыноў — Ёселя 5 гадоў і Моўшу 2 гадоў; жыў у Навагародку (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 184, арк. 5 зв.).

III. 1. 1328. **СРЭБРАНІК** Ёсель Рубінаў, навагародскі мешчанін, злотнік, нарадзіўся ў 1788 г.; у 1806 г. вучыўся за мяжой; жыў у Навагародку з 1801 г.

(НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр.184, арк. 6 зв.).

III. 1. 1329. **СРЭБРАНІК** Зэлік Аўсееў, у 1806 г. «желает быть записанным» у мірскія мяшчане; на той час яму 26 гадоў, меў бацьку Аўсея і маці Шэйну, жонку Блюму 20 гадоў і дачку Хаю, якой 1 год (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 184, арк. 58).

III. 1. 1330. **СРЭБРАНІК** Лейба Моўшаў, мірскі злотнік, нарадзіўся ў 1765 г.; у 1806 г. яго жонцы Шэйне 40 гадоў, сыну Зэліку — 26, яго жонцы Блюме — 20, іх дачцэ Хаі 1 год, сыну Моўшу 2 гады (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 184, арк. 58).

III. 1. 1331. **СРЭБРАНІК** Моўша Мендэлевіч, бабруйскі злотніцкі майстра; у 1852 г. фігуруе ў справе па вырабе і рэалізацыі нізкапробных залатых і срэбраных вырабаў (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 3923, арк. 3—5).

III. 1. 1332. **СТАБРОЎСКІ** Людвік, менскі майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха, меў свой дом на вул. Захар'еўскай і майстэрню, у якой працавалі 3 работнікі (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 3, спр. 1, арк. 63 зв. — 64); 13.03.1870 хадайнічае аб пераводзе ў падмайстры свайго вучня *Б. Станкевіча* (тамсама, ф. 10, воп. 1, спр. 164, арк. 1), 10.10.1871 — *П. Карчэўскага* (тамсама, арк. 5); 20.10.1876 хадайнічае аб выдачы атэстата падмайстры свайму вучню *Г. Пашковічу* (тамсама, арк. 1 зв., 3); у 1890 г. згадваецца як майстра (тамсама, спр. 577, арк. 1); 30.12.1894 атрымаў штогадовае пасведчанне на права вырабу залатых, срэбраных і ювелірных «штук» у Менску ў 1895 г. (тамсама, спр. 721, спр. 15).

III. 1. 1333. **СТАЙФІЗЭР** Айзік Абрамавіч, 28.03.1852 прыняты майстрам у менскі злотніцка-срэбраніцкі цэх (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 5 зв.).

III. 1. 1334. **СТАНКЕВІЧ** Браніслаў Аляксандравіч, дваранін Менскага пав.; 13.03.1870 пераведзены «по выбытию установленных лет» і прашэнні майстры *Л. Стаброўскага* з вучняў у падмайстры менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 164, арк. 1).

III. 1. 1335. **СТОЛТЭР** До[а?]н Гіршаў, віцебскі мешчанін, майстра залата-срэбраных спраў; фігуруе ў спісе майстраў 1877—1886 гг. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2).

III. 1. 1336. **СТРАЖ** Хайм Хайкелавіч, віленскі мешчанін; 12.08.1874 пераведзены з вучняў у падмайстры менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 164, арк. 10); 20.08 атрымаў атэстат менскага майстры (тамсама, арк. 1 — 1 зв.).

III. 1. 1337. **СУПЕРФІН** Файбіш Шмеркаў, нарадзіўся каля 1818 г., майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны як памерлы ў 1855 г. у кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; меў брата, *Ю. Суперфіна* (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 68 зв. — 69).

III. 1. 1338. **СУПЕРФІН** Юдка Шмеркаў, майстра залатых і срэбраных спраў, запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 37 гадоў, меў жонку Злату 32 гадоў, яго сыну Самуэлю 8 гадоў, Файбішу 2 гады, дачцэ Гіндзе 13 гадоў; меў брата *Ф. Суперфіна* (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 68 зв. — 69).

III. 1. 1339. **СУСМАН** Залман Ельевіч, менскі срэбраніцкі майстра ў 1854 г.

(НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2 зв.).

III. 1. 1340. **СУХОЦІН** Берка, веліжскі мешчанін, залатых спраў майстра, нарадзіўся ў 1830 г.; у 1865 г. пражываў у Веліжы на Узгорскім завулку; меў жонку Малку 33 гадоў, яго сыну Арону 16 гадоў, Аўсею — 14, Хайму — 11, Ёселю — 9, Вульфу — 5, Абраму — 3 (НГАБ у Мінску, ф. 2640, воп. 1, спр. 747, арк. 797 зв.).

III. 1. 1341. **СЫРДЫНАЎ** Ёсель, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.).

III. 1. 1342. **СЯРЭБРАНЫ** Фройм Літманаў, «залатар» мяст. Брагін Рэчыцкага пав.; паводле рэвізіі 1811 г. яму 28 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 261, арк. 390).

III. 1. 1343. **СЯРЭБРАНЫ** Янкель Літманаў, «залатар» мяст. Брагін Рэчыцкага пав.; паводле рэвізіі 1811 г. яму 33 гады (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 261, арк. 390).

III. 1. 1344. **СЯРЭБРЫК** Моўша, бабруйскі злотніцкі майстра; у 1845—1846 гг. абвінавачваецца менскім проберам *Анташкевічам* у тым, што разам з землякамі ўхіляўся ад кляймення сваіх вырабаў, чым наносіў шкоду Казённай палаце і падманваў «публіку»; на абвінавачанне М. Сярэбрык апраўдваўся, што ў сувязі з блізкасцю Магілёва ён знаходзіцца на ўліку ў тамтэйшай пробернай палатцы, аднак яна не пацвердзіла гэты факт (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 2500).

III. 1. 1345. **ТАДХІН** Абрам Гірша Аронаў, віцебскі мешчанін; у 1892 г. фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 522, арк. 5);



*Адбітак пячаткі менскай паліцыі. [1813 г.]*

05.11.1893 атрымаў атэстат «вечнага» майстры золата-срэбраных спраў (тамсама, спр. 343, арк. 6 зв. — 7); жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Смаленскай у доме Пархаля; 03.03.1894 атрымаў гадавы дазвол на права гандлю залатымі і срэбранымі вырабамі (тамсама, спр. 505, арк. 92).

III. 1. 1346. **ТАНХАЎ** Волька, злотнік, прыпісаны да яўрэйскага грамадства г. Рэчыцы; у 1816 г. яму 30 гадоў, яго жонцы Рохлі — 25 (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 316, арк. 1013 зв.).

III. 1. 1347. **ТАПАЗ** Борух Шмуйлаў, менскі мешчанін; у 1849 г. майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20); у 1853 г. старшыня цэха (тамсама, ф. 10, воп. 1, спр. 29, арк. 31); у снежні таго ж года атрымаў пасведчанне на «производство в Минске мастерства золотых и серебряных изделий... на приготов-

ление волочения... и сусального золота и серебра» (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 9); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, спр. 30, арк. 2), 01.01 заключыў дагавор аб прыёме ў вучні *М. Гольдзіна* (тамсама, спр. 30, арк. 8); у 1870 г. меў уласны дом і майстэрню на вул. Захар'еўскай, працаваў «без работнікаў», тут жа названы «купцом» (тамсама, ф. 1, воп. 3, спр. 1, арк. 61 зв. — 62); у 1890 г. фігуруе як майстра (тамсама, спр. 577, арк. 1); 28.12.1894 атрымаў пасведчанне на права займацца рамяством у 1895 г. (тамсама, ф. 10, воп. 1, спр. 721, арк. 8), 07.01.1898 — пасведчанне на 1898 г. (тамсама, спр. 791, арк. 1).

III. 1. 1348. **ТАПАЗ** Елья Мендэлеў, менскі мешчанін, у 1854 г. майстра срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 1349. **ТАПАЗ** Зэлік Шмуйлавіч, менскі мешчанін; 20.12.1845 прыняты падмайстрам у менскі ювелірны цэх, па беднасці вызвалены ад уплаты ўступнага ўзносу (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 1 зв.); у тым жа годзе значыцца майстрам срэбраніцкага цэха (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.); у 1886 г. згадваецца як старшыня цэха, звольніўся ў адпачынак у жніўні 1887 г. (тамсама, ф. 10, воп. 1, спр. 326, арк. 3 — 4 зв.); у 1890 г. фігуруе як майстра (тамсама, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 1350. **ТАПАЗ** Міхель Борухаў, менскі мешчанін, майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха; на 1886 г. яму 48 гадоў; у чэрвені 1889 г. знаходзіўся ў Варшаве (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 467, арк. 4 зв.); у лістападзе таго ж года звярнуўся ў менскую агульную рамесную ўправу з прашэннем аб выдачы пашпарта яго 19-гадоваму сыну Лейзеру (тамсама, арк. 1—2); у 1896—1899 гг. меў вучня *Мордуха Сагаловіча* (тамсама, спр. 955, арк. 2—3).

III. 1. 1351. **ТАПАЗ** Моўша Шмуйлаў, менскі мешчанін; 15.06.1849 пераведзены ў падмайстры ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 3 зв.); у 1854 г. менскі срэбраніцкі майстра (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2 зв.); у 1890 г. майстра злотніцка-срэбраніцкага рамяства (тамсама, спр. 577, арк. 1); у 1894 г. згадваецца як майстра; 20.12 атрымаў пасведчанне на права займацца рамяством у 1895 г. (тамсама, спр. 721, арк. 10), 07.01.1898 — пасведчанне на 1898 г. (тамсама, спр. 797, арк. 1).

III. 1. 1352. **ТАПАЗ** Невах Рубінаў, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1867 г.; у 1887 г. жыў на вул. Губернатарскай ва ўласным доме; усыноўлены сям'ёй эсьмонскага мешчаніна Барысаўскага пав. Аўсея Ліўшыца (ад 31.12.1886 за № 10522); пісьменны, унесены ў спісы асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 1698, арк. 139 зв. — 140); у 1890 г. згадваецца як падмайстра менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (тамсама, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 1353. **ТАПАЗ** Рубін, менскі мешчанін; пражываў ва ўласным доме ў 1-й частцы г. Менска; у 1890 г. майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 1354. **ТАПАЗ** Шмуйла Хаймавіч, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1793 г.; у 1849 г. значыцца майстрам менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20); у 1852 г. меў сыноў — Боруха 35 гадоў і Моўшу

21 года, унукаў — Хайма 15 гадоў і Рубіна 10 гадоў; жылі ў драўляным доме на вул. Францысканскай (тамсама, спр. 462, арк. 288 зв. — 289); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, спр. 338, арк. 2).

III. 1. 1355. **ТАТАРСКІ** Мордух, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.).

III. 1. 1356. **ТАТАРСКІ** Шалом, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40).

III. 1. 1357. **ТАТАРСКІ** Янкель, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40).

III. 1. 1358. **ТАЎБІН** Абрам Беркаў, мсціслаўскі мешчанін; у 1878—1883 гг. вучыўся ў майстры *Ю. Гурэвіча* «ремеслу по промыслу часовых, золотых и серебряных дел мастера»; атрымаў пасведчанне тэрмінам у 1 г. на права займацца рамяством (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 7, арк. 60—62).

III. 1. 1359. **ТАЎБІН** Арон Хаймаў, віцебскі мешчанін; 23.01.1891 атрымаў пасведчанне падмайстры золата-срэбраных спраў віцебскай злотніцка-срэбраніцкай управы, вучыўся на працягу 5 г. у майстры г. Луга[10]; скончыў вучобу ў 1890 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 457, арк. 23).

III. 1. 1360. **ТАЎБІН** Берка, мсціслаўскі мешчанін; у 1880—1883 гг. меў вучня А. Кручковіча; 02.08.1886 прыняты майстрам залатых і срэбраных спраў, прымаў іспыты ў Б. А. Ланіна (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 2).

III. 1. 1361. **ТАЎКАЧАР** Зэлік Шэндэравіч, мешчанін Рэчыцкага пав., бабруйскі злотніцкі майстра, рэзчык пячатак; у 1851 г. «отлучился [на год] в Великорусские губернии»; у 1852 г. згадваецца ў сувязі з тым, што займаўся вырабам і рэалізацыяй нізкапробных залатых і срэбраных вырабаў, пры гэтым накладваў фальшывае кляйно з лічбай «84»; не зарэгістраваны ў пробернай палатцы (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 3923, арк. 3—5); у 1854 г. згадваецца як памерлы 2 гады таму (тамсама, арк. 5).

III. 1. 1362. **ТОЙЦ** Юда Гіршаў, мсціслаўскі мешчанін; 19.04.1884 запісаны майстрам гадзіннікавых спраў у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў мсціслаўскай агульнай рамеснай управы на тэрмін у 1 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 5).

III. 1. 1363. **ТРЫФСІК** Моўша Кастрылёў, полацкі купец II гільдыі; жыў на вул. Віцебскай у доме Гордзіна, гандляваў залатымі і срэбранымі вырабамі, трымаў аднаго прыказчыка; 23.12.1894 прайшоў рэгістрацыю на права займацца сваёй дзейнасцю на наступны 1895 год; меў гадавы абарот 1700 рублёў, рэнтабельнасць — 10% з кожнага рубля; траты штогадова на памяшканне — 100 рублёў і на арэнду кватэры — 150 (НГАБ у Мінску, ф. 2523, воп. 1, спр. 6, арк. 58 зв. — 59).

III. 1. 1364. **ТРЭНЧУК** Залман, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40).

[10] *Луры Давід Аўсееў* — лузскі майстра залатых і срэбраных спраў.

III. 1. 1365. **ТУБЯНСКІ** Марк Ізраэлавіч, гарадзенскі майстра залатых спраў; у студзені 1898 г. падаў заяву ў Віленскую акруговую проберную палатку з прашэннем выдаць яму пасведчанне на права займацца рамяством (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 1620).

III. 1. 1366. **ТУБЯНСКІ** Моня, гарадзенскі злотнік; у 1897 г. прыцягнуў увагу Віленскай пробернай палаткі ў сувязі з падазрэннем, што заніжаў пробу каштоўнага металу ў вырабах (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 1620, арк. 6).

III. 1. 1367. **ТУРКАЎ** Абрам Эліеў Герман, мешчанін Пінскага пав. Менскай губ., нарадзіўся ў 1822 г.; залатых, бляхарных і медных спраў майстра, у 1852 г. жыў у Пінску (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 4, спр. 2482, арк. 114 зв. — 115).

III. 1. 1368. **ТУРКЕВІЧ** Давід Гаўсееў, пінскі мешчанін, нарадзіўся ў 1821 г.; у 1852 г. займаўся злотніцкім рамяством, меў пляменніка Айзіка 25 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 2482, арк. 113 зв. — 114).

III. 1. 1369. **ТЭЙСАЎ** Моўша Хлонавіч, мешчанін мяст. Самахвалавічы Менскай губ.; у чэрвені 1846 г. залічаны ў майстры менскага срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 2); у красавіку 1850 г. абраны старшынёй цэха (тамсама, спр. 42, арк. 1 зв.); у 1850—1852 гг. меў вучня Ф. Ледэра (тамсама, спр. 31, арк. 1 зв.); у 1852 г. згадваецца як старшыня цэха (тамсама, спр. 33, арк. 3 — 6 зв.; тамсама, спр. 31, арк. 1).

III. 1. 1370. **УЛЬЯНСКІ** Юда Велькавіч, новагародскі купец II гільдыі, віцебскі злотніцкі майстра; 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 659, арк. 12).

III. 1. 1371. **ФАЙВІШАЎ** Іцка Герцавіч, мешчанін менскага яўрэйскага грамадства; 19.11.1857 унесены ў кнігу майстраў менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха, на той час меў 21 год (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 105, арк. 2 зв. — 3).

III. 1. 1372. **ФАЙН** Айзік Ёселеў Янкелеў, залатых спраў майстра, нарадзіўся ў 1880 г.; у 1887 г. менскі мешчанін, пражывае на вул. Крашчэнскай у доме бацькі; пісьменны, унесены ў спісы асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 3768, арк. 186 зв. —187).

III. 1. 1373. **ФАЙН** Елья Іцкавіч, да 1852 г. быў вучнем у менскага майстры Ш. Любаніна; 28.03 прыняты ў менскі срэбраніцкі цэх (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 3).

III. 1. 1374. **ФАЙН** Лейба Моўшавіч, нарадзіўся ў 1809 г.; у 1849 г. значыцца майстрам менскага срэбраніцкага цэха; у 1852 г. меў сыноў — Моўшу 21 года і Абрама 17 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20; тамсама, спр. 462, арк. 286 зв. — 287).

III. 1. 1375. **ФАЙН** Моўша Лейбавіч, менскі мешчанін; 25.12.1845 прыняты ў лік падмайстраў менскага ювелірнага цэха, у сувязі з беднасцю вызвалены ад уплаты ўступнага ўзносу (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 1 зв.); у 1849 г. значыцца ў ліку майстраў срэбраніцкага цэха (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.).

III. 1. 1376. **ФАЙНГОЛЬД** Вігдэр Ёселевіч, у 1863 г. слонімскі майстра залатых і

срэбраных спраў (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 2180, арк. 205).

III. 1. 1377. **ФАЙНГОЛЬД** Іцка Абрамавіч, у 1863 г. слонімскі майстра залатых і срэбраных спраў (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 2180, арк. 205).

III. 1. 1378. **ФАЙНШТЭЙН** Абрам Янкелеў, менскі «ювилерскі» майстра, нарадзіўся ў 1814 г.; у 1852 г. яго сыну Шмулю 5 гадоў, Пінхусу — 4, Вульфу — паўгода; жыў у г. Глухаве Чарнігаўскай губ. (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 291 зв. — 292).

III. 1. 1379. **ФАКТАРОВІЧ** Берка Меераў, віцебскі мешчанін, майстра залата-срэбраных спраў; фігуруе ў спісе майстраў 1877—1886 гг. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2), у 1892 г. — у спісе віцебскіх майстраў, што маюць права голасу (тамсама, спр. 522, арк. 5); у 1893 г. жыў у 3-й частцы г. Віцебска на вул. Вакзальнай, меў вучня *Я. Фактаровіча* (тамсама, спр. 510, арк. 84 зв.); 13.01.1894 атрымаў гадавы дазвол на права гандлю залатымі і срэбранымі вырабамі (тамсама, спр. 505, арк. 39).

III. 1. 1380. **ФАКТАРОВІЧ** Меер, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1840—1850-я гг. жыў на вул. Смаленскай у доме Рыса (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13); у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (тамсама, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40); у 1868 г. жыў на вул. Смаленскай у доме Бяссмертнага (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 123, арк. 44 зв.).

III. 1. 1381. **ФАКТАРОВІЧ** Янкель Беркаў, віцебскі мешчанін; у 1893 г. вучань у майстры *Б. Фактаровіча*, жыў у 3-й частцы г. Віцебска на вул. Вакзальнай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 84 зв.).

III. 1. 1382. **ФАЛЬК** Вільгельм Канстанцінавіч, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1868 г., залатых спраў майстра; у 1889 г. пражываў у г. Санкт-Пецярбургу на вул. Малай Пад'ячаскай, № 1-96, кв. 27; пісьменны, унесены ў спісы асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 1696, арк. 31 зв. — 32).

III. 1. 1383. **ФАНТАРОВІЧ** Абель, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 39 зв.).

III. 1. 1384. **ФАНТАРОВІЧ** Іцка, віцебскі майстра злотніцкага цэха; у 1866 г. трымаў майстэрню на вул. Смаленскай у доме Цырлі, працаваў «без наёмных работнікаў» (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 108, арк. 29 зв. — 30).

III. 1. 1385. **ФІЛОН** Давід Хацкелавіч, менскі мешчанін; у 1849 г. падмайстра менскага срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49).

III. 1. 1386. **ФІНКЕЛЬ** Сендар, бабруйскі мешчанін; 04.04.1874 запісаны ў вучні на 5 г. і 10 мес. да віленскага ювеліра Л. Нодэльмана (L—V, № 2.241).

III. 1. 1387. **ФІСБОН** Хацэк Хацкелевіч, менскі мешчанін; 25.12.1850 прыняты ў майстры менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 4); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 3).

III. 1. 1388. **ФІТЭРСЭН** Янкель Залманаў, менскі мешчанін; 26.11.1844 паступіў у вучні да менскага майстры залатых спраў С. Белінштэйна на тэрмін у 3 г. і 8 мес. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 4 — 4 зв.).

III. 1. 1389. **ФІШДОН** Хайм Хацкелевіч, мешчанін мяст. Камень Менскага пав.;

04.05.1846 прыняты ў падмайстры менскага срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 1 зв.).

III. 1. 1390. **ФІШКІНД** Залман Ёсель Хаймаў, чашніцкі мешчанін Лепельскага пав. Віцебскай губ.; жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Суражскай у доме Лесіна; у 1889—1892 гг. вучань майстры Л. Х. Лейчына, у 1892—1895 гг. падмайстра ў таго ж майстры; 02.02.1902 звярнуўся ў віцебскую рамесную ўправу з просьбай выдаць яму пасведчанне майстры срабрэння металічных рэчаў «гальванопластическим способом» (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 819, арк. 12—18).

III. 1. 1391. **ФРАЙМАН** Янкель Лейбавіч, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1832 г. падаў заяву віцебскаму грамадзянскаму губернатару аб выдачы яму пашпарта для паездкі ва ўнутраныя губерні Расіі (НГАБ у Мінску, ф. 1430, воп. 1, спр. 3463, арк. 37); у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (тамсама, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40).

III. 1. 1392. **ФРАНКФУРТЭР** Ёсель Беніцыянавіч, воранаўскі мешчанін Лідскага пав.; 18.10.1859 запісаны вучнем на тэрмін у 5,5 г. да віленскага ювеліра Ш. Ш. Крумгальза (L—V, № 2.248).

III. 1. 1393. **ФРЫДЛЯНД** Іцка Беркавіч, ігуменскі мешчанін; у 1849 г. майстра менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20); у 1854 г. менскі срэбраніцкі майстра (тамсама, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 1394. **ФРЫДМАН** Моўша Пейсахавіч, слонімскі мешчанін, нарадзіўся каля 1865 г.; у сакавіку 1895 г. згадваецца як купец II гільдыі, кандыдат на выбарчую пасаду старшыні слонімскага цэха майстраў залатых і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 33, спр. 802).

III. 1. 1395. **ФРЭЙДЭНБЕРГ** Аўгуст (August Freidenberg), 31.10.1804 атрымаў званне майстры віленскага злотніцкага цэха; у 1806 г. працаваў у нясвіжскім двары князёў Радзівілаў (L—V, № 2.249).

III. 1. 1396. **ФРЭНКЕЛЬ** Ерахісель Іцкаў, менскі мешчанін; 12.11.1875 атрымаў атэстат рэзчыка пячатак, быў вучнем менскага майстры (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 164, арк. 12 зв.).

III. 1. 1397. **ФРЭНКЕЛЬ** Іцка Шмуйлаў, у 1854 г. менскі срэбраніцкі майстра (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 1398. **ФУНГОЛЬД** Гірша Ескавіч, запасны радавы м. Варшава, віцебскі майстра; 09.09.1891 атрымаў атэстат часовага майстры бронзава-срэбраных спраў віцебскай злотніцка-срэбраніцкай управы (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 343, арк. 5 зв. — 6); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, спр. 659, арк. 12).

III. 1. 1399. **ХАЙМОВІЧ** Іцка, менскі мешчанін; у 1849 г. падмайстра менскага срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 49).

III. 1. 1400. **ХАЙМОВІЧ** Лейба, злотнік нясвіжскі; у 1801 г. згадваецца ў іску нясвіжскага катлярскага цэха да новастворанага цэха злотнікаў (НГАБ у Мінску, ф. 530, воп. 3, спр. 1, арк. 23 зв. — 29).

III. 1. 1401. **ХАНІН** Шалом, мсціслаўскі мешчанін; 11.05.1887 запісаны майстрам гадзіннікавых спраў у мсціслаўскі

цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў мсціслаўскай агульнай рамеснай управы (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 2).

III. 1. 1402. **ХАРЛІП** Лейзер Шмуйлавіч, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1820 г.; у 1849 г. значыцца майстрам менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.; тамсама, спр. 462, арк. 290 зв. — 291); у 1854 г. згадваецца як майстра (тамсама, спр. 338, арк. 2).

III. 1. 1403. **ХАСІН** Міхель Хайм Еўзераў, веліжскі мешчанін, залатых спраў майстра, нарадзіўся ў 1844 г.; у 1865 г. пражывае ў Веліжы на вул. Смаленскай з бацькамі і іншымі родзічамі (НГАБ у Мінску, ф. 2640, воп. 1, спр. 747, арк. 954 зв.).

III. 1. 1404. **ХАЮЦІН** Вульф Евелеў, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1866 г., залатых спраў майстра; у 1886 г. пражывае ў г. Маскве на завулку Нікіцкім у доме Чыжова; пісьменны, унесены ў спісы асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 1548, арк. 36).

III. 1. 1405. **ХЕЙФЕЦ** Лейба Хонанаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 46 гадоў, яго жонцы Рохлі Беркавай — 46, іх сыну Айзіку — 22, Літману — 13, Аўсею — 12, дачцэ Рохлі — 20; сын Айзік жанаты на Гітлі 20 гадоў, іх дачцэ Мірцы 2 гады (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 74 зв. — 75).

III. 1. 1406. **ХЕЙФЕЦ** Сямён Файбішаў, майстра залатых і срэбраных спраў, нарадзіўся каля 1838 г.; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; меў жонку Міхлю Іцкаўну 20 гадоў, з імі жыла сястра С. Хейфеца Хая 18 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 76 зв. — 77).



*Адбітак пячаткі нясвіжскага казначэйства. Канец XVIII — пачатак XIX ст.*

III. 1. 1407. **ХЕЙФЕЦ** Файбіш Шлёмаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на час рэвізіі яму 22 гады, яго жонцы Перлі — 21 (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 75 зв., 76 зв. — 77).

III. 1. 1408. **ХЕЙФЕЦ** Шлёма Хонанаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на час рэвізіі яму 41 год, яго жонцы Дзіне Беніцыянаўне — 40, іх сынам Файбішу

і Моўшу па 2 гады, дачцэ Рэўзе — 16; Ш. Хейфец меў пляменніка *С. Хейфеца*; «отчислен от семейства» ў 1852 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 3 — 75 зв., 76 зв. — 77).

III. 1. 1409. **ХЕСЕЗ** Моўша Хаймаў, дрызенскі мешчанін, майстра залатых і срэбраных спраў; працаваў у мяст. Асвея (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 27).

III. 1. 1410. **ХЕШЭД** Нохім Моўшавіч, дрызенскі мешчанін, нарадзіўся ў 1829 г.; «грамоты русской не знает... занимается бронзической работой или серебряннык»; у 1865 г. яго жонцы Фейзе 35 гадоў, сыну Моўшу — 15, Хайму — 3, дачцэ Фруме — 12, Яхне — 3 (НГАБ у Мінску, ф. 2502, воп. 1, спр. 62, арк. 414 зв.).

III. 1. 1411. **ХЕШЭС** Абрам Шмуйлавіч, гарадзенскі злотнік; у 1897 г. мае гадавы даход 400 рублёў, пражывае на вул. Мяшчанскай (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 1584, арк. 27).

III. 1. 1412. **ХЕШЭС** Шэпшэль Шмуйлавіч, гарадзенскі злотнік; у 1897 г. займаецца рамонтам рэчаў і гандлем пры майстэрні залатымі вырабамі па даверанасці купца Якава Крынскага, мае гадавы даход 2500 рублёў, пражывае на вул. Саборнай (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 1584, арк. 22).

III. 1. 1413. **ХІДЗЯНКОЎ** Абрам Нохімавіч, у 1863 г. полацкі мешчанін, «золотых и серебряных дел мастер»; на той час «в отлучке»; пражываў ва ўласным доме ў Полацку на вул. Спаскай, д. 210; яму 29 гадоў, яго жонцы Соры-Рыве — 27, дачцэ Зісе — 5 (НГАБ у Мінску, ф. 2523, воп. 1, спр. 5, арк. 412 зв.).

III. 1. 1414. **ЦАРФІН** Завель Зарухавіч, у 1854 г. менскі срэбраніцкі майстра (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 1415. **ЦАРФІН** Лейба Абрамавіч, нарадзіўся ў 1828 г., менскі срэбраніцкі майстра ў 1854 г. (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 3); у 1852 г. меў братоў Зэліка 15 гадоў і Берку 5 гадоў; яны жылі ў драўляным доме на вул. Нямігскай разам з бацькам Л. Царфіна Абрамам Зэлікавым (тамсама, спр. 462, арк. 287 зв. — 288).

III. 1. 1416. **ЦВІКМАН** Абрам Давыдаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 32 гады, яго жонцы Іце Бенецэлевай — 33, іх дачцэ Марголі — 7, Крэйне — 2 (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 72 зв. — 73).

III. 1. 1417. **ЦВІКМАН** Давыд Моўшаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 72 гады, яго [другой] жонцы Рэўцы Янкелевай — 48, дачцэ Давіда Леі — 40 гадоў; меў двух жанатых сыноў — Іцку і Абрама, трэці, Вольф, нарадзіўся каля 1836 г. і памёр у 1852 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 72 зв. — 73).

III. 1. 1418. **ЦВІКМАН** Іцка Давыдаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 42 гады, яго жонцы Гені Еўзеравай — 43, іх сыну Моўшу — 19, Осеру — 16, дачцэ Хаі — 23, Дзіне — 14 (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 72 зв. — 73).

III. 1. 1419. **ЦІПОГРАФ** (Типограф) ... гарадзенскі мешчанін; 06.04.1858 запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. і 3 мес. да віленскага ювеліра *Х. Ціпографа* (L—V, № 2.1012).

III. 1. 1420. **ЦІПОГРАФ** (Типограф) Абрам, гарадзенскі мешчанін; 28.07.1874 запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага злотніка Л. Нодэльмана (L—V, № 2.1010).

III. 1. 1421. **ЦІПОГРАФ** (Типограф) Самуэль, гарадзенскі мешчанін; 23.07.1874 запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага ювеліра Л. Нодэльмана (L—V, № 2.1013).

III. 1. 1422. **ЦІПОГРАФ** (Типограф) Хайм Пейсах Абрамаў, гарадзенскі мешчанін; 23.11.1847 і 05.05.1850 запісаны падмайстрам да віленскага злотніка Ш. Олькіна, 05.06.1852 і 27.01.1855 — да віленскага майстры *Я. Барэлі*; 14.12.1856 атрымаў званне віленскага злотніцкага майстры, прыняты ў цэх; працаваў з падмайстрамі, меў сваіх вучняў, сярод якіх быў *Ціпограф* (1858); апошні раз згадваецца ў 1859 г. (L—V, № 2.1011).

III. 1. 1423. **ЦУКЕРМАН** Абрам, у 1846 г. значыцца майстрам менскага срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 31, арк. 1 зв.).

III. 1. 1424. **ЦУКЕРМАН** Завель Борухавіч, менскі мешчанін, нарадзіўся ў 1819 г.; у 1846 г. прыняты майстрам у менскі срэбраніцкі цэх; у снежні 1847 г. абраны падстаршынёй гэтага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 42, арк. 1); у 1870 г. трымае майстэрню з 1 рабочым (тамсама, ф. 1, воп. 3, спр. 1, арк. 133 зв. — 134; тамсама, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 288 зв. — 289).

III. 1. 1425. **ЦУКЕРМАН** Хацкель Шмуйлавіч, у 1854 г. менскі срэбраніцкі майстра (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2).

III. 1. 1426. **ЦУРАКАЎ** Бейнцык Герцыкаў, лепельскі мешчанін, срэбраных спраў майстра, памёр каля 1844 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2620, воп. 1, спр. 186, арк. 2).

III. 1. 1427. **ЦУТРЫН** Кушэль Моўшавіч, паходзіў з Новагародка; 17.10.1839 запісаны ў вучні на тэрмін у 1 г. да віленскага злотніцкага майстры А. Эпеля (L—V, № 2.152).

III. 1. 1428. **ЦЫВІН** Сімха Аронаў, клімавіцкі мешчанін; 16.10.1885 прыняты майстрам залатых спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 6).

III. 1. 1429. **ЦЫНКЕН** Абрам Нохімавіч, менскі мешчанін; 26.03.1852 прыняты ў майстры менскага срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 5).

III. 1. 1430. **ЦЫНМАН** Аншэль Моўшаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 62 гады, яго [другой?] жонцы Сары Беніёмаўне — 53; меў жанатых сыноў Лейбу, Елью, Хайма і Моўшу; апошні нарадзіўся ў 1831 г. і памёр у 1856 г. (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 69 зв. — 70).

III. 1. 1431. **ЦЫНМАН** Гірша Моўшаў, майстра залатых і срэбраных спраў, запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той

час яму 60 гадоў, яго жонцы Махлі Герцаўне — 59, сыну Ізраілю — 31, жонцы сына Леі Орлікавай — 38; яны мелі дзяцей: сына Орліка 16 гадоў, Аўсея 13 гадоў і дачку Лею 5 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 68 зв. — 69).

III. 1. 1432. **ЦЫНМАН** Давід Моўшаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на час перапісу яму 72 гады, памёр 12.03.1867; яго [другой] жонцы Рэўзе Янкелевай 48 гадоў, сыну Іцку — 42, Абраму — 32, дачцэ Леі — 40 (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 46, арк. 55 зв. — 56).

III. 1. 1433. **ЦЫНМАН** Елья Аншэлеў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 38 гадоў, яго жонцы Песі Пінхусавай — 36; яны мелі дзвюх дачок (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 69 зв. — 70).

III. 1. 1434. **ЦЫНМАН** Зусман Моўшаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на час перапісу яму 66 гадоў, яго жонцы Розе Ізраілевай — 65, іх жанатаму сыну Ізраілю — 34 (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 70 зв. — 71; тамсама, спр. 46, арк. 53 зв. — 54).

III. 1. 1435. **ЦЫНМАН** Ізраіль Зусманаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на час рэвізіі яму 34 гады, яго жонцы Рысі Лейбаўне — 25, з імі жыла падчарыца Бася 8 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 70 зв. — 71).

III. 1. 1436. **ЦЫНМАН** Лейба Аншэлеў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 41 год, яго жонцы Стэрцы Моўшаўне — 40, іх сыну Янкелю — 12, Гіршу — 4, дачцэ Хаі — 15, Юдасі — 10 (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 69 зв. — 70).

III. 1. 1437. **ЦЫНМАН** Хайм Аншэлеў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 25 гадоў, меў жонку Белю Айзікаву (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 69 зв. — 70).

III. 1. 1438. **ЦЫНМАН** Янкель Моўшаў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час яму 62 гады, сыну Лейбу — 41, Елью — 38, Хайму — 25 (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 46, арк. 51 зв. — 52 зв.).

III. 1. 1439. **ЦЫНХЕН** Абрам Мордухаў, менскі «ювилерскі» майстра, нарадзіўся ў 1805 г.; у 1852 г. меў сына Юдэля 20 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 287 зв. — 288).

III. 1. 1440. **ЦЫПКІН** Юдэль Іцкавіч, мешчанін менскага яўрэйскага грамадства; 28.02.1857 унесены ў кнігу майстраў менскага ювелірнага цэха; на той час яму 26 гадоў, меў жонку Мар'яну 20 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 105, арк. 1 зв. — 2).

III. 1. 1441. **ЦЫРЛІН** Лейба Янкелеў Ізраіль Іцкаў, майстра залатых і срэб-

раных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; у 1850 г. яму 69 гадоў, меў сына Ізраіля 41 года; пазнейшая пазнака: «пералічаны разам з сямействам у земляробы» (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 77 зв. — 78; тамсама, спр. 46, арк. 59 зв. — 60).

III. 1. 1442. **ЦЫРФЕР** Абрам Зэлікавіч, менскі мешчанін; у 1844—1847 гг. старшы менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1 зв. — 3); у 1845 г. прыняў вучняў М. Ракаўшчыка і Н. Гантмана (тамсама, спр. 31, арк. 1); у 1850 г. памёр (тамсама, спр. 33, арк. 1).

III. 1. 1443. **ЦЫРФЕР** Лейба Абрамавіч, менскі мешчанін; у 1846 г. прыняты ў майстры менскага срэбраніцкага цэха; у 1850 г. атрымаў дазвол на 3 мес. з'ехаць з Менска (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 42, арк. 2); у 1852 г. меў вучня Ш. Блоха (тамсама, спр. 29, арк. 21).

III. 1. 1444. **ЦЫРЫЛЬСОН** Ёсель, віцебскі мешчанін, падмайстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 41 зв.).

III. 1. 1445. **ЦЫРЫЛЬСОН** Моўша, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.).

III. 1. 1446. **ЦЭЙТЛІН** Евель Нохімавіч, менскі мешчанін; 03.01.1879 атрымаў атэстат майстры злотніцка-срэбраніцкага і ювелірнага рамяства (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 164, арк. 1 зв.); меў вучня А.-Я. Лянду; у 1890 г. старшыня менскага ювелірнага цэха (тамсама, спр. 519, арк. 1—3).



Ё. Аман. *Выраб ліставога (сусальнага) золата. Дрэварыт. XVI ст.*

III. 1. 1447. **ЦЭЙТЛІН** Зэлік Зэлікаў, магілёўскі мешчанін шклоўскага грамадства; 12.05.1888 атрымаў «дозволительный лист» на гальванапластычнае залачэнне і срабрэнне металічных рэчаў на тэрмін да 31.12.1888 (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 405, арк. 50).

III. 1. 1448. **ЦЭЙТЛІН** Іцка Лейбавіч, 13.04.1858 прыняты ў вучні менскім майстрам Бейлінам на тэрмін у 3 г. (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 83, арк. 1 зв. — 2); у 1870 г. меў уласную майстэрню ў г. Менску, працаваў «без работнікаў» (тамсама, ф. 1, воп. 3, спр. 1, арк. 124 зв. — 125).

III. 1. 1449. **ЦЭЙТЛІН** Лейба (Абрам Лейба) Нахманаў, залатых спраў майстра, нарадзіўся ў 1875 г.; у 1894 г. менскі

мешчанін, пражывае на вул. Ракаўскай у доме Інчыка; пісьменны, унесены ў спісы асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 3137, арк. 180 зв. — 181).

III. 1. 1450. **ЦЭЙТЛІН** Лейба Нохімавіч, у 1844 г. прыняты ў вучні менскім майстрам Г. Рубенчыкам; за хлопца ўнёс гарантыі яго бацька Нохім (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 2 зв. — 3).

III. 1. 1451. **ЦЭЙТЛІН** Міхель Лейбавіч, менскі мешчанін; 26.03.1852 прыняты ў падмайстры менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 4 зв.).

III. 1. 1452. **ЦЭЙТЛІН** Нахман Лейбавіч, менскі мешчанін; 26.03.1852 прыняты ў падмайстры менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 4 зв.).

III. 1. 1453. **ЦЭЙТЛІН** Ошэр, менскі мешчанін; у 1890 г. майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 1454. **ЦЭЙТЛІН** Янкель Лейбавіч, да 1844 г. запісаны ў падмайстры менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 30, арк. 1).

III. 1. 1455. **ЧАРНЯК** Беньямін Кушэлеў, хославіцкі мешчанін Магілёўскай губ.; 25.05.1887 прыняты майстрам залатых спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 9); 25.05.1888 атрымаў пасведчанне майстры на 1 г. (тамсама, спр. 24, арк. 101); 15.11 выключаны з цэха (тамсама, спр. 14, арк. 9).

III. 1. 1456. **ЧАРНЯК** Гершань Хаймаў, мсціслаўскі мешчанін мяст. Хославічы; рамяство «по промыслу часовых и золотых дел» вывучаў з 1878 г. у майстры Ю. Гурэвіча; 09.03.1883 атрымаў пасведчанне майстры залатых спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскім цэху залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 7, арк. 69—71).

III. 1. 1457. **ЧАРТОК** Мордух Абрамавіч, менскі мешчанін; 17.08.1844 прыняты ў падмайстры менскага ювелірнага цэха, у сувязі з беднасцю вызвалены ад уплаты ўступнага ўзносу (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 1).

III. 1. 1458. **ЧАРЦЯНКОЎ** Іван, менскі майстра срэбраных спраў у 1878 г. (РЗиСД, с. 201).

III. 1. 1459. **ЧЭСКІН** Іцка Лейбавіч, нарадзіўся ў 1863 г. у г. Лідзе; у 1893 г. адкрыў сваю справу ў Вільні; у тым жа годзе атрымаў дазвол віленскай рамеснай управы на працу без вучняў і падмайстраў (L—V, № 2.158).

III. 1. 1460. **ШАДХІН** Абрам-Гірша Аронаў, віцебскі майстра; у 1892 г. згадваецца ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 659, арк. 50); у 1893—1896 гг. меў вучня *З. Шубіка*; 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, спр. 659, арк. 11).

III. 1. 1461. **ШАЛАНТ** Габрыэль Беркаў, дрызенскі мешчанін, майстра залатых і срэбраных спраў у 1817 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 27).

III. 1. 1462. **ШАЛЯР** Аўсей, менскі мешчанін, майстра залатых спраў; у 1870 г. працуе без работнікаў ва ўласнай майстэрні на вул. Койданаўскай

(НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 3, спр. 1, арк. 120 зв. — 121).

III. 1. 1463. **ШАПІРА (САПІРА)** Шая Шмеркаў, віцебскі мешчанін; 09.07.1889 атрымаў атэстат «вечнага» майстры злотніцка-срэбраніцкага рамяства (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 439, арк. 136 зв. — 137); у 1892 г. фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў (тамсама, спр. 522, арк. 5 зв.), 03.06.1897 — у спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, спр. 659, арк. 11 зв.).

III. 1. 1464. **ШАПІРА (САПІРА)** Шмерка Ехіэль Шмеркаў, віцебскі мешчанін, падмайстра злотніцкай управы, майстра злотніцкага цэха, нарадзіўся ў 1845 г.; у 1860—1863 гг. разам са старэйшым братам пражывае на вул. Кавальскай у доме Ф. Я. Дыменштэйна (НГАБ у Мінску, ф. 2631, воп. 2, спр. 2, арк. 1499 зв.); у 1866—1868 гг. трымае майстэрню на вул. Смаленскай у доме Бескіна, працуе «без наёмных работнікаў» (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 108, арк. 27 зв. — 28; тамсама, спр. 123, арк. 44 зв.); 02.09.1870 атрымаў пасведчанне на права займацца залатымі і срэбранымі работамі, заплаціў за яго 2 рублі 50 капеек (тамсама, спр. 147, арк. 10); 07.09.1872 атрымаў ад смаленскай рамеснай управы пасведчанне часовага майстры (тамсама, спр. 439, арк. 82); фігуруе ў спісе майстраў 1877—1886 гг. (тамсама, спр. 249, арк. 2); 05.01.1889 за крадзеж рэчаў прыгавораны да заключэння ў арыштанцкім аддзяленні на тэрмін у 2 г. і 9 мес. (тамсама, спр. 439, арк. 88 — 88 зв.); у 1892 г. фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў, тут жа пазначана, што адбываў турэмнае пакаранне (тамсама, спр. 522, арк. 5 зв.); у 1897—1898 гг. упамінаецца ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, спр. 659, арк. 10 зв.).

III. 1. 1465. **ШАПІРА (САПІРА)** Шмуйла, віцебскі злотніцкі падмайстра ў 1840—1850-я гг. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13 зв.).

III. 1. 1466. **ШАПІРА (САПІРА)** Юдэль Завелеў, менскі «ювилерскі» майстра, нарадзіўся ў 1806 г.; у 1852 г. меў сына Лейбу 19 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 290 зв. — 291).

III. 1. 1467. **ШАРНАЎ** Зусман Вульфаў, менскі «ювилерскі» майстра, нарадзіўся ў 1819 г.; у 1852 г. дзеючы майстра (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 291 зв. — 292).

III. 1. 1468. **ШАРЭР** Абрам Ёселеў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на складанне рэвізскай казкі разам з сынамі не з'явіўся; паводле матэрыялаў 9-га перапісу ў 1850 г., яму 47 гадоў, меў сыноў: Нохіма 1837 г.н., Абеля 1841 г.н. і Герцаля 1848 г.н. (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 70 зв. — 71).

III. 1. 1469. **ШАФІРЭ** ... менскі майстра срэбраных спраў у 1878 г. (РЗиСД, с. 201).

III. 1. 1470. **ШАФРЫН** Беньямін Лейбавіч, мешчанін лагойскага яўрэйскага грамадства Барысаўскага пав., рэзчык пячатак; 17.03.1852 прыняты ў лік падмайстраў менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 4).

III. 1. 1471. **ШАХІН** Абрам Аронаў, віцебскі мешчанін; у 1893 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Смаленскай; падмайстра ў майстраў П. Кабака і К. Рыўкіна



*Адбітак пячаткі маршалка Барысаўскага пав.*

(НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 84).

III. 1. 1472. **ШВАБ** Файбіш Абелеў, бабруйскі жыхар, майстра срэбраных спраў; у 1848—1863 гг. згадваецца ў справе аб гандлі некляймёнымі і сфальшаванымі вырабамі (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 3923, арк. 34).

III. 1. 1473. **ШВАБСКІ** ... дваранін, полацкі майстра залатых і срэбраных спраў у 1817 г. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 37 зв.).

III. 1. 1474. **ШВАРЦ** Фалька Файбішаў, віцебскі мешчанін; 08.03.1873 прайшоў атэстацыю ў Віцебску; 15.11 атрымаў «дозволение» маскоўскай рамеснай управы на права займацца рамяством, 07.11.1889 — атэстат «вечнага» майстры золата-срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 343, арк. 3 зв. — 4); 03.06.1897 фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, спр. 659, арк. 11 зв.).

III. 1. 1475. **ШВЕЙЦЭР** Зуся-Іцка Еўзераў, віцебскі майстра ў 1897—1898 гг.; фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 659, арк. 11).

III. 1. 1476. **ШКЛОЎСКІ** Залман, бабруйскі злотніцкі майстра; у канцы 40-х — пачатку 50-х гг. XIX ст. займаўся вырабам нізкапробных залатых і срэбраных рэчаў і іх рэалізацыяй, пры гэтым накладваў фальшывае кляйно з лічбай «84» (НГАБ у Мінску, ф. 299, воп. 2, спр. 3923, арк. 3—5).

III. 1. 1477. **ШЛЁМАВІЧ** Берка, дзінабургскі майстра залатых і срэбраных спраў; у 1821 г. тутэйшым гарадавым у яго забраны і адпраўлены ў Віцебскую проберную палатку штэмпель для кляймення вырабаў (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 242).

III. 1. 1478. **ШЛІЁЗБЕРГ** Ёсель Ёселевіч, пінскі злотніцкі майстра; 20.12.1897 атрымаў ад віленскай рамеснай управы права працаваць ювелірам (L—V, № 2.963).

III. 1. 1479. **ШМУЙЛОВІЧ** Абрам, менскі мешчанін; у 1849 г. майстра менскага злотніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20).

III. 1. 1480. **ШМУЙЛОВІЧ** Ізраіль, у 1818 г. віцебскі майстра залатых і срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 57).

III. 1. 1481. **ШМУЛІЁВІЧ** Хайм Шмуйлавіч, злотнік Гарадзенскай губ.; у 1897 г. пражывае ў мяст. Саколка; меў гадавы абарот у 50 рублёў (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 1584, арк. 28).

III. 1. 1482. **ШМЯРКОВІЧ** Гоўсей Шмеркаў, злотнік м. Нясвіж Слуцкага пав.; у 1816 г., паводле рэвізскай казкі мяшчан-яўрэяў, яму 19 гадоў, меў жонку Роху 20 гадоў і дачку Гіту 2 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 220, арк. 662 зв. — 663).

III. 1. 1483. **ШНЕЙМАН** Файбіш, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.).

III. 1. 1484. **ШПІРА** Міхель-Фішэль Хайкелеў (Хайкелевіч), слонімскі мешчанін; у сакавіку 1891 г. меў 25 гадоў ад нараджэння, кандыдат на пасаду старшыні слонімскага цэха майстраў залатых спраў і «часовщиков» (НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 33, спр. 802).

III. 1. 1485. **ШПОЛЬНІНГ** Вульф, віцебскі мешчанін, майстра золата-срэбраных спраў; фігуруе ў спісе майстраў 1877—1886 гг. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 249, арк. 2 зв.).

III. 1. 1486. **ШТРАЙШТЭЙН** Айзік Абрамавіч, майстра менскага ювелірнага цэха; у 1844 г. жыў у Смалявічах (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1).

III. 1. 1487. **ШТЫН** Залман Евелеў, мсціслаўскі мешчанін; 09.12.1884 прыняты майстрам залатых і срэбраных спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 5).

III. 1. 1488. **ШТЭЙБЕРГ** Моўша Хайм Лейзеравіч, гарадзенскі мешчанін; 17.02.1887 запісаны вучнем на тэрмін у 4 г. да віленскага ювеліра А. Н. Глезера; 06.02.1891 працуе падмайстрам у віленскага ювеліра *Ш. Арановіча* (L—V, № 2.978).

III. 1. 1489. **ШТЭЙЗАНД** Лейба, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1860 г. жыў у 1-й частцы г. Віцебска (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.).

III. 1. 1490. **ШТЭЙН** Мендэль Моўшавіч, менскі мешчанін; у 1849 г. значыцца майстрам менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.); у 1852 г. яму 48 гадоў, меў сына Мордуха 28 гадоў (тамсама, спр. 462, арк. 288 зв. — 289).

III. 1. 1491. **ШТЭЙН** Янкель Моўшавіч, у 1862 г. ваўкавыскі майстра залатых і срэбраных спраў (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 2180, арк. 182 зв.).

III. 1. 1492. **ШУБ** Абрам Моўшавіч, чэрыкаўскі мешчанін мяст. Крычава; 08.02.1887 прыняты майстрам, рэзчыкам пячатак, на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 7 зв.).

III. 1. 1493. **ШУБІК** Залман Сімон Мееравў, віцебскі мешчанін; з 20.04.1893 па 08.04.1896 быў вучнем у майстры *А.-Г. Шадхіна*; у 1902 г. жыў у 3-й частцы г. Віцебска па вул. Арлоўскай у доме Хаўкіна (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 819, арк. 2).

III. 1. 1494. **ШУНЕР** Зэлік Капланаў, менскі «ювилерскі» майстра, нарадзіўся ў 1802 г.; у 1852 г. дзеючы майстра (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 288 зв. — 289).

III. 1. 1495. **ШУПЕР** Елья Калманавіч, менскі мешчанін; у 1849 г. значыцца майстрам менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.).

III. 1. 1496. **ШУР** Ёсель Залманаў, віцебскі мешчанін; у 1893 г. вучань у майстры

*Б. Мезінскага*, жыў у 2-й частцы г. Віцебска на вул. Замкавай (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 510, арк. 84 зв.).

III. 1. 1497. **ШЫМАНОВІЧ** Лейзер, да 1844 г. запісаны ў падмайстры менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 1).

III. 1. 1498. **ШЫМЕНЧЫК** Моня Аронаў, койданаўскі мешчанін, нарадзіўся ў 1871 г., залатых спраў майстра; у 1890 г. пражывае ў г. Менску ў доме Вендорфа; непісьменны, унесены ў спісы асоб, якія падлягаюць прызыву на вайсковую службу (НГАБ у Мінску, ф. 1, воп. 1, спр. 2120, арк. 19).

III. 1. 1499. **ШЫФЕРС** Моўша-Мордухель Самуілавіч, гарадзенскі майстра залатых спраў; жыў у доме Шылінгера на Парадной плошчы; у 1897 г. прыцягнуў увагу Віленскай пробернай палаткі ў сувязі з падазрэннем, што заніжаў пробу каштоўнага металу ў вырабах (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 1620, арк. 6); 13.08.1898 атрымаў пастанову віленскай акруговай управы «о сломке» яго вырабаў, таму што яны не прайшлі пробы (тамсама, спр. 1680, арк. 61); у студзені 1899 г. мае гадавы даход «адзін фунт золата» (тамсама, спр. 1641, арк. 2).

III. 1. 1500. **ШЫФЕРС** Янкель-Меер, гарадзенскі майстра залатых спраў, жыў у доме Бергмана на вул. Мяшчанскай; у 1897 г. трымаў падмайстру і 2 вучняў, меў гадавы абарот 400 рублёў (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 1584, арк. 24); прыцягнуў увагу Віленскай пробернай палаткі ў сувязі з падазрэннем, што заніжаў пробу каштоўнага металу ў вырабах (тамсама, спр. 1620, арк. 6); 17.02.1898 атрымаў пастанову віленскай акруговай пробернай управы «о сломке» 11 залатых кольцаў і срэбранага тавара, таму што гэтая прадукцыя не прайшла пробы (тамсама, арк. 12); у 1899 г. трымаў 2 вучняў і меў гадавы даход да 400 рублёў (тамсама, спр. 1641, арк. 1).

III. 1. 1501. **ШЫФРЫН** Абрам Лейзеравіч, лагойскі мешчанін; у 1849 г. значыцца майстрам менскага злотніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20 зв.).

III. 1. 1502. **ШЫФРЫН** Меер Беньянаў, клімавіцкі мешчанін мяст. Хоцімск; 02.03.1887 прыняты майстрам залатых і срэбраных спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў; у сувязі з заканчэннем тэрміну выключаны з цэха (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 8 зв.).

III. 1. 1503. **ШЫФРЫН** Моўша-Мордухель Самуйлаў, гарадзенскі злотнік; у 1897 г. прыцягнуў увагу Віленскай пробернай палаткі ў сувязі з падазрэннем, што заніжаў пробу каштоўнага металу ў вырабах (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 1620, арк. 4).

III. 1. 1504. **ШЫФРЫН** Янкель Меер, гарадзенскі злотнік; прыцягнуў увагу Віленскай пробернай палаткі ў сувязі з падазрэннем, што заніжаў пробу каштоўнага металу ў вырабах (НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 1, спр. 1620, арк. 4).

III. 1. 1505. **ШЭЙНКМАН** Давід, віцебскі злотніцкі падмайстра ў 1840—1850-я гг. (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13 зв.).

III. 1. 1506. **ШЭЛІХАЎ** Сямён Якімавіч, рослаўскі мешчанін, майстра розных залатых спраў; у кастрычніку 1850 г. атрымаў падрад і накіраваўся ў Полацак для ўнутраных работ у Сафійскім

саборы (НГАБ у Мінску, ф. 1297, воп. 1, спр. 21335, арк. 1—9); у 1867 г. «заведуе залатарнай» майстэрняй у Віцебску на Сабарнай плошчы ў доме Фроса (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 109, арк. 38 зв.).

III. 1. 1507. **ШЭНКМАН** Шая Давыдаў, віцебскі мешчанін, 06.06.1888, пасля атэстацыі майстрам Б. Дыменштэйнам і іспытаў экспертаў, атрымаў атэстат «вечнага» майстры золата-срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 343, арк. 1 зв. — 2).

III. 1. 1508. **ШЭНКМАН** Шмуйла, дзісненскі мешчанін; у 1868 г. майстра віцебскага злотніцкага цэха, жыў у Віцебску на вул. Шасэйнай у доме Позіна (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 123, арк. 45).

III. 1. 1509. **ШЭРМАН** Залман, мешчанін Барысаўскага пав.; у 1849 г. значыцца майстрам менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 338, арк. 20).

III. 1. 1510. **ШЭФТЭЛЬ** Ізраіль-Юда Іцкаў, лепельскі мешчанін мяст. Чашнікі; 22.06.1893 атрымаў у лепельскай спрошчанай рамеснай управе пасведчанне майстры (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 626, арк. 1); 12.08.1894 прасіў віцебскую рамесную ўправу аб выдачы яму часовага пасведчання на званне майстры «серебрянника и позолотчика посредством гальванирования»; падчас іспытаў «оказалось, что Шефтель своего ремесла не знает» (тамсама); 26.05.1895 «за самовольное производство им ремесла» у яго «заведении... находившемся по Ильинскому переулку в доме Залмана Шадхана» канфіскаваны старшымі цэха прылады працы і вырабы (тамсама, арк. 3—4); 07.06.1895 віцебская рамесная ўправа данесла аб прыцягненні яго «в порядке уголовном к ответственности за невыборку свидетельства» і «за обманное присвоение себе вымышленной фабричной промышленности, которая не существовала и не существует» (тамсама, арк. 2); 12.08.1895 вынесены прыгавор міравога суддзі, паводле якога віцебская рамесная ўправа не мела права знішчаць пасведчанне І.-Ю. Шэфтэля на права займацца рамяством і «подвергать» новым іспытам, у сувязі з гэтым неабходна лічыць яго апраўданым па справе і канфіскаваныя ў яго рэчы і прылады працы вярнуць (тамсама, арк. 12 — 12 зв.); 14.08.1895 датуецца пастанова Віцебскага губернскага праўлення на імя віцебскай рамеснай управы аб аб'яўленні І.-Ю. Шэфтэля цэхавым майстрам названага рамяства і дазволіць яму адкрыць майстэрню (тамсама, арк. 19); 22.08.1895 напісана апеляцыйная скарга віцебскай рамеснай управы з'езду міравых суддзяў на рашэнне міравога суддзі па справе І.-Ю. Шэфтэля, слуханне справы было прызначана на 22.11.1895 (тамсама, арк. 13—16); 29.03.1895 датуецца пастанова Віцебскай гарадской думы па скарзе І.-Ю. Шэфтэля на рамесную ўправу, якой прадпісана без затрымак вярнуць «заарыштаваныя» прылады працы, запісаць яго ў цэх і дазволіць займацца рамяством, а пасля прадстаўлення пасведчанняў аб вучэнні і падмайстэрстве «предоставить» яму званне майстры (тамсама, арк. 20, 23); 10.10.1895 накіраваны запыт пракурора Віцебскага акруговага суда да віцебскай рамеснай управы, чаму «да сяго часу» не выкананы прыгавор міравога суддзі ад 12.08.1895 (тамсама, арк. 24); 23.11.1895 датуецца адказ рамеснай управы на пракурорскі запыт, у якім

падкрэслена, што І.-Ю. Шэфтэлю «производить ремесло… без учеников и подмастерьев… не возбранялось» (тамсама, арк. 26); 05.02.1896 пасведчанне веліжскага медна-бляхарнага цэха на права рабіць «серебряничество и позолочение» розных металёвых вырабаў у 1896 г. зафіксавана ў Рыжскай пробернай палатцы (тамсама, арк. 28); 14.01.1897 паступіла прашэнне майстры І.-Ю. Шэфтэля, які жыў у 1-й частцы г. Віцебска на вул. Афіцэрскай у доме Кагана, аб выдачы яму пасведчання на права займацца рамяством у 1897 г. (тамсама, арк. 27).

III. 1. 1511. **ЭБЕРТ** Ян (Jan Ebert), 16.09.1807 запісаны вучнем на 6 г. да гарадзенскага злотніцкага майстры *І. Колса*; 12.08.1809 залічаны падмайстрам у віленскі злотніцкі цэх (L—V, № 2.207).

III. 1. 1512. **ЭВЕНЧЫК** Меер Рубінаў, койданаўскі мешчанін; жыў у Менску на вул. Замкавай у доме Шрэйдэля; у 1897 г. у 15-гадовым узросце паступіў у вучні да майстры *М. Кморына* для абучэння гравёрнаму рамяству (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 955, арк. 7—10); 10.02.1900 прасіў менскае рамеснае таварыства выдаць яму пасведчанне работніка гравёрнага рамяства, што было задаволена 11.02 (тамсама, арк. 7).

III. 1. 1513. **ЭДЭЛЬШТЭЙН** Іцка, віцебскі мешчанін, майстра злотніцкай управы; у 1840—1850-я гг. жыў на вул. Афіцэрскай у доме З. Эпштэйна (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 17, арк. 13), у 1860 г. — у 1-й частцы г. Віцебска (тамсама, ф. 1416, воп. 2, спр. 11540, арк. 40 зв.); у 1892 г. фігуруе ў спісе віцебскіх майстраў (тамсама, ф. 2505, воп. 1, спр. 522, арк. 5 зв.) і ў спісе майстраў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якія маюць права голасу на грамадскіх сходах (тамсама, спр. 659, арк. 50).

III. 1. 1514. **ЭПШТЭЙН** Ёсель Ёселевіч, у 1844 г. майстра менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 33, арк. 1).

III. 1. 1515. **ЭПШТЭЙН** Лейба Залманавіч, нарадзіўся ў 1771 г. у г. Лідзе; у 1813 г. зарэгістраваны ў кнізе віленскага злотніцкага яўрэйскага цэха разам з жонкай і сынам (L—V, № 2.223).

III. 1. 1516. **ЭПШТЭЙН** Мордух Бора Моўшаў, хославіцкі мешчанін; 16.10.1885 прыняты майстрам залатых спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мін-ску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 6).

III. 1. 1517. **ЭПШТЭЙН** Смугель Абрамаў, хославіцкі мешчанін, радавы мяст. Хославічы Мсціслаўскага пав.; у 1885 г. займаецца «золотым делом» (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 24, арк. 81—82); 08.05.1887 прыняты майстрам залатых спраў на тэрмін у 1 г. у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў; 15.10.1888 выключаны з цэха (тамсама, спр. 14, арк. 9).

III. 1. 1518. **ЭПШТЭЙН** Шлёма Лейзераў, пінскі мешчанін, нарадзіўся ў 1822 г.; у 1852 г. займаецца злотніцкай, бляхарнай і медніцкай справай (НГАБ у Мінску, ф. 333, воп. 9, спр. 2482, арк. 113 зв. — 114).

III. 1. 1519. **ЭСПКІН** Ёсель Меераў, майстра залатых і срэбраных спраў; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; на той час

яму 29 гадоў, меў жонку Слову Абрамаву 27 гадоў і дзяцей: сына Вільку 7 гадоў і дачку Хану 5 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 73 зв. — 74).

III. 1. 1520. **ЭСПКІН** Меер Лейбаў, майстра залатых і срэбраных спраў, нарадзіўся каля 1798 г.; запісаны ў кнізе 10-га народнага перапісу ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства ў 1858 г.; памёр у 1855 г.; меў сына Ёселя (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 15, арк. 73 зв. — 74).

III. 1. 1521. **ЭТЭЛЬТЭЕН** Іцка Есьманаў, віцебскі мешчанін, залатых і срэбраных спраў майстра, нарадзіўся ў 1841 г.; у 1863 г. мае сына Моўшу 1½ года, пражывае на вул. Дварцовай на кватэры *Ш. Роніна*, там жа знаходзіцца лаўка перакупу золата і срэбра (НГАБ у Мінску, ф. 2631, воп. 2, спр. 2, арк. 723 зв.).

III. 1. 1522. **ЭФРОН** Іцка Ізраілевіч, паходзіў з Менскай губ.; 05.02.1875 запісаны вучнем на тэрмін у 4,5 г. да ўдавы віленскага злотніка А. Дрохеса-Рохлі; 21.06.1879 заплаціў у віленскі яўрэйскі злотніцкі цэх падмайстроўскі ўзнос у памеры 50 капеек (L—V, № 2.208).

III. 1. 1523. **ЮДЭЛЕВІЧ (ЮДОВІЧ)** Хайм, злотнік нясвіжскі; у 1801 г. згадваецца ў іску нясвіжскага катлярскага цэха да новастворанага цэха злотнікаў (НГАБ у Мінску, ф. 530, воп. 3, спр. 1, арк. 23 зв. — 29).

III. 1. 1524. **ЮНІС** Гірша Рафалавіч, менскі мешчанін; 18.03.1850 залічаны ў падмайстры менскага ювелірнага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 32, арк. 3 зв.); у 1870 г. меў уласную майстэрню на Саборнай плошчы г. Менска (тамсама, ф. 1, воп. 3, спр. 1, арк. 48 зв. — 49).

III. 1. 1525. **ЮНІС (ЮНЕС)** Нохум, менскі мешчанін; у 1890 г. майстра злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 1526. **ЮНІС** Шлёма, менскі мешчанін; у 1890 г. майстра менскага злотніцка-срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 577, арк. 1).

III. 1. 1527. **ЮНІС** Шмойла Моўшавіч, у 1854 г. менскі срэбраніцкі майстра (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 770, арк. 2 зв.).

III. 1. 1528. **ЮНІС** Янкель Рафалаў, менскі «ювилерскі» майстра, нарадзіўся ў 1817 г.; у 1852 г. меў брата Гіршу 28 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 462, арк. 286 зв. — 287).

III. 1. 1529. **ЮНІС** Янкель Шмуйла, менскі мешчанін; са снежня 1847 па 1852 г. падстаршыня менскага срэбраніцкага цэха (НГАБ у Мінску, ф. 10, воп. 1, спр. 42, арк. 1 зв.; тамсама, спр. 33, арк. 6 зв.).

III. 1. 1530. **ЯВІЧ** Перац Хаймаў Шмерка Мееравіч, віцебскі мешчанін; 18.04.1890 атрымаў атэстат «вечнага» майстры золата-срэбраных спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2505, воп. 1, спр. 343, арк. 4 зв. — 5); у 1897—1898 гг. фігуруе ў спісе цэхавых майстраў, якія маюць права голасу падчас выбараў кіраўніцтва цэха (тамсама, спр. 659, арк. 11 зв.).

III. 1. 1531. **ЯНАВІЦКІ** Гірша Неўхавіч, гарадоцкі злотніцкі майстра; у 1817—1824 гг. працаваў са сваім сынам Шмулем; [меў сына Мендэля?] (НГАБ у Мінску, ф. 1297, воп. 1, спр. 786, арк. 14; тамсама, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 51 зв.).



*Адбітак пячаткі нясвіжскага казначэйства. Першая палова XIX ст.*

III. 1. 1532. **ЯНАВІЦКІ** Шмуля Гіршаў, гарадоцкі мешчанін; у 1824 г. працаваў разам са сваім бацькам Гіршам (НГАБ у Мінску, ф. 1297, воп. 1, спр. 786, арк. 14; тамсама, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 51 зв.).

III. 1. 1533. **ЯНКЕЛЕВІЧ** Яўна [Лейбавіч] (Jankelewicz Jawna), злотнік і зэгармістр, «жыд нясвіжскі»; у 1801 г. згадваецца ў іску нясвіжскага катлярскага цэха да новастворанага цэха злотнікаў (НГАБ у Мінску, ф. 530, воп. 3, спр. 1, арк. 23 зв. — 29); 02.09.1809 жыў разам са сваёй маткай у камяніцы на вул. Віленскай; прасіў радзівілаўскі скарб даць яму і матцы пазыку са зваротам па 60 чырвоных злотых для адбудовы свайго дома, што згарэў падчас пажару; прашэнне было задаволена часткова: ім пазычылі палову жаданай сумы (AGAD, AR, dz. XXI, j — 174).

III. 1. 1534. **ЯРОХАЎ** Берка Гіршаў, «старинный здешний» мешчанін г. Веліжа, нарадзіўся ў 1793 г., майстра срэбранага майстэрства; згадваецца як майстра залатых і срэбраных спраў у 1817—1821 гг. (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 217); у 1827 г. меў дом у Новай Слабадзе г. Веліжа (тамсама, воп. 1, спр. 240, арк. 137 зв. — 138).

III. 1. 1535. **ЯСЕНКІН** Меер Лейбаў, майстра залатых і срэбраных спраў; у 1850 г. яму 52 гады; памёр у 1855 г.; значыўся ў рэвізскіх казках мсціслаўскага яўрэйскага грамадства; меў сына Ёселя 29 гадоў і ўнука Вельку 7 гадоў (НГАБ у Мінску, ф. 2151, воп. 2, спр. 46, арк. 55 зв. — 56).

III. 1. 1536. **ЯЎЛІНСКІ** Гірша Янкелеў, мсціслаўскі мешчанін; 25.11.1884 прыняты «на неабмежаваны час» майстрам гадзіннікавых і залатых спраў у мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, медных, бляхарных і гадзіннікавых спраў (НГАБ у Мінску, ф. 2106, воп. 1, спр. 14, арк. 2).

III. 1. 1537. **ЯЎНОВІЧ** Агія Лейбавіч, менскі мешчанін; у 1849 г. значыцца ў спісе майстраў ювелірнага цэха г. Менска (НГАБ у Мінску, ф. 24, воп. 1, спр. 333, арк. 20).

III. 2. 1538. … … майстра залатых і срэбраных спраў; у 1821 г. дрызенскім гарадавым у яго забраны і адпраўлены ў Віцебскую пробірную палатку 2 штэмпелі для кляймення вырабаў (НГАБ у Мінску, ф. 1416, воп. 4, спр. 837, арк. 223).


1619

# КЛЕЙНЫ-ІМЕННІКІ

Іменнікі злотнікаў выконваліся на лацініцы, перад прозвішчам часта ставілася першая літара імя яго ўладальніка. У дадзеных табліцах прозвішчы злотнікаў пададзены на беларускай кірыліцы ў алфавітным парадку.




АБЕДЗІНСКІ Ц.
ДАНІШЭЎСКІ
(падвойнае кляйно)




БАРУХОВІЧ Х.




БЕГАК Р.




БЕРАНШТЭЙН Е. (III. 1. 709)




ВАГНЕР К.




ВЕРНЕР Т. (III. 1. 751)




ВІНДЫШ Е.




ВІНДЫШ Т.




ГАН І.




ГОЛЬД М.




ГОЛЬДСМІД М.




ДАНІШЭЎСКІ І. (III. 1. 840)




ДАМ Я. (І. 1. 112)




ДЗЯКОЎСКІ С. (III. 1. 841)




ЗАБЕЦКІ (III. 1. 886)




ЕПЕЛЬ А.




ЕПЕЛЬ М.




КАЦ Х.




КЛІМОВІЧ (III. 1. 979)



КРУПІНСКІ Л.




КРУМГАЛЬЗ Х.



КРУМГАЛЬЗ Ш.




ЛІПМАН М. (III. 1.1053)




МАГАТ А.




МАЕР Ф.




НЕВЯДОМСКІ М.




ПАГАРЭЛЬСКІ (ІІІ. 1. 1153)



(кляйно — у авале галава аленя)




ПЯРКОЎСКІ Л.




РАБІНОВІЧ Ю.




РОЙЗМАН (ІІІ. 1. 1229)




РОХР Л.




РЫДЭЛЬ А. (ІІІ. 1. 1258)




РЫКМАН Ф.




СВІНЯРСКІ М. (ІІІ. 1. 1293)




СЯНКЕВІЧ С.




ШАКАЎ М.




ШАФІРЭ (ІІІ. 1. 1469)




ШЭЙНКЕР Л.




ЯСТРЖЭМБСКІ С.




ЯЛОЎЦЫН Ш.

## КЛЕЙНЫ З ІНІЦЫЯЛАМІ




АДАМОЎСКІ




БЕГАК Р.




БЛЕНДЭР Р.




ГОЛЬД Л.




ГОЛЬДСМІД М.




ДАНІШЭЎСКІ В.




ДАНІШЭЎСКІ І. (ІІІ. 1. 840)




ЕПЕЛЬ А.




КАЦ Х.




КРУМГАЛЬЗ Ш.




КУЛЬМГРЫН І.

МЛ ЛІПМАН М. (ІІІ. 1. 1053)

АЛ ЛУК’ЯНАЎ А.

SLM МАНЧУНСКІ С.

ММ
ММ МІНЦЭВІЧ М.

Г.М МІХАЛІНСКІ Г.

MN НЕВЯДОМСКІ М.

Ю·Р РАБІНОВІЧ Ю.

СС СЯНКЕВІЧ С.

ШТ ТАЙК Ш.


ТАПАЗ Б. (ІІІ. 1. 1347)


ТАТАРСКІ М. (ІІІ. 1. 1355)

Н | Т


ТРЫЛЬНЕР Г. (І. 1. 1360)

ВТ ТУРКЕС Б.

ЕС ХАБАС Е.

AS ШМЕЛЬ А.

PS ШТЫРМЕР П.


ШТЭЙЗАНД Л. (ІІІ. 1. 1489)

СШ ШТЭЙНБЕРГ С.

М · Ш ШЫФЕРС Я.-М. (ІІІ. 1. 1500)

Ш·Я ЯЛОЎЦЫН Ш.

WJ ЯСТРЖЭМБСКІ В.

SJ ЯСТРЖЭМБСКІ С.

ЛГ Нявызначаны майстра (магчыма, варыянт кляйна Л. Гольда)



# ПРЫВІЛЕІ ЗЛОТНІЦКІМ ЦЭХАМ

## БЯРЭСЦЕ

### CONFIRMATIA CECHU ZLOTNICZEGO BRZESKIEGO

WLADYSLAW IV...

...Pokladany byl przed Nami Prywiley S Pamięci KrJeMsc Zygimonta trzeciego Pana Oyca Naszego podpisany y pieczęcia Cancelarenej mniejsza WXLtt zapieczętowany Artykuly pewna do parządku Cechu Zlotniczego Malarskiego należące w sobie maiący y doniesiona iest Nam przed PP Rady i Urzedniki dworu Naszego od slawietnego Jana Wiszenierskiego Cechmistrza Cechu Zlotniczego Yminiem Swym y wszysylkiej Braci Supplikującego prozba abysmy takowy przywiley we wszystkich iego punktach Condutuch y Artykulach Moią y powagą nasza krolewska zmocnili y ztwerdzili ktory słowo w slowo tak w sobie opiera.

Sigismundust tertius Dei Gracia... My Urząd Stanislaw Kurzalowski Burmistr wiary Chresciankiej Rymskiej a Jwan Rapowicz Burmistr wiary Chresciankiej Greckiej y tez wszyska Rada Je Kr Msci miasta Brzestskiego w WXLitt będąca przy nas wzupelnim sie dze[je]mi wszyskim pospolicie y kazdemu komu by o tym wiedzic bylo potrzebe nineyszym y na potym będącym o tym, naszym listem oznamyemy... Jz przyszedszy obliczne przed osoby na... Radę wycey pomienieną zupelną na miejsce zwykle na Ratusz stanowi y... Męzowie Obywatele a Rzemiesnicy tegoz miasta Brzeskiego, Rzemiesla Zlotniczego i Malarskiego, to iest — Jakub Raczka, Jan Dryznek, Jan Ryk, Michal Gronostayski, Adam Jasiński Rzemiosla Malarskiego Sami od siebe y od niszey Braciey Cechowej pokladali przed nami Condycye pewne sposoby i artykuly nizey opisane Porzadku Rzemiosla swego Zlotniczego Ktory Porządek chceąc aby przecz nas im byl potvierdzeon żądali nas oto zpilnoscią abysmy ie wprzod przeyrzacsiszy y rzomiawszy Brzetosestu urzedu swego onego im uzywać i rzadzic się dopuscili y uzmocnili do tąd az sobie v... artykuly... na pismie w te slowa podali:

**[Artykuł 1]** Naprzod Udzmalil (?) y postanowili to miedzy sobą ku czci y chwale Pana Boga Wszechmogacego wszytcy tey pospolicie w Bractwie mienionym Kosciola Rzymskiego Wiary Chrzescianskiey maiąc na pieizy dusze swe zbawiene y przedkow swych mszych na potym będących na kozdy kwartal, abo czwierc Roku podlug obrędu Kosciola Rymskiego Vigiilio za umarlych w kosciele obchodzic y celebrowac przy ktorych wykonania wszyscy Bracia y z Zonami Swoemi y Towarzyszimi Rzemiosla swego z tozciwsscią być maią z modlitwami wedlug powinnosci zwyczaiu Crzecianskiego ozymie pelnic powinny będa, pod winę grosza. Artykuly tez swoie w te slowa opisali. Naprzod iesliby

ktory Towarzysz ich rzemiosla chcial byc w Brzesciu Mistrzem powinen będzę miedzy nimi przynajmniey przecz zupelne dwie lecie robic aby za tym iego powolanie, zywot, obceroenia, Rodzicze mogli byc coswiadczane y poznane, za tym ktory by kolwiek tu w Miescie rzemioslo to robić chcial y bylby tu porządnie wycwiczony y wyuczony takowy powinen przez dwie lecie w dalekich u cudzych miastach bawic się chwalebne y przystojne zwyczai do tego rzemiosla przynaleząсе poymowac y nabywac.

**[Artykuł 2]** Potym zaden mieszczan w domu swoim Zlotnika ani Malarza robiącego rzemioslo z szkode y zneslawie braciey Bractwa tego miejskiego ktorzi... uszyskie Miejskie przystoynie znoszą czewsie trzymać nie będzie się wazyl pod wina sta kop polowice na urąd, polowice do Cechu wyymuiąc iesliby ten Zlotnik y prawo Miejskie y Spolecznoć Bracką miasta tegoz pierwiey przyaial.

**[Artykuł 3]** Jednak takowy Towarzysz Mistrzowstwo swoie y doskonalość nauki ukazuąc w sztukach Mistrzowskich nizey napisanych będzie powinen u Cechmistrza czynic y wykonywać. Naprzod Kilich ma misteny urobic, potym pieczęc na ktorzey ma byc Helm nazwany z literami wyraznemi pod zaslona albo gałaskami kwiaty ozdobnymi, iako zwyczay iest wyryc powinen. Potym ten ze ma osadzic kamien w pierstniu zlotym, y będzie powinen. A gdy to wykona y dosyc temu wszyskiemu uczyni, ma isc do urzędu Miejskiego zimszymi Sąsiady swymi y tam ma być mieskie przyiąc wedlug porządku miasta onego.

**[Artykuł 4]** Potym tenze mlody Mistrz skoroby Mistrzowstwo swoje porządnie wykonal y wszytko dokonczyl Ten pul grzywny srebra y zlotych 10 do Skrzynki Brackiej wstępnego będzie powinen zaplacic wyiawszy (?) Mistrzowskie tego rzemiosla syny ktori tylko do Skrynki brackiej pul grzywny y Srebra będą powinny dac x teyze wolnośći ktorzey Oycowie ich zazywac będą.

**[Artykuł 5]** Nad to Nowy Mistrz ciezarzy poslug tego Bractwa nosic y wypelniać dotąd dokąd by drugi Mlodzy Mistrz przybyl z chęcia powinen będzie.

**[Artykuł 6]** K temu iesli by ktora wdowa po męzu swym pozostala tego rzemiosla Zlotniczego ma iey byc dopuszczeno to rzemioslo robic y towarzysza chowac do roku y do 6 niedziel a dalej nie, y to przed ten rok ma i będzie powinna to Rzemioslo porządnie i sprawedliwie wykonywac, wedlug proby srzebra niziey opisaney. Do tego ta wdowa nie mosze zadnego chlopca wolnym uczynić tego rzemiosla.

**[Artykuł 7]** K temu ile kroć bysie Mistrzom tego rzemiosla Zlotniczego robota trafila to iest czarki, konwie, roztruchany, kubki, lyzki, knassle i inne rzeczy tym podobnie albo naczynia ku iedzemy i pieciu przynalezacze z srebra robic przypadalo.

**[Artykuł 8]** Ktorego srzebra kazda zosobne grzywna niemniey nad pietnaśćie lotow w szczerym i czystym srzebrze trzymac ma.

**[Artykuł 9]** Potym w robotach skladanych tak wielkich iako i malych, iako są pasy, cetki, zagle i inszym tych podobnych, karzda grzywna srebra ma w sobie trzymac takze piętnascie lotow, mniey iedna kwarta z koya.

**[Artykuł 10]** K temu iesliby kto do Zlotnika srebro przyniosl cechu Zlotnika ktorego Brzeskiego ne pieczętowanie ku robocie tenze Mistrz będzie powinen Srzebro one wedlug Nauki Swoiey rozpusac wonia y wytrzybobac, y wytrybowanie temu czyie iest wydac wedlug proby zwysz opisaney.

**[Artykuł 11]** Przy tym na kazde dwie niedzeli dwa Cechmistrowie wedlug porządku do kazdego zosobna kramnice albo warstatu wstępowac y nawiedac y probę brać iakie srebro robi, y robote oglądac.

**[Artykuł 12]** A iestliby wedlug postanowienia nie uczynil nalezy do występnego, wedlug iego zaslug y wedlug ich ustav za wszem karać będą.

**[Artykuł 13]** Za tym iesliby Srebro albo Zloto robione albo lamane iednak falszowane kto kolwiek do ktorego Mistrza przyniosl powinen on Zlotnik, takowie Srebro albo Zloto do Cechmistrzie odnieść, ktore Cechmistr na kowalskim mlocie tluc będzie tak ze by one zlote falszowanie do ludzi nie moglo więciy przyść.

**[Artykuł 14]** Potym kazdy Zlotnik z swego zlota ku przedawaniu chcąc robic potrzeba aby ono zloto osmnaście dragusow, albo pospolicie nazwane drag, w sobie mialo.

**[Artykul 15]** A iesliby kto zlotnikowi wlasne zloto do robenia przyniosl Zlotnik on takowe zloto iakowie od niego robić przyiął z warsztatu oddać zawsze powinen będzie.

**[Artykuł 16]** Tez iesliby komu z ludzi szkoda albo krzywda dziąc się w wadze srebra pozlocistego będzie sie dziala twierdziac ze pozlota ma wage y chcąc aby sobie wzgędom pozloty nie co bylo wytracono, tedy takomu zlotnikowi od kazdey grzywny Srebra za zywie srebro y kracbierst Sześć groszey wedlug czasu y wagi monety zaplacic powinen.

**[Artykuł 17]** Takze zaden towarzysz Mistrowski tego rzemiosla Zlotniczego ani przychodzien bez woley Cechmistrzow niech się ne wazy sobie robic pod iakimkolwiek prawiem bądz Swieckim albo Duchownym tak przytym Brześciu będącym nie uczyniwszy dosyc Cechowi Zlotniczemu Miasta Brzeskiego. Aiesliby się nalazl taki ktorzy swowolny y nieposluszny Cechowi tamecznemu Brzeskiemu takowy ma byc karan siem kop liczby i monety Litts. na kucznia Kr Je Msc i robota zlotarska ktora by nim byla nalezonna, ma byc pobrana do Cechu Zlotniczego do tąd az by pierwiey Cech Zlotniczy i Mieyski przyiął.

**[Artykuł 18]** Takze iesliby ktory Mistr taz, albo dwa, albo trzy przeciw tey wyszej napisanej ustawie, robiący byl znaleziony za kaydy raz do Skrynki Brackiej ma zaplacic grozy dwanascie y pracą Swoją utraciwszy Srebro albo Zloto dobre i czyste temu czyie będzie ma oddać, potym iesliby w tym występku poczmazte (?) byl doyrzany Cechmistrz iego warsztat zamknąc y występnego nam wedlug czasu będacym Burmistrom wedlug iego zaslug ku skarania odnieść będą powinni.

**[Artykuł 19]** Takze iesliby kto za falszowanie Srebra albo iake podeyrzenie Mistrowi zadal, a Cechmistrowie Zlotnicy dobre y czyste Srebro albo Zloto być wziali, będzie powinen ten czyie Srebro iest nagrodzic to zelzenie wedlug wynalazka Urzędowego. Tez iesliby Cechmistrowie Zlotnicy, a ktorego Zlotnika niesprawedliwej funt albo wagi nalezli, będa powinni pod winomi wielkimi takowego Nam y na ten czac bytnym Burmistrom wedlug Naszego wynalezenia y dekretu ku skazaniu odnieść.

**[Artykuł 20]** Takze iesliby ktory Zlotnik pod drudim Zlotnikiem naięty dom droicy naimowal, albo Towarzysza ucznia albo sluzebnika premowil, albo odmawiać kasilsię tyle krol będzie powinen do Skrynki Brackiey kamien wosku dac, ile kroć to będzie czynil.

**[Artykuł 21]** Takze chlopczykom albo uczniowku cwinczemu kazdy Mistrz nie więcey takze oproc trzech dobrzego y uczciwego wychowania będzie trzymał takze towarzyszow nie więcey takze iedno trzech będzie mu wolno chowac.

**[Artykuł 22]** A od kozdego ucznia takowego do Bractwa groszy powinen dać dwanaśćie.

